ARCHE Зьмест № 4’06

1. Зьмест / Уводзіны
2. ARCHE :: Галоўная
3. Ці мае Мілінкевіч будучыню? Круглы стол у рэдакцыі «ARCHE»
4. Нярыюс Пракявічус. Сярэдненькія карты апазыцыі
5. Эндру Ўілсан. Хто лепш засвоіў урокі Памаранчавай рэвалюцыі?
6. Павал Усаў. Паміж прэзыдэнтам і мэсіем. Перадвыбарны дыскурс Лукашэнкі.
7. Віталь Сіліцкі. Пачатак рэвалюцыі духу.
8. Алесь Анціпенка. Пэрспэктыўны праект «Саюзнай дзяржавы»?
9. Пётра Рудкоўскі. Паўстаньне на Кастрычніцкай плошчы
10. Андрэй Катлярчук. Нацыянальнае канструяваньне Міцкевіча...
11. Я не баюся слова «свабода». Гутарка зь пісьменьніцай Ірынай Жарнасек.
12. Андрэй Хадановіч
13. Патрык Оўржаднік. Еўрапеана. Кароткі нарыс гісторыі дваццатага стагоддзя.
14. Да гісторыі Беларускай Сацыялістычнай Грамады: агляд крыніцаў
15. Віталь Зайка. Беларуская разьяднанасьць і таталітарызм-light.
16. Юры Чавусаў. Да апалёгіі здрады.
17. Юры Чавусаў. Да апалёгіі здрады.
18. Аркадзь Цеплякоў. Дэміталягізацыя езуітаў у Беларусі.
19. Павал Абрамовіч. Жаночыя комплексы і непатрэбныя скарбы.
20. Даніла Жукоўскі. Анталогія і паталогія.
21. Генадзь Семянчук. Расійская выключнасць і еўрапейская рацыянальнасць.
22. Дзмітрый Крывашэй. Праблема выбару і мяжы.

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 4 (44) - 2006**

[image]

[image]

[image]

4[image]-[image]**2006**

выбары-2006 • аналітыка • літаратура • гісторыя • эсэістыка

[image] [image] [image]

[image]

З ь м е с т

C o n t e n t s

ВЫБАРЫ-2006

Ці мае Мілінкевіч будучыню? Круглы стол у рэдакцыі «ARCHE»
НЯРЫЮС ПРАКЯВІЧУС Сярэдненькія карты апазыцыі
ЭНДРУ ЎЙЛСАН Хто лепш засвоіў урокі Памаранчавай рэвалюцыі?
ПАВАЛ УСАЎ Паміж прэзыдэнтам і мэсіем
ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ Пачатак рэвалюцыі духу
АЛЕСЬ АНЦІПЕНКА Пэрспэктыўны праект «Саюзнай дзяржавы»?
ПЁТРА РУДКОЎСКІ Паўстаньне на Кастрычніцкай плошчы

АНАЛІТЫКА

АНДРЭЙ КАТЛЯРЧУК Нацыянальнае канструяваньне Міцкевіча, або What Tomas Venclova did not say in Harvard

ЛІТАРАТУРА

Я не баюся слова «свабода». Гутарка зь пісьменьніцай **ІРЫНАЙ ЖАРНАСЕК**
АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ Лірыка

ГІСТОРЫЯ

ПАТРЫК ОЎРЖАДНІК Эўрапеана. Кароткі нарыс гісторыі

дваццатага стагодзьдзя
АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ Да гісторыі Беларускай Сацыялістычнай Грамады: агляд крыніцаў

ЭСЭІСТЫКА

ВІТАЛЬ ЗАЙКА Беларуская разьяднанасьць і таталітарызм-light

ПАЛЕМІКА

ЮРЫ ЧАВУСАЎ Да апалёгіі здрады
ЮРЫ ПАЦЮПА Tahafut al-Tahafut

РЭЦЭНЗІІ

АРКАДЗЬ ЦЕПЛЯКОЎ Дэміталягізацыя езуітаў у Беларусі
ПАВАЛ АБРАМОВІЧ Жаночыя комплексы і непатрэбныя скарбы
ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ Анталёгія і паталёгія
ГЕНАДЗЬ СЕМЯНЧУК Расейская выключнасьць і эўрапейская рацыянальнасьць
ДЗЬМІТРЫ КРЫВАШЭЙ Праблема выбару і мяжы

[image]
[image]

№ 4 (44) - 2006

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/04/12
[image]

Powered by phpBB © 2001, 2005 phpBB Group

Ці мае Мілінкевіч будучыню?
Круглы стол у рэдакцыі «ARCHE»

У круглым стале, які адбыўся 24 сакавіка, узялі ўдзел філёзаф **Алесь Анціпенка**, галоўны рэдактар часопісу «ARCHE» **Валер Булгакаў**, незалежны палітоляг, актывіст каманды Мілінкевіча **Алесь Лагвінец**, філёзаф, рэдактар інтэрнэт-сайту «Наше мнение» **Янаў Палескі**.

Валер Булгакаў: Нягледзячы на гарачыя запэўніваньні ў вялікім зруху ў беларускім грамадзтве падчас выбараў, згодна зь іх афіцыйнымі вынікамі, электарат дэмакратычных сілаў паменшыўся прыкладна на 600–700 тыс. чалавек. Выходзіць, Ганчарык 5 гадоў таму быў значна больш пасьпяховым кандыдатам ад дэмакратычных сілаў, чымся адзіны кандыдат – Мілінкевіч – сёлета.

Алесь Анціпенка: Тут мае сэнс звярнуць увагу на тое, як асьвятлялася выбарчая кампанія ў дзяржаўных мэдыях. Калі падчас кампаніі выбараў у парлямэнт і рэфэрэндуму 2004 г. усё ж прызнавалася існаваньне апазыцыі, то цяпер пасыл быў іншы: апазыцыі і яе рэпрэзэнтантаў у краіне няма. Ёсьць толькі пасьпяховае разьвіцьцё краіны, якое ўзначальваецца Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам. Вынікі выбараў фактычна адлюстроўваюць гэты мэдыя-пасыл: ёсьць толькі адзін лідэр, адзін герой нацыі, і нікога, роўнага яму, няма і

быць ня можа. Як бы аб’ектыўнае разьвіцьцё падзеяў, посьпехі і дасягненьні, у нашай краіне выпрадукавалі з Аляксандра Рыгоравіча кіраўніка новай якасьці. Калі раней ён быў усенародна абраны, то цяпер ён проста ўсенародны. А значыць, і выбіраць ня трэба. Больш за тое, паводле таго, як дзяржаўныя мэдыі асьвятлялі выбарчыя кампаніі альтэрнатыўных прэтэндэнтаў на пасаду прэзыдэнта, выбіраць не было з каго, кандыдат быў толькі адзін.

Мяне не зьдзіўляе, чаму зьніклі 600 тыс., якія заманіфэставалі падчас мінулых прэзыдэнцкіх выбараў сваю падтрымку Ганчарыку. Беларускім грамадзянам, якія яшчэ ня страцілі здольнасьці зьдзіўляцца, наперад патлумачылі, што за прадстаўніка апазыцыі прагаласуе мізэрная колькасьць выбарцаў. Агучваліся сацыялягічныя зьвесткі, паводле якіх Аляксандар Рыгоравіч зьбярэ як найменей 76 % галасоў. А падтрымка А. Мілінкевіча разам з А. Казуліным была на мяжы статыстычнай памылкі. Так тыя выбарцы, якія маглі мець сумнеў, адпаведным чынам «адукоўваліся». Наперад адбывалася мадэляваньне вынікаў выбараў.

Гэта азначае, што вынікі выбараў карэлююцца з той закладзенай схемай, якую паказвала беларускім грамадзянам беларускае тэлебачаньне і прадукавалі іншыя дзяржаўныя мэдыі.

Янаў Палескі: Падчас гэтай выбарнай кампаніі (якую трэба называць выбарачнай, паводле аналёгіі з «уборачнай») часта выкарыстоўваўся сацыялягічны канцэпт падтрымкі, які мне хацелася б дэканструяваць. Інстытут Гелапа, калі адмаўляўся ладзіць тут дасьледаваньні, зусім разумна тлумачыў, што тут у прынцыпе ня створаныя ўмовы для сацыялягічных замераў. З такім самым посьпехам можна прыйсьці ў турму і апытаць зьняволеных, ці ўсё добра ў іх з абслугоўваньнем і ці падтрымліваюць яны палітыку адміністрацыі. У нас ня створаныя ўмовы для прадукаваньня палітычных меркаваньняў. Таму гаварыць пра падтрымку Лукашэнкі ці Мілінкевіча ня мае сэнсу.

З другога боку, я салідарызуюся з тымі камэнтатарамі, якія, кажучы пра перабор ува ўжываньні сілы, запалохваньня і г. д. у

гэтай выбарчай кампаніі, лічаць гэта сьведчаньнем таго, што ўлада разумее, што падтрымка ў яе невялікая. У іншым разе ня трэба было б такога масавага наступу на тое, што называецца грамадзкай сьвядомасьцю, якой (у дадатак) яшчэ быццам і не існуе.

Валер Булгакаў: Мне здаецца, такія развагі вядуць нас у тупік. Ёсьць улада і ёсьць апазыцыя. Улада ажыцьцяўляе свой праект. І што б ні рабіла апазыцыя, яна з самага пачатку была асуджаная, груба кажучы, на 5 %. І яна атрымлівае гэтыя свае 5 %. Гэткае мысльленьне затушоўвае прастору апазыцыйнай актыўнасьці, а сам дыскурс пра апазыцыю робіцца абстрактным. Выходзіць, ніякага значэньня ня маюць пытаньні, наколькі быў прадуктыўны альянс Казуліна і Мілінкевіча, колькі шкоды прынесла памылка каманды Мілінкевіча, калі яна забылася ў адведзены законам тэрмін апублікаваць перадвыбарную праграму ў дзяржаўных мэдыях, і маса іншых?

Алесь Лагвінец: Пытаньне наконт лічбаў, напісаных апазыцыі, як мерніка вагі апазыцыі для мне проста сьмешнае. Апэляваньне да іх можа мець сэнс толькі ў тым выпадку, калі мы кажам пра паводзіны ўлады. Гэта значыць, калі мы абмяркоўваем, што ўлада робіць. Так, яна адмінусоўвае яшчэ 600 тыс. – гэта адназначна. Але калі мы аналізуем дынаміку таго, што адбываецца ў асяродзьдзі дэмакратычных сілаў, дык рэлевантнасьць гэных лічбаў нулёвая. Лічбы, якія цяпер абвясьцілі, далёкія ад рэчаіснасьці. Я быў нават вельмі ўсьцешаны, калі пабачыў, што па Менску паводле афіцыйных зьвестак падтрымка Лукашэнкі сягала 69–72 %, прычым другім па Менску амаль паўсюдна паставілі Гайдукевіча з 5–6 %, Мілінкевіч жа быў толькі трэці з напісанымі 4 %. Хто паверыць у гэтыя лічбы?

Так, гэта ляпсус, што не пасьпелі занесьці ў дзяржаўныя газэты тую ж праграму Мілінкевіча. Хаця ў мяне ёсьць сумневы, што яна была б надрукаваная ў колькасьці, роўнай рэальнаму накладу гэтых газэтаў. Магла б быць тая ж самая дробная подласьць, якую дэманструе цяпер улада.

Алесь Анціпенка: Чаму не было б? У «Саўбеліі» была праграма Казуліна...

Алесь Лагвінец: Яна павінна была быць надрукаванай па законе. А колькі нумароў разышлося – хто-небудзь мог лічыць?

Алесь Анціпенка: Ну, падпісчыкам дайшла. А я купіў. Так што тут ня трэба...

Алесь Лагвінец: Добра, калі так. Другая рэч – тое, што грамадзтва нашае вельмі моцна падзеленае. Яно падзеленае на практычна роўныя часткі. Калі браць практычныя, рэальныя рэчы, па выніку збору подпісаў я заўважыў, што чвэрць людзей у Менску, нягледзячы на ўсе запужваньні, згаджаецца падпісвацца за адназначна альтэрнатыўнага кандыдата. Я скажу больш: там, дзе людзі мелі толькі адну ўлётку пра Кангрэс дэмакратычных сілаў, яны адразу казалі: «Я чытаў, і я буду падпісвацца».

Валер Булгакаў: Я б ахарактарызаваў такі падыход як успрыманьне апазыцыяй грамадзтва, а не як успрыманьне апазыцыі грамадзтвам. У такім ж стылі разважаў сп. Янаў Палескі, калі гаварыў, што на самай справе лукашэнкаўская падтрымка не была вялікая...

Янаў Палескі: Я ня так сказаў. Мы ня ведаем, якая яна была. Мы ня можам ацэньваць колькасна, але можам гаварыць пра якасную падтрымку. Калі гэты Новы горад на пляцы, які штодня зьбіраў паўтары тысячы (лічба яго ўмоўнага «насельніцтва» хісталася) існаваў сапраўды, то ў падтрымку Лукашэнкі прыходзілі нейкія жанчыны.

Тут мы бачым падтрымку адно сілавую. Сілавыя структуры зьмятуць гэты гарадок, але ж – не падтрымка зьмяце!

Валер Булгакаў: Як на мяне, Лукашэнка карыстаецца падтрымкай больш як 50 % беларускага насельніцтва. А сілавы варыянт сьведчыць пра тое, што ўлады зьмянілі ранейшыя правілы. Маючы падтрымку бальшыні беларусаў, яны хочуць яе павялічыць праверaным рэпрэсіўным мэтадам.

Алесь Анціпенка: Спадар Янаў Палескі кажа, што ў нашай сытуацыі не прадукуецца грамадзкая апінія, што няма ўмоваў, у якіх можна колькасна замерыць, як розныя сэгмэнты

грамадзтва ставяцца да таго ці іншага палітычнага лідэра. Я магу пагадзіцца толькі з тым, што ў нас грамадзкая апінія не структураваная, бо няма публічнай прасторы і няма незалежных мэдыяў. Але гэта не азначае, што людзі ніяк не ацэньваюць таго ці іншага кандыдата ці прадстаўніка той ці іншай палітычнай сілы.

Адказ, як жа ўсё ж такі ставілася насельніцтва да зьяўленьня адзінага альтэрнатыўнага кандыдата (маю на ўвазе Мілінкевіча), можна – прынамсі ўскосна – знайсьці ў тым, як разгортвалася кампанія за Лукашэнку ў дзяржаўных СМІ. Яна паказала, што грамадзтва падзеленае. Што хаця Лукашэнка і меў падтрымку, вышэйшую за 50 %, але атрымаць такую падтрымку на выбарах было для яго проста недапушчальна. Недапушчальна – па розных прычынах. У тым ліку і таму, што на рэфэрэндуме ён атрымаў ледзьве больш за 80 %.

Валер Булгакаў: Магчыма, зьяўленьне зьніадкуль Казуліна сьведчыла, што адпаведныя сацыялягічныя замеры былі праведзеныя, і было вырашана (у лістападзе ці сьнежні) запусьціць гэты праект – пасьля пэўных кансультацыяў і сацыялягічнай інжынэрыі? Ці такі гэты праект цалкам самастойны, які не залежаў ад дынамікі рэйтынгаў Лукашэнкі і Мілінкевіча?

Алесь Анціпенка: Я ня думаю, што гэта цалкам самастойны праект.

Я б хутчэй сказаў, што значная колькасьць людзей у Беларусі фактычна не жыве ў нашым грамадзтве і ніяк ня хоча ставіцца ці вызначаць сваё стаўленьне да Лукашэнкі ці кагосьці яшчэ. Але пагадзіцеся, з другога боку, што ніхто з вас сёньня не заўважыць энтузіястычнага стаўленьня да Аляксандра Рыгоравіча, якое б публічна выказвалася. А гадоў сем таму гэтае энтузіястычнае стаўленьне маніфэставалася. Узровень пазытыўнага эмацыйнага стаўленьня да Аляксандра Рыгоравіча істотна панізіўся.

Валер Булгакаў: Можа, Лукашэнка стаў меншым раздражняльнікам у грамадзкай прасторы, бо ператварыўся ў такую трансцэндэнтную сутнасьць, якая мала залежыць ад

законаў фізычнага сьвету?

Алесь Лагвінец: Улада дамагалася пэўнай трывіялізацыі або інстытуцыялізацыі харызмы Лукашэнкі, якая была да гэтага. Ягоная кампанія была вельмі абстрактнай. «Стабільнасьць» – слова, якое стала ключавым. Яно ўжо нібыта не абавязкова зьвязанае з пэўнай асобаю. Улада разумее, што на якіхсьці чыста эмацыйных рэчах яна больш ня зможа доўга трымацца. Таму з боку ўладаў гэтая кампанія была вельмі далекасяжная. Я не хачу казаць пра лічбы – наконт паловы грамадзтва, 50 % ці 60 %. Мне падаецца, што 50 % – гэта максымальная мяжа, якую можа мець сёньняшняя ўлада з усім ейным рыштункам масавае прапаганды. І яна не дасягала гэтай мяжы.

Наконт іншых праектаў. Цяжка казаць, самастойны ці несамастойны (ня ведаю ўсіх падводных камянёў) праект іншага альтэрнатыўнага кандыдата, апроч Аляксандра Мілінкевіча. Але відавочна, што ў пэўны момант яны ўзаемадапаўнялі адзін аднаго, і для ўладаў гэта было небясьпечна. Таму з боку ўладаў ніхто і ня дбаў пра бюлетэні. Галоўным для іх было «зрабіць» патрэбны вынік.

Мы ня можам казаць пра ступень падтрымкі ці непадтрымкі ўва ўмовах татальнага кантролю за СМІ і такой прапаганды. Таму лічбы могуць быць розныя. Улада была таксама запалоханая, калі яна разьменьвалася на дробныя подласьці і калі яна не палічыла патрэбным надаць хоць якісьці фасад дэмакратычнасьці гэтым выбарам. Параўнальна ж з папярэднімі, інфармацыйная кампанія, праведзеная як Мілінкевічам, так і Казуліным, была даволі эфэктыўная.

Валер Булгакаў: Хацеў бы задаць яшчэ два дробныя пытаньні. Каб не было Казуліна, ці набраў бы Мілінкевіч 8 %? Другое пытаньне тычыцца выбарчай кампаніі Мілінкевіча. Кідалася ў вочы, што яго паездкі па рэгіёнах уключалі двух ці нават трохразовае наведваньне адных і тых жа гарадоў (Жлобіна, Бабруйску ці Баранавічаў) пры ігнараваньні іншых рэгіянальных цэнтраў. Адным словам, Мілінкевіч езьдзіў у тыя райцэнтры, дзе былі асяродкі грамадзянскай супольнасьці. Таму ў мяне выклікае вялікія пытаньні фармулёўка, што інфармацыйная кампанія была эфэктыўная. У якім пляне? У

пляне выпуску агітацыйнай прадукцыі? У пляне доступу да мэдыяў?

Алесь Лагвінец: Першая рэмарка: я ня бачу ніякага сэнсу гадаць над лічбамі, якія каму напісалі. Гэта з прасторы мэтафізыкі і ўвогуле шызоіднасьці – абмяркоўваць, колькі каму напісалі б, калі не было б Казуліна.

Інфармацыйная ж кампанія была пасьпяховая ў тым, што на месцах праца была больш асэнсаваная. Мы можам казаць пра большыя ці меншыя недахопы дзейнасьці штабу і агульнай стратэгіі, але кампанія была ўдалая інфармацыйна. У тым ліку дзякуючы таму, што была велізарная ініцыятыва зьнізу. Пры тым, што адсутнічаюць СМІ, параўнальныя з 2001 г., тое, што адбылося сёньня, і тое, якім чынам людзі шукалі інфармацыю, і якім чынам яны самі ведалі наперад, найперш праз Інтэрнэт, пра выбарчую кампанію да таго, як мы да іх завіталі з улёткамі або запрашэньнямі на сустрэчы – усё гэта вялікае дасягненьне.

Наконт паездак па рэгіёнах. Я лічу, што рэсурс сустрэчаў з выбарцамі ў сталіцы быў не да канца выкарыстаны. Відавочна, кожная паездка ў рэгіёны мусіць быць падрыхтаваная і мусіць існаваць пэўная база для таго, каб гэта рабіць. Так, у адных райцэнтрах больш эфэктыўна працуюць вэртыкальнікі, якія ўсё павынішчалі, у іншых – менш эфэктыўна, і там існуюць людзі і структуры, якія могуць усё арганізаваць. Тут таксама варта глядзець з адваротнага. У пэўныя райцэнтры ўсходняй Гомельшчыны, напрыклад, нават ня мае сэнсу ехаць: трэба глядзець дэмаграфічна, наколькі тыя ці іншыя раёны вырашальныя для таго, каб стварыць велізарную перавагу.

Вялікая праблема дэмакратычных сілаў да цяперашняй кампаніі была ў тым, што яны не маглі змабілізаваць нават свой уласны электарат. Мяне зьдзівіла, калі людзі, якія ведалі, што пойдуць на плошчу (і гэта мадэль, якая была зададзена ўва Ўкраіне, у Грузіі), былі недастаткова змабілізаваныя, каб штосьці рэальна, канкрэтна рабіць на лякальным роўні – нават парупіцца і разьнесьці ўлёткі па сваіх суседзях. І гэта мінус кампаніі.

І вось гэтыя нечаканыя 20 тысячаў (ці колькі?) 19 сакавіка і

потым наступнага дня былі сапраўды нечаканыя.

Валер Булгакаў: Паводле «Associated Press» было 10 тыс. на першы дзень, а на другі – 5 тыс. Ёсьць меркаваньне, што такая яўка на плошчу была выкліканая тым, што ў адрозьненьне ад Ганчарыка Мілінкевіч ішоў пад нацыянальнымі сьцягамі. «Баявы атрад» беларускай апазыцыі, які быў на плошчы (калі браць статыстыку затрыманых) – гэта нацыянальны актыў, якога ніяк асабліва ня трэба мабілізаваць.

Алесь Анціпенка: На маё разуменьне, зьмянілася сама інфармацыйная сытуацыя ў нашым грамадзтве. Калі я пытаюся ў студэнтаў: «Дзе вы даведваецеся пра навіны?», яны ня кажуць, што ў газэтах. Усе мне адказваюць: «Мы зьвяртаемся да Інтэрнэту». Толькі паводле афіцыйнай статыстыкі «Белтэлекаму» адна траціна насельнікаў зьяўляецца карыстальнікамі Інтэрнэту. Зьмянілася сама звычка (асабліва ў маладой генэрацыі) атрымліваць інфармацыю. Інтэрнэт дастаткова добра інфармаваў пра палітычную кампанію Мілінкевіча: я маю на ўвазе ня толькі сайт кандыдата, але і іншыя інфармацыйныя і аналітычныя сайты, якія ёсьць у нашай краіне ці па-за яе межамі.

Частка электарату сталася іншай. Мяняецца дэмаграфічная структура насельніцтва. Хаця і становіцца большай удзельная вага людзей сталага ўзросту, тым ня менш за гэты час, за гэтыя 5 гадоў 5 міні-генэрацыяў увайшлі ў рэальнае жыцьцё і маюць права ўдзелу ў выбарах. Гэта маладыя людзі, якая маюць іншую мэнтальнасьць, якія не ўяўляюць сябе без кампутара, без Інтэрнэту, без таго, што ў прынцыпе няма межаў для атрыманьня інфармацыі (іншая справа – далягляды іхных уласных інтарэсаў), – вось гэта паўплывала.

Плюс, я думаю, адбылася зьмена стаўленьня да самога Лукашэнкі. Не хачу сказаць, што яно сталася занадта крытычнае. Яно магло стацца неэмацыйнае, для кагосьці ён папросту ўжо нецікавы і ня ёсьць палітычнай фігурай, якая прыцягвае ўвагу. Для кагосьці ён традыцыйна (а хтосьці да гэтага яшчэ далучыўся) папросту ня ёсьць прымальнай фігурай і г. д. Я настойваю на тым, што адбыўся пэўны зрух у стаўленьні да Лукашэнкі, і адносіны да яго (прынамсі, у

эмацыйным ракурсе) адназначна зьмяніліся. Яго нельга назваць раздражняльнікам, які адназначна палярызуе і правакуе ўсіх. Спэктар стаўленьня да Лукашэнкі цяпер больш шырокі, чым ён быў, скажам, у 1998 г., калі адназначна – «за» і з энтузіязмам і адназначна – «супраць». Да яго ёсьць розныя стаўленьні. У тым ліку і абсалютна нэўтральнае, і пафігісцкае.

Валер Булгакаў: І што з таго? Ці ёсьць у гэтым заслуга Мілінкевіча? Выразам гэтай тэндэнцыі можа быць, у лепшым выпадку, факт, што сёлета на пляц прыйшло на 5 тыс. чалавек болей, чым у 2001 г. – нягледзячы на ўвесь фэнамэнальны доступ ў Інтэрнэт, зьмену стаўленьня і многае другое.

Алесь Анціпенка: Зьмена стаўленьня яшчэ не азначае зьмены паводзінаў. Зьмена паводзінаў адбываецца, калі ёсьць моцная ўнутраная матывацыя.

Па-другое. Я б не сказаў, што ў сымбалічным сэнсе на плошчу прыйшло 10 тыс. Я не падзяляю аптымістычнай ацэнкі, што на плошчу 19-га (я там таксама быў) прыйшло 20–25 тыс. Мая ацэнка – 10–12 тыс. Але ў сымбалічным сэнсе прыйшло значна болей. Адзін бок справы – тое, што мы ўбачылі на плошчы. Другі бок – тое, што адбывалася ў горадзе з самай раніцы і да позьняга вечара. Хто з вас назіраў, што адбывалася на вуліцах? Вуліцы былі пустынныя, у транспарце езьдзілі рэдкія людзі. Дзіўна! У нядзелю звычайна едуць на базар ці яшчэ кудысьці, а тут раптам пустынны горад. Я зайшоў у краму, зазірнуў заадно ў аддзел, дзе прадавалі гарэлку. Я жахнуўся: ніводнага алькаша! Нават напужалі алькашоў! Вы разумееце, якая была масаваная псыхалягічная атака? І пасьля такой масаванай псыхалягічнай атакі, калі вымер увесь горад, прыйшло 10 тыс., значыць мы маем як мінімум яшчэ 10–20 тыс. людзей, ці нават болей, якія пры іншай псыхалягічнай атмасфэры прыйшлі б на плошчу.

Янаў Палескі: Адна рэч – выйсьці на плошчу ўва Ўкраіне ці ў 2001 г. у Менску. Другая рэч – выйсьці сёньня. Гэта розныя сытуацыі. Нешта мяняецца ў грамадзкай сьвядомасьці, але мяняецца і сытуацыя. Зьмены ў грамадзкай сьвядомасьці не вядуць да зьменаў у сацыяльных практыках. Усе гэтыя зьмены трэба яшчэ «асядлаць». І тое, што мы спрабуем ацаніць –

посьпех ці няпосьпех апазыцыі – можна падзяліць на два фрагмэнты. Выбарчую кампанію ў створаных умовах апазыцыя правяла больш-менш эфэктыўна. Эфэктыўнасьць – гэта суадносіны ўкладаньняў да выхаду. Калі параўнаць рэсурсы ўлады: якія грошы падаткаплатнікаў былі ў гэта ўкладзеныя і г. д. – і рэсурсы, якія выкарыстоўвалі Мілінкевіч з Казуліным, уключаючы тыя жалю вартыя два разы па паўгадзіны, то эфэкт быў бессумнеўны. І гэта напалохала ўладу, якая перайшла раптам да іншай стратэгемы: пачала хапаць лідэраў апазыцыі і г. д. Гэта першая частка.

Валер Булгакаў: Мілінкевіч – гэта правільны выбар?

Янаў Палескі: Гэтае пытаньне лічу некарэктным, бо гэта быў проста выбар. Выбар не бывае правільны ці няправільны.

Валер Булгакаў: Ён вам сымпатычны ці несымпатычны?

Янаў Палескі: Калі вярнуцца да Кангрэсу дэмакратычных сілаў і выбіраць паміж Лябедзькам, Казуліным і Мілінкевічам, то, канечне, Мілінкевіч. І я выступіў у яго падтрымку. Хаця мне, праўду кажучы, было абыякава. Я не трапляю пад уплыў палітычнай фэтышызацыі: мне ня важна – жанчына ці мужчына, хай хоць чорт з кавенькай – я прагаласую за яго. Бо я пасьлядоўна трымаюся меркаваньня, што гэтая ўлада вядзе ў тупік. Што гэта ніякі не дэмакратычны транзыт, а канцавы прыпынак, і мы яго дасягнулі.

Валер Булгакаў: Прабачце, я вас перапыніў...

Янаў Палескі: Другая частка. Намётавы гарадок паказаў, што партыйная апазыцыя не гатовая дзейнічаць у «неканстытуцыйных» умовах. І тут выявіў сябе грамадзянскі супраціў. Мы пабачылі расколіну паміж грамадзянскай і партыйнай апазыцыяй. Грамадзянскі супраціў – гэта фэномэн, у прынцыпе новы для Беларусі, – як і сам намётавы гарадок. Цяпер я чытаю «жывыя журналы»: там грамадзянскі супраціў працягвае разьвівацца. І сёньня задача апазыцыі – альбо спрабаваць «асядлаць» гэты фэномэн, альбо працягваць ладзіць кангрэсы, прымаць нейкія дэклярацыі.

Адбываецца паўзучая дэмакратызацыя апазыцыі. Многіх лідэраў сёньня саджаюць на 10–15 сутак, і адбываецца вылучэньне новых лідэраў. Адбываюцца стыхійныя зьмены ў самой апазыцыі і ў грамадзянскім супраціве. ...Усялякае грамадзтва расколатае. Але раскол гэты не праходзіць па лініі 50 на 50. У сапраўднасьці ёсьць 5–10 %, якія выступаюць за кансэрватыўны шлях разьвіцьця, і 5–10 % – за зьмены. У адным і другім выпадку гэта – асэнсаваная падтрымка. Само ж грамадзтва, якое ня бачыць, якія дывідэнды можна атрымаць зь зьменаў у сфэры чыстай палітыкі, як правіла, ніяк ня ставіцца. І ступень падтрымкі залежыць ад ступені набліжанасьці да ўмоўнага поля палітыкі. Гэтыя галасуюць за Лукашэнку, бо ў іх няма выбару, гэныя – проста за ягоную спартовую праграму. Астатнія ня ведаюць, чаму яны так робяць. Проста ім сказалі ісьці галасаваць. Такім чынам, задача і адной, і другой меншыні – авалодаць астатняй масай, пераканаць яе ў тым, што яна падтрымлівае менавіта іх. Падтрымку нельга сумаваць як раўназначныя велічыні ўва ўсіх групах.

Тут паўстае пытаньне: хто здолее ў агляднай пэрспэктыве больш адэкватна пабудаваць карціну сацыяльнага сьвету і выкарыстаць саму гістарычную сытуацыю. Тут пытаньне – пра гістарычную творчасьць.

Алесь Лагвінец: Пытаньне ў тым, як сёньня дэмакратычным сілам выйграць поствыбары. Грамадзтва дасягнула пэўнага ўзроўню палітызацыі і эмацыйнага ўзрушэньня. Цяпер гэтая ўзрушанасьць паступова зьнікае, хваля заціхае і праз пэўны час спадзе. Пытаньне ў тым, наколькі дэмакратычныя сілы ў стане скарыстаць з гэтай палітызацыі.

Наконт хаўрусу Мілінкевіча і Казуліна. Лічу, што Мілінкевічу крышачку бракавала ўпэўненасьці ў сабе, каб проста публічна не зважаць на тое, што робіць сп. Казулін. Кампанія Мілінкевіча была пазытыўнай. Уступаючы ў перамовы, адказваючы на звароты Казуліна, ён выяўляў у нечым сваю слабасьць і ставіў сябе зь ім на адзін ўзровень. Бо мы мусім апэляваць да ўсяго беларускага народу, а не да палітызаванае часткі насельніцтва (яна вельмі важная, але сама зробіць свой выбар).

Паглядзіце на колькасьць подпісаў, сабраных у рэгіёнах. На Гомельшчыне менш за ўсё подпісаў набраў Казулін, бо там дэмакратычныя актывісты былі пад большым кантролем каманды Мілінкевіча і не працавалі на два франты. А ўва ўсіх іншых месцах яны часьцяком працавалі на абодвух. У нас ня так і шмат палітычна заангажаваных людзей, таму выйшла так, што адны былі з аднымі, другія – зь іншымі, некаторыя былі адначасова на двух франтах.

Гэты хаўрус Мілінкевіча і Казуліна пэўны момант існаваў. Цяпер цяжка казаць, ці будзе існаваць ён далей. Калі параўноўваць Мілінкевіча як з Казуліным, так і з Лукашэнкам, прага да ўлады ў яго меншая: ён удзельнічае ў палітыцы з інтэлігенцкага пачуцьця абавязку перад Радзімай. А ў нашым народзе ўжо быў створаны пэўны ўзор: калі чалавек хоча ўлады, ён мусіць быць брутальным і рвацца да яе. Гэты стэрэатып даволі складана будзе пераадолець. Але я б ня ставіў крыж на палітычнай будучыні Мілінкевіча. І я цалкам згодны з Янавым Палескім, што ўнутры дэмакратычных сілаў адбываецца пэўнае абнаўленьне. І вельмі важна, каб Мілінкевіч быў у стане, застаючыся на сёньняшні дзень лідэрам дэмакратычных сілаў, надалей ствараць рэальную альтэрнатыву сёньняшняму альбо заўтрашняму кандыдату ад уладаў.

Янаў Палескі: Для мяне ня важна, якую мэту закладалі ў Казуліна і хто ім кіруе, хто торгае за ніткі. Я мяркую пра ўсё з гледзішча эфэктаў, а хто кім кіруе – гэта пытаньне для разьведслужбаў. Будучы сам прыхільнікам Мілінкевіча, я выступлю ў абарону таго, што называецца «эфэктам Казуліна». На такім прыкладзе. Два сайты – А і В – існуюць у стане канкурэнтнай дзяльбы чытацкай аўдыторыі. Калі сайт В сышоў у адпачынак на 2 тыдні ўлетку, кіраўніцтва сайту А вырашыла выкарыстаць гэта і перацягнуць на сябе частку аўдыторыі. Але адбылося адваротнае: агульнае падзеньне наведвальнасьці сайту А пры тым, што В не працаваў. Выходзіць, дэмакратычны электарат ня ёсьць пастаяннай велічынёй. І самі дзьве аўдыторыі ёсьць эфэктам прадукаваньня палітычных навінаў. Калі іх няма, няма канкурэнцыі – адбываецца падзеньне ў абодвух выпадках. Заслуга Казуліна ў тым, што ён зрабіў такі

самы эфэкт. Ён не падзяліў, а павялічыў колькасьць патэнцыйных ці рэальных прыхільнікаў Мілінкевіча. І сам нарасьціў уласную папулярнасьць. Яны ня дзеляць устойлівую і малазьменлівую з гадамі базу антылукашыстаў, а з двух бакоў падразаюць тую масу, якая ня мае і не прадукуе палітычных меркаваньняў. (Агульнавядомае выказваньне Бурд'ё, што бальшыня не прадукуе палітычнага меркаваньня, гэтаксама як бальшыня не разьбіраецца ў радыёапаратуры, журналістыцы і г. д.) Яны проста далучаюцца да большасьці, да сьвядомасьці і г. д. Бальшыня выбірае той ці іншы шампунь не таму, што разьбіраецца ў гэтым, а таму што гэта папулярна сярод бальшыні. Гандлёвыя маркі кажуць: гэта – папулярна, нас выбірае ўвесь сьвет, нават кітайцы. Таму і нельга казаць пра падтрымку на марфалягічным узроўні. Гэта вельмі хісткія велічыні, як зь дзьвюма аўдыторыямі гэтых сайтаў.

Менавіта пэўная канкурэтная барацьба прадукавала палітычныя навіны. Калі Казулін ці Мілінкевіч прапануюць нейкія палітычныя альтэрнатывы, яны адразу ў «Яндэксе» перасоўваюцца ў лідэры спасылак. Калі Мілінкевіч адказвае Казуліну (ня важна, пагадзіўся ён ці адмовіўся) – гэта таксама навіна, гэта таксама выклікае да іх цікавасьць. Агульны эфэкт – кумулятыўны. Пры тым, што падтрымка Мілінкевіча, калі меркаваць па людзях на пляцы, вышэйшая: ён папулярны, і яго можна лічыць паўнацэнным лідэрам нацыі, які прайшоў усе неабходныя выпрабаваньні – натоўпам, тэлебачаньнем і г. д.

Ня важна, хто ім кіруе і чые грошы былі ўкладзеныя ў кампанію таго, хто перамог і стаў прэзыдэнтам. Адбываецца скрыўленьне траекторыі спачатна закладзеных у ім інтарэсаў і канчатковага кантракту з грамадзтвам. Шэксьпір у п'есе «Генрых IV» апісвае, як Фальстаф прыходзіць да свайго старога сябра, былога прынца і цяперашняга караля і вітае яго як старога прыяцеля, а той кажа нешта накшталт: «Стары, цябе не пазнаю я...» Бо старыя адносіны разарваныя, і ў яго новы кантракт з грамадзтвам.

Валер Булгакаў: Ці праведзеная кампанія будзе спрыяць таму, каб Мілінкевіч заставаўся агульнанацыянальным лідэрам дэмакратычных сілаў? Ці спрыяла яна нарошчваньню

палітычнага капіталу Мілінкевіча?

Алесь Лагвінец: Я мяркую, што гэта ўжо пэўны капітал. Я ня чуў, каб на плошчы крычалі «Казулін». Крышку больш увагі Мілінкевіч мусіў надаць (бо ён занадта даверыўся цэнтральным структурам штабу) пытаньню будаваньня сваёй уласнай каманды і стварэньню эмацыйнага кантакту зь людзьмі на месцах, якія самааддана яго падтрымлівалі. Ён мусіў яшчэ далей думаць пра тое, што ў яго мусіць застацца свая каманда. І неабавязкова – тая каманда, якая яму дасталася ў выніку Кангрэсу. Пытаньне эфэктыўнасьці структураў вельмі важнае. Ён на гэта не заўсёды зважаў, і гэта зразумела па-чалавечы: можа, яму проста бракавала часу.

На сёньняшні дзень Мілінкевіч мае значны крэдыт даверу, які адназначна павялічваўся цягам апошніх 3-х месяцаў. Як ён яго выкарыстае – гэта ўжо іншае пытаньне. Пакуль сярод бальшыні дэмакратычна арыентаваных грамадзянаў Беларусі прозьвішча Мілінкевіча выклікае пазытыўныя эмоцыі. І гэта велізарны плюс.

Алесь Анціпенка: Я хацеў бы сказаць наконт таго, ці будзе Мілінкевіч сапраўдным нацыянальным лідэрам і рэпрэзэнтантам дэмакратычных сілаў у краіне і ці ўдасца яму захаваць палітычную кааліцыю і пашырыць базу падтрымкі.

Для мяне гэтая кампанія (найперш Мілінкевічава) прадэманстравала, што дагэтуль тое, што мы называлі незалежным беларускім грамадзтвам, усё яшчэ не функцыянуе як пэўная цэльная сыстэма. Няма сапраўднага падзяленьня функцыяў, каб розныя сэгмэнты незалежнага грамадзтва не канкуравалі, а ўзаемадапаўнялі і стваралі нейкі новы эфэкт. Гэтага пакуль не адбылося.

Цяпер пра будучыню. Яна ў Мілінкевіча будзе бліскучай, калі яму з таго, што мы называем беларускім незалежным грамадзтвам, удасца стварыць цэльную функцыянальную сыстэму, калі яму ўдасца «асядлаць» (як сказаў сп. Янаў Палескі) пэўныя новыя практыкі. Гэта залежыць ад яго і ад таго, наколькі ён цяпер у новай сытуацыі акажацца ўмелым мэнэджарам. Мэнэджмэнт – гэта мастацтва з самых розных

рэсурсаў, нават і нязначных, ствараць новыя сытуацыі, якія часам даюць вялікі выйгрыш альбо новы эфэкт.

Янаў Палескі: Першы крок у гэтым сэнсе ўжо зроблены. Мілінкевічу ўсё-ткі ўдалося падначаліць зацятых лідэраў партыйнай апазыцыі й прымусіць працаваць на сябе. Ён паказаў ужо сябе як мэнэдэжар.

Казуліну таксама ўдалося «пастроіць» аб'яднаных сацыял-дэмакратаў: там жа таксама была «рэвалюцыя», путч супраць Статкевіча. Але ў выпадку Мілінкевіча варта мець на ўвазе, што за ім стаіць дастаткова разнародная апазыцыя, якую ўсе папракалі ў сабатажы розных ініцыятываў менавіта з тае прычыны, што заміналі амбіцыі, ці партыйныя мэты, ці партыйная праграма, ці яшчэ што.

Валер Булгакаў: Ці не сядзіць Мілінкевіч на міне запаволенага дзеяньня? Ён доўгі час працаваў у сыстэме анкляваў празаходняй грамадзянскай супольнасьці (Кімітака Мацузата) і засьведчыў сябе як надзейны і сумленны работнік. Ён быў дэ-факта не публічным палітычным лідэрам, а пасьпяховым мэнэджарам, які меў вялікі крэдыт даверу з боку заходніх донараў беларускай дэмакратыі. Ці не «пахавае» яго палітычную будучыню тое, што ў аснове яго вылучэньня ляжалі ягоныя якасьці, якія мала спалучаліся з палітычным лідэрствам?

Янаў Палескі: Усё даводзіцца рабіць у першы раз. Ніхто не нараджаецца публічным палітыкам.

Алесь Анціпенка: Паколькі я сачыў за тым, як Мілінкевіч выступаў, як ён даваў інтэрвію ў новай якасьці – лідэра беларускай апазыцыі, як ён камунікаваўся зь людзьмі, то я магу сказаць, што ён заўважна прагрэсаваў і сапраўды набыў некаторыя важныя якасьці палітычнага лідэра. Ён увесь час вучыўся, і я не заўважыў вялікіх праколаў у працэсе ягонага саманавучаньня. Адзіная сытуацыя, якая здавалася да сёньняшняга дня нечаканай для Мілінкевіча і астатніх, каго мы называем штабам, – гэта непадрыхтаванасьць да таго разгортваньня падзеяў, якое адбылося 19-га і пасьля 19-га.

Алесь Лагвінец: На сёньняшні дзень ёсьць вялікі капітал даверу. Пытаньне ў тым, якім чынам ён будзе скарыстоўваць яго. Я хачу заставацца аптымістам і лічу, што ў Мілінкевіча ёсьць палітычная будучыня. Відавочна, застаецца пытаньне, у якіх часавых катэгорыях мы думаем: 2–3–5 гадоў і г. д. На сёньняшні ж дзень ён ужо мае велізарны плюс у параўнаньні з 2001 г.: ён ужо 6 дзён правёў на пляцы разам з дэмакратычнымі актывістамі. Параўнайце з Ганчарыкам, які пасьля выбараў адразу «зваліў».

Янаў Палескі: Схема разьвіцьця падзеяў тады была іншая: усё, мы прайгралі, давайце рыхтавацца да наступных выбараў.

Алесь Лагвінец: Мінусам жа сёлетняе кампаніі Мілінкевіча было тое, што ўвесь час заяўлялася: гэта толькі этап, і што гэта пачатак, пачатак канца. А можа, канца і ня будзе?! Мусіла быць рашучасьць у дзеяньнях. Гэтай рашучасьці часам бракавала. Яна толькі зьявілася ў Мілінкевіча ў апошнія часы.

Валер Булгакаў: Чаму Мілінкевіч дагэтуль не арыштаваны?

Алесь Лагвінец: Дзеяньні ўладаў тыя ж самыя: сярэдняе зьвяно выбіваецца, каб яшчэ больш дыскрэдытаваць лідэра, паказаць, што ў яго няма ніякай падтрымкі. Усе ж ведаюць, што арыштаваць можна ў кожны момант. Чым больш трымаюць на свабодзе, тым больш у той жа час яго спрабуюць дыскрэдытаваць, падсякаючы базу пад ім. Гэта можа надысьці сёньня-заўтра-пасьлязаўтра – у любы момант, і тэхнічна на гэта ёсьць усе сродкі. Можа, гэта пытаньне замежнапалітычнага кантэксту. Можа – унутрыўладных абмеркаваньняў, як гэта лепш зрабіць. Але гэта тое, што ад нас не залежыць. Мілінкевіч мусіць мысьліць у катэгорыях таго, што залежыць надалей ад яго ў сёньняшняй сытуацыі й што ён можа зрабіць, незалежна ад таго, змогуць улады на гэта адрэагаваць ці не. Гэты кантэкст, мне падаецца, быў зададзены, пачынаючы ад Кангрэсу.

Уладу можна зрынуць, калі ёсьць асымэтрычныя дзеяньні апазыцыі альбо калі ў яе ёсьць свая лёгіка дзейнасьці.

Янаў Палескі: Што датычыць арыштаў, то мэты ўва ўсяго

гэтага адны, а вынікі могуць быць зусім іншыя. Ад таго, будзе арыштаваны Мілінкевіч ці ня будзе, ужо нічога не залежыць: ён усё адно будзе альтэрнатыўным лідэрам нацыі, як Пазьняк успрымаецца ў якасьці такога, знаходзячыся наагул за мяжой. Ня мае вырашальнага значэньня, будзе ён у турме ці не. Можна сказаць, што лідэр – гэта кляймо, якое ўжо на ім паставілі. Ён ужо ў нейкай меры не залежыць сам ад сябе.

Што датычыць работы на вымываньне «прамежкавай базы», сярэдняга партыйнага зьвяна, то гэты працэс і павінен весьці да дэмакратызацыі апазыцыі, да вылучэньня новых лідэраў. Мы гэта назіралі на плошчы: кіраваць няма каму – давайце я.

Валер Булгакаў: Але гэта не было вельмі пераканаўча.

Янаў Палескі: У сымбалічным сэнсе – дастаткова пераканаўча.

Валер Булгакаў: Калі і дзе яшчэ апазыцыя праявіла слабасьць падчас кампаніі і пасьля выбараў? Чаму так шмат было праколаў з друкаванай прадукцыяй? І Калякіна затрымалі 200 тыс. асобнікаў газэты «Товарищ» пры спробе загрузіць-разгрузіць з гаража, Алесь Міхалевіч змог давесьці з Смаленску свой варыянт «Советской Белоруссии» толькі да Мсьціслаўскага раёну і г. д.

Алесь Лагвінец: Недахоп якаснай друкаванай прадукцыі ў нечым быў слабасьцю кампаніі. Было слабасьцю кампаніі і тое, што яна не была падрыхтаваная і надрукаваная загадзя. Маглі быць (і мусілі быць!) нэўтральныя інфармацыйна-палітычныя рэчы. Мы мусім заўсёды памятаць, што мы павінны адукоўваць і палітычна, і юрыдычна нашае насельніцтва наконт важнасьці выбараў. Гэта, на вялікі жаль, рабілася ў апошні момант і не заўсёды ўдала.

Не да канца ўдала была зробленая мабілізацыя дэмакратычнага электарату. Вельмі важна выйсьці на асабісты кантакт. Уцягваючы чалавека, просіш яго штосьці рабіць і надаеш яму важнасьць. Гэты чалавек становіцца таксама часткай вялікай каманды. Здаецца, што каманда была абмежаваная. Безумоўна, 5 тыс. асобаў па ўсёй краіне, якія афіцыйна сказалі, што яны не баяцца быць сябрамі

ініцыятыўнай групы, – гэта посьпех. Але гэтыя людзі мусілі ўцягнуць іншых і ўсуб'ектніць іх.

Бракавала зваротаў (нават і адукацыйных) да грамадзянаў, каб абудзіць іхную грамадзянскую пазыцыю і падштурхнуць іх да дзеяньня. Потым гэтае дзеяньне адбылося – выхад на плошчу. Але магло быць шмат іншых дзеяньняў, якія маглі б іх неяк абудзіць. Цудоўнае ўзьдзеяньне мелі заклікі да людзей на плошчы каля намётаў – калі вы ня можаце начаваць, дык прыносьце каву-гарбату і розныя рэчы. І людзі прыходзілі, прыносілі. Тыя, хто прыходзілі, дапамагалі, – гэта людзі, якія не абавязкова чымсьці «засьвяціліся» ў кампаніі. Яны гэта рабілі, бо адчулі сябе суб'ектамі і адчулі значнасьць сябе.

Пасьля арыштаў лідэраў «Партнэрства» назіраньне было – калі казаць дыпляматычна – далёка ня самым моцным бокам як каманды Мілінкевіча, так і Казуліна. З майго асабістага досьведу, ніякай каардынацыі паміж імі не было. Хаця адзінае, пра што можна было добра дамаўляцца з Казуліным, – гэта пра агульнае назіраньне за выбарамі. Калі б на кожным участку было па 10 назіральнікаў...

Як у 2004 г., так і цяпер мне ўдалося ўцягнуць у назіраньне некалькі асобаў, якія да гэтага ніколі не займаліся актыўнай палітычнай дзейнасьцю. І ў іх адбылося ўсьведамленьне таго, якім чынам дзейнічаюць мэханізмы ўлады, а пачуцьцё несправядлівасьці што да ўлады ўзмацнілася.

Самае галоўнае, што не было зроблена, – не было дасягнута палітычнае ўсуб'ектненьне максымальнай колькасьці людзей.

Алесь Анціпенка: Раней усё разгортвалася паводле прынцыпу «мы – яны», а паміж «мы» і «яны» ёсьць некалькі мільёнаў выбарцаў (а калі гаворка ідзе не пра выбары, то – некалькі мільёнаў дарослых людзей), якія дзеляцца на сацыяльныя групоўкі, маюць розныя інтарэсы... Было б вялікай памылкай паўтарыць досьвед мінулых выбарчых кампаніяў і не пачаць ужо цяпер працаваць з рознымі сацыяльнымі групамі, адукоўваючы, заангажоўваючы іх і ведучы зь імі дыялёг. Апазыцыйныя палітычныя партыі, структуры грамадзянскай супольнасьці ня маюць права ня весьці дыялёгу з рознымі

сацыяльнымі групамі ў пэрыяд паміж выбарамі. Інакш наступны раз мы зноў станем на тыя ж самыя граблі. Які гэта дыялёг, на падставе абмеркаваньня ці вырашэньня якіх праблемаў яго весьці – гэта ўжо іншая рэч. Магу пахваліць Алеся Лагвінца, які з сваёй малой камандай сабраў вялікую колькасьць подпісаў за Мілінкевіча ў сваім раёне. Прычына простая: ён працуе з сваімі былымі і патэнцыйнымі выбарцамі.

Янаў Палескі: Слаба адпрацаваны тэхнічны, арганізацыйны момант работы. Заміж лёзунгаў «За перамены!» ці захаваньня канстытуцыйных правоў трэба разьбіць усё на пакет, і не падаваць яго ў адзіным выглядзе, а сфармаваць прапановы для кожнай сацыяльнай групы. У адных іхныя канстытуцыйныя правы закранаюцца ў сфэры працоўнага заканадаўства, для іншых важнейшыя папраўкі ў Крымінальны кодэкс, для трэціх – гэта пытаньне: каму ўсё ж належаць плошчы і вуліцы гораду – уладзе ці грамадзянам, якія маюць права маніфэставаць там, дзе хочуць. Ёсьць сэнс фармаваць паралельную супольнасьць. Няма прафсаюзаў – іх трэба ствараць у выглядзе паралельных інстытуцыяў (хай сабе і не прызнаных), наладжваць сувязі з працоўнымі калектывамі. Ня проста зьбіраць подпісы за перавыбары, хаця гэта, канечне, важная ініцыятыва, а карпатліва рабіць шырэйшую работу.

Валер Булгакаў: А як вы ставіцеся да думкі, што посьпех гэтай кампаніі хаця б у тым, што Мілінкевіч рэпрэзэнтаваў яўную нацыянальную альтэрнатыву Лукашэнку? Ці павінен у 2011 г. будучы лідэр дэмсілаў выканаць гэты манэўр, каб стаць сапраўднай альтэрнатывай цяперашняму рэжыму і яго лідэру?

(Мы прытрымліваемся тэорыі, што дэмакратычны транзыт магчымы толькі праз пабудову нацыі. Адзіны магчымы шлях пабудовы нацыі – клясычны ўсходнеэўрапейскі шлях пабудовы культурнай нацыі, якая абапіраецца на нацыянальную мову і культуру. Усе іншыя праекты мы лічым у найлепшым выпадку ўтапічнымі, а ў найгоршым – шарлятанскімі.)

Янаў Палескі: Транзыт магчымы ў кірунку да сэкулярызацыі, эмансыпацыі грамадзтва, з аднаго боку, і дзяржавы – з другога. У заходнеэўрапейскай гістарычнай, культурнай традыцыі завяршальным этапам дзяржавы-нацыі ёсьць канцэптуалізацыя

і выяўленьне грамадзянскай супольнасьці. Я паспрабую «прызямліць» гэтую ідэю. Што такое нацыя ў гэтым выпадку, як я яе разумею? Кажучы гегелеўскай мовай, нацыя – гэта калі ты адчуваеш сябе як дома, калі ты не падазраеш сваіх суграмадзянаў у нейкай зламыснасьці: што табе кіраўніца ЦВК не назаве фальшывыя лічбы, што міліцыянт затрымае цябе за правапарушэньне, а не за тое, што ты нібыта «лаяўся матам» на плошчы. То бок, у аснове нацыі ляжыць пэўны давер да нейкіх правілаў – прапісаныя ці непрапісаныя, але яны працуюць! І гэты давер не абавязкова адсылае да беларускай мовы ці да чагосьці іншага ў нашым выпадку. Мы не разумеем адзін аднаго нават тады, калі гаворым адной мовай. Мы карыстаемся рознымі тэзаўрусамі. Калі нацыя прывязваецца да такога фэтышу, як мова, то гэта якраз і ёсьць утопія, на мой погляд.

Алесь Анціпенка: Ёсьць розныя ракурсы бытаваньня, існаваньня і функцыянаваньня мовы. Калі я пярэчу, што мова ня фэтыш, я маю на ўвазе такую пару, як культура (творчасьць) і мова. Яна ёсьць чымсьці абсалютна ўнікальным. Як ёсьць унікальныя інструмэнты, пры дапамозе якіх можна зрабіць унікальныя рэчы, так і любая мова ўнікальная настолькі, каб здолець прадукаваць унікальную культуру. Напэўна, вы ведаеце, што ў Індыі няма такога жанру, як трагедыя. А памятаеце, у свой час рок ніяк ня клаўся на расейскую мову? Ён і дагэтуль ніяк не кладзецца. Таму што матрыца мовы іншая, яна не прадукуе гэтага фэномэну.

Валер Булгакаў: Бліжэй да тэмы. Вы лічыце, што стаўка Мілінкевіча на нацыянальны дыскурс не яднае грамадзтва і прадукуе адну з магчымых альтэрнатываў?

Янаў Палескі: Я бачу, што, па-першае, у яго ёсьць стаўка на канстытуцыйныя правы і грамадзянскую супольнасьць. А тое, што ў яго ёсьць нейкі нацыянальны мэсыдж, – гэта дадатковае пасланьне тым, хто згодны гэта падтрымаць. Я не лічу, што гэта кепска, але гэта толькі адзін з складовых элемэнтаў, і я ня бачу, каб гэты элемэнт быў структураўтваральны: я чытаў ягоную праграму.

Валер Булгакаў: Я хацеў бы адкруціць крыху назад: мы забыліся абмеркаваць падазрона высокую яўку на выбарах. Ці

гэта не прыкмета іх фальсыфікацыі?

Алесь Лагвінец: Ня варта шукаць д'ябла там, дзе яго няма. Высокая яўка была таму, што сьпісы ніхто ня спраўджваў ад кампаніі байкоту 2000 г. Тады была адмыслова заніжаная колькасьць выбарцаў і тады было добрае назіраньне, і было сказана, што выбары адбыліся. Цяпер сьпісы крышку мяняюцца, але ўсё адно радыкальна іх ніхто не ўдакладняў. Выбарцаў у нас насамрэч больш, чым ёсьць у сьпісах – гэта вынік кампаніі байкоту. Я сядзеў на ўчастку, дзе здалі новыя дамы. Сьпісы выбарцаў спраўдзілі абы-як, мне як назіральніку ад грамадзянаў адмаўляліся даваць інфармацыю пра колькасьць выбарцаў, але прыехалі «палатачнікі» – і я пачуў, што на ўчастку 1500 выбарцаў, а ў выніковым пратаколе атрымлівалася, што іх 1970, хаця магло быць і больш: людзі прыходзілі з новых дамоў з прапіскай – і ім давалі бюлетэні.

Што пазытыўнага ў гэтай высокай яўцы? Людзі сапраўды ішлі на выбары. Мяне ўсьцешыла тое, што людзі абапіраліся на досьвед ранейшых кампаніяў. Узрост тых, хто прыходзіў галасаваць у нядзелю ўвечары з 17.00 да 20.00, быў вельмі нізкі, гэта маладыя людзі – да 25 гадоў. Гэта значыць, што яны памятаюць, што калісьці маглі падкінуць бюлетэні і г. д. Сёлета камісіі праяўлялі ініцыятыву інакш.

Алесь Анціпенка: Пры моцнай аўтарытарнай ці таталітарнай уладзе яўка выбарцаў на выбары заўсёды высокая: трэба схадзіць на ўсялякі выпадак, а раптам заўважаць, што не пайшоў, і будуць праблемы...

Валер Булгакаў: Як зрабіць дзейнасьці апазыцыі больш пасьпяховай? Мне здаецца, што стратэгічны кірунак актыўнасьці дэмакратычных сілаў падказваюць акурат гэбоўскія ідэолягі, уводзячы артыкул «Дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусі». Дыскрэдытацыя для іх – гэта зьніжэньне легітымнасьці цяперашняга рэжыму ўсімі магчымымі сродкамі, культурнымі, палітычнымі і нават спартыўнымі...

Янаў Палескі: Кажучы словамі Раймона Арона, толькі наіўны ня бачыць у палітыцы барацьбы за ўладу; але той, хто бачыць толькі барацьбу за ўладу, той псэўдарэаліст. Палітыка заўжды

ўлучае момант легітымнасьці. Усялякая ўлада ёсьць манаполіяй на ўжываньне гвалту – сымбалічнага ці, як мы назіралі, фізычнага. Але заўжды стаіць пытаньне, наколькі гэтае ўжываньне сілы законнае. Калі бальшыня ці значная частка насельніцтва перакананая, што гэта незаконна, такая ўлада пачынае трашчаць па швах.

Легітымнасьць, на маю думку, ня ёсьць цалкам рацыянальнай катэгорыяй і складаецца з эмацыйнага (падсьвядомага ці сьвядомага) даверу, перакананасьці, што гэта – справядліва, што парадак – справядлівы. Далейшая работа апазыцыі (ня будзем казаць пра формы, у якіх яна можа выяўляцца) павінна накіроўвацца на дэлегітымацыю кіроўнай групоўкі, пазбаўленьня яе маральных падставаў на ўжываньне ня толькі сілы, але і ўсіх астатніх дзеяньняў. Яны павінны ўспрымацца бальшынёй як незаконныя.

На ўсім сьвеце, за выняткам Расеі ці Кубы, гэтая ўлада праходзіць як нелегітымная: яна ня мае права, напрыклад, езьдзіць у Эўропу і г. д. Пытаньне ў тым, наколькі такая перакананасьць распаўсюдзіцца сярод насельніцтва, якое жыве тут.

Улада заўжды ўлучае момант гвалту і спакусы. Мала трымаць людзей з дапамогай аднога толькі страху, прымушаць іх рабіць тое, што яны рабілі 12 гадоў. Патрэбная яшчэ нейкая спакуса, нейкія пэрспэктывы, нейкія віды на будучыню. Улада, якая пазбаўляецца элемэнту спакусы і пераходзіць толькі да гвалту, да гэтай «альтэрнатывы пазьбяганьня», як яе часта называюць, яна асуджаная. І што мы там чуем сёньня для большасьці? Вы кажаце, што губляецца нейкая эмацыйная падтрымка – гэты момант вельмі важны. Сапраўды, акрамя таго, што ўсё будзе, як было, акрамя стабільнасьці і бясконцага ўзнаўленьня нейкіх склератычных праектаў, нічога новага не прапанавана. Грамадзтва жыве практычна без пэрспэктываў. Менавіта таму, што спакусы ўсё менш, прапановаў усё менш, праектаў няма, большае ўдзельная вага гвалту.

Для экспэртнай супольнасьці гэты кірунак аналізу нашай сытуацыі ёсьць актуальным і прадуктыўным.

Алесь Анціпенка: Ёсьць зашмат падставаў і факталягічнага матэрыялу, якія не скарыстаць папросту немажліва. Прырода гэтых фактаў і гэтых матэрыялаў якраз паказвае на тое, што ёсьць сур'ёзная праблема зь легітымнасьцю беларускай улады.

Алесь Лагвінец: Я б зьвярнуў увагу на тыя сытуацыі, дзе ўлада чарговы раз праявіць свой твар і сваю слабасьць, то бок зьвернецца да гвалту. Гэтыя выбары – найвялікшая палітычная кампанія – ствараюць такія магчымасьці. Пытаньне ў тым, наколькі гэтыя магчымасьці для дэлегітымацыі ўлады альбо для стварэньня пачуцьця несправядлівасьці ў бальшыні грамадзянаў будуць выкарыстаныя нашай апазыцыяй. Г. зн. паказаць, наколькі несправядлівая ўлада была падчас выбараў.

Сам факт існаваньня таго, што мы называем незалежным беларускім грамадзтвам, вельмі важны. Я прывяду ўласны прыклад. Тое, што прыбіральнікі ў мяне ў двары бачаць, што я кожны ранак пасьля таго, як я нібыта ня выйграў выбараў у 2004 г., выводжу і саджу сваё дзіця, вязу ў школу і вітаюся зь імі – сам факт прысутнасьці вельмі важны. Прысутнасьці, адмаўленьня ад маргіналізацыі і наяўнасьць уласнай ініцыятывы. Але для гэтага павінна быць, зноў жа, мабілізацыя дэмакратычных сілаў і стварэньне такіх кантэкстаў, дзе ўлада сапраўды паказвае свой рэальны твар – г. зн. у чарговы раз зьвяртаецца да сілы.

Янаў Палескі: Яшчэ наконт легітымнасьці. Я часам чытаю расейскіх эўразійцаў. Яны пішуць, што Лукашэнка пабудаваў паліцэйскую дзяржаву. Мяне гэта дзівіць, паколькі эўразійцы мяркуюць, што супрацьстаяньне Захаду адбываецца на лініі Духу ці Космасу. Што паказвае Лукашэнка? Што гэта супрацьстаяньне праходзіць па традыцыйнай лініі свабоды: як толькі забіраеш у людзей свабоду, так атрымліваеш тыповую дыктатуру. Яны ўсе пачынаюць з карпарацыйнай дзяржавы, як Мусаліні, а заканчваюць Гітлерам. Лукашэнка трапляе ў клясычны дыяпазон гэтых дзяржаваў. І гэта эўразійцаў вельмі расчароўвае, бо яны бачаць, што тут няма ніякага асаблівага шляху, а ёсьць звычайная заходняя дзяржава – пакуль, праўда, дыктатура. Эўразійцы, каб паказаць, што шлях капіталізму ці Галівуду – тупіковы, кажуць: пабудуем не такое, што на

Захадзе, а нешта такое небывалае. І гэты момант ёсьць дэлегітымізоўным. Яны разумеюць, што ў прынцыпе гэта тупік. Яны хочуць эўразійскую цывілізацыю, а тут выяўляецца карпаратыўная дзяржава, як у Мусаліні: жарсьць па індустрыі, прага да спорту... Усіх пастроіць! Усіх на працу – з ранку да вечара! Усе нібыта падтрымліваюць лідэра.

Алесь Лагвінец: Наконт Мілінкевіча і нацыянальнага праекту. Я лічу, што гэта было велізарным плюсам, але я не сказаў бы, што гэта было вырашальным. Велізарны плюс, бо ён атрымаў на свой бок тых людзей – яны склалі касьцяк ягонае каманды, – якія былі верныя і яму давяралі.

Янаў Палескі: Вялізным плюсам было тое, што ў нацыянальным лідэры камуністы змаглі ўбачыць сваё, а прыхільнікі нацыянальнага дыскурсу – сваё. Гэта велізарнае дасягненьне. Тут адсутнічаў матыў выключальных практык.

Алесь Анціпенка: А тыя, хто многа глядзеў БТ, пабачылі ў Мілінкевічу паляка. У адной і той самай фігуры пабачылі самае рознае!

Занатаваў Зьміцер Дзядзенка

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 4 (44) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/04/10
[image]

НЯРЫЮС ПРАКЯВІЧУС
палітолаг, супрацоўнік унівэрсытэцкага коледжу «Södertörn» у Стакгольме.
Яго апошні аналіз у «ARCHE» мяў назоў «Перадвыбарныя памылкі апазыцыі» (6/2005).
Гэты аналіз быў напісаны адмыслова на замову «ARCHE».

Нярыюс Пракявічус Сярэдненькія карты апазыцыі

выбары 2006

Апошнія прэзыдэнцкія выбары ў Беларусі часова прыцягнулі да яе ўвагу сусьветных СМІ, якія пераважна засяроджваліся на праблеме справядлівых і свабодных выбараў. Гэты артыкул прысьвечаны асноватворным, на маю думку, пытаньням беларускай палітыкі і іх адлюстраваньню ў прамовах кандыдатаў. Дапісваўся ён 25 сакавіка і адлюстроўвае стан рэчаў на гэты момант.

У артыкуле пераважна выкарыстоўваюцца матэрыялы, зьмешчаныя на ўэб-сайтах прэтэндэнтаў[1] і на адмысловым прысьвечаным выбарам сайце інфармацыйнага агенцтва БелаПАН. Я разглядаў найперш перадвыбарныя прамовы кандыдатаў, іх інтэрвію і адказы на пытаньні, у тым ліку апублікаваныя на сайце радыё «Свабода». Агульная інфармацыя пра падзеі ўзятая з розных СМІ – ад выразна праўладнай «Советской Белоруссии» да адкрыта антыўрадавага радыё «Свабода».

ЧАМУ А. ЛУКАШЭНКА – ПЕРШЫ І ПАКУЛЬ АДЗІНЫ?

Як доўгатэрміновы назіральнік выдатных прамоўніцкіх здольнасьцяў А. Лукашэнкі, рызыкну акрэсьліць шырокія

сацыяльныя слаі, якія прэзыдэнт лічыць сваёй базай падтрымкі і да якіх часта зьвяртаецца. Найперш гэта беларускія грамадзяне, якія дома гавораць па-расейску («*это наш русский язык*»). Іх доля, паводле вынікаў перапісу 1999 г., складае 62,8 %. Згаданы сэгмэнт насельніцтва неаднародны: сюды ўваходзяць і расейцы, што жывуць у Беларусі, і іншыя[1] расейскамоўныя нацыянальныя меншасьці, і перадусім расейскамоўныя беларусы. Хоць гэтыя групы і неабавязкова цалкам падтрымліваюць прэзыдэнта, ягоная палітыка наакул прапануе ім пэўныя перавагі. Саюз з Расеяй надае ўпэўненасьці расейцам, культурная палітыка дзьвюхмоўя абяцае роўны статус нацыянальным меншасьцям («*здесь их не будут считать чужими*»); расейскамоўныя беларусы могуць захаваць свой культурны *status quo* (а ў нечым і прывілеяванае становішча). Фактычнае вяршэнства ў грамадзтве расейскай мовы здымае неабходнасьць вывучаць другую мову – беларускай мовай дома карыстаюцца ўсяго 3,2 % небеларусаў (72 % зь іх – палякі).

Апроч таго, А. Лукашэнка можа прыцягнуць на свой бок тых, хто лічыць сябе савецкімі грамадзянамі – у гэтай катэгорыі ёсьць і беларусы, і небеларусы. Прасякнутыя настальгіяй па мінулым заявы прэзыдэнта («*мы, советские люди, в свое время встали на защиту главного права человека*») умацоўваюць іх самавызначэньне і абяцаюць савецкага тыпу роўнасьць паміж карэнным насельніцтвам і новымі перасяленцамі («*мы по духу самый интернациональный народ*»). У пэўнай ступені палітыка А. Лукашэнкі здымае таўро «меншасьці» зь небеларускамоўнага насельніцтва.

Для А. Лукашэнкі палітыка саюзу з Расеяй мае пэўную мяжу. Ён не жадае ўводзіць расейскую валюту – «*Это же самоубийственный шаг*!». Як кажа Лукашэнка, канчатковае ўлучэньне Беларусі ў склад Расеі можа стварыць праблемы для самой Расеі – «*наши националисты и Запад ждут, они бы тогда… развернули «национально-освободительную борьбу за независимость*». Прэзыдэнт часта падкрэсьлівае, што за інтэграцыяй стаяць прагматычныя матывы – «*прежде всего… огромнейшие рынки для нашей продукции*». Яе канчатковая мэта – абарона выключна беларускіх інтарэсаў: «*И в этих союзах мы пойдем настолько далеко, насколько это соответствует*

[1] president.gov.by; kazdim.com; miliakevich.org.

интересам нашего государства и нашего народа».

А. Лукашэнка зьвяртаецца і да тых, хто разьлічвае на моцнае ўмяшаньне дзяржавы ў эканоміку і пераразьмеркаваньне ВУП. Іх таксама можна падзяліць на некалькі падгрупаў. Доўгі час жыцьцё прэзыдэнта было зьвязанае зь вёскай, і таму ён у вялікай ступені атаесамляе сябе зь сялянствам: «*Это великие труженики, которые своим трудом кормят не только себя, но и остальное население страны. Это наши родители*». Вялікая ўвага да вясковага насельніцтва абумоўленая хаця б ягонай доляй у агульным складзе жыхароў Беларусі – 30,7 % паводле перапісу 1999 г., але яно ўвесь час скарачаецца. Досьвед сельскага насельніцтва ў іншых рэспубліках былога СССР і ў посткамуністычных краінах паказвае, што рынкавыя рэформы нясуць яму мала выйгрышаў і значныя страты: аслабленьне сыстэмы сацыяльнай бясьпекі, заняпад інфраструктуры і павелічэньне разрыву ўва ўзроўні дабрабыту ў параўнаньні з горадам. І А. Лукашэнка вельмі часта пра гэта кажа.

Прэзыдэнт таксама заўжды падкрэсьлівае сваю ролю ў захаваньні ў Беларусі буйных прадпрыемстваў. Буйная вытворчасьць Усходняй Эўропы шмат пацярпела ў працэсе пераўтварэньняў, і беларусаў, якія працуюць на падобных прадпрыемствах, могуць пужаць пэрспэктывы эканамічнай лібэралізацыі. Лукашэнка часта сьцьвярджае, што падтрымлівае прыватызацыю толькі тады, калі яна прыносіць дастатковы прыбытак дзяржаве, а таксама пры ўмове захаваньня сацыяльнай сыстэмы: «*Мы не даем уничтожать «социалку», требуем строить детские садики, заводские амбулатории*». А. Лукашэнка ўсяляк зьвяртае ўвагу на сацыяльную роўнасьць у Беларусі, зьвязваючы яе з палітычнай стабільнасьцю: «*Почва для радикалов есть там, где народ живет хуже, чем должен жить, и где народ это осознает*». Калі браць абсалютныя лічбы, найбольш эканамічна не абароненым групам і тым, хто атрымлівае сацыяльныя выплаты, у большасьці эўрапейскіх краінаў жывецца лепей, але, калі глядзець адносна, у Беларусі іх становішча больш выгоднае. Людзі часта ацэньваюць свой дабрабыт, параўноўваючы сябе зь іншымі. Да таго ж ніхто ня можа гарантаваць, што эканамічнае разьвіцьцё без Лукашэнкі адразу ж палепшыцца.

Нарэшце, тая роля, якую адыгрывае дзяржава ў сацыяльна-эканамічным жыцьці, патрабуе вялікага бюракратычнага апарату, у тым ліку і разгалінаваных сілаў бясьпекі. А. Лукашэнка толькі нядаўна стаў казаць пра дэбюракратызацыю: «*Настало время разобрать завалы. Дебюрократизировать страну*» . Пры тым, што палітыка Лукашэнкі стварае падставы для разрастаньня дзяржаўнага апарату і надае яму асаблівы сацыяльны статус, адносіны паміж прэзыдэнтам і чынавенствам нельга назваць бясхмарнымі. Імкненьне прэзыдэнта захоўваць асабісты кантроль над дзяржчыноўнікамі на ўсіх узроўнях вядзе да частых кадравых перастановак і рэпрэсіяў супраць тых, хто страціў давер ці неэфэктыўна працуе (а працаваць больш эфэктыўна беларускім чыноўнікам, мабыць, цяжка, калі ўзяць пад увагу, што ўлада часта вызначае невыканальныя мэты). Аднак гэты працэс сэлекцыі сее страх, адсякае няверных і не дае сфармавацца апазыцыі ўва ўладных структурах. А. Лукашэнка рэгулярна пераконвае вайскоўцаў, што апазыцыя ўяўляе для іх пагрозу, «*считают, что армию у нас можно распустить», «все «откосили» от армии*».

Тое, што прэзыдэнту дванаццаць гадоў удаецца ўтрымліваць уладу, у значнай ступені тлумачыцца наяўнасьцю шырокіх сацыяльных слаёў, якім даспадобы ягоная палітыка. Важна таксама адзначыць, што яны накладаюцца і на іншыя: беларускамоўнае насельніцтва больш шматлікае ў сельскіх раёнах, але яно пераважна падтрымлівае А. Лукашэнку за ягоную аграрную палітыку. А заможныя расейскамоўныя бізнэсоўцы, відаць, падтрымліваюць прэзыдэнта за ягоную культурную і замежную палітыку.

Таму агульную колькасьць патэнцыйных праціўнікаў Лукашэнкі вызначыць цяжка. Можна разгледзець вынікі плебісцытаў 1995 і 1996 гг. – яны менш аспрэчваліся, чым вынікі наступных выбараў. Рэфэрэндум 1995 г. прывёў да кардынальнай зьмены нацыянальных сымбаляў і наданьня расейскай мове статусу другой дзяржаўнай. Па першым пытаньні супраць выказалася 989 тысячаў выбарцаў, па другім – 614 тысячаў. Відаць, гэтыя лічбы адлюстроўваюць найменшы ўзровень непрыманьня лукашэнкаўскай культурнай і замежнай палітыкі. На рэфэрэндум 1996 г. выносілася пытаньне наконт продажу

зямлі. Большасьць выбарцаў выказалася супраць – «за» прагаласавала толькі 949 тысячаў чалавек. Верагодна, як мінімум столькі выбарцаў не ўхваляюць эканамічнай палітыкі А. Лукашэнкі.

Вядома, на зыход галасаваньня магло паўплываць агульнае стаўленьне да А. Лукашэнкі і ўзьдзеяньне дзяржаўных СМІ. Але ў пэўнай ступені гэтым лічбам можна давяраць і сёньня – гэта выяўляецца ў палітычных падзеях у Беларусі. Хоць зь цягам часу прэзыдэнт Лукашэнка і страціў некаторую долю падтрымкі, але палітычныя пытаньні застаюцца. Іншымі словамі, нават калі А. Лукашэнка сыдзе з палітычнай сцэны, ягоныя ідэі застануцца запатрабаваныя, і апазыцыі, бадай, трэба браць гэта ў разьлік.

ЦЭНЫ НА ПРЫРОДНЫ ГАЗ

Кандыдаты ў прэзыдэнты паказалі сваё палемічнае майстэрства ў абмеркаваньні актуальнай праблемы цаны на прыродны газ. Здавалася б, пытаньне простае, але яно непасрэдна зьвязанае з асноватворнымі праблемамі беларускага грамадзтва. З гледзішча міжнароднай палітыкі, цэны на газ – пераважна вынік таго, што Расея мае ў Беларусі свае інтарэсы, а Лукашэнка праводзіць прарасейскую палітыку. У эканамічным ракурсе дзякуючы нізкім цэнам на газ беларуская прадукцыя больш канкурэнтаздольная. Калі б апазыцыя знайшла альтэрнатыўнае прэзыдэнцай палітыцы рашэньне, яна, магчыма, пераканала б грамадзянаў, што здольная кіраваць дзяржавай лепш за А. Лукашэнку.

Лукашэнка некалькі разоў зьвяртаўся да пытаньня цэнаў на расейскія прыродныя рэсурсы (напрыклад, у інтэрвію «Российской газете»). Ён адзначае, што асноўная прычына («*многие называют не в последнюю очередь*») падвышэньня цаны на газ для Ўкраіны – яе празаходняя арыентацыя. Прэзыдэнт сьцьвярджае, што рух Украіны ў бок НАТО прывядзе да вялікіх стратаў у расейскай абароннай прамысловасьці – «*российские компании и государство российское потеряют миллиарды долларов*». Далей ён згадвае прысутнасьць у Беларусі расейскіх вайсковых аб'ектаў («*трепетно относились и относимся к*

стратегическим объектам, которые обеспечивают реальную оборону Российской Федерации»), за якія Расея ня плаціць, – «*вы ни копейки не платите*». Наяўнасьць беларускага войска таксама разглядаецца як плюс для Расеі. Прэзыдэнт падкрэсьлівае, што з эканамічнага гледзішча Расеі таньней транспартаваць газ празь Беларусь, чым праз Украіну. Саюз Расеі і Беларусі таксама ўскосна – праз праблему роўных умоваў канкурэнцыі – зьвязаны з цэнамі на газ: «*Если у нас будет цена на газ в два раза выше, чем у российских потребителей, какая же это будет конкуренция?*» Паводле канчатковых падлікаў А. Лукашэнкі, калі ўлічваць усе паслугі Беларусі для Расеі, тая мусіць сплаціць 750 мільёнаў даляраў.

Уражвае меркаваньне С. Гайдукевіча наконт пэрспэктываў газавай прамысловасьці ў Беларусі: «*Газопровод без газа – груда металла и не больше*». Ніжэйшыя цэны на газ ён лічыць вынікам прарасейскай палітыкі, а яе зьмена, на думку Гайдукевіча, прывяла б да эканамічнай катастрофы – «*цена на газ стала бы просто астрономической*».

А. Казулін сьцьвярджае, што Беларусь зашмат спажывае прыроднага газу. Ён зьвязвае нізкія цэны на газ з продажам беларускіх прадпрыемстваў Расеі і даводзіць, што ў доўгатэрміновай пэрспэктыве цэны ўсё адно вырастуць. Ніякіх канкрэтных рашэньняў праблемы А. Казулін не прапаноўвае.

А. Мілінкевіч мяркуе, што нізкія цэны на газ – жыцьцёва важнае для А. Лукашэнкі пытаньне: «*Бязь іх у яго няма палітычнай будучыні*». На думку А. Мілінкевіча, цэны на газ трэба зьвязаць з коштам транспартаваньня газу па тэрыторыі Беларусі і з магчымасьцю будаўніцтва новых газаправодаў. Ён таксама разглядае як казырныя карты ў перамовах з Расеяй транзыт газу ў Калінінградзкую вобласьць і прысутнасьць у Беларусі расейскіх вайсковых аб'ектаў. У дадатак Мілінкевіч спадзяецца на агульнае паляпшэньне эканамічнай сытуацыі: «*Мы что, неспособны зарабатывать достаточно денег, чтобы платить за газ по нормальным ценам?*»

Пры глыбейшым разглядзе відавочна, што ніводны з прэтэндэнтаў ня здолеў прапанаваць сур'ёзнай альтэрнатывы падыходу А. Лукашэнкі. Пазыцыя А. Мілінкевіча выглядае

больш аргумэнтаванай, але ягоным прапановам бракуе канкрэтнасьці, яны недалёка ідуць ад ідэяў самога А. Лукашэнкі (казырная карта – паслугі для Расеі). С. Гайдукевічу і А. Казуліну амаль няма чаго сказаць па гэтай праблеме.

С. ГАЙДУКЕВІЧ – (ПА-РАНЕЙШАМУ) ЛЯЯЛЬНАЯ АПАЗЫЦЫЯ

Палітычныя лёзунгі і прынцыпы С. Гайдукевіча вельмі нагадваюць Лукашэнкавы: «*должен быть вожак, который все возьмет на себя», «стабильность, порядок и благополучие*». Ён абвінавачвае НДА ў тым жа, што і прэзыдэнт: «*Приоритетной задачей стало получение финансирования от влиятельных зарубежных фондов*». Пагарда С. Гайдукевіча да г. зв. аб'яднанай апазыцыі таксама вельмі сугучная з прэзыдэнтавай: «*От полного политического бессилия, от своей неизвестности, от обиды, что ничего другого предложить белорусскому народу они не могут*». Ён апісвае традыцыйную апазыцыю пагразлай у карупцыі, поўнай антырасейскіх настрояў: «*Рвутся к власти и нацелены своими опекунами на решение одной единственной задачи – разрушение белорусско-российского союза*». Такім чынам, С. Гайдукевіч дапамагае А. Лукашэнку крытыкаваць традыцыйную апазыцыю, спрабуючы захаваць відочнасьць канструктыўнай апазыцыі. Іншымі словамі, прысутнасьць С. Гайдукевіча павінна засьведчыць, што А. Лукашэнку падтрымліваюць і тыя сацыяльныя групы, што не залежаць наўпрост ад улады.

Як А. Лукашэнка ў 1994 г., С. Гайдукевіч падкрэсьлівае праблему бюракратыі і яе карумпаванасьці: «*Целая армия совершено ненужных чиновников, имеющих значительные властные полномочия, но недовольных своей зарплатой*». Гэтую двухсэнсоўную заяву можна разумець або як прапанову скараціць дзяржапарат, або як абяцаньне павялічыць чыноўнікам заробкі. Аднак любая апазыцыя заўсёды абвінавачвае ўлады ў карупцыі, а сам Лукашэнка ўсімі спосабамі імкнецца паказаць, як ён з усіх сіл стараецца трымаць чыноўнікаў пад кантролем. Таму дзяржслужбоўцы не ўспрымаюць заявы С. Гайдукевіча як пагрозу. Ім таксама няма рэзону зьмяняць свой наяўны status quo на Гайдукевіча.

Для яго прыярытэт – паглыбленьне інтэграцыі ў міжнародныя структуры, на чале якіх стаіць Расея. Ён адкрыта выказвае сымпатыі да Расеі: «*Уважаю В. В. Путина и рад за дружественную Россию*». Культурная палітыка акрэсьленая гэтак жа адназначна: цяперашняе дзьвюхмоўе («*самим выбирать язык образования, творчества*»). У гэтых пытаньнях С. Гайдукевіч, мабыць, яшчэ далейшы ад традыцыйнай апазацыі, чым А. Лукашэнка, які часьцяком крытыкуе расейскую эканамічную сыстэму. Таму фігура С. Гайдукевіча, відаць, менш прымальная для расейскамоўнага, але зарыентаванага на незалежнасьць беларускага насельніцтва – а менавіта яно, відавочна, і складае касьцяк беларускага грамадзтва.

Але культурная і замежная палітыка адыгрывае ў С. Гайдукевіча другасную ролю. На што ён найперш зьвяртае ўвагу і за што крытыкуе прэзыдэнта, дык гэта за эканамічную палітыку («*республика начинает пробуксовывать*»). С. Гайдукевіч падае сябе прыхільнікам рынкавых рэформаў: «*Надо развивать частную собственность*». Ён падкрэсьлівае, што пры стварэньні «аграгарадкоў», як таго хоча прэзыдэнт (увогуле С. Гайдукевіч падхоплівае шмат ягоных ідэяў), эфэктыўнае плянаваньне немагчымае, і выступае за разьвіцьцё прыватнага сельскагаспадарчага сэктару. Ён бачыць у зьмяншэньні і спрашчэньні падаткаў спосаб барацьбы зь ценявой эканомікай і стымул для разьвіцьця эканомікі ўвогуле. З выказваньняў С. Гайдукевіча можна ўскосна зрабіць выснову, што падатковая палітыка не павінна залежаць ад формы ўласнасьці. Ён таксама заяўляе, што адукацыя павінна больш дакладна адпавядаць патрэбам рынку працы. Палітык прапануе правесьці ясную мяжу паміж платнай і бясплатнай мэдыцынай («*люди так и не понимают, что можно получить бесплатно, а за что должны доплачивать*») і разьвіваць крэдытаваньне жыльлёвага будаўніцтва і рынак жыльля ўвогуле. Хоць шмат якія ідэі С. Гайдукевіча скіраваныя на падтрымку сацыяльнай арыентацыі беларускай дзяржавы, прапанаваныя ім захады могуць у канчатковым выніку мець адваротны эфэкт.

Выглядае, што С. Гайдукевіч больш за А. Лукашэнку гатовы адмовіцца ад некаторых мэханізмаў дзяржаўнага кантролю, у

прыватнасьці, ён больш схільны да прыватызацыі. Калі прыняць ва ўлік ягоныя прарасейскія сымпатыі і жаданьне паглыбіць інтэграцыю («*обеспечение максимальной открытости экономик, через устранение барьеров на пути взаимной торговли, деловой и общественной инициативы*»), падобная палітыка абавязкова прывяла б да паглынаньня беларускай прамысловасьці расейскім капіталам. Тут пазыцыя С. Гайдукевіча, відаць, далёка разыходзіцца з чаканьнямі большасьці беларускіх грамадзянаў. Аднак гэта, мабыць, заўважыць ня кожны чытач, бо на паверхні С. Гайдукевіч выглядае прыхільнікам цяперашняй сацыяльна арыентаванай палітыкі.

Ідэі С. Гайдукевіча маглі б уяўляць найбольшую небясьпеку для прэзыдэнта, калі б палітычнае кіраўніцтва Расеі вырашыла адмовіцца ад падтрымкі Лукашэнкі і шукаць прыхільнага да Расеі, але больш паслухмянага палітычнага лідэра. З увагі на шматбаковую залежнасьць Беларусі ад Расеі, А. Лукашэнка наўрад ці змог бы захаваць кантроль над дзяржнамэнклятурай і сіламі бясьпекі, калі б Расея адкрыта заявіла, што ня будзе дапамагаць Лукашэнку. Аднак сам С. Гайдукевіч наўрад ці падышоў бы на ролю стаўленіка Расеі, бо мае вельмі нязначныя адміністрацыйныя і эканамічныя рэсурсы. На цяперашні момант ён, бясспрэчна, грае на баку прэзыдэнта. Ён увогуле высока ацэньвае дасягненьні ўлады – і таму ня можа складаць ёй сур'ёзнай канкурэнцыі: навошта прыхільнікам А. Лукашэнкі адмаўляцца ад спрыяльнага *status quo*, рызыкаваць і ставіць на С. Гайдукевіча?

А. КАЗУЛІН – ПАПУЛІСЦКАЯ АПАЗЫЦЫЯ

Рыторыка А. Казуліна шмат у чым нагадвае стыль прэзыдэнта, што сілкуецца асабістай харызмай: «*власть мучилась, не знала, что со мной делать*»; «*они дрогнули, потому что за мной – народ*», «*открою двери в цивилизованный мир*». Абяцаньне захаваць парадак і вобраз моцнага чалавека – гэта адказ на абвінавачаньні, што апазыцыя дэстабілізуе дзяржаву: «*рука у меня не менее твердая и сильная, чем у Лукашенко*», «*придется применять навыки морской пехоты*», «*я привык идти до победного конца*». Упэўненасьць у сабе, якую дэманструе А. Казулін, часам сягае ўзроўню мэсіянскіх відзежаў – «*есть*

власть от Бога, а есть от дьявола», «*белорусам… недостает Светлого правителя*». Паказальнае і ягонае зацікаўленьне астралёгіяй: «*Я как ученый сам интересуюсь астрологией и поддерживаю дружеские отношения с крупными специалистами в этой области знаний*». Цяжка сказаць, што ў заявах Казуліна сапраўды раскрывае ягоную асобу, а што выкарыстоўваецца як мэханізм сьвядомай маніпуляцыі сьвядомасьцю аўдыторыі. Памойму, тут прысутнічае і тое, і другое.

А. Казулін зьверху ўніз паглядае на іншыя апазыцыйныя сілы: «*Еще более далека от народа и старая оппозиция… за 15 лет не смогла добиться ничего, кроме поражений*». Ён паўтарае абвінавачаньні ўлады: «*У меня нет таких гигантских средств на раскрутку и рост популярности, как у Милинкевича*». А. Казулін часам называе апазыцыю «яны». У некаторай ступені гэта можа тлумачыцца жаданьнем дыстанцыявацца ад мінулых паразаў апазыцыі або прыцягнуць на свой бок шырэйшыя за звычайныя апазыцыйныя колы.

А. Казулін ўжывае на адрас А. Лукашэнкі разнастайныя абразьлівыя эпітэты, нават называе яго «крымінальным аўтарытэтам», абвінавачвае яго ў шмат якіх злачынствах, у тым ліку і ў асабістай карумпаванасьці («*требую вернуть деньги народу*»). Пагоня за эфэктнымі фігурамі маўленьня часам прыводзіць яго да абсурдных заяваў: «*Даже картошка выродилась за время его правления*». Крытыка перарастае ў прыхаваныя пагрозы: «*цепляться за кресло, не думая не то что о народе, а даже о своих собственных детях и внуках*». Зь іншага боку, А. Казулін падкрэсьлівае, што ён супраць канфрантацыі («*моя священная цель – спасти республику от крови и революции*»), што ня лічыць акцыі пратэсту за самамэту. Перад выбарамі А. Казулін сьцьвярджаў, што, каб дамагчыся зьмены ўлады, на вуліцы павінны выйсьці як мінімум 100 тысячаў маніфэстантаў, іначай усё скончыцца толькі праліцьцём крыві («*когда выйдет 20–30 тысяч человек и две тысячи подготовленных бойцов*»). Ён прызнае некаторыя станоўчыя вынікі кіраваньня А. Лукашэнкі – «*сумел создать сильную власть, уберечь страну от социальных потрясений, укрепить суверенитет и независимость государства*». Пазыцыя А. Казуліна часьцяком выглядае супярэчлівай – гэта зьвязана са

складаным становішчам самой беларускай апазыцыі.

А. Казулін шматкроць запэўнівае цяперашніх дзяржслужбоўцаў, што яны будуць працягваць працаваць і пасьля ягонай перамогі («*90 % чиновников сохранит свои позиции*») – апроч зацятых прыхільнікаў А. Лукашэнкі: «*от цепных псов мы избавимся*». Казулін даводзіць, што ў апаратчыкаў, прызначаных паводле прынцыпу асабістай адданасьці, за Лукашэнкам няма ўпэўненасьці ў будучыні («*Сегодня на должности, завтра – не угодил – и пошел вон. Все заслуги Лукашенко приписывает себе, все просчеты – разносы и наказание – вам*»). Гэтая заява гучыць яшчэ мацней, калі згадаць лёс самога А. Казуліна. Зь іншага боку, ён кажа пра завысокія заробкі дзяржчыноўнікаў і іх залішнія паўнамоцтвы ў сфэры бізнэсу. Ён вельмі вобразна абяцае пакараць за фальсыфікаваньне вынікаў выбараў («*возмездие за предательство своего народа*»). Агульны тон звароту да намэнклятуры, відаць, павінен яе абнадзеіць.

У сфэры замежнай палітыкі А. Казулін крытыкуе прэзыдэнта за тое, што ён канфліктуе зь іншымі краінамі, у тым ліку і з Расеяй («*особенно хочу извиниться перед Россией*»). Казулін падкрэсьлівае ролю Расеі ў забесьпячэньні стабільнасьці ў Беларусі («*стабильность держится на безвозмездной помощи Российской Федерации и преференциях, которые она оказывает*») і нават сьцьвярджае, што А. Лукашэнка культуве ў Беларусі антырасейскія настроі. Лёзунг замежнай палітыкі Казуліна – «*Россия стратегический союзник, Европа – стратегический партнер*». Ён бачыць Беларусь як мост паміж Захадам і Ўсходам, што досыць тыпова для ўсходнеэўрапейскіх палітыкаў. А. Казулін выступае за інтэграцыю ў Эўразьвяз (хоць і ў далёкасяжнай пэрспэктыве), але супраць уваходжаньня Беларусі ў НАТО. Ён крытыкуе А. Лукашэнку за завышаныя выдаткі на абарону: «*Зачем же нам комбайны на воздух пускать?*»

А. Казулін адназначна адказвае на пытаньне пра нацыянальныя сымбалі: «*Нацыянальная сымболіка нашай краіны – бела-чырвона-белы сьцяг і Пагоня*». Дзьвюхмоўе часова застанецца: «*В Беларуси пока должны оставаться два государственных языка*». Аднак ён не прывязвае беларускую мову да беларускага

патрыятызму і сам пераважна карыстаецца расейскай мовай. У суме ягоны падыход да пытаньняў культурнай і замежнай палітыкі здаецца дваістым. Падобна, што ён хоча прыцягнуць на свой бок выбарцаў з абодвух лагераў.

На думку А. Казуліна, эканамічнаму разьвіццю перадусім замінаюць дзяржаўнае рэгуляваньне і падатковая сыстэма. Але пры гэтым ён абяцае захаваць і нават умацаваць наяўную сыстэму сацыяльнага забесьпячэньня. Дадатковыя прыбыткі на гэтыя мэты павінна даць больш эфэктыўнае выкарыстаньне фінансавых рэсурсаў і фондаў, падкантрольных прэзыдэнту.

А. Казулін прапануе прыватызаваць сельскую гаспадарку («*У нас столько земли! Ее нужно отдать хозяину*»). Ён мяркуе, што яна павінна стаць больш канкурэнтнай галіной. Пляны зьвярнуць увагу на разьвіццё рэгіёнаў («*разве рационально все вкладывать только в столицу*») зводзяцца пераважна да адміністрацыйнай рэформы пры захаваньні цэнтралізацыі – «*Вместо шести областей сделаем приблизительно 40 волостей, которые будут напрямую подчиняться правительству*». Выглядае, што праблемы сельскай гаспадаркі Казуліна мала абыходзяць.

А. Казулін прызнае, што прэзыдэнт карыстаецца высокай падтрымкай у пэнсіянэраў і што падтрымліваць іх – у ягоных інтарэсах («*он из страны выжимает все соки, чтобы выдать хоть маленькую пенсию, но вовремя*»). Хоць Казулін і сьцьвярджае, што пэнсіі малыя, але не прапаноўвае канкрэтных спосабаў іх павялічыць – «*я соберу группу пенсионеров, которые предложат, как лучше должно быть*». І наадварот, як выхадзец з навуковага асяродзьдзя, А. Казулін надае шмат увагі сыстэме адукацыі і, у прыватнасьці, студэнцтву. Яму Казулін абяцае, што беларускія дыплёмы будуць прызнаваць за мяжой, а навучальны працэс зробіцца стабільным.

А. Казулін, бадай, больш за якога іншага лідэра апазыцыі нагадвае правадыроў г. зв. «каляровых рэвалюцыяў». Ён прыйшоў у апазыцыю з уладнай эліты, яго лепей ведаюць у грамадзтве, чым большасьць традыцыйных апазыцыянэраў. Кар'ера навукоўцы дазваляе яму ўсталёўваць кантакт са студэнцкай моладзьдзю. Некаторыя заявы А. Казуліна

прымушаюць сумнявацца ў ягонай адданасьці прынцыпам дэмакратыі. Ягоная сутычка зь сілавікамі 2 сакавіка і тое, што ён ачоліў шэсьце да спэцпрымальніка на Акрэсьціна 25 сакавіка, сьведчаць, што пры пэўных умовах Казулін можа выяўляць схільнасьць да агрэсіўных захадаў. Ён спрабуе зьвяртацца да ўсіх сацыяльных слаёў, выкарыстоўвае папулісцкую рыторыку. Праграмныя заявы А. Казуліна, асабліва ў галіне эканомікі, даволі расплывістыя, але ён раздае багата абяцаньняў. Калі эканамічная сытуацыя ў Беларусі значна пагоршыцца і вулічныя акцыі пратэсту апазыцыі займеюць шырэйшую падтрымку, А. Казулін або іншы падобны апазыцыйны лідэр можа стаць магутным праціўнікам цяперашняй улады.

А. МІЛІНКЕВІЧ – НОВАЯ І СТАРАЯ АПАЗЫЦЫЯ

А. Мілінкевіч успрымае дэмакратыю як самакаштоўнасьць і як спосаб палепшыць сацыяльна-эканамічнае становішча («*Укрепившаяся демократия станет тем универсальным инструментом, с помощью которого со временем будут решаться и социально-экономические проблемы*»). Ён крытыкуе прэзыдэнта за непрадказальнасьць і ўнікае азначэньня «рэвалюцыя» датычна беларускіх падзеяў: «*Пастаянна падкрэсьліваю, што мы супраць рэвалюцый*». Ён пярэчыць заявам улады, што апазыцыя – гэта крыніца нестабільнасьці, імкнецца ня даць падставаў для рэпрэсіяў супраць апазыцыі і, трэба меркаваць, прыцягвае больш грамадзянаў у шэрагі апазыцыі.

А. Мілінкевіч абяцае па магчымасьці захаваць узрослыя заробкі мэнэджараў («*будем думать… как поддержать, прежде всего материально*»), а заробкі намэнклятуры разглядае як магчымую крыніцу эканоміі («*до ограничения аппетитов государственных чиновников*»). Тое ж датычыцца і сілаў бясьпекі: «*численность различных «сил правопорядка» необходимо постепенно сокращать*». Войска трэба паступова скарачаць – «*[армия] будет профессиональной, мобильной и не очень большой*». Афіцэрам ён абяцае дапамогу ў пошуках новай працы. А. Мілінкевіч заяўляе, што скарачэньні мусяць пачацца з тых, хто парушаў закон (трэба меркаваць, з тых, хто ўдзельнічаў у

рэпрэсіях супраць апазыцыі). Журналісты, якія працуюць на ўладу, таксама не атрымліваюць ніякіх гарантыяў: «*Не найдут себе работы по специальности в силу естественных причин*». А. Мілінкевіч зрэдчас згадвае, што пры цяперашнім прэзыдэнту становішча намэнклятуры зрабілася нестабільным: «*Кто из них может быть уверенным, что завтра его не уволят и не посадят?*» Але гэтая заўвага не скасоўвае агульнага нэгатыўнага мэсыджу Мілінкевіча да дзяржчынавенства.

Дзьвюхмоўе, на думку Мілінкевіча, сьведчыць пра сёньняшні неспрыяльны стан рэчаў («*отражает сегодняшнюю языковую ситуацию в Беларуси*»), які зь цягам часу выправіцца («*проведение продуманной политики по популяризации белорусского языка и культуры, расширению сферы его применения в государственной, общественной жизни и в быту*»). Статус расейскай і іншых моваў павінен гарантавацца агульнай дзяржаўнай падтрымкай нацыянальных меншасьцяў: «*обеспечим условия для свободного развития национальных меньшинств, их культур и языков*». Тут А. Мілінкевіч ненашмат адыходзіць ад традыцыйных поглядаў беларускай апазыцыі.

Заява пра роўнасьць розных рэлігійных канфэсіяў мае на ўвазе, што за А. Лукашэнкам праваслаўная царква карыстаецца прывілеямі і што такі стан павінен зьмяніцца – «*не будет ущемлять интересы и права представителей других конфессий, как и создавать государственные привилегии православию*». У сваіх публічных заявах і дзеях А. Мілінкевіч раз-пораз ужывае рэлігійныя элемэнты. Ён досыць выразна фармулюе сваё стаўленьне да мінулага: «*следующим президентом Беларуси будет не советский человек, а белорус*». Але вяртаньне дзяржаўнай сымболікі пачатку дзевяностых ён зьвязвае з будучым рэфэрэндумам ці з прыняцьцем адпаведнага закону парлямэнтам.

Вайсковую прысутнасьць Расеі А. Мілінкевіч разглядае як непрыемнасьць, якую давядзецца трываць, пакуль дзейнічаюць цяперашнія афіцыйныя дамоўленасьці («*сослужим очень дурную службу Беларуси, если после прихода к власти начнем не соблюдать внешнеполитические договоренности предыдущего правительства*»). Пытаньне ўваходжаньня ў НАТО

разглядаецца ў сьвятле патрабаваньняў Канстытуцыі – «*По Конституции Беларусь – нейтральное государство, поэтому вопрос вступления в военный блоки не может стоять в принципе*». Значыць, застаецца адкрытам пытаньне вайсковага саюзу з Расеяй. Далучэньне да Эўразьвязу Мілінкевіч бачыць як доўгатэрміновую мэту.

Ён просіць Расею паверыць, што ад новай улады для яе будзе больш карысьці («*предсказуема, договороспособна, открыта и дружественна*»), але канкрэтна не тлумачыць, чаму. Наадварот, на думку Мілінкевіча, эканамічная інтэграцыя збольшага беспасьпяховая («*выніку ад гэтага будаўніцтва няма, базы эканамічнай няма*»), а пэўныя эканамічныя пагадненьні выклікаюць падазрэньне («*адыгрываюць ролю прыкрыцьця розных карупцыйных схем*»). Ён таксама выступае супраць увядзеньня адзінай валюты. Увогуле А. Мілінкевіч мяркуе, што расейскае кіраўніцтва не жадае, каб Беларусь заставалася незалежнай краінай («*многія ў Маскве не гатовы да такой пастаноўкі пытаньня*»).

Бачаньне А. Мілінкевічам функцыяў дзяржавы пераважна адпавядае лібэральнай канцэпцыі: «*функции обеспечения безопасности, обороны и правопорядка, обучения детей и лечения больных, социальной поддержки тех, кто в силу разных причин не в состоянии зарабатывать себе на жизнь*». Ён таксама верыць у нэалібэральную ідэю, што скарачэньне падаткаў у выніку вядзе да росту дзяржаўных даходаў. Ня дзіўна, што ён ускладае вялікія надзеі на прыцягненьне замежных інвэстыцыяў і крэдытаў. А. Мілінкевіч прапануе правесьці прыватызацыю стратных малых і сярэдніх прадпрыемстваў (у іншым выпадку ён сьцьвярджае, што яны павінны прыватызоўвацца ў першую чаргу), а вялікія пакінуць пад кантролем дзяржавы. Банкруцтва непрыбытковых прадпрыемстваў, зь ягонага гледзішча, – нармальная зьява: «*Банкі не павінны крэдытаваць хранічна стратныя прадпрыемствы*». Супрацоўнікі падлеглых прыватызацыі кампаніяў збольшага пакінутыя самі на сябе: «*Получат возможность трудиться на приватизированном предприятии в качестве наемного работника или перейдут на новое место работы*». На думку А. Мілінкевіча, даходы ад прыватызацыі

павінны пайсьці на выплату пэнсіяў і кампэнсацыяў тым, хто страціў свае ашчаджэньні падчас развалу СССР.

Зь іншага боку, А. Мілінкевіч абяцае захаваць наяўную сыстэму сацыяльнага забесьпячэньня, улучна зь бясплатнай адукацыяй і бясплатным мэдыцынскім абслугоўваньнем у дзяржаўных установах. Ён прапануе рэгуляваньне цэнаў на карысьць вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі і рост дзяржаўных інвэстыцыяў у сельскія раёны. Калгасы застануцца: «*Мы никогда не повторим печальный опыт Литвы, когда они в антикоммунистическом порыве взяли и ликвидировали все колхозы*». На думку Мілінкевіча, дзяржава павінна падтрымліваць і прыватны, і грамадзкі сэктар. Моладзі прапануюцца адмена кантрактнай сыстэмы і магчымасьці паехаць за мяжу. А. Мілінкевіч спадзяецца, што будучыя перамены на лепшае ў Беларусі зробяць немагчымай «уцечку мазгоў».

А. Мілінкевіч зрабіў пэўны прарыў у дыскурсе апазыцыі. Замест ідэалізацыі будаўніцтва беларускай нацыянальнай дзяржавы ён прагматычна прапануе зьвярнуць увагу на каштоўнасьці і погляды большасьці грамадзянаў. Вынік – больш «зручная для карыстальніка» апазыцыя.

Аднак узважанасьць Мілінкевіча часам даходзіць да скрайнасьці, ператвараецца ў неканкрэтнасьць. Вось досыць характэрны адказ на пытаньне пра ягоныя ідэалягічныя прыхільнасьці: «*Я – беспартийный человек, который мечтает о том, чтобы в свободной демократической Беларуси люди разных убеждений… могли беспрепятственно выражать свои идеологические взгляды, пропагандировать свои политические программы*». І пра стаўленьне да легалізацыі марыхуаны: «*Вырашэньне такіх пытаньняў у дэмакратычных краінах знаходзіцца ў кампэтэнцыі парлямэнту, а не прэзыдэнта*». А. Казулін адказаў на гэтае пытаньне проста: «Адмоўнае».

Яшчэ адна праблема Мілінкевіча ў тым, што зьмена формы, у якой падаецца ідэя, не абавязкова азначае зьмену яе зьместу. Здаецца, што ён выказваецца за дзьвюхмоўе і добрыя стасункі з Расеяй ня шчыра, а вымушана, і залішне натхнёна гаворыць пра магчымасьці рынкавай эканомікі. Апошняе дадае яму

прыхільнасьці заходніх дэмакратыяў, але ў бліжэйшай пэрспэктыве зьмяншае ягоныя шанцы. Перш чым перамога Мілінкевіча стане рэальнай, мусяць адбыцца значныя зьмены ў эканоміцы і ў міжнароднай сытуацыі. Магчыма, ягоныя шанцы вырастуць, калі Лукашэнка стане праводзіць больш адкрытую прарасейскую палітыку і калі для кіраўніцтва Расеі Беларусь страціць цікавасьць.

РЭВАЛЮЦЫЯ ЦІ?..

Перш чым абмяркоўваць магчымыя вынікі беларускіх падзеяў, трэба ўдакладніць паняткі. І падчас выбарчай кампаніі, і пасьля абвяшчэньня вынікаў у паветры лунала слова «рэвалюцыя». Я асабіста вызначыў бы дзьве рысы, што адрозьніваюць рэвалюцыю ад іншых тыпаў зьмены ўлады: кардынальную зьмену палітычнай (а часам і сацыяльна-эканамічнай) структуры і шырокую народную падтрымку пераменаў. Зыходная колькасьць апазыцыі не настолькі істотная – лістападаўскія падзеі 1917 г. у Расеі распачала адносна нешматлікая партыя, але ў выніку адбыліся ўсёахопныя грамадзкія пераўтварэньні… З гэтага гледзішча ўсе антыкамуністычныя трансфармацыі напрыканцы васьмідзясятых ўва Ўсходняй Эўропе падпадаюць пад азначэньне рэвалюцыі. За выключэньнем Румыніі, яны былі пераважна мірныя, бо ўлады залежалі ад падтрымкі Савецкага Саюзу, які і стварыў гэтыя рэжымы. Ня дзіва, што ў Румыніі, якая за часам Нікалаэ Чаўшэску неаднойчы дэманстравала сваю незалежнасьць ад савецкага хаўрусьніка, падзеі пайшлі па самым крывавым сцэнары.

На маю думку, галоўных актораў у антыкамуністычных рэвалюцыях шэсьць: уладная групоўка (палітычныя кансэрватары), ніжэйшае рангам чынавенства (пераважна памяркоўнае), войска і сілы бясьпекі, дысыдэнты (найчасьцей інтэлектуальныя і рэлігійныя), шырокая грамадзкасьць (найперш працоўныя) і вонкавыя гульцы (Савецкі Саюз і заходнія дзяржавы).

Схематычна антыкамуністычныя рэвалюцыі адбываюцца паводле наступнага сцэнару: рэпрэсіі супраць дысыдэнтаў

выклікаюць незадаволенасьць шырокай грамадзкасьці, палітычныя пратэсты перарастаюць у масавыя дэманстрацыі і страйкі, сілы бясьпекі ня ў стане стрымаць пратэстаў (замала патронаў ці бессаромнасьці), на зьмену здыскрэдытаванай уладнай групоўцы прыходзіць ніжэйшае рангам чынавенства, яно пачынае перамовы зь лідэрамі дысыдэнтаў. Канчатковы зыход залежыць ад маштабаў народнай незадаволенасьці і моцы дысыдэнцкага руху. Там, дзе ён быў слабейшы, новая чыноўніцкая эліта даўжэй пратрымалася ўва ўладзе. Вядома, гэта проста схема, якая ня цалкам падыходзіць пад кожны асобны выпадак.

Аднак яна дазваляе зьвярнуць увагу на некаторыя істотныя пытаньні. Посьпех і пераважна негвалтоўны характар антыкамуністычных рэвалюцыяў палягаў у адчужанасьці ўлады ад пераважнай большасьці насельніцтва, наяўнасьці шчырых дысыдэнцкіх груповак і разгалінаванасьці (вэртыкальнай і гарызантальнай) камуністычнай уладнай сыстэмы. Трэба ўлічваць і ролю вонкавых гульцоў: Савецкі Саюз, апошні хаўрусьнік камуністычных рэжымаў, ад іх адмовіўся, а патрэба ў эканамічнай дапамозе з Захаду адыграла істотную ролю ў тым, каб не дапусьціць рэпрэсіяў і захаваць вынікі рэвалюцыяў у доўгатэрміновай пэрспэктыве.

СМІ назвалі нядаўнія выступленьні ў посткамуністычных Грузіі (2003 г.), Украіне (2004 г.) і Кыргызстане (2005 г.) «каляровымі рэвалюцыямі». На маю думку, яны наўрад ці покуль што падпадаюць пад азначэньне рэвалюцыі, бо не прынесьлі трывалых структурных зьменаў. Ад антыкамуністычных рэвалюцыяў яны адрозьніваюцца некаторымі ключавымі чыньнікамі. Па-першае, незадаволенасьць уладай хоць і мае шырокараспаўсюджаны характар, але больш яскрава выяўляецца ў пэўных рэгіёнах і сацыяльных групах. Гэта стварае падставы для напружанасьці пасьля зьмены ўлады, дазваляе сумнявацца ў яе законнасьці. Па-другое, коўдру дысыдэнцкага руху перацягнулі на сябе былыя ўрадоўцы, далёка не абавязкова аддадзеныя ідэалам дэмакратыі. Узьнікае небясьпека, што новае кіраўніцтва ня будзе трымацца дэмакратычных працэдураў. Па-трэцяе, усе «каляровыя рэвалюцыі» адбыліся пры паўаўтарытарных рэжымах з простай

структурай, арганізаванай вакол палітычнага лідэра, але пры некаторай наяўнасьці плюралізму па-за сыстэмай улады. Зьяўляецца пагроза інстытуцыйнай нестабільнасьці і ўжываньня гвалтоўных захадаў на пераходным этапе. Да таго ж лік краінаў, дзе могуць адбыцца падобныя трансфармацыі, даволі абмежаваны. І нарэшце, хоць гэта і не настолькі істотна, «каляровыя рэвалюцыі» плянаваліся, а ня ўспыхвалі раптоўна. І для ўлады, і для дысыдэнтаў антыкамуністычныя рэвалюцыі пачаліся зьнянацку, а перавароты ў камуністычных краінах былі рэакцыяй на загадзя вызначаныя падзеі – парлямэнцкія ці прэзыдэнцкія выбары. З гледзішча гэтых крытэраў тое, што адбылося ў 1989 г. у Румыніі – пераходны выпадак паміж антыкамуністычнай і «каляровай» рэвалюцыяй.

ШТО АДБЫЛОСЯ Ў БЕЛАРУСІ?

З увагі на вышэйсказанае Беларусь патэнцыйна больш падпадае пад катэгорыю «каляровай», а не антыкамуністычнай рэвалюцыі. Апазыцыя не карыстаецца ўсеагульнай падтрымкай насельніцтва. Яна здолела вывесьці на вуліцы, паводле ейных жа падлікаў, да 30 тысячаў сваіх прыхільнікаў. Гэта значна менш, чым у камуністычных краінах у васьмідзясятыя (да прыкладу, у сярэдніх памераў правінцыйным горадзе Тымішаары пратэставалі дзясяткі тысячаў чалавек). Трэба зважаць і на тое, што апазыцыя засяродзіла ўсю ўвагу на сталіцы і пераважна ня думала пра акцыі пратэсту ў рэгіянальных цэнтрах (у некаторых зь іх удзельнічала да сотні маніфэстантаў). Можна казаць пра пагрозу з боку сілаў бясьпекі, але напрыканцы васьмідзясятых у колішніх камуністычных краінах яна была ня меншай. Стыль кіраваньня А. Лукашэнкі, які вымагае ад намэнклятуры асабістай адданасьці, не дазваляе ўзьнікнуць у яе шэрагах апазыцыйным асяродкам – яны маглі б зрабіць пераходны працэс больш гладкім. А ў такой сытуацыі дысыдэнтам няма з кім дамаўляцца. Вонкавы ўплыў зыходзіць, галоўным чынам, ад Расеі, якая падтрымлівае Лукашэнку. Заходнія краіны абмежавалі кантакты з уладай, таму ў іх мала мэханізмаў узьдзеяньня і мала інфармацыі.

Аднак Беларусь, здаецца, ня цалкам трапляе і ў катэгорыю

«каляровых рэвалюцыяў». На сёньня дысыдэнцкі рух уяўляе сабою сумесь антыкамуністычнай апазыцыі васьмідзясятых і ўрадоўцаў, што страцілі свае пасады ў дзевяностых. Большасьць зь іх не настолькі добра вядомыя ў грамадзтве, як лідэры «каляровых рэвалюцыяў». Улада амаль не дапушчае праяваў плюралізму ў грамадзтве. Альтэрнатыўныя каналы інфармацыі абмежаваныя, таму апазыцыі складаней мабілізоўваць і накіроўваць сваіх прыхільнікаў. Ёсьць іншыя чыньнікі, што сьведчаць за сцэнар «каляровай рэвалюцыі». Беларуская апазыцыя актывізуе сваю дзейнасьць падчас выбараў, бо яны даюць, бадай, адзіную магчымасьць доступу да дзяржаўных СМІ. Сілы апазыцыі сканцэнтраваныя ў сталіцы – там адбываецца большасьць значных падзеяў. Нарэшце, адзінства намэнклятуры выступае перашкодай да цалкам негвалтоўнай зьмены ўлады.

Усё гэта ўскладняе задачу тым, хто дамагаецца пераменаў. Аднак і беларуская апазыцыя таксама зрабіла шэраг арганізацыйных памылак, асабліва ў тыдзень пасьля выбараў. Хоць зыход выбараў быў прадказальны, па абвяшчэньні афіцыйных вынікаў лідэры апазыцыі заблыталіся ў сваіх мэтах. А. Казулін і А. Мілінкевіч называлі прынамсі чатыры розныя мэты адначасова: пералік бюлетэняў, другі тур, новыя выбары і стварэньне альтэрнатыўнага ўраду. Дзіўна арганізоўваліся і масавыя акцыі: тая, што адбылася 19 сакавіка (верагодна, найбольш шматлікая), скончылася прапановай правесьці гэткую ж дэманстрацыю 20 сакавіка, потым «дзень Х» быў адкладзены да 25 сакавіка. Двойчы адкладаючы «дзень Х», лідэры апазыцыі выявілі няўпэўненасьць наконт мэты акцыяў пратэсту. Ня дзіва, што апошняя дэманстрацыя – 25 сакавіка – сабрала менш удзельнікаў, чым папярэднія, хоць улада і пазьбягала адкрыта ўжываць гвалт (маленькі «намётавы гарадок» зьліквідавалі ўначы).

Апроч таго, улада добра падрыхтавалася як з гледзішча кантролю над каналамі інфармацыі, гэтак і разгортваньня сілаў бясьпекі. Некаторыя назіральнікі адзначалі, што апазыцыя падчас выбарчай кампаніі выявіла значны творчы патэнцыял. Я ўдакладніў бы – *у параўнаньні з ранейшай дзейнасьцю апазыцыі, але не ў абсалютным вымярэньні*. А

значыць, улада добра ведала, чаго чакаць. Дзяржаўныя СМІ прывязалі апазыцыю да кантэксту «каляровых рэвалюцыяў», асабліва да расколаў паміж іх лідэрамі і неэфэктыўнай палітыкі, і досыць пасьпяхова высьмеялі яе сымбалі – сіні колер і джынс. У СМІ прайшла кампанія па абвінавачаньні апазыцыі ў падрыхтоўцы да тэрактаў, лідэры апазыцыі мусілі апраўдвацца, так што здавалася – яны ўвогуле нічога не зьбіраюцца рабіць. Улада, ведаючы, што папярэднія «каляровыя рэвалюцыі» адбываліся ў сталіцах, перадысьлякавала ў Менск сілы бясьпекі. Улада была падрыхтаваная не дапусьціць масавага збору людзей на Кастрычніцкай плошчы, якую абрала апазыцыя, і адрэзала «намётавы гарадок» ад падтрымкі звонку.

Улада прывяла ў гатоўнасьць шматлікія сілы бясьпекі, але паўстрымалася іх задзейнічаць, верагодна, таму, што чакала «каляровай рэвалюцыі». Адзін зь яе галоўных элемэнтаў – блякада ці захоп урадавых будынкаў, бо гэта выяўляе бездапаможнасьць улады, паказвае сілам бясьпекі, што ўлада больш не кантралюе сытуацыю, а ўладзе – што яна ня можа разьлічваць на сілы бясьпекі. Апроч таго, пасіўныя прыхільнікі апазыцыі тады больш не баяцца далучыцца да актыўнага пратэсту. Беларуская ўлада не праяўляла слабасьці. Таму спробу А. Казуліна трапіць на Ўсебеларускі народны сход і ачоленае ім шэсьце да спэцпрымальніка на Акрэсьціна спынілі гэткімі гвалтоўнымі захадамі. Ліквідацыя «намётавага гарадка» найхутчэй абумоўленая тым, што ўлада ня здолела б не дапусьціць яго ўмацаваньня, калі б дэманстрантам дазволілі зноў сабрацца на Кастрычніцкай плошчы.

Становішча апазыцыі ў параўнаньні з уладай неяк нагадвае гульца, які трымае карты адкрытымі. Вядома, калі карты сапраўды добрыя, ён усё роўна выйграе. Але мне здаецца, што апазыцыя мела на руках у лепшым выпадку сярэдненькія карты. Калі б за беларускай апазыцыяй стаяла выразная большасьць насельніцтва, усе гэтыя памылкі ня мелі б надта вялікага значэньня.

Пераклала з ангельскай V.K.
[image]
[image]

№ 4 (44) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/04/10
[image]

[image] [image] [image]

ЭНДРУ ЎІЛСАН
палітоляг, прафэсар Лёнданскага ўнівэрсытэту. Вывучае дынаміку нацыяналізмаў і нацыянальных ідэнтычнасьцяў на постсавецкай прасторы. Апошняя публікацыя – кніга «Virtual Politics. Faking Democracy in the Post-Soviet World» (London: Yale University Press, 2005).

Эндру Ўілсан Хто лепш засвоіў урокі Памаранчавай рэвалюцыі?

Хто лепш засвоіў урокі нядаўніх «каляровых рэвалюцыяў», што хваляю пракаціліся па былой савецкай прасторы: беларускія «джынсавыя рэвалюцыянэры» ці лукашэнкаўскія тэхнолягі-контрарэвалюцыянэры? Паводле вынікаў галасаваньня 2006 г. лік у матчы вызначыць цяжка. Паколькі надзейнага паралельнага падліку галасоў ці незалежнага экзыт-полу не было, немагчыма дакладна сьцьвярджаць, што адзін або другі бок сапраўды ўмацаваў свае пазыцыі ў параўнаньні з 2001 г. Згодна з афіцыйнымі зьвесткамі, тры кандыдаты, што супрацьстаялі Лукашэнку, разам атрымалі 11,8 % галасоў – менш, чым у 2001 г., калі два кандыдаты набралі 17,1 %. НІСЭПД, паводле вынікаў свайго апытаньня, у 2001 г. даваў Ганчарыку 32 %, а камандзе Мілінкевіча ў 2006 г. – 25–30 %.

Але можна паспрабаваць папярэдне прааналізаваць тактыку бакоў і стратэгічную сытуацыю, у якой праходзілі выбары. Праўда, мне даводзіцца рабіць камэнтар, калі падзеі яшчэ ў разгары… Па-першае, аўтарытарныя лідэры здольныя даць народу тое, што яму трэба. З дапамогай расейскіх субсыдыяў ці бязь іх, але ў 2001–2006 гг. адбыўся значны рост беларускай эканомікі. Відавочна, што шмат выбарцаў высока ацэньваюць усталяваны Лукашэнкам «закон і парадак», як і ягонае абяцаньне стварыць «спакойны, утульны дом». Ува Украіне ў

Гэты аналіз быў напісаны адмыслова на замову «ARCHE».

2004 г. выбухнула гадамі назапашанае абурэньне рэжымам. У Беларусі Лукашэнка дасюль мае трывалую базу падтрымкі. Януковіч скраў перамогу – Лукашэнка, здаецца, папросту перабольшыў сваю.

Таму беларускай апазыцыі было апрыёры цяжка вырашаць сваю задачу – дзейнічаць у межах тактыкі «негвалтоўнага супраціву», узятай на ўзбраеньне ў Джына Шарпа[1] і інш. Апазыцыянэры шмат што рабілі слушна – перадусім пазьбягалі гвалтоўных формаў пратэсту і «простага дзеяньня», што дало б уладам нагоду, якой яны так шукалі, каб пусьціць у ход сілу. Дакладней, пусьціць у ход сілу раней. Апазыцыя таксама добра навучыла сваіх прыхільнікаў адрозьніваць і пазьбягаць правакатараў. Джын Шарп лічыць неабходным вызначаць і падкрэсьліваць слабыя бакі, што ёсьць у кожнага рэжыму. На ягоную думку, каб дамагчыся пераменаў, галоўнае ня грошы, а зьмена ў людзкой сьвядомасьці. Упэўненасьць у сваёй маральнай перавазе – галоўны актыў апазыцыі, асабліва калі вядзецца пра тое, каб падштурхнуць тысячы шарагоўцаў, якія падтрымліваюць уладу, перайсьці на другі бок. Аднак у Беларусі рэжым ніколі не выяўляў слабасьці. Абурэньне тым, што Лукашэнка душыць дэмакратыю, не выходзіла за межы апазыцыйных колаў. Памаранчавая рэвалюцыя ўдалася, бо на вуліцы выйшлі сотні тысячаў звычайных людзей. Беларускай апазыцыі бракавала відочнай падтрымкі «тылу» – масаў народу, якія б надалі вагу акцыі пратэсту ня проста таму, што яны падтрымлівалі Мілінкевіча ці не прымалі лукашэнкаўскай нацыянальнай ідэі, а таму, што баранілі сваё права на пратэст, баранілі агульную ідэю свабодных і справядлівых выбараў. Згодна з вынікамі апытаньня «Дэмакратычных ініцыятываў» у 2005 г., толькі 39 % маніфэстантаў выйшлі ў 2004 г. на вуліцы дзеля таго, каб падтрымаць Юшчанку, 59 % пратэставалі супраць самога факту фальсыфікацыі выбараў.

Іншымі словамі, стратэгія негвалтоўнага супраціву палягае на тым, каб ціснуць на слабыя бакі ўлады. У лукашэнкаўскага рэжыму іх няшмат. Прынамсі, пакуль – магчыма, яны высьпеюць з часам. Можна меркаваць, што пэрыяд адразу па выбарах заўсёды яшчэ важнейшы за самі выбары. Мабыць, Лукашэнка хоча, каб сытуацыя «вярнулася ў норму». Апазыцыя

[1] Джын Шарп (нар. у 1928 г.) – амэрыканскі палітолаг. У ягонай асноўнай працы «Палітыка негвалтоўнага дзеяньня» (1973) падаецца прагматычны палітычны аналіз негвалтоўных дзеяў як мэтаду ўзьдзеяньня ў выпадку канфлікту (*Заўв. перакл.:*).

павінна не спыняцца на дасягнутым, а Захад, асабліва Эўропа, мусяць аказваць ёй больш рашучую падтрымку, чым падчас самой выбарчай кампаніі. Эўразьвязу трэба распрацаваць цьвёрдую, але канструктыўную палітыку датычна Беларусі, бо на цяперашні момант ён увогуле амаль ніяк не задзейнічаны.

Выглядае, што рэжым Лукашэнкі лепш засвоіў урокі Памаранчавай рэвалюцыі. Улада не дапусьціла ніякага сур'ёзнага паралельнага падліку галасоў або экзыт-полу, якія б маглі зрабіцца штуршком да электаральнай рэвалюцыі. Хоць шмат для каго бясспрэчна, што абвешчаная лічба галасоў за Лукашэнку – разьдзьмутая, але апазыцыя не змагла хоць колькі-небудзь пераканаўча давесьці, што за яго прагаласавала менш як 50 % выбарцаў. Лукашэнка забясьпечыў адзінства намэнклятуры і вернасьць службаў бясьпекі. Гэта, у сваю чаргу, дапамагло зьвесьці да мінімуму колькасьць акцыяў пратэсту праз простыя практычныя захады: адмену цягнікоў на Менск, падтрыманьне атмасфэры страху… Ува Ўкраіне маніфэстанты хутка перасталі баяцца, што дэманстрацыі ўдушаць сілай, і перайшлі ў наступ. Беларускія ўлады прымусілі людзей адчуць рэальнасьць пагрозы. Але яны пазьбягалі і надта жорсткіх захадаў, якія маглі б справакаваць больш шырокі пратэст. Людзей арыштоўвалі, калі яны *сыходзілі* з плошчы, каб іх можна было пахапаць маленькімі гурткамі. Сілавыя структуры не дазвалялі перадаваць у намётавы гарадок ежу, коўдры і інш., каб удзельнікі акцыі маглі трымацца. І ўлады вырашылі правесьці выбары ня ўлетку, а халоднай сакавіцкаю парою.

Неяк дзіўна, што апазыцыя не паклапацілася пра тое, каб надзейна і стала замацавацца на сваім «пляцдарме». Калі б намётавы гарадок уяўляў дастатковую пагрозу для ўладаў, тыя мелі цудоўную магчымасьць лёгка захапіць тэрыторыю. Апроч таго, улада не дапусьціла эфэкту сьнегавога камяка, стварыўшы глухую сьцяну маўчаньня вакол акцыі пратэсту ў беларускіх СМІ і зьвёўшы да мінімуму прысутнасьць замежных.

Нарэшце, рэжым перастрахаваўся – у дадатак да «адміністрацыйнага рэсурсу» задзейнічаў «паліттэхналёгіі». Ізноў, каб стварыць уражаньне пратэстнай палітыкі, быў пушчаны ў ход Сяргей Гайдукевіч. Могуць узьнікаць пытаньні і

наконт Аляксандра Казуліна: прынамсі, а ці ня дзеля таго ён створаны, каб заняць месца «кантраляванай апазыцыі» – замест сапраўднай?

І вядома, ключавую ролю ў гэтых выбарах адыграла Расея – у сьнежні 2005 г. Пуцін засьведчыў Лукашэнку сваю падтрымку. У 2001 г. за падобную дапамогу Лукашэнка абяцаў расчыніць дзьверы ў Беларусь расейскаму бізнэсу, аднак тады ён сваёй абяцанкі ня выканаў. Лягічна было б думаць, што гэтым разам Крэмль забясьпечыў сабе больш цьвёрдыя гарантыі. Паказальным у гэтым пляне будзе лёс «Белтрансгазу». Хоць па шмат якіх пазыцыях Лукашэнка і дамогся чарговай (ужо не такой «элегантнай») перамогі, але ён ня здолеў зьнішчыць сам палітычны працэс у Беларусі. Наперадзе нас чакае шмат цікавага.

Пятніца, 24 сакавіка 2006 г.

Пераклала з ангельскай V.K.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/04/10**
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 4 (44) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

выбары 2006

выбары 2006

[image] [image] [image] [image]

ПАВАЛ УСАЎ

Павал Усаў Паміж прэзыдэнтам і мэсіем Перадвыбарны дыскурс Лукашэнкі

палітоляг. Апошні аналіз у «ARCHE» меў назоў «Ці можа дзяржава існаваць безь людзей» (1–2/2006).

Моцная дзяржава – кволы народ, кволы народ – моцная дзяржава.

Шан Ян

У эпоху інфармацыйных тэхналёгіяў, калі процьма інфармацыі, думак, меркаваньняў, ацэнак, што прэтэндуюць праўду, укідваецца ў грамадзтва, людзям усё цяжэй і цяжэй разабрацца ў тым, хто маніць, а хто кажа праўду. Калі ў дэмакратычных грамадзтвах яшчэ застаецца шанец дзякуючы палітычнаму і інфармацыйнаму плюралізму наблізіцца да аб’ектыўных ацэнак палітычнай рэчаіснасьці, то ў недэмакратычных грамадзтвах такая магчымасьць мінімізавана да скрайнасьцяў, асабліва што да палітычнай сфэры. Недэмакратычныя лідэры не прымаюць крытыкі, вальнадумства і аўтаномных дзеяньняў, таму робіцца ўсё магчымае, каб падначаліць грамадзтва і асобнага індывіда адзінай мэце – працы на ўладу і падпарадкаваньню ёй. Інфармацыю можна таксама назваць мэханізмам рэпрэсіяў, што разбурае сьвядомасьць чалавека і стварае новае аблічча навакольнай рэчаіснасьці і ўкараняе яго ў грамадзтва. Калі гэта

адбываецца штодзённа, калі адсутнічае магчымасьць атрымаць іншую інфармацыю, асоба, не жадаючы таго, паступова «засвойвае» новую рэчаіснасьць.

У Беларусі выбудавалася таталітарная інфармацыйная мадэль, якая падначаліла сабе сродкі масавай інфармацыі. Усё, што не ўбудоўваецца ў афіцыйнае бачаньне падзеяў, выводзіцца па-за межы інфармацыйных плыняў і застаецца невядомым большыні грамадзянаў. І калі час ад часу ўрыўкі інфармацыі пра сапраўдны стан рэчаў у краіне даходзяць да асобных людзей, то яны на фоне афіцыйных паведамленьняў здаюцца настолькі ненатуральнымі, што вельмі рэдка ўспрымаюцца як праўда. У беларускім грамадзтве ўжо даўна сьцёрліся межы паміж праўдай і маной, паміж сапраўдным і ўяўным. Разабрацца простаму чалавеку, занятаму працай, сям'ёй, ня проста, і таму ён выбірае не ўдавацца ў падрабязнасьці, а чытаць і слухаць тое, пра што часьцей гавораць. Сёньня інфармацыйная прастора краіны запоўнена вобразамі і прамовамі аднаго чалавека, прэзыдэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі. Ягоныя прамовы слухаюць, яму вераць, за ім ідуць. З прычыны традыцыйнасьці нашага грамадзтва яго лічаць неаспрэчным аўтарытэтам, які ня можа памыляцца. Такое аблічча ён стварыў сабе сам, і ў гэтым дапамаглі яму беларускія СМІ. Тым ня менш, прэтэндуючы на ролю правадыра нацыі, ён сам заганяе сябе ў лягічныя казусы, якія гавораць супраць яго. Лукашэнка ня можа доўга падтрымліваць тую сацыяльную і палітычную рэчаіснасьць, якую ён стварыў для сябе. Але разам з тым вакол яго людзі, якія проста не жадаюць заўважаць усіх недагаворак, памылак і супярэчнасьцяў, яны вераць у яго, чым ускосна падтрымліваюць ілюзорнасьць беларускай рэчаіснасьці.

Прэзыдэнцкія выступы падчас выбарчай кампаніі ўяўляюць сабой асаблівую цікавасьць для палітычнага аналізу, бо ў іх раскрываецца сутнасьць той палітычнай сыстэмы, якая сфармавалася ў Беларусі за апошнія 12 гадоў. Аб'ектам аналізу будуць тры маштабныя выступы А. Лукашэнкі: інтэрвію беларускім каналам «Дзяржава для людзей», даклад на трэцім усебеларускім сходзе «Дзяржава для народу» і заключнае слова на гэтым сходзе. Хаця друкаваныя крыніцы ўжо грунтоўна падчышчаныя і адрэдагаваныя, тым ня менш, схаваць агульныя

неадпаведнасьці не атрымалася. Напрыклад, у заключным слове да «сходу» прэзыдэнт сказаў: «*Более того*, если бы это был *одушевленный предмет – наше собрание*, сказал бы, *что я отдаю дань уважения этому форуму и буду его чтить всю жизнь*…» Паводле лёгікі, раз «сход» ня быў «одушевленным предметом», то паважаць яго прэзыдэнт не зьбіраецца.

Вылучым для сыстэмнага аналізу некалькі асобных блёкаў: эканоміка, палітычная сытуацыя, месца Беларусі ў геапалітычнай прасторы і вобраз прэзыдэнта. Зыходнай кропкай дасьледаваньня будуць словы прэзыдэнта «*я никогда не говорю неправду*». Празь іх прызму будуць разглядацца вышэйпамянёныя блёкі.

Эканоміка. Эканамічнаму становішчу ў краіне А. Р. Лукашэнка надаў вялікую ўвагу, бо лічыць яго рухавіком усяго грамадзтва, было сказана шмат словаў, якія падкрэсьліваюць яго эфэктыўнасьць. Тым ня менш, тая сытуацыя, якая склалася на сёньня ў краіне, не зусім добрая. «*Я не хочу сказать, что у нас хуже, чем у кого-то. У нас лучше, чем у кого-то, но и у нас еще очень плохо*». (Ня будзем высьвятляць, хто ж гэты «кого-то», мо гэта азіяцкая краіна, цяпер гэта неістотна.) Асноўная праблема ў тым, што беларуская эканоміка існуе коштам некалькіх прадпрыемстваў: «*Львиную долю в валовой внутренний продукт внесло сравнительно небольшое число наших ведущих предприятий… Производственные фонды в топливно-энергетическом комплексе изношены более чем на 60 %. Для их модернизации требуется выделить миллиарды долларов. Самым важным вопросом остается вопрос заработной платы, средний размер которой составляет 250 долларов*». Прэзыдэнт прызнаў, што хтосьці мае 100, 150, 50 даляраў. «*У нас осталось совсем немного людей, я считаю их просто бездельниками, которые не могут заработать заработную плату хотя бы в 70–100 долларов*». Нягледзячы на такі паказьнік сярэдняга заробку, узровень жыцьця ў краіне застаецца невысокі, асноўнай прычынай гэтага зьяўляецца нерэнтабэльная эканоміка і рост цэнаў. «*У нас еще очень затратная экономика. Очень. У нас затраты на производство товара на 30, а в отдельных случаях на 50 %, а то и в два раза выше, чем на Западе*». Напэўна, таму асноўнымі гандлёвымі партнэрамі, дзе збываецца беларуская

прадукцыя, зьяўляюцца краіны Лацінскай Амэрыкі, Азіі, Бліжняга Ўсходу і Афрыкі. Як вынік – рост цэнаў, у якім, як высьвятляецца, вінен ня ўрад, а асобныя працоўныя калектывы. Аналізуючы цэнавую палітыку, Лукашэнка выпрацоўвае новую эканамічную тэорыю:

Выше цена – больше доходов. А кто повышает цены? Трудовые коллективы. Если тракторный завод повышает цену на трактор, так что дорожает? Дорожает хлеб и молоко, дорожает мясо. Потому что потребитель вынужден выкладывать большую сумму на приобретение трактора и закладывать эти расходы в цену готовой продукции. Тогда чего же обижаться работникам того или иного коллектива на то, что в магазинах растут цены на продукты питания? Вы же сами стимулируете рост этих цен.

У гэтай сытуацыі ўзьнікае пытаньне, а на каго крыўдаваць настаўнікам, лекарам ды інш. Ня склаліся спрыяльныя ўмовы і ў прадпрымальнікаў: «*Надо прямо признать, что заниматься предпринимательством у нас пока не так просто. Главное, на что жалуются предприниматели, – это отсутствие постоянных правил игры*». Як адзначыў прэзыдэнт, асноўнымі формамі неэканамічнага ціску на прадпрымальнікаў ёсьць: штомесячныя праверкі з боку кантралюючых органаў, санстанцыяў і пажарных. Лукашэнка пацьвердзіў, што і сытуацыя ў вёсцы пакідае жадаць лепшага: «*На селе только за последние пять лет численность работников уменьшилась более чем на четверть*». Акрамя таго, узмоцненая барацьба з карупцыяй, як выявілася, не прывяла да доўгачаканых вынікаў. Кажучы пра сфэру будаўніцтва, Лукашэнка адзначыў:«*И, как я чувствую, она коррумпирована*». Ня дзіва, што пры такіх тэндэнцыях у эканоміцы пачаліся перамовы з расейскімі алігархамі Вагітам Алякперавым і Міхаілам Гуцарыевым, якія прапануюць: «*Мы дадим вам 25 процентов собственности, только вы* возьмите это, мы вам инвестируем туда, мы построим вам это. *А я говорю Правительству: «Посчитайте, выгодно ли нам* это *или нет*» (**вылучана аўт.**). Вельмі цяжка ўявіць, што менавіта жадаюць пабудаваць і прадаць расейскія алігархі. Панятак «это» вельмі шырокі, але ў той жа час вельмі

зразумелы вуху простага савецкага абываталя, які быў заўсёды гатовы памерці ў «барацьбе за «это». Ужо даўно прыкмечана, што прамовы Лукашэнкі гучаць у стылі старога савецкага рэалізму, шмат лічбаў, фактаў, мэтаў і задачаў і расплывістых выразаў накшталт «это». Асабліва часта такія фразы гучаць, калі гутарка ідзе аб палітыцы.

У недэмакратычных сыстэмах палітыка і ўлада становяцца самакаштоўнасьцю, ядром якой зьяўляецца фігура кіраўніка. Як правіла, уся сыстэма базуецца і падначалена волі і жаданьню аднаго чалавека. І чым мацнейшы ўплыў сыстэмы і кіраўніка, тым больш узрастае неабходнасьць мабілізацыі грамадзтва вакол кіраўніка. Як толькі страчваецца вера ў правадыра, руйнуецца ўся сыстэма. Таму ўлада імкнецца пераканаць грамадзтва, што ў іншых умовах яно ня выжыве, чым выракае яго на самазьнішчэньне.

Палітычны дыскурс усіх выступаў Лукашэнкі выбудаваны такім чынам, што пасьля яскравай карціны, якая паказвае вялікія дасягненьні ўлады, нікчэмнасьць і прадажнасьць яе апанэнтаў, чытач устае перад адзіным і неаспрэчным фактам, які агучыў сам А. Л.: «*…продемонстрировать в эту предвыборную кампанию людям, что нормальный у них президент. Не нужен им другой президент*». У сьвядомасьці большасьці беларусаў слова прэзыдэнт асацыюецца толькі і выключна з Лукашэнкам. Падобна, што гэта слова стала ўжо ў нашым грамадзтве імем уласным і ўбудоўваецца ў наступную формулу: Лукашэнка – прэзыдэнт, прэзыдэнт – Лукашэнка. У гэтым сьвятле вывешаныя ў гарадох плякаты пра выбары выразна ўпісваюцца ў гэтую формулу «Выбары Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь», падтэкст «перавыбары Аляксандра Лукашэнкі».

«*Паміж прэзыдэнтам і мэсіем*». Аўтарытарныя рэжымы базуюць працэсы, зьвязаныя з кіраваньнем грамадзтвам, на іррацыянальных кампанэнтах: веры, боязі, любові, нянавісьці. У сваіх палітычных закліках аўтарытарныя правадыры зьвяртаюцца да эмоцыяў, а не да розуму, умела прапагандуючы неабходнае бачаньне сьвету. Важна адзначыць, што грамадзкая легітымізацыя, то бок падтрымка грамадзкай думкі ў такіх умовах ужо ня мае значэньня, бо правіцель становіцца

памазаньнікам божым і выразьнікам волі самога Бога, а не народу. Сама ж грамадзкая думка служыць фармальнай абалонкай, яна павінна пераканаць само грамадзтва ў тым, што яно падтрымлівае кіраўніка краіны. Асноўны націск робіцца на ролю і значэньне лідэра ў гістарычным і палітычным разьвіцьці грамадзтва, што ёсьць базісам для ўсталяваньня культу асобы ў дзяржаве. Варта адзначыць, што акрамя СМІ і ідэалягічнай дзяржаўнай машыны сам Лукашэнка, сьвядома ці несьвядома, падкрэсьлівае сваю значнасьць для беларускага народу, а таксама сваю богаабранасьць. Жаданьне наблізіцца да боства сьвядома ці не, але існуе ў ягоных выказваньнях. «*Но нас Господь, наверное, уполномочил сделать это большое дело*» альбо «*Вот говорят, Лукашенко диктатор. Это от чего? Потому что Лукашенко часто «загружает» на себя те проблемы, которыми должны заниматься другие люди*». У іншым месцы: «*Он* (прэзыдэнт. – **П. В.**) *борется с теми невзгодами, несчастьями, которые так или иначе объективно могут обрушиться на нашу страну. Вот, пожалуйста, стихия… Я борюсь против этих стихий, чтобы сохранить наших людей*». Зь лёгікі гэтых выказваньняў можна зрабіць выснову, што грамадзтва нашае бездапаможнае і кволае, і загіне яно, калі ў яго ня будзе абаронцы.

Ён жа, Лукашэнка, асудзіў сябе на мукі дзеля свайго народу, бо яму апроч Беларусі нічога ня трэба. Асабістае жыцьцё, сям'я, простыя чалавечыя слабасьці – гэта не для яго. Ён мэсія і правадыр. І дарма што ён спрабуе адмежавацца ад велічных званьняў, кожны раз Лукашэнка падкрэсьлівае ўласную ахвяру, якая была прынесена на алтар сваёй краіны і народу. «*Бедная была бы та женщина, пусть даже супермодель в мире, которая бы жила с Президентом Беларуси. Потому что у меня кроме страны и этой изнурительной, дикой работы, практически ничего не было. Никакой я не семьянин, потому что положил свою жизнь на это*». Бацька свайго народу. Вось галоўны вобраз, які маляваўся ўсе гэтыя гады для насельніцтва краіны. Хто адкідае гэты вобраз – залічваецца ў шэрагі ерэтыкаў. Вобраз «бацькі» стаў рэлігійна-сьвятарным і перайшоў з плашчыні палітычнай у плашчыню духоўную. Абываталі Беларусі, пазбаўленыя за гады савецкай улады духоўнага вобразу, апроч вобразу правадыра, у асобе Лукашэнкі вярнулі

сабе аб’ект для пакланеньня. Для іх ягоныя словы абсалютныя і стаяць па-за любой крытыкай. Самыя грунтоўныя довады супраць успрымаюцца з агрэсіяй і разглядаюцца як хлусьня. Розум заснуў – прывітаньне невуцтву! СМІ сыстэматычна падтрымліваюць гэты культ. Як адзначыў адзін з афіцыйных жрацоў культу асобы У. Вялічка: «*Президент не ленится появляться на телеэкране, регулярно подзаряжая доверившийся ему электорат. Моя мама, например, не может успокоиться и заснуть, пока не увидит Лукашенко. Так что в наше время президент – это еще и психотерапевт*»[1].

Дазволім, з мэтай больш яскрава паказаць «сілу духу» Беларуская прэзыдэнта, прывесьці сабе цытату з Эвангельля ад Марка 2:1-12. «Зараз жа сабралася шмат, ажно ўжо й ля дзьвярэй не было. 5. месца; і Ён казаў ім слова. І прышлі да Яго, несучы хворага на паралюш, каторага чатырох несьлі. Як Ісус абачыў веру іхную, Ён сказаў паралюшнаму: «Дзіцё, дараваны табе грахі твае». ...І ўстаў, і, ўзяўшы ложак, выйшаў перад усімі…» Параўнаем словы Эвангельля з наступнымі выказваньнямі спадара Лукашэнкі: «*И когда я приезжал в какой-нибудь город, тысячи приходили и слушали Лукашенко. Я помню, как люди наперекор власти шли и слушали Лукашенко. Я помню, когда шло голосование, и мне мои доверенные лица докладывали*, как ветераны войны, годами не поднимавшиеся с постели, как старик цеплялся за спинку кровати и тянулся: «Я говорит, пойду за Лукашенко голосовать, поднимите меня!» (**вылучана аўт.**). Варта, напэўна, правесьці яшчэ адну паралель, што ў сьвятых кнігах слова Бог, Сын Божы і інш. пішуцца зь вялікай літары. Колькі гадоў таму ў беларускім лексыконе зьявілася слова Прэзыдэнт, якое пішацца зь вялікай літары, калі вядзецца пра Лукашэнку.

Як і любая аўтарытарная асоба, дзякуючы канцэнтрацыі ўсіх інфармацыйных рэсурсаў Лукашэнка стварае вобраз ўсёбачнага і ўсёведнага чалавека. Як і Гасподзь Бог, прэзыдэнт мае паўнамоцтвы выяўляць і караць вінаватых. Ён даруе грахі тым, хто раскаяўся, як, напрыклад, Жураўкова, і бязьлітасна карае адступнікаў. Гордыя і вольныя грамадзяне яму непатрэбныя. Грамадзтва павінна баяцца і трымцець. Натуральна, што пры такім чыстым і бязгрэшным вобразе прэзыдэнта любыя памылкі

[1] Беларуская думка. 2002. № 11. С. 5.

і няўдачы звальваюцца на атачэньне, а посьпехі прыпісваюцца выключна яму. Усё, што было створана падчас кіраваньня Лукашэнкі, створана насуперак сілам зла і дзякуючы прэзыдэнту. Прычым бязь лішняй сьціпласьці заяўляецца: я стварыў, я пабудаваў, я зрабіў.

Такім чынам, прэзыдэнт стаў ключавой фігурай у той сыстэме, якая выбудавалася ў Беларусі за апошнія 12 гадоў. Як неаднакроць ён падкрэсьліваў, усе сфэры жыцьцядзейнасьці грамадзтва і дзяржавы функцыянуюць дзякуючы прэзыдэнту, а гэта значыць, што падобная сыстэма загіне і зьнікне пасьля сыходу Лукашэнкі. За некалькі гадоў Беларусь можа апынуцца там, дзе яна была на пачатку 1990-х.

«Народ і дзяржава». У выступах прэзыдэнта краіны шмат выказваньняў, якія характарызуюць цывілізацыйныя аспэкты фармаваньня і разьвіцьця беларускага народу і дзяржавы. Парадаксальнасьць і неадпаведнасьць многіх зь іх сьведчыць ня толькі пра дэзарыентацыю прэзыдэнта ў пытаньнях гісторыі і філязофіі, гэта хутчэй паказьнік таго, што ў цывілізацыйным пляне народ наш не аформіўся як адзіны, самасьвядомы сацыяльны арганізм. Таму і выказваньні Лукашэнкі пра Скарыну, Быкава ўспрымаюцца большасьцю як належныя. Кім жа ўва ўяўленьні Лукашэнкі ёсьць насельніцтва краіны? «*Мы же люди советские, «совковые»*, – кажа прэзыдэнт. Праўду кажа! Узровень палітычнай сьвядомасьці, індывідуальнай свабоды застаецца нязьменным з часоў СССР. Неакрэсьленай і несфармаванай застаецца гістарычная памяць насельніцтва. Усе айчынныя ідэалягічныя тэорыі цьвердзяць, што гісторыя беларускай незалежнасьці пачалася з утварэньня БССР і разьвілася ў складзе СССР. Прычынай жа культурнай спадчынай зьяўляецца расейская мова і расейская культура. Асновай духоўнага разьвіцьця «саўковай» нацыі павінна стаць расейская мова, і Лукашэнка падкрэсьліў, што аніякага дзьвюхмоўя ня будзе. «*Мы все создавали русский язык* (дазволю паставіць пад сумнеў ролю Лукашэнкі ў стварэньні расейскай мовы. – **П. В.**). *Поэтому когда у нас стал вопрос о двуязычии, это никакое не двуязычие. Это наш русский язык*». Спэцыфіка пабудовы і фармаваньня сучаснага беларускага народу і дзяржавы палягае не ў культываваньні нацыянальных ідэі і

гісторыі, а ў вяртаньні савецкіх традыцыяў і формаў разьвіцьця грамадзтва. Старыя мэханізмы савецкага мінулага былі скампіляваныя і ў звыродлівай форме перанесеныя на беларускі апарат дзяржаўнай улады і мэханізмы кіраваньня. Без аніякіх засьцярог можна казаць пра фармаваньне нэататалітарнай палітычнай сыстэмы. Існаваньне такой сыстэмы апраўдваецца Лукашэнкам і падаецца неабходным для правільнага разьвіцьця грамадзтва. Акрамя таго, само грамадзтва гэтага прагне. «*Государство по-прежнему должно держать руку на пульсе жизни общества во всех областях*». Інтарэсам дзяржавы падначалены, найперш, грамадзкія сфэры, такія, як СМІ і спорт. Палітызацыя спорту становіцца вынікам жаданьня беларускай дзяржавы легалізаваць сябе на міжнароднай арэне. «*Это большая политика – спорт, честная политика*».

Важным элемэнтам ува ўсталяваньні жорсткага кантролю дзяржавы за грамадзтвам і апраўданьнем рэпрэсіяў ёсьць змова. Зь іншага боку, дзеяньні ўлады ставяць гвалт вышэй за закон, бо карныя дзеяньні дзеюцца «*во имя народа и для народа». «Недавно Комитет госбезопасности, Служба безопасности разоблачили 72 организации – целую систему в нашей стране*». Таталітарнай дзяржаве патрэбныя ворагі, бяз гэтага яна ня можа існаваць. Бяз ворагаў яна пачынае зьядаць сама сябе. Пакуль існуюць «аб'ектыўныя» ўнутраныя і вонкавыя ворагі – гэта апазыцыя і заходнія «гаспадары». Пра апазыцыю Лукашэнка абвясьціў: «*Они вообще в нашем обществе ничего не представляют, они являются противниками нашего народа и нашего общества*». Такім чынам, зыходзячы з заяваў кіраўніка краіны, у дзяржаве ўзяты курс на ліквідацыю любых формаў палітычнага пратэсту і крытыкі. На зьмену апазыцыі павінны прыйсьці верныя і канструктыўныя арганізацыі, з выразна выбудаванай дзяржаўнай ідэалёгіяй, якія дапамогуць дзяржаве кантраляваць сьвядомасьць грамадзянаў. «*Партии, движения или общественные объединения должны работать на конструктивной основе, в рамках Конституции и Закона и на страну, и на народ*».

Палітызацыя адукацыі, культуры ставіць на мэце масавую, прымусовую мабілізацыю насельніцтва вакол фігуры лідэра.

Па-за агульнай грамадой думка асобнага чалавека нічога ня будзе значыць, а гэта прывядзе да сьціраньня асобы.

«Мы» і «яны». У канктэкст нэататалітарнай сыстэмы і аўтарытарнай псыхалёгіі выразна ўбудоўваецца прынцып сацыяльнага водападзелу «мы» і «яны». Прычым панятак «мы» ў выступах Лукашэнкі набывае форму «МЫ», пра якую пісаў Я. Замяцін. «МЫ» – гэта асаблівы псыхалягічны і сацыяльны стан чалавека і грамадзтва наагул, у якім сьціраецца «Я» і няма месца для «яны», «хто ня з намі, той супраць нас». Можна меркаваць, што ў бальшыні выпадкаў выкарыстаны Лукашэнкам у сваіх выступах займеньнік «МЫ» замяняе «Я». З гэтай прычыны абагульненьне многіх зьяваў і наданьне ім формы «МЫ» часам ускладняе разуменьне таго, пра каго кажа Лукашэнка: пра сябе, пра дзяржаўную ўладу і бюракратычны апарат альбо пра беларускае грамадзтва наагул. Напрыклад, на пытаньне А. Зімоўскага: «*Есть штамп: Кремль – вам поддержку, вы им собственность государственную. Или еще один: вы уже все отдали, потом выясняется, что не так отдали…*» – Лукашэнка адказвае: «*…Мы ничего не отдали, и отдавать не намерены. Я за спиной у вас, у своего народа ничего не делал такого…*». Зь іншага боку, асоба Лукашэнкі тым самым убірае ў сябе ўвесь народ, ён і толькі ён мае права казаць ад імя ўсіх. Ягонае «Я» пазбаўленае асабовасьці, ён больш не належыць сабе, у ім кажа воля народу. ЁН – гэта МЫ, МЫ – гэта ЁН. Крытыкуючы апазыцыю, Лукашэнка кажа: «*Но разве это нормальные люди, разве это нормальная оппозиция? Ну, мы же умные тоже уже люди, мы же не совсем уже «молодые», как это было раньше. Мы же понимаем, чего они хотят. Поэтому мы им «подарков» преподносить не намерены*». З прыведзеных вышэй прыкладаў можна зрабіць выснову, што прэзыдэнт не разьмяжоўвае сябе і ўладу. Думаецца, што мэнтальнае і рэальнае зрастаньне катэгорыі «ўлады» і ўласнага «Я» ўжо адбылося. Выбудавалася формула «Я – гэта ўлада, улада – гэта Я». Таму дзеяньні ўлады – гэта мае дзеяньні і наадварот.

«Мы» – з аднаго боку спрашчэньне рэчаіснасьці, зь іншага – працяг працэсу сацыяльнай ідэнтыфікацыі грамадзтва з прэзыдэнтам. «*Мы сохранили страну. Сегодня мы спокойно видим на прилавках молоко, мясо, масло, жиры и так далее*».

«МЫ» – безаблічная і абстрактная зьява. Няма ні беларусаў, ні супольнасьці грамадзянаў, ні асобы. Ёсьць толькі «МЫ», што жыве аднымі думкамі, меркаваньнямі, якія ня могуць быць адкінутыя. Мы павінны будаваць сваё жыцьцё так, як «МЫ» гэтага жадаем. Выконваючы тое, што кажа прэзыдэнт: «*Жизнь будет идти своим чередом: мы будем сеять хлеб, растить детей, мы будем убирать этот хлеб, кормить своих детей и сами будем нормально жить*». Такая філязофія «МЫ», тыя ж, хто не разумее гэтай філязофіі, безальтэрнатыўна адносяцца да іншых, да тых, каго прэзыдэнт называе «яны».

Панятак «яны» ўбірае ў сябе ўсе нэгатыўныя зьявы сацыяльнага жыцьця, сацыяльнае зло. «ЯНЫ» – гэта апазыцыя, што супрацьстаіць «МЫ» і нармальнаму жыцьцю. Прывядзём толькі некалькі выказваньняў. «*Они что, рассчитывают, что народ белорусский за них проголосует, когда они пакостят этому народу? Ну извините, полные отморозки!.. Вот они и говорят. Если бы они этого не говорили, им бы не дали денег. Поэтому за то, что они говорят, им платят*». Катэгорыя «ЯНЫ» не патрабуе канкрэтызацыі, і так зразумела – гэта чужыя, ворагі, не свае людзі і не істотна, хто яны насамрэч. Тут дзейнічае формула «яны ворагі, таму што яны ворагі», нашто даводзіць адваротнае. А ворагаў трэба зьнішчаць.

Яны – гэта дурні, адмарозкі, здраднікі, хлусы, сацыяльныя адшчапенцы. Тыя, іншыя ёсьць вобразам хаосу і гібелі. Барацьба з апазыцыяй – гэта сьвятая барацьба, гэта барацьба з сусьветным злом. Сама Беларусь зьмешчана ў цэнтар смуроднай клаакі і ўяўляе сабой чысты вобраз. «*Я проехал весь мир, я видел Европу – все сжато, все задымлено, все грязно, люди трутся один о другого, толкают… Тяжело там жить людям. И в центре этого хаоса, здесь, посмотрите, Браславские озера, Витебщина, Брестский регион – душа радуется*».

У цэлым усе выступы Лукашэнкі поўныя дакладных і канкрэтных установак і для грамадзянаў (як і за каго галасаваць) і для прадстаўнікоў улады (як і што рабіць, каб людзі прагасавалі). Адна зь іх была відавочнай і тычылася збору подпісаў. «*Они* (апазыцыя. – **П. В.**) *кричат: Лукашенко мешает собирать подписи. Мы, наоборот, им помогать будем*

собирать эти подписи, чтобы они вышли на президентские выборы». Цікава, навошта і каму ўлады дапамагалі зьбіраць подпісы?

У словах прэзыдэнта выразна прамалёўваецца той сьвет, у якім ён хоча, каб жыла краіна. Іншага выбару для яе ня будзе.

Сучасныя афарызмы прэзыдэнта Лукашэнкі: «*Это колоссальнейшая нагрузка на главу государства», «Слушайте, кому надо такое государство, где человек должен быть каким-то рабом?», «Вы не представляете, что у меня внутри, когда ко мне обращаются и начинают больше одного раза благодарить», «Через Украину, Прибалтику и Польшу идут сотни миллионов денег», «Популяция животных в два раза увеличилась за последние пять лет. Мы их лишних тоже держать не можем. Уничтожат же природу, им же питаться надо*».
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/04/10
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 4 (44) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

выбары 2006

[image]

выбары 2006 • аналітыка • літаратура • гісторыя • эсэістыка

[image] [image] [image]

Віталь Сіліцкі Пачатак рэвалюцыі духу

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ

палітоляг, сталы аўтар «ARCHE».

Усё пазнаецца ў параўнанні. 7 верасня 2004 года, калі Лукашэнка ў жывым эфіры аб’явіў пра чарговы рэферэндум, у натоўпе, што стаяў на Кастрычніцкай плошчы, раздаўся толькі адзін крык супраць. 19 сакавіка 2006 года плошча была перапоўнена людзьмі, а ў паветры панавала шматгалоссе. Палітычнай рэвалюцыі не адбылося. Але пачатак рэвалюцыі духу відавочны.

Гэтаму пачатку папярэднічаў не менш уражвальны шэраг падзей падчас прэзідэнцкай кампаніі, якую большасць назіральнікаў, у тым ліку і аўтар, разглядалі хіба як адміністрацыйную працэдуру пацвярджэння паўнамоцтваў кіраўніка дзяржавы. У рамках гэтай працэдуры апазіцыя, здавалася б, была цалкам асуджана. Ёй трэба было прыкладаць звышвысілкі, каб дамагчыся мінівынікаў, плён ад якіх быў вельмі сумнеўны ў той час, як аўтарытарная ўлада была цалкам здольная ліквідаваць наступствы любых дзеянняў сваіх апанентаў. Аксіёмай нашага мыслення напярэдадні выбараў 19 сакавіка было тое, што рэвалюцыя ў Беларусі пакуль што немагчымая з-за адсутнасці цэлага шэрагу чыннікаў: гатоўнасці большасці грамадства да перамен, мяккасці аўтарытарнай улады, вольных медыяў, і гэтак далей. Удалося хіба што аб’яднаць апазіцыю (нават не ўлічваючы Казуліна – ані

Юшчанка, ані Саакашвілі не былі тэхнічна адзінымі кандыдатамі).

Аднак аналітыкі, напэўна, не ўлічылі трох фактараў. Па-першае – колькасці прыхільнікаў перамен і свабоды, гатовых рабіць, здавалася б, безнадзейную справу, калі не для выніку, то для гонару. Па-другое, нечаканай моцы альтэрнатыўных кандыдатаў – як Мілінкевіча, так і Казуліна. Па-трэцяе, таго, што рэпрэсіўнасць уладаў дасягне такога ўзроўню, што стане, як гэта ні парадаксальна, пэўным мабілізуючым фактарам. Галоўным дасягненнем апазіцыйных сілаў можна лічыць ужо тое, што вынікі падзей сакавіка 2006 года – незалежна ад канчатковай развязкі супрацьстаяння – сталі ўжо здабыткам беларускай гісторыі і аб'ектам увагі ўсяго свету. Болей празаічна – сцэнар чарговай «элегантнай перамогі» аказаўся сарваны.

Дзесяткі тысяч, што выйшлі на Кастрычніцкі пляц (ці, як яго ўжо многія для сабе перайменавалі, пляц Каліноўскага), канечне, ж не рэпрэзентатыўныя для ўсяго беларускага грамадства. Лічба пратэстуючых у самы пік вулічнага супраціву не перавышала колькасці самых значных пратэстаў у сярэдзіне 1990-х гг. Да пералому ў грамадстве ў цэлым на карысць ідэй свабоды і перамен яшчэ далёка. Сацыяльны баланс пакуль на карысць Лукашэнкі, і кампанія яго наўрад ці змяніла. Ды і лічба пратэстуючых па словах кіраўніка штабу Мілінкевіча Сяргея Калякіна ў дзесяць (ну, можа, у пяць. – **В. С.**) раз менш за тую, што была б патрэбная, каб улада лічылася з пратэстам. Але гэтая ж лічба разоў у дзесяць больш за тую, якую прадказвала большасць аналітыкаў перад падзеяй, прычым не толькі песімістаў – асабліва пасля таго, як патэнцыйным удзельнікам пратэсту прыгразілі смяротным пакараннем. У 1996 годзе нас мабілізаваў страх страціць незалежнасць. У 2006 годзе нас яднае прага свабоды і годнасці.

Тое, што гэта магчыма, што менавіта свабода, а не нейкія сацыяльныя пытанні стануць мабілізоўным чыннікам у супрацьстаянні рэжыму Лукашэнкі, таксама многімі ставілася пад сумнеў. Як высветлілася, дарма. Больш за тое, уражвае тая роля, якую адыгралі падчас пратэстаў нацыянальныя сімвалы,

пачуцці, святыні. Выявы бел-чырвона-белага сцяга, Звона і песняў свабоды, партрэта Каліноўскага надалі грамадзянскаму чыну пэўны дух, якога былі цалкам пазбаўлены шматлікія спробы вывесці людзей на вуліцы пад лозунгамі «лепшага жыцця» і г. д. Так, можа, нацыянальная афарбоўка і сама ідэалогія свабоды багата каго і адштурхоўвае, паглыбляе падзел у грамадстве. Аднак прыхільнікам «чыстай» дэмакратыі за дзесяцігоддзе барацьбы з аўтарытарызмам так і не ўдалося стварыць мабілізоўнай альтэрнатывы, што бачылі і цягам Менскай вясны, і падчас пахавання Васіля Быкава, і цяпер.

Дарэчы, менавіта нацыянальная арыентацыя галоўнага апанента Лукашэнкі на гэтых выбарах і вызвала першапачаткова шквал незадавальнення з боку часткі апазіцыйных колаў. Аднак крытыкі і кандыдата, і стратэгіі апазіцыі пэўна не ўлічылі тых задач, якія насамрэч стаялі падчас гэтай кампаніі. Адпачатку было зразумела, што гуляць на выйгрыш было немагчыма і бессэнсоўна. Апазіцыя была адсечаная ад большасці грамадства, спробы весці ардынарную выбарчую кампанію, абапіраючыся на тыя пытанні, што маглі б «прыцягнуць электарат», былі бессэнсоўныя яшчэ і таму, што такія высілкі ў гэтых умовах мелі б мінімальны мабілізоўны эфект: пытанні чаркі, скваркі і стабільнасці прыносілі ў сённяшнім сацыяльна-палітычным кантэксце ачкі толькі Лукашэнку. Апазіцыйныя кандыдаты рабілі ўсё не па правілах, вялі сябе не так, як вядуць палітыкі, што дамагаюцца выйграць выбары. Яны зрабілі акцэнт на негатыўную агітацыю (перш за ўсё Казулін), прапагандавалі нацыянальныя каштоўнасці (нават Казулін!), казалі аб свабодзе, калі большасць, здавалася б, гатовая была прамяняць свабоду на стабільнасць. Трэба ўлічваць, аднак, што скатаць вялікі ком снегу немагчыма без таго, каб першапачаткова не зляпіць невялічкі сняжок. Іншымі словамі, кансалідацыя ядра і пашырэнне базы грунтуюцца на розных, супрацьлеглых логіках. На жаль, у гэтай кампаніі апазіцыя проста мусіла пачынаць многае спачатку. І ў нечым яна была асуджана на самаабмежаванне ў электаральным плане.

Ёрнічаць з нагоды неэфектыўнасці дзеянняў апазіцыі на вуліцах пачынаюць, па звычцы, тыя, хто загадзя схаваўся ў бульбу.

Дзеянні сапраўды не заўжды лагічныя, але інтэрнэт-заградатрадчык Фядута лепш бы памаўчаў са сваіх кіеўскіх кустоў. Зазначым, аднак, што няўдачу беларускага Майдану запраграмавалі не дзеянні апазіцыі, а адсутнасць у гэтым кантэксце рэвалюцыйнай сітуацыі. Рэвалюцыя пачынаецца з супрацьстаяння легітымнасцяў (гэта значыць, калі не проста адмаўляецца легітымнасць сённяшняга лідэра, а адстойваецца легітымнасць прэтэнзій на ўладу лідэра заўтрашняга). Прэтэнзій на ўладу Мілінкевіч (а тут я кажу толькі аб Мілінкевічу – Казулін урэшце пляц пакінуў) не выставіў. На тое, канечне, былі аб'ектыўныя чыннікі – але калі пытанне аб уладзе не паўстала, то і пратэст быццам бы падвісае – ісці наперад некуды, а адступаць гонар не дазваляе. Застаецца пратрымацца як мага далей, каб гэтая годнасць мела шанец на працяг у будучых, больш паспяховых змаганнях...

Наконт улады. Сакавіцкія падзеі засведчылі, што нашыя ўладары сапраўды ўявілі, што з беларускага грамадства можна віць вяроўкі. Нечувана жорсткія прэвентыўныя дзеянні, безумоўна, забяспечылі непахіснасць улады на гэты момант, але відавочная пагарда сваімі суграмадзянамі і правіламі здаровага сэнсу прывяла як мінімум да таго, што самі дзеянні ўлады дапамаглі апазіцыі мабілізавацца. Сапраўды, такой колькасці праколаў і глупстваў, што адбылося гэтым часам, ніколі не было. Пачалося ўсё з таго, што забылі прывесці ўласнае заканадаўства ў адпаведнасць з уласным жа рэферэндумам. Потым цэнзураванне выступаў апазіцыйных кандыдатаў. Затым – «выкрыцці» спадара Сухарэнкі, пра якія лепш за ўсё выказаўся аблаяны мной вышэй Фядута: «*Теперь каждый из ваших подчиненных, глядя на вас, будет не погоны генеральские видеть, а сдерживать смех, дохлую крысу в ведре явственно так себе представляя*». Паверыўшы ўласнай прапагандзе, улада не здолела адчуць прагі да свабоды, хай сабе і сярод часткі грамадства, і абсурднасць яе дзеянняў толькі падштурхнула выбух 19 сакавіка. З іншага боку, аднак, стала таксама відавочным, які ўплыў на далейшае развіццё палітычных падзей будзе мець псіхалагічны стан першай асобы. Часам, асабліва падчас прамовы 2 сакавіка, нават здавалася, што страхі Лукашэнкі перавышаюць той страх, які апанаваў беларускае грамадства ў цэлым. Няма сумневаў, што ён хутка

паспрабуе аднавіць гэты баланс.

А таму – да перамогі яшчэ далёка. Але шлях намечаны. У будучага палітычнага прарыву абазначыўся ідэалагічны і нацыянальны чыннік – засталося, каб ён супаў і зліўся з чыннікам сацыяльным. Нягледзячы ні на што, праглядваюцца і яго інстытуцыянальныя рамкі – відавочна, што нават такія выбары здольныя змабілізаваць грамадства. Не, электаральнай рэвалюцыі ў Беларусі не будзе. Але, калі галасаванне пераўтвараецца з тайнага ў пайменнае, калі яно пераносіцца з выбарчых участкаў на плошчы, тады спадарыня Ярмошына ўжо не дапаможа.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 4 (44) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/04/10
[image]

АЛЕСЬ АНЦІПЕНКА (нар. у 1953 г. у Слаўгарадзе) – філёзаф. У 1975 г. скончыў Менскі дзяржаўны лінгвістычны ўнівэрсытэт, у 1982 г. – асьпірантуру Інстытуту філязофіі і мэйкерам ды права НАН Беларусі. Кандыдат філязофскіх навук.

Алесь Анціпенка Пэрспэктыўны праект «Саюзнай дзяржавы»?

Зьяўленьне гэтага чалавека на беларускай палітычнай сцэне было нечаканым, але надзвычай шумным. Аніяк не заўважаны раней у дзейнасьці палітычнай апазыцыі, незалежнага беларускага грамадзтва ці інтэлектуальнай супольнасьці краіны, гэты былы савецкі і лукашэнкаўскі функцыянэр хутка робіцца «дэмакратычным» палітыкам і адначасова ўвасабленьнем «новай» беларускай апазыцыі, ньюсмэйкерам ды асобай, заангажаванай у беларускую культуру. І вось ужо шмат хто захапляецца энэргічнай асобай спадара А. Казуліна, сьмелага палітыка і рашучага апазыцыянэра.

Шчыра прызнаюся: я таксама ў свой час быў моцна зьдзіўлены адным праектам, – выданьнем збору твораў Васіля Быкава. Здавалася б, навошта прагматычнаму палітыку займацца мэцэнацтвам?! Але справа, відаць, – не ў мэцэнацтве. Моцны ход быў зроблены. І вось ужо вакол новай палітычнай фігуры некалькі беларускіх літаратараў ды ажно два дзейныя літаратурныя генэралы. Разам яны і «легалізавалі» ў беларушчыне новага палітыка. Ператварылі яго ў «знакавую фігуру» апазыцыйнай беларускай культуры. Надалей сытуацыя робіцца яшчэ больш сэнтымэнтальнай – *прэтэндэнт загаварыў на беларускай мове*! Тут ужо і сумневаў аніякіх быць ня можа.

Зьмешчаны ніжэй тэкст быў напісаны 8 сакавіка 2006 году.

Кожны, хто хоць крыху знаёмы зь піяр-тэхналёгіямі, ня мог не адзначыць элемэнтарнасьці ходу – «раскруткі» прэтэндэнта ў шырокім, *пазапалітычным, але выразна апазыцыйным кантэксьце*. Карацей кажучы, клясыка жанру. Надалей жанр вымагае драматызацыі дзеяньня, шумных публічных акцыяў (прыцягненьне ўвагі гледачоў да асобы героя) і пэрыпэтыяў, гэта значыць, сутыкненьняў з канкурэнтнымі палітычнымі дыскурсамі і іх падмены сваім уласным. Апошняе дасягаецца выразнай блізінёй да пазыцыяў галоўных канкурэнтаў за прэзыдэнцкую пасаду. А таму на сёньня сп. Казулін – гэта ўжо як бы А. Мілінкевіч і А. Лукашэнка, разам узятыя. Гэта і ёсьць «эфэкт Казуліна», паводле ўдалага выразу аднаго ананімнага аналітыка, які разьмясьціў свае развагі з нагоды прэзыдэнцкай кампаніі на сайце www.belintellectuals.com. Пасьпяховасьць праекту, між іншым, дае падставы гаварыць пра тое, што палітык А. Казулін – «усур'ёз і надоўга».

Застаецца зразумець бадай што адно, чый гэта праект і навошта ён патрэбны? Перадусім відавочна, што праект зьяўляецца прадуктам дзейнасьці прафэсійных піяр-тэхнолягаў. Такіх, прынамсі, у А. Мілінкевіча няма. Да таго ж, ажыцьцяўленьне такога «сьмелага» праекту вымагае і пэўных палітычных гарантыяў бясьпекі галоўнаму герою. А гарантам у нашай краіне зьяўляецца, як вядома, толькі адзін чалавек. І тут мы падыходзім да вельмі хісткага моманту ў выкладенай гіпотэзе.

Найлепш гэты момант выявіў маскоўскі журналіст П. Шарамет: «*Разговоры о том, что Козулин – это проект Лукашенко, ведут только клинические идиоты*» («Александр Козулин – новая жертва или новый лидер?», www.belaruspartizan.org). Аргумэнт, безумоўна, моцны. Хто ж гэта захоча выглядаць «клінічным ідыётам»? Але адзначым, што ён не зьяўляецца аргумэнтам рацыянальным. А любая іррацыянальная аргумэнтацыя заўсёды хавае нейкую неагучаную пазыцыю.

Пазыцыю гэтую калі не агучылі, дык пазначылі ў Маскве дзьве вядомыя асобы: сп. Караганаў ды сп. Паўлаў, спэцыялісты ў беларускай сытуацыі з гэбэшным мінулым. Яны паабяцалі давесьці да ведама сп. Пуціна факт зьбіцьця кандыдата на

прэзыдэнта А. Казуліна.

«Ну, і што?» – запытаецца паспаліты чытач. І адкажа: «Пуцін жа падтрымлівае А. Лукашэнку». Правільна. Але навошта тады даводзіць да ведама сп. Пуціна?! Гэта мажліва, калі Аляксандар Рыгоравіч у чарговы раз парушыў нейкія папярэднія дамоўленасьці пра недатыкальнасьць аднаго з кандыдатаў і зноў перакрочыў мяжу. Праект, гэткім чынам, трэба папросту вярнуць у раней вызначанае рэчышча.

Ці не выглядае тады сытуацыя такім чынам, што Масква мела два выбарчыя праекты ў Беларусі? Цалкам верагодна. У белакаменнай ня могуць не разумець, што час сп. Лукашэнкі сыходзіць. Далейшай ягонай падтрымкай яна сур'ёзна рызыкуе папсаваць свой міжнародны імідж. Неабходны новы і пэрспэктыўны лідэр для Беларусі. Зразумела, што не цяпер, але надалей можа і спатрэбіцца. А. Мілінкевіч на гэтую ролю яўна не падыходзіць. Не падыходзіць, відавочна, і С. Гайдукевіч.

Караля, як вядома, робіць сьвіта. У сьвіце сп. Казуліна не стае покуль некалькіх функцыянальна значных асобаў са «старой» апазыцыі. Ці зьявяцца яны ў найбліжэйшай пэрспэктыве, невядома. Але некаторыя ўжо ёсьць. У выпадку неабходнасьці, папоўніць каманду будзе нескладана: у Беларусі ніколі не было дэфіцыту ў маргінальных палітыках. Але дагэтуль трэба вырашыць галоўную на сёньня задачу: нэўтралізаваць і выціснуць з палітычнага поля *рэальную* палітычную апазыцыю, якую рэпрэзэнтуе А. Мілінкевіч. Найлепшы спосаб яе выціснуць – замяніць «новай». У выкананьні гэтай задачы супадаюць, хаця і паводле зусім розных матывацыйных падставаў, інтарэсы трох бакоў: дзейнай улады, часткі «старой» беларускай апазыцыі і стратэгічных плянавікоў зь белакаменнай.

Калі ж пасьля гэтых прэзыдэнцкіх выбараў пазначаную вышэй задачу ўдасца вырашыць, дык «праект Казуліна» набудзе новую якасьць. Ён можа ператварыцца ў пэрспэктыўны праект «Саюзнай дзяржавы».
[image]
[image]

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/04/12**
[image]

ПЁТРА РУДКОЎСКІ

Пётра Рудкоўскі Паўстаньне на Кастрычніцкай плошчы

сталы аўтар «ARCHE». У апошнім нумары нашага часопісу выйшаў яго аналіз «Як Пазьняк стаў закладнікам гісторыі».

«Хтосьці старанна задушвае надзею, а яна, гадаўка, усё ж жыве», – прачытаў у інтэрнэтным дыярыюшы адной спадарыні, якая гэткім чынам спрабавала скамэнтаваць падзеі сёлетняга беларускага сакавіка. «В эти дни я узнала, что значит Переступать страх, что значит Любить и что значит Ненавидеть. И как это бывает, когда рушится вся жизнь. Кое-что из того, что я узнала и почувствовала, я никогда, НИКОГДА не смогу забыть. А кое-что не смогу простить», – чытаю ў дзёньніку іншай спадарыні с., непасрэднай удзельніцы «кастрычніцкай» рэвалюцыі. «Эххх... Россия!!! Теперь ты наш враг, однозначно. И теперь я понимаю, почему отвернулась от неё и Украина, и Грузия», – піша ў сваім лісьце на belintellectuals.com Ларыса Ягорава. «Хочется спросить россиян: неужели вам нужен такой союзник, как Лукашенко? (...) Тем россиянам, которые стояли в оцепенении плечом к плечу с белорусами, такой союзник не нужен», – піша с.

Ламаецца пяро аналітыка, які спрабуе даць «рацыянальнае тлумачэньне» адбытаму, недарэчна выглядае сацыёляг, які намагаецца выпрадукаваць чарговую паняцьцевую схему, якая б дала «адэкватнае» апісаньне апошніх падзеяў, сьмешным

падаецца інтэлектуал, які імкнецца адзець маску «незаангажаванага» і са стаіцкім спакоем разважае пра новы «беларускі фэномэн». Праўда схавалася ад вока аналітыкаў і філёзафаў, яна тоіцца глыбока ў сэрцах соцень тысячаў беларусаў і беларусак, не сьпяшаючыся адкрыцца «мудрым гэтага сьвету». А калі ўжо і адкрываецца (ды і то заўсёды толькі нясьмела і часткова), дык хутчэй не ў разважаньнях навукоўцаў, а ў дзёньніках-споведзях, у асьцярожных (бо падслухоўваюць!) тэлефонных званках да блізкіх, у енках і ўздыхах...

Тое, што дзеялася і дзеецца ў Беларусі, мае нейкі мэтафізычны посмак. Мэтады пацыфікацыі мірных дэманстрантаў у нечым нагадвалі паказваныя ў ваенных фільмах мэтады нямецка-фашыстоўскіх акупантаў. Памятаю, як будучы дзіцем, сьцепануўся ад жаху, калі пабачыў у фільме «Ідзі і глядзі», як гітлеравец схапіў за валасы дзяўчыну і кудысьці пацягнуў. Здавалася тады, што такое можа быць толькі ў фільмах. А ўсё ж не, такое можа быць рэальна ў XXI стагодзьдзі, у цэнтры Эўропы, у «талерантнай» Беларусі.

Хто яны, гэтыя мускулістыя гаміноіды, здольныя назваць беларускую жанчыну «сукай», бяспамятна катаваць падлеткаў і з садыстычнай асалодай таптаць сьвятыя беларускія сымбалі і хрысьціянскія іконы? Яны не беларусы і не расейцы. Яны ня маюць нацыянальнасьці, ня маюць айчыны, ня маюць уласнай гісторыі. Магчыма, ня маюць нават імя, калі пад «імем» разумець здольнасьць атаесамляць сябе з чалавечым родам. Гэта – племя *X*, якое так і ня здолела разьвіць у сабе «вышэйшых функцыяў», уласьцівых нармальным прадстаўнікам *homo sapiens*: здольнасьць спачуваць і любіць, абараняць слабейшых, адчуваць сваю ўласную годнасьць. Гэта – прымітыўнае, барбарскае племя, рэлікт каменнай эпохі, які ўтварае сталую пагрозу для чалавечай свабоды і духоўнага поступу. Надыдзе час, і яны напоўніцу адкажуць за кожную кроплю крыві, пралітую на вуліцах Менску, за таптаньне бел-чырвона-белага сьцяга і за абразу беларускай жанчыны. Фашыстоўская Нямеччына таксама ў свой час здавалася моцнай і непарушнай. Адзінае, пра што трэба добра памятаць *цяпер*, што яны, згаданыя гаміноіды, кормяцца нашым страхам і

роспаччу. Трэба адабраць ад іх гэту «пажыву». Іхная сіла слабее па меры ўзросту нашай веры і салідарнасьці.

Вось чаму мяне так уразілі цытаваныя словы: *хтосьці старанна задушвае надзею, а яна, гадаўка, усё жыве*. Відавочна, так яно і ёсьць: мінуў час, калі трэба было задушваць роспач. Цяпер *надзея* явіцца як сіла, мацнейшая ад рэаліяў. Мабыць, усім ці, прынамсі, большасьці дэманстрантаў была вядомая «наканаванасьць» гэтых акцыяў. Тым ня менш, *надзея*, зусім «нерэалістычная» надзея павыцягвала людзей у такой вялікай колькасьці на вуліцы Менску, Віцебску, Горадні. Кажу «вялікая колькасьць», хоць некаторым гэта можа падацца дзіўным і недарэчным. Як беларускія, так і замежныя аналітыкі застаюцца пад уплывам эстэтыкі ўкраінскага Майдану, якая не дазваляе ім заўважыць сутнасную розьніцу паміж беларускім «джынсам» і ўкраінскім «памаранчам». Выхад на Майдан ува Ўкраіне быў выразам *грамадзянскай непаслухмянасьці*, а выхад на Плошчу ў Беларусі – праявай *гераізму*. Так, рызыка была і ў першым выпадку, але былі таксама фактары, якія значна лагодзілі гэтую рызыку: наяўнасьць дастаткова «рэальнага» парлямэнту, самакіраваньне, адносная незалежнасьць судоў, немалая аўтаномія бізнэсовага сэктару, элемэнты свабоды слова. Беларусы выйшлі на Плошчу без *аніякіх* такога тыпу падстраховак, ня мелі нават косаў і нажоў, якія былі ў паўстанцаў Кастуся Каліноўскага. Таму словы спадара Казуліна, што дэманстранты – гэта героі нашага часу, зусім не перабольшаньне ці праява пустога патасу. Гэта праўдзівыя словы.

Сакавіцкія падзеі наводзяць і на іншыя рэфлексіі. Неяк падчас аднаго з круглых сталоў у рэдакцыі «ARCHE» ўдзельнікі дыскусіі разважалі, да якой эпохі можна было б аднесьці беларускі рэжым. Большасьць, бадай, пагаджалася, што палітыка Лукашэнкі па сваім духу адлюстроўвае савецкія сямідзясятыя, гэта значыць, беларускі прэзыдэнт рэалізуе брэжнеўскую мадэль кіраваньня. Разыходжаньні былі толькі наконт таго, ці гэта «сярэдняя», ці ўсё ж «позьняя» брэжнеўшчына. Ня думаю, што такая дыягностыка цалкам добра пасуе да беларускай сытуацыі. Тут патрэбен больш «плястычны» падыход.

Так, беларуская сытуацыя мае ў сабе элемэнты «брэжнеўшчыны». Магчыма, кандэнсацыя гэтых элемэнтаў найбольшая, але апрача іх трэба заўважыць няўнасьць іншых элемэнтаў, якія, можа, ня так раптам кідаюцца ў вочы, але маюць велізарную вагу. Палітыка Лукашэнкі, «брэжнеўская» па сваёй сутнасьці, так і ня здолела паралізаваць фармаваньне вялікай дэмакратычнай кааліцыі. «Вялікасьць» тут вымяраецца ня колькасьцю аб'яднаных сілаў ці колькасьцю заангажаваных у гэта індывідуўмаў (хоць кааліцыя таксама і ў колькасным пляне паказальная), колькі ідэйным і палітычным патэнцыялам. Беларусь мае дэмакратычную і прагрэсіўную лявіцу, рэпрэзэнтаваную ПКБ с. Калякіна, мае таксама здольную да дыялёгу правіцу (БНФ В. Вячоркі), добра ўфармаваную лібэральную опцыю (АГП Лябедзькі), а таксама шэраг палітычных сілаў, якія дапаўняюць спэктар ідэйна-палітычных опцыяў, наяўных у грамадзтве. Ува ўсім гэтым асабліва важным ёсьць факт узаемапаразуменьня і выпрацоўкі супольнай стратэгіі дзеяньня такімі рознымі палітычнымі сіламі. *Мы сталіся сьведкамі зьяўленьня мэтапалітычнай аксіялёгіі*, набору мэтаў і каштоўнасьцяў, якія аднолькава «прачытваюцца» рознымі партыямі і прадстаўнікамі розных ідэалёгіяў. Працэс паўставаньня плюралістычнай, унутрана адкрытай грамадзянскай супольнасьці ідзе наперад.

Поступ гэтага працэсу ня варта, канечне ж, адназначна зьвязваць са згаданай кааліцыяй. Было б фатальнай памылкай лічыць, што па-за кааліцыяй – адны толькі нядобразычліўцы. Сутнасьць дэмакратычнага ўтварэньня ў тым і палягае, што яно імкнецца «ўнутраную» этыку стасаваць таксама навонкі: гэтаксама як шануе *іншасьць* унутры сябе, так імкнецца шанаваць *іншасьць* навонкі. Дэмакратычнаму ўтварэньню ўласьціва адмова ад манапалізацыі вызнаваных ідэяў ці праграмы дзеяньня. Таму я згадваю пра фэномэн кааліцыі, каб даказаць наяўнасьць у беларусаў патэнцыялу быць плюралістычным і адкрытым грамадзтвам, але не раблю з гэтага выснову, што яна, гэта кааліцыя, ёсьць *адзінай* прасторай ажыцьцяўленьня дэмакратычных ідэалаў. Ёсьць многа топасаў дэмакратызацыі ў Беларусі, і гэта добра.

Гэтыя – пададзеныя тут коратка і павярхоўна – назіраньні

даюць падставу заявіць пра тое, што цяперашняя Беларусь – гэта *«брэжнеўшчына», якая вымушана ўвесь час мэханічна стрымліваць «гарбачоўшчыну»*. Альбо інакш: этап, калі ізаляцыя дэмакратычных сілаў ад кіроўных элітаў і народных масаў *пакуль што* спрацоўвае, але невядома, як надоўга. Няма сумневу, што няспынна нарастае патрэба як сярод кіроўнай эліты, так і сярод масаў у зьяўленьні магчымасьцяў мець *сваіх* рэпрэзэнтантаў ува ўладзе і мець сродкі ўзьдзеяньня на іх (свабодныя мас-мэдыі). Пакуль што гэтыя патрэбы не заўсёды бываюць артыкуляваныя альбо артыкулююцца ў «глухім» асяродзьдзі.

У Беларусі маем дачыненьне са «скрыўленай прасторай», гэта значыць, няма магчымасьцяў простай камунікацыі паміж палітыкамі і народам. Перш, чым мэсыдж вестуна дэмакратыі натрапіць на «жывое» ў душы паасобнага адрасата, ён, гэты мэсыдж, мусіць прайсьці скрозь альбо абмінуць магму прапагандысцкай ды ідэалягічнай індактрынацыі, якой «заляпаны» мазгі шараговага беларуса. Кажучы словамі Сакрата: «Калі яны столькі гадоў хлусьліва нагаворвалі на мяне, дык ня ведаю, ці здолею за такі кароткі прамежак часу дастаць з вашых вушэй усю гэтую хлусьню». Але выбарчыя кампаніі Мілінкевіча і Казуліна, якія мусілі весьціся ў вельмі неспрыяльных вірунках, паказалі немалую здольнасьць «прачытваньня» шараговымі беларусамі ідэалаў новай, свабоднай Беларусі. Ідэалёгія, прапаганда, паралізаваньне дыялёгу ўнутры грамадзтва – дагэтулешнія сродкі ізаляцыі дэмакратычных сілаў – ня так добра і не паўсюдна спрацоўваюць, і гэта рэжым добра разумее. Таму стаўка пачынае рабіцца на крайні і небясьпечны мэтад – фізычны гвалт над акторамі новага тэатру і аўтарамі сцэнара новай п'есы, інсьпіраванымі ідэямі *свабоды, праўды* і *справядлівасьці*.

Ясна, што Лукашэнка не ператворыцца *sua sponte* з Брэжнева ў Гарбачова. Аднак ня выключана, што гарбачоўская эпоха папросту «наедзе» на брэжнеўскую, гэта значыць, кансэнсус паміж дэмакратычнымі сіламі з аднаго боку і кіроўнымі элітамі ды шараговымі абываталямі з другога будзе ўзрастаць. Цяпер ён мае прыхавана-кансьпірацыйны характар, але ў будучыні можа стацца больш адкрытым і сьмелым. Ці гарбачоўская эпоха

«наедзе» і наколькі эфэктыўна наедзе, залежыць у значнай ступені ад «пэрцэпцыйных здольнасьцяў» дэмакратычных палітыкаў. Маецца тут на ўвазе здольнасьць распазнаваць блізкіх па духу асобаў як сярод дзяржаўных службоўцаў, так і сярод звыклага насельніцтва, а таксама здольнасьць выйсьці да іх з чытэльнымі, зразумелымі для іх прапановамі. Даволі трапна гэты стратэгічны момант назваў Янаў Палескі: *фармуляваць свае прапановы ў найменей абстрактнай форме*, зьвярнуць увагу на *лякальныя сфэры парушэньня правоў чалавека* («Бремя исторического творчества», belintellectuals.com).

Што станецца ў выпадку «наезду» гарбачоўшчыны? Ці брэжнеўшчына распусьціцца ў гарбачоўскай эпосе, ці, наадварот, яшчэ больш закасьцянее і пачне рыхтаваць мацнейшыя, крапчэйшыя ланцугі? Інакш кажучы, ці магчымы «франкаўскі варыянт» (лібэралізацыя і паступовы пераход да дэмакратыі), ці, хутчэй, узмоцнены рэакцыянізм? Апошні варыянт больш, бадай, лягічны для беларускага рэжыму, але наўрад ці больш пэрспэктыўны. Мэтад страху – гэта марны і зманлівы мэтад. Страх спараджае стан безупыннага напружаньня, маральнага дыскамфорту і пэрманэнтнага прыніжэньня. Многія, праўда, да гэтага прывыкаюць, але для большасьці асабістая годнасьць і самаатесамленьне як вольнай істоты застаюцца важнейшымі.

Трэба пры гэтым зьвярнуць увагу на яшчэ адну рэч: рэжым, які зрабіў стаўку на *таталізацыю* (калянізацыю ўсіх сфэраў грамадзтва), выставіў сябе на сур'ёзную небясьпеку. Справа ў тым, што таталізацыя абазначае таксама «паглынаньне» элемэнтаў, зусім не спрыяльных для рэпрадукцыі самога рэжыму. Унутры рэжымнага арганізму можа зьявіцца сьціжма «запальных пунктаў», ад якіх сам арганізм можа ня сёньня дык заўтра сканаць. Аналягічна, як савецкая таталітарная машына (надзвычай моцная і з дасканалымі «фільтрамі») усё ж такі «праглынула» Гарбачова і пару сьмелых рэфарматараў, што спарадзіла вядомыя наступствы, так можа стацца і зь беларускім рэжымам. На небясьпеку таталізацыі ўскосна ўказаў і сам Лукашэнка, аднойчы заяўляючы: «Вось зьявіцца ўва ўладных структурах такі апазыцыянэр, а вакол яго столькі

гнілізны нарасьце».

Будучыня Беларусі застаецца адкрытай. Шмат невядомага хаваецца ў душах сёньняшніх беларусаў, ня ведаем, якая будзе расстаноўка сілаў у Расеі праз пару гадоў, і невядома, наколькі пасьпяхова будзе рэалізаваць сваю місію беларуская дэмакратычная эліта. Аднак паўстаньне, сьведкамі (альбо і ўдзельнікамі) якога мы былі сёлета, паказвае, наколькі моцная яна, сіла беларускай волі. Народнае перайменаваньне Кастрычніцкай плошчы на Плошчу Каліноўскага сымбалізуе перамогу беларускага вызвольнага паўстаньня над бальшавіцкай кастрычніцкай рэвалюцыяй, антычалавечай і рэакцыйнай па сваёй сутнасьці.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 4 (44) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/04/12**
[image]

[image]

A R C H E П а ч а т а к № 4 (44) - 2006

[image]

[image]

[image]

[image]2006
выбары 2006" • аналітыка • літаратура • гісторыя • эсэістыка

[image] [image] [image]

Андрэй Катлярчук Нацыянальнае канструяваньне Міцкевіча або What Tomas Venclova did not say in Harvard

АНДРЭЙ КАТЛЯРЧУК
гісторык, супрацоўнік унівэрсытэцкага коледжу Sцdertцrn у Стакгольме. Неўзабаве ў выдавецтве гэтага ўнівэрсытэту мае выйсьці яго кніга «In the Shadows of Poland and Russia. The Grand Duchy of Lithuania and Sweden in the European Crisis of the mid-17th Century».

У красавіку 1998 г. амэрыканскі прафэсар літоўскага паходжаньня Томас Вэнцлава выступіў ува ўнівэрсытэце Гарварду зь лекцыяй «Зноў пра родную дзяржаву: Міцкевічава Літва і Міцкевіч у Літве». Вэнцлава закрануў вельмі важнае пытаньне, а менавіта рэцэпцыю творчасьці Адама Міцкевіча літоўскім нацыянальна-культурным рухам XIX – пачатку XX ст., паказаў практычна невядомы на Захадзе працэс яе прысваеньня гэтым рухам, ролю перакладаў твораў Міцкевіча на літоўскую мову. Лекцыя Вэнцлавы даступная сёньня ў беларускім перакладзе[1].

Чаму паўстала патрэба зьвярнуцца да яе зьместу зноў?

Прычына – ацэнка Вэнцлавам беларускай рэцэпцыі Міцкевіча. Калі частка «Міцкевіч у Літве» не выклікае пытаньняў, то «Літва Міцкевіча» зьдзіўляе сваёй тэндэнцыйнасьцю. У лекцыі Вэнцлавы беларусы ствараюць адно этнаграфічны фон творчасьці Міцкевіча ды паўстаюць пасіўнымі статыстамі

ягонай спадчыны. Каб ня быць галаслоўным, дамо некалькі прыкладаў. Па-першае, зьвесткі пра пераклады Міцкевіча на беларускую мову ў Літве і Беларусі XIX ст. у Вэнцлавы адсутнічаюць. Па-другое, няма спасылак на вядомыя тэксты пра стаўленьне да паэзіі Міцкевіча беларускамоўных пісьменьнікаў. Сучаснае паняцьце «Беларусь» пераносіцца Вэнцлавам на XIX ст. Ён піша, што Міцкевіч у «Фрагментах 1 Вэнцлавам, Томам. Вялікая літоўская дзяржава // Фрагменты. 2011. № 1–2 (10). С. 3. 2 Там жа. С. 4. 3 Там жа. С. 5.

Вэнцлава, Том. Вялікая літоўская дзяржава // Фрагменты. 2011. № 1–2 (10). С. 3.

Там жа. С. 4.

Там жа. С. 5.

заўважыў, што «Беларусь і Літва адзіную» адзіны раз скарыстаўся гэтым паняцьцем як культурна-гістарычным. Гэта няпраўда, дастаткова пагартаць лекцыі Міцкевіча, чытаныя ім у Калеж-дэ-Франс. Як вядома, у XIX ст. тэрмін «Беларусь» абазначаў толькі ўсходнія абшары сучаснай краіны (Полацак, Магілёў, Ворша), землі былога Беларускага япіскапства зь пераважна праваслаўным сялянствам. У той самы час беларусы насялялі ўсе апроч Жмудзі культурна-геаграфічныя правінцыі ВКЛ, гэта значыць Літву, Палесьсе, Падляшша і ўласна Беларусь. Зьвесткі пра «Беларусь», як пра Палесьсе ці Валынь, вельмі рэдкія ў Міцкевіча, бо паэт паходзіў зь Літвы і пісаў пра Літву. Да таго ж вядома яго нэгатыўнае стаўленьне да шэрагу ягоных знаёмых «беларускіх» шляхціцаў, бо пераважна праваслаўная Беларусь, якая сталася часткай Расеі ў 1772 г., была адзінай у часы Міцкевіча вобласьцю расейскамоўнай адукацыі ў Літве.

Вэнцлава слушна піша, што Літва ў сэнсе былога ВКЛ для Міцкевіча складалася зь дзьвюх моўных частак: літоўскай і беларускай. Ён таксама прызнаецца, што паняцьце «літоўскі» ў Міцкевіча часта мела на ўвазе «носьбітаў славянскіх дыялектаў». Але стаўленьне да беларусаў у дасьледчыка адбываецца паводле формулы «зьверху ўніз»: літоўская гаворка ўжо ў XIX ст. паўстае як разьвітая «мова», у той час як беларуская мова XIX ст. атаесамляецца выключна зь неразьвітымі славянскімі гаворкамі. Вэнцлава – магчыма, несьвядома – ненавукова разважае, кажучы пра «літоўскую мову ў XIX ст.» і проціпастаўляючы яе «ўсходнеславянскім (русінскім) дыялектам… якія пазьней разьвіліся ў беларускую мову, што захавалася галоўным чынам сярод сялянаў». Між тым, у XIX ст. не існавала розьніцы паміж літаратурным статусам літоўскіх і беларускіх гаворак. Абедзьве мясцовыя літаратуры жывіліся выключна дзейнасьцю асобных энтузіястаў. Кніжкі друкаваліся ў аўтарскіх вэрсіях, на аснове

розных дыялектаў і рознай графікі. Пры гэтым беларуская творчасьць выглядала нават больш стандартызаванай у параўнаньні зь літоўскай з прычыны вялікай лексычнай розьніцы паміж літоўскімі і жамойцкімі гаворкамі.

Культурны канфлікт, што паўстаў у XIX – пачатку XX ст. на землях гістарычнай Літвы, разглядаецца Вэнцлавам у рэчышчы «сацыяльнага канфлікту паміж літоўскамоўнымі сялянамі і польскай (палянізаванай) шляхтай краю, што быў канфліктам дзьвюх розных нацыяў, кожная зь якіх мела ўласнае мінулае і ўласную будучыню». Вэнцлава паказвае, як паралельна з канфліктам ішло творчае пераасэнсаваньне Міцкевіча на літоўскай глебе. Увесь зьмест лекцыі будуецца на барацьбе і сынтэзе «дзьвюх» канцэпцыяў ліцьвінства: польскамоўнага, зьвязанага культурна з ВКЛ, і этнічна літоўскага. Трэцяга чыньніка, гэта значыць ліцьвінаў-беларусаў, у дыскурсе Вэнцлавы няма. Выглядае, што беларусы былі толькі дэмаграфічна-культурным фонам для творчасьці Міцкевіча, ды, у адрозьненьне ад літоўцаў, заставаліся па-за межамі інтэлектуальнага руху Літвы. Лягічная і галоўная выснова лекцыі: «Паэт, які выйшаў з шматэтнічнага і шматкультурнага Вялікага Княства і адлюстроўваў яго цэльнасьць і адзінства, сёньня можа стацца сымбалем міжэтнічнай згоды ды сяброўства паміж дзьвюма незалежнымі сучаснымі дзяржавамі [Польшчай і Літвой]». Беларусі ў праве на спадчыну паэта адмоўлена. Заўважым, што акурат лекцыі такога аўтарытэтнага кшталту ствараюць вобраз беларускай культуры на Захадзе.

Як здарылася, што Вэнцлава, вядомы, між іншым, сваім прыхільным стаўленьнем да беларушчыны, праігнараваў у выкладзе беларускі аспэкт «Міцкевічыяны»? Цяжка ўявіць, што прафэсар славістыкі ня ведаў пра існаваньне беларускіх перакладаў і водгукаў на творчасьць «літоўскага генія», што паходзяць з XIX – пачатку XX ст. Праўда, найбольш грунтоўныя зборнікі, што падсумоўваюць досьледы жыцьця і творчасьці Міцкевіча ў Беларусі, выйшлі ў 1997–1998 гг., і Вэнцлава мог не пасьпець іх заўважыць[2]. Але існуе процьма ранейшых беларускіх і замежных публікацыяў на гэты конт, а самі тэксты даступныя нават у школьных хрэстаматыях[3].

На маю думку, гэтая крыўдная для беларусаў ацэнка будуецца на двух літоўскіх мітах. Першы – гэта міт ВКЛ як этнічна літоўскай дзяржавы, дзе беларусы былі толькі дэмаграфічным балястам, а беларускай шляхты (эліты) не існавала ў прыродзе. Тут думкі амэрыканскага вучонага дзіўным чынам беларусы ацэнкай беларускага прэзыдэнта. Як і Вэнцлава, Лукашэнка шчыра перакананы, што беларусаў прыгняталі ў ВКЛ. Па-другое, гэта сучасны літоўскі міт беларусаў як «ізгоіў гісторыі». Як кажа сам Вэнцлава, за саветамі літоўцаў зьдзіўлялі ў БССР дзьве рэчы:

— большая колькасьць дэфіцытных тавараў, па якія яны стала прыяжджалі ў Заходнюю Беларусь;

— татальная русіфікацыя гарадзкога насельніцтва ды занядбаныя касьцёлы і цэрквы.

Тым часам як літоўцы змагаліся за родную мову, шанавалі свае гістарычныя і рэлігійныя традыцыі, беларусы прадаліся за «кілбасы», кажучы словамі Ларысы Геніюш. Дзяржава Лукашэнкі ўмацоўвае такую пазыцыю, дзеля чаго краіна Беларусь апынулася сёньня па-за межамі эўрапейскай супольнасьці.

Тым ня менш, хоць у XIX ст. беларускі рух меў элітарны характар, але ён такі існаваў.

Паспрабуем дапоўніць тэкст Вэнцлавы.

Яшчэ пры жыцьці Адама першы пераклад (паэму «Конрад Валенрод») зь Міцкевіча зрабіў Арцём Вярыга-Дарэўскі. Паўстанец 1863 г., ён быў ліцьвінам, але ліцьвінам беларускамоўным – нашчадкам русінскай шляхты ВКЛ. Ён шчыра надтрымліваў першыя крокі беларускага руху, быў сярод ладнікаў на беларускае выданьне 1859 г. «Пана Тадэвуша» ў перакладзе Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Свае творы Вярыга-Дарэўскі — у адрозьненьне ад большасьці тагачасных пісьменьнікаў краю – пісаў не на польскай, а на «беспэрспэктыўнай», як здавалася, беларускай мове – штодзённай мове дробнай шляхты Беларусі і большай часткі Літвы. Гэтую родную для яго мову па старой звычцы Вярыга-

[2] Гуд Адама Міцкевіча. Адам Міцкевіч і Беларусь. Зборнік Д[4]. Па-Мінск, 1997; Адам Міцкевіч і нацыянальныя культуры. Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1998.

[3] Stankiewicz, Stanisław. Pierwiastki białoruskie w polskiej poezji romantycznej. – Wilno, 1936; Брага, Сымон [Вітаўт Тумаш]. Міцкевіч і беларуская плынь польскай літаратуры. – Нью-Ёрк, 1957; Лойка, Алег. Адам Міцкевіч і беларуская літаратура. – Мінск, 1959;

Skibinka-Charyło, Zofia. O przekładach «Pana Tadeusza» na język białoruski // Studia Polono-Slavica-Orientalia. R. II. 1975. S. 181–198;

Janowicz, Sokrat. «Pan Tadeusz» w celi więziennej // Kultura. 1977. № 12. S. 5; Александровіч, Спяпан. Пан Тадэвушча Беларусі // Беларуская літаратура XIX – пачатку XX ст. Мінск, 1978. С. 80–81;

Taylor, Nina. The Folklore Origins of Mickiewicz's Dziady: Olimpia Swianiewiczowa's interpretation // Oxford Slavonic Papers. Vol. XXIII. 1990. P. 39–60;

Дарэўскі Францішак // Міцкевіч А. Выбраныя творы. Вершы. Паэмы. Санеты. Драма. Проза. Крымскія сонеты. Вершы. Пераклады. Артыкулы. Успаміны. Ліст. — Мінск, 1992. — С. 5–6.

Дарэўскі Францішак // Міцкевіч А. Выбраныя творы. Вершы. Паэмы. Санеты. Драма. Проза. Крымскія сонеты. Вершы. Пераклады. Артыкулы. Успаміны. Ліст. — Мінск, 1992. — С. 5–6.

4 Гэты сказ вызначае Дарэўскага як чалавека, які ведаў сучасныя яму літаратурныя плыні і імкнуўся ісці ў нагу з часам.

4 Гэты сказ вызначае Дарэўскага як чалавека, які ведаў сучасныя яму літаратурныя плыні і імкнуўся ісці ў нагу з часам.

Матэрыял з Энцыклапедыі Гісторыі Беларусі. Дарэўскі Францішак (Вярыга-Дарэўскі Францішак Казімір) (1858 — 24.11.1918) — беларускі пісьменнік, публіцыст, грамадскі дзеяч. Нарадзіўся ў Гарадзенскім павеце ў сям'і збяднелага шляхціца. Вучыўся ў Гарадзенскай гімназіі, у 1878 скончыў Пецярбургскі ўніверсітэт. Працаваў настаўнікам у Гарадзенскай гімназіі, з 1905 — інспектар народных вучылішчаў Гарадзенскай губерні. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 — старшыня Гарадзенскага губернскага камітэта РСДРП(б). Пісаў на польскай і рускай мовах. Аўтар аповесці «Мікіта Кірэенка і яго сябры» (1882), нарысаў «Вялікія і малыя» (1883), «Сцэны з жыцця» (1884), «Сцэны з жыцця Беларусі» (1885), «Сцэны з жыцця Літвы» (1886), «Сцэны з жыцця Беларусі і Літвы» (1888), «Сцэны з жыцця Беларусі і Літвы» (1889), «Сцэны з жыцця Беларусі і Літвы» (1890), «Сцэны з жыцця Беларусі і Літвы» (1891), «Сцэны з жыцця Беларусі і Літвы» (1892), «Сцэны з жыцця Беларусі і Літвы»

радкох паэт дэкляруе, што справа Літвы ня мае будучыні і яе гісторыя цалкам у мінулым. Як падкрэсьлівае Вэнцлава, акурат гэтыя хітрыкі ўсонілі царскую цэнзуру, і паэма была выдадзена ў Пецярбурзе. Але Міцкевічава ідэя была ясная, і хутка рух «валенродзтва» зрабіўся вельмі папулярны сярод радыкальнай моладзі гістарычнай Літвы: вучыцца і рабіць кар'еру сярод маскоўцаў, каб потым разбурыць імпэрыю зь яе нутра. Невядома, як з этнічнымі літоўцамі (прынамсі Вэнцлава не пакідае нам прыкладаў), але гэтай думкай Міцкевіча кіраваўся не адзін дзясятак ліцьвінаў-беларусаў.

Заўважым, што кіраўнікі літоўскага паўстаньня 1863 г. Каліноўскі, Серакоўскі і Ўрублеўскі былі не з этнічнай Літвы. Агульнавядома, што яны выдавалі першую нелегальную газэту да тутэйшых жыхароў Літвы на беларускай мове, а таксама газэту і ўлёткі на польскай мове і трохі па-літоўску. Менш вядома, што кіраўнікі паўстаньня будавалі сваё жыцьцё паводле формулы Міцкевіча. Валенродзтва сталася галоўнай рысай іх дапаўстанцкага жыцьця. Актыўны ўдзел у нелегальных і нават тэрарыстычных арганізацыях пасьпяхова сумяшчаўся з імпэрскай кар'ерай. Каліноўскі быў выхаванцам прэстыжнага юрыдычнага факультэту Пецярбурскага ўнівэрсытэту, які падрыхтаваў за сваю гісторыю процьму найвышэйшых урадоўцаў Расеі, між іншым сёньняшняга прэзыдэнта Пуціна. Серакоўскі скончыў Імпэратарскую акадэмію Генштабу і напярэдадні паўстаньня служыў афіцэрам Генштабу. Урублеўскі скончыў Пецярбурскі лясны інстытут. Як расейскамоўны і ляяльны «заходнярус» ён атрымаў працу дырэктара расейскай вучэльні ў падляскай Саколцы, бастыёне расейскага культурнага змаганьня з палякамі.

У 1890-х гг. над перакладам «Конрада Валенрода» працаваў Адам Гурыновіч. На беларускай мове захаваўся кавалак зьбеларушанай паэмы, а менавіта песьня «Вілія». Гурыновіч нарадзіўся ля берагоў гэтай ракі ў шляхецкай ліцьвінскай сям'і. Удзень Гурыновіч старанна рабіў імпэрскую кар'еру. Ён скончыў непапулярную сярод шляхты расейскамоўную Віленскую рэальную вучэльню, працягваў навучаньне ў Пецярбурскім тэхналягічным інстытуце. Гэтая прэстыжная ВНУ рыхтавала кіраўнічыя кадры для стратэгічна важнай чыгункі.

Туды набіралі толькі абсалютна ляяльных да ўраду асобаў, тым больш з Паўночна-Заходняга краю. У паслужной даведцы на Гурыновіча тады не было ніякага кампрамату. Затое ўвечары малады беларус кіраваў нелегальнай шматэтнічнай суполкай студэнцкай моладзі Літвы і Беларусі ў горадзе на Няве ды марыў пра скон імпэрыі. Таксама ў вольны час наш Адам пісаў гісторыю паўстаньня 1863 г. У паўстаньні Гурыновіча, між іншым, цікавіла тэма валенродзтва яго кіраўнікоў. Нататкі былі знойдзены паліцыяй падчас арышту маладога рэвалюцыянэра ў Вільні, у чэрвені 1893 г., як небясьпечнага дзяржаўнага злачынцу, 24-гадовага хлопца перавезьлі зь Літвы ў Пецярбург ды кінулі ў Петрапаўлаўскую крэпасьць. Ягоная стаўка на валенродзтва скончылася правалам. Да перакладаў «Конрада Валенрода» таксама актыўна зьвяртаўся ў раньні пэрыяд творчасьці Янка Купала. Ён аддаў даніну валенродзтву – ягоны Мікіта Зносак у «Тутэйшых» выпісаны пад уплывам гэтай паэмы Міцкевіча.

Вершы Міцкевіча перакладаў на родную мову слуцкі шляхціц, гадаванец пратэстанцкіх пансіёнаў Швайцарыі Альгерд Абуховіч. Ёсьць зьвесткі, што яшчэ пры жыцьці Міцкевіча невядомы аўтар пераклаў на беларускую мову Міцкевічаву баляду «Пані Твардоўская». Што цікава, наш пераклад быў зроблены не з арыгіналу, а праз украінскі пераклад рэктара Харкаўскага ўнівэрсытэту Пятра Гулак-Арцямоўскага. Наш пераклад 70-х гг. XIX ст. хадзіў у рукапісных сьпісах ды быў надрукаваны на пачатку XX ст. «Нашай Нівай».

Праз чатыры гады пасьля сьмерці Міцкевіча ў Вільні на беларускай мове выйшла паэма «Пан Тадэвуш» у перакладзе Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Гэта першы ў сьвеце пераклад паэмы на замежную славянскую мову. Перакладчык абгрунтаваў патрэбу выданьня твору на беларускай мове наступнымі прычынамі:

— твор Міцкевіча апісвае «норавы і звычаі *нашых літоўскіх гаспадароў*» на пачатку XVIII ст.;

— пераклад адрасуецца пісьменным чытачам, што, валодаючы лацінкай, маюць праблемы з польскай мовай;

— кола гэтых чытачоў не абмяжоўваецца заможным сялянствам, а пашыраецца на беларускамоўных ліцьвінаў, на «нашу засьцянковую шляхту, якая, жывучы ў лясным зацішшы, найчасьцей карыстаецца ў хатнім ужытку народнай гаворкай»; выданьне паэмы на беларускай мове прызначаецца «паном і простаму народу»;

— заахвоціць дробную «літоўскую і беларускую шляхту» і каталіцкае сялянства да асьветы па-беларуску.

Такім чынам, Дунін-Марцінкевіч завочна спрачаецца зь Міцкевічам і колам ягоных аматараў – палянізаванай заможнай шляхтай Беларусі і Літвы. Менскі аўтар дэкляруе пасьля вякоў палянізацыі наяўнасьць значнай групы беларускамоўнай «літоўскай і беларускай шляхты» ды спадзяецца на яе прыхільнасьць. У спалучэньні прыметнікаў «літоўскі» і «беларускі» Дунін-Марцінкевіч першым вырашае геаграфічную разьяднанасьць этнічна беларускай эліты. Знаходка Марцінкевіча адаптаваная сучаснай беларускай гістарыяграфіяй. Паняцьце «літоўскі» ў яго мае тыповы для XIX ст. гістарычны і геаграфічны сэнс. Літоўскі шляхціц – гэта беларускамоўны нобль Менскага, Гарадзенскага, Навагрудзкага ваяводзтваў. «Беларускі» шляхціц жыве на землях гістарычнай Беларусі (там, дзе Полацак, Віцебск, Амсьціслаў, Ворша і Гомель). Пры гэтым перакладчык ігнаруе наяўнасьць у краі балцкамоўнай «літоўскай і жамойцкай» шляхты. Невыпадкова пераклад дачакаў толькі адну прыхільную рэцэнзію буйнога літоўскага дзеяча Мікалаюса Акялайціса, але яна сьвет ня ўбачыла[5].

Дунін-Марцінкевіч кладзе яшчэ адзін вельмі важны кампанент у падмурак беларушчыны. Ён вызначае этнічныя межы бацькаўшчыны. Усе ведалі, дзе праходзілі межы ВКЛ, але вызначэньне этнічных межаў беларускіх і літоўскіх земляў было нявырашаным пытаньнем. Этнічны абшар беларускага народу Марцінкевіч акрэсьлівае басэйнамі «Дняпра, Дзьвіны, Бярэзіны, Сьвіслачы, Вяльлі і часткова Нёману». Акрэсьліваньне вельмі цікавае. З аднаго боку, перакладчык прызнае, што частка Панямоньня належыць літоўцам ды немцам. З другога боку, ён прэтэндуе на шэраг этнічна літоўскіх і латыскіх

[5] Кісялёў, Е. Адзін з першых... // Тамсама. – С. 5.

Віленшчыны і Латгаліі. Дзіўнага тут нічога няма, бо іцкевічае рабілі і тагачасныя літоўскія дзеячы, даводзячы абшары свайго народу да гарадоў Gardinas, Naugardukas і Brastas – Мінск, Горадні, Наваградку і Берасьця. Праблема дакладных этнічных межаў краю была вырашана навукова толькі на пачатку XX ст. Заўважу, што зь беларускага этнічнага арэалу Марцінкевіч выключаў Палесьсе (берагі Піны і Прыпяці) зь яго ўкраінскімі дыялектамі.

Міцкевіч Адам Міцкевіч і Беларусь. Мінск, 1997. С. 97.

Першае выданьне Міцкевіча па-беларуску было і першай калектыўнай дэманстрацыяй падтрымкі беларускай культуры. Гаворка ідзе пра сьпіс падпісчыкаў на пераклад. Гэтая крыніца годная дысэртацыі. Карыстаючыся сучаснымі мэтадамі, на падставе сьпісу можна акрэсьліць геаграфічны эпіцэнтар пражываньня прыхільнікаў беларушчыны, іх сацыяльнае і рэлігійнае паходжаньне, адсачыць далейшы асабісты лёс і стаўленьне да беларускага руху. У першай і адзінай вядомай частцы сьпісу 79 прозьвішчаў. Абсалютную большасьць падпісантаў складае шляхта. Сярод іх 11 каталіцкіх сьвятароў і ніводнага праваслаўнага (выданьне было лацінкаю). Нешляхецкія колы прэзэнтуюць 3 сялянаў і 5 настаўнікаў. Геаграфічны абшар падпіскі ахоплівае Менск, Вільню, Магілёў, Віцебск, Полацак, Смаленск, Лепель і нават неславянскае Коўна. Радзіма Міцкевіча, Наваградак, а таксама Горадня, Пінск і Берасьце ў сьпісе адсутнічаюць. Найбольш адданы патрыёт беларушчыны пражываў у Менску. Гэта быў царскі ўраднік, судзьдзя менскай цывільнай палаты Дмахоўскі, які замовіў ажно 12 асобнікаў паэмы. Сьпіс 1859 г. моцна адрозьніваецца ад сьпісу падпісчыкаў «Нашай Нівы» 1906 г. – пераклад Дуніна-Марцінкевіча быў арыентаваны, галоўным чынам, на шляхту, а аўтары «Нашай Нівы» бачылі ў сваіх чытачах перадусім сялянскі люд.

У 1892 г. свой пераклад «Пана Тадэвуша» выдаў у Аўстрыі Аляксандар Ельскі. Гэты выхаванец славутай Менскай клясычнай гімназіі і расейскі афіцэр выйшаў у адстаўку ў 30 гадоў. Акурат Ельскі ў 1885 г. у польскім пецярбурскім часопісе «Kraj» надрукаваў першы літаратуразнаўчы артыкул, прысьвечаны рэцэпцыі Міцкевіча ў Беларусі: «Адам Міцкевіч на Беларусі». Там жа беларускай лацінкай друкаваліся фрагмэнты

зь ягоных перакладаў зь Міцкевіча. У адрозьненьне ад Дуніна-Марцінкевіча, Ельскі вызначае больш шырокія этнічныя межы беларускага народу. На ягоную думку, беларусы апанавалі апроч цэнтральных абшараў Літвы і Беларусі таксама берагі палескай Прыпяці і падляскай Нарвы. Ельскі прызнае, што «Беларусь мае неаспрэчнае права ганарыцца Міцкевічам, бо гэты велізарны дух вырас і сфармаваўся як паэт на глебе нашай карэннай літоўскай славяншчыны». Нагадаю: гэта было сказана ў 1885 г. аўтарам, які на тагачасныя паняцьці жыў у Літве, у Замосьці пад Менскам Літоўскім.

На прыклад Дуніна-Марцінкевіча Ельскі таксама напісаў прадмову да свайго выданьня «Пана Тадэвуша». Як перакладчык аргумэнтаваў патрэбу ў зьбеларушаным Міцкевічу?

Для Ельскага Міцкевіч – «паляк з роду», які нарадзіўся «на Літоўскай Русі». Аўтар піша, што дзякуючы Міцкевічу палякі атрымалі выдатны эпас, які шмат разоў быў надрукаваны па-польску. Між тым беларусы, «братні народ Міцкевіча, каторы быў яму найбліжшы да сэрца», так і не дачакалі выданьня на роднай мове. Як адзначае Ельскі, першы пераклад Дуніна-Марінкевіча «прапаў марна», і ён вырашыў зноў перакласьці і надрукаваць «Пана Тадэвуша» па-беларуску. Чаму?

Па-першае, Ельскі падкрэсьлівае, што паэма Міцкевіча апісвае ня Польшчу, а Літву і Беларусь і ўсе яе станы. Пераклад Міцкевіча павінен служыць доказам крэўнасьці беларускай і польскай моваў і пакліканы прымусіць беларусаў палюбіць «сваю родную, занядбаную, сьвятую беларускую мову, каторая спрадвеку ня толькі была вашаю ў сёлах, але яе ўжывалі самыя даўнія манархі краю і іх вяльможы». У адрозьненьне ад Марцінкевіча, Ельскі адрасуе сваё выданьне сялянам. Аўтар нават дыстанцуецца ад сваіх чытачоў: «*Ваш старадаўні беларускі язык*, мусіць, варты чагось, калі можна на яго склад ператлумачыць найцальнейшыя паэтычныя творы вялікіх пісацялей. Праз умілаваньне свайго языка ўмілуйце ж і афяраванага *Вам* у беларускай шаце «Пана Тадэвуша», у каторым жыве ўся быліна дарагога *нам і Вам* краю».

Такім чынам, што зьмянілася ад часоў Дуніна-Марцінкевіча да

часоў Ельскага?

Па-першае, беларускамоўная шляхта імкліва палянізуецца. Новы пераклад рэалізаваны зноў лацінкай, але прызначаны толькі сялянам, да таго ж каталіцкай яе частцы. Большасьць беларускіх сялянаў, г. зн. праваслаўных, надалей заставаліся па-за Міцкевічам. За адно пакаленьне (34 гады) беларуская мова перастае быць штодзённай мовай дробнай шляхты.

Ліцьвін Міцкевіч тварыў у тыя часы, калі ані беларускага, ані літоўскага літаратурнага руху не было. Культурна ён быў сынам ВКЛ, якое 500 гадоў зьяўлялася часткай польскага палітычнага поля і ў якім беларуская шляхта была толькі часткай эліты нароўні з этнічна літоўскай і польскай (з XVII–XVIII стст.). Паэт востра рэагаваў на гвалтоўнае зьнішчэньне Рэчы Паспалітай і быў настроены па-антырасейску і антынямецку да фанатызму. Польскае пытаньне ў XIX ст. было як курдзкае ў XXI. Польскай дзяржавы не існавала, і ніхто з рэальных палітыкаў не даваў веры ў магчымасьць яе адраджэньня. З пункту гледжаньня расейскай улады ўтапіст Міцкевіч быў тэрарыстам і бунтаўніком, які да таго ж памёр падчас арганізацыі чарговай змовы супраць імпэрыі. У гэтых умовах перастварацьтворы паэта на тутэйшыя мовы (беларускую і літоўскую) было мужным учынкам. Менавіта таму пераклады Ельскага друкаваліся ў Аўстрыі. Увесь наклад перакладу «Пана Тадэвуша» Дуніна-Марцінкевіча быў сканфіскаваны і зьнішчаны. Захаваліся 4 унікальныя асобнікі, адзін зь якіх, як высьветліў Генадзь Кісялёў, паходзіць са збораў каталіцкай сэмінарыі ў Жмудзі, г. зн. беларускім перакладам цікавіліся і этнічныя літоўцы.

Для Міцкевіча як польскага супэрпатрыёта будучыня беларускай і літоўскай моваў была ясная. Дзьвюхмоўная шляхта краю мусіла перш за ўсё пільнавацца пальшчызны. Беларускія і літоўскія сяляне мусілі як мага хутчэй авалодаць польскай мовай. У сваім запавеце, балядзе «Дудар», ён марыў, каб просты люд з-пад Наваградку і Коўны навучыўся чытаць ды смакаваць ягоныя творы па-польску. Міцкевіч памыліўся, і сёньня ў гэтых мясьцінах ягоныя творы чытаюць пераважна ў перакладах. Таму перакладчыкі Міцкевіча на беларускую і

літоўскую мовы вялі завочную палеміку зь вялікім паэтам. Сваімі перакладамі нашы аўтары даводзілі ў XIX ст. жыццяздольнасьць «сялянскіх» моваў. Такім шляхам на пачатку XX ст. пайшоў іншы Міцкевіч, Якуб Колас, калі пад уплывам «Пана Тадэвуша» напісаў беларускі эпас «Новая зямля». Дакладна тое самае зрабіў літоўскі паэт і дзеяч Антанас Баранаўскас паэмай «Анікшчайскі бор».

Большая частка нашых перакладчыкаў Міцкевіча паходзіла з гістарычнай Меншчыны і Наваградчыны (Слуцкае княства). Ёсьць тыпалягічная розьніца паміж літоўскімі і беларускімі перакладамі. Этнічна літоўскі рух, як сьпялейшы ў палітычнам сэнсе і этнічна неславянскі, арыентаваўся на балцкія творы Міцкевіча накшталт паэмы «Жывіла» ці публіцыстычнай «Кнігі народу польскага і пілігрымства польскага». У беларускім асяродзьдзі цэнтральнае месца заняў блізкі культурна «Пан Тадэвуш» ды прыгодніцкі «Конрад Валенрод». Аналіз Ніны Тэйлар (гл. спасылку 3) давёў моцны ўніяцкі, значыць, адназначна беларускі, падтэкст паэмы Міцкевіча «Дзяды». Выяўляецца, у час стварэньня паэмы праваслаўныя сьвятары ў Літве зацята змагаліся з уніятамі, каб перанесьці сьвяткаваньне невядомых расейскай царкве лістападскіх Дзядоў на вясну (Радаўніца).

Міцкевіч паходжаньнем належаў не да дробнай (яшчэ адзін міт савецкага літаратуразнаўства), а заможнай шляхты. Бацькоўская камяніца ў Навагрудку была самым шыкоўным прыватным будынкам места. Ягоны дзядзька, заможны навагрудзкі судзьдзя Мэдард Растоцкі, апекаваўся маладым сваяком. Іншы ўплывовы дзядзька, прафэсар Маеўскі, дастаў паэту дзяржаўную расейскую стыпэндыю на навучаньне ў Віленскім унівэрсытэце. Сацыяльная розьніца мела свой лінгвістычны аспэкт. Калі для дробнага шляхціца з усходу Беларусі Яна Баршчэўскага беларуская мова была штодзённай мовай дзяцінства, для заходніка Міцкевіча як месьціча і заможнага шляхціца яна была другараднай мовай зносінаў зь сялянамі і мовай сяброўскіх вечарынак.

Якія стасункі зьвязвалі Міцкевіча зь беларускай і літоўскай мовамі? Па-першае, ён у нейкай ступені валодаў кожнаю зь іх.

Па-беларуску гаварылі сяляне і месьцічы Наваградзкага краю. Па-беларуску дэклямаваў паэту свае вершы ягоны найлепшы сябра Ян Чачот. Ён жа напісаў знакамітае беларускае віншаваньне «Едзе міленькі Адам». Міцкевіч выказваў камплімэнты беларускай мове ў сваіх парыскіх лекцыях (1840–1844). З гэткай самай павагай адгукаўся Міцкевіч у тых лекцыях і да літоўскай мовы. Але гэта ўсё дробязь у параўнаньні з грунтоўнымі лекцыямі Міцкевіча ў Калеж-дэ-Франс чэскай і сэрбскай літаратураў, ня кажучы пра родную пальшчызну. Ведаючы беларускую мову, Міцкевіч па-беларуску не пісаў. Адзіны сказ Міцкевіча беларускай лацінкай, што знайшлі ў сховішчах Варшавы, «na boэym sudzie usim u sraku budzie», не пасуе да школьных хрэстаматыяў. Не пісаў Міцкевіч і па-літоўску. Запісы рукой паэта трох літоўскіх песьняў, выяўленыя ў 1927 г. у Парыжы, сьведчаць, што Міцкевіч валодаў літоўскай мовай. Яе – пра што піша Вэнцлава – Адам засвоіў падчас 4-гадовай працы ў Коўне. Першае ж знаёмства паэта з балцкімі дыялектамі адбылося, відаць, на Наваградчыне, дзе на той час яшчэ было некалькі балцкамоўных вёсак. Але ў будучыню беларускай і літоўскай літаратураў Адам ня верыў. Калі ягоны парыскі сябра, жамойцкі шляхціц Кіпрыян Незабытоўскі зьвярнуўся з просьбай дапамагчы выдаць кніжку сваіх твораў па-літоўску, Міцкевіч адказаў маўчаньнем. Не зьдзіўлюся, калі навукоўцы знойдуць падобны дакумэнт у перапісцы зь Міцкевічам іншага ягонага знаёмага па Парыжы, паэта і фальклярыста Аляксандра Рыпінскага, шляхціца з Полаччыны, што друкаваў свае кніжкі ў Францыі ды Брытаніі.

Літоўскія і беларускія дзеячы сярэдзіны XIX ст. называлі Міцкевіча «нашым паэтам, што піша па-польску». Становішча зьмянілася ў канцы XIX ст. Лідэр літоўскіх нацыяналістаў Вінцас Кудзірка назваў у 1898 г. Міцкевіча «здрайцам» ды «чужым і непатрэбным нам геніем». У 1897 г. гэтак сама выказаўся вялікі ўкраінскі паэт Іван Франко. Ён надрукаваў у венскай газэце «Die Zeit» артыкул, прысьвечаны творчасьці Міцкевіча, між іншым, і ягонай паэме «Конрад Валенрод», дзе назваў Адама «паэтам здрады». На думку Франка, галоўнай мэтай паэмы было жаданьне Міцкевіча апраўдацца перад палякамі за сваё супрацоўніцтва з расейцамі і сяброўскія сувязі

з расейскай элітай. Як вядома, паэт, прызнаны ў Расеі дзяржаўным злачынцам, да эміграцыі працаваў у Маскве ў канцылярыі вайсковага генэрал-губэрнатара ды бавіў час у раскошных салёнах Пецярбургу – «гораду сатаны», паводле яго ўласнага прызнаньня. Выгадны габсбурскай уладзе (у 1848 г. Міцкевіч прыклаў руку да антыаўстрыйскага паўстаньня ў Італіі і Польшчы) і ўкраінскай інтэлігенцыі артыкул Франка выклікаў буру пратэстаў палякаў Галіччыны. Франко патрапіў пад абструкцыю, на яго кар'еры журналіста быў пастаўлены крыж.

Роля Міцкевіча для беларускага нацыянальнага руху дагэтуль грунтоўна не прааналізаваная. На буйной менскай канфэрэнцыі 1998 г., прысьвечанай Міцкевічу, толькі два навукоўцы (Мікола Нікалаеў і Захар Шыбека) паставілі пытаньне пра тое, ці была яна шкодная. Творчасьцю Міцкевіча абгрунтоўваліся польскія праекты асыміляцыі беларусаў. Зь сьвяткаваньня 55-х угодкаў сьмерці Міцкевіча пачаў у 1905 годзе сваю працу Віцебскі польскі тэатар[6]. У 1917 г. пасьля прагляду п'есы «Дзяды» каталіцкая моладзь Менску масава запісвалася ў польскі корпус, часта нават добра ня ведаючы польскай мовы[7].

Успрыманьне Міцкевіча на ягонай бацькаўшчыне ў XX ст. залежала ад палітычнай каньюнктуры. У Савецкай Беларусі дапамогай Міцкевіча грамілі беларускіх нацыяналістаў, лукашыстаў паэт зрабіўся «певцом славянского единения». У Ковенскай Літве Міцкевіч стаўся рупарам этнічнага рэваншызму. Літоўцы старанна – пра што піша Вэнцлава Кіпель – рэдагавалі тэксты паэта, «ачышчаючы» іх ад усякіх праяваў польскасьці. Дагэтуль на помніку Міцкевічу ў Вільні ўсе зроблены толькі па-літоўску.

Ці належыць Міцкевіч сучаснай Беларусі? Дакладна так, як Шапэн належыць Польшчы. З 1859 па 1996 гг. па-беларуску выйшла друкам агулам 148 публікацыяў твораў Міцкевіча. Сёньня паэзія Міцкевіча – абавязковы складнік беларускай школьнай праграмы. Самае поўнае ў сьвеце права лічыць Міцкевіча сваім паэтам мае перадусім польская этнічная

6 Wacław Kipel, Adam Mickiewicz i Litwini, 1905–1955, The revival of Polish culture between the Neman and the Dnepr Rivers // Canadian Slavonic Papers. 1999. March.

7 Шыбека З. Адам Міцкевіч і беларускае пытанне // Беларуска-

кістарурныя гарадзіны // Адам Міцкевіч і нацыянальныя далёкі
культуры. Матэрыялы Міжнароднай навукова-кніжнай
Міна, 1998. С. 187.
[8] Гельмуан, Сэмуэл. К вопросу о национал-большевизме //
Бальшавік Беларусі. 1927. № 6–7. С. 65–90.
[9] Такім жа чынам аўтары сайту прэзыдэнта Беларусі зьляпілі з
пратэстанцкага дзеяча ВКЛ XVI ст. Сымона Будная змагара за
узьяднаньне славянскіх народаў.
[10] Metryka Litewska. Księga wpisów № 131 / Opracował Andrzej
Rachuba. Warszawa 2001. № 421.

кістарурныя гарадзіны // Адам Міцкевіч і нацыянальныя
культуры. Матэрыялы Міжнароднай навукова-кніжнай
Міна, 1998. С. 187.
[8] Гельмуан, Сэмуэл. К вопросу о национал-большевизме //
Бальшавік Беларусі. 1927. № 6–7. С. 65–90.
[9] Сёньня для земляка паэта шанец засвоіць з паленства
польскую мову зноў мінімальны. Між тым, яшчэ 60–70 гадоў
таму ваяводзкі Наваградак займаў у Польшчы адно зь першых
месцаў паводле накладаў твораў Міцкевіча. У арыгінале
вядома. У той самы час адзіны тагачасны пераклад «Пана
Тадэвуша» на беларускую мову быў створаны за кратамі
гарадзенскай турмы былым польскім дэпутатам і беларускім
нацыяналістам Браніславам Тарашкевічам.

Вэнцлава добра паказаў, як літоўскі літаратурны і нацыянальны рух, увесь час дыстанцуючыся ад Міцкевіча, адначасова сілкаваўся ягонымі ідэямі. Тое самае тычыцца і беларусаў. Цяжка знайсьці іншыя, акрамя «Пана Тадэвуша» ці «Дзядоў», творы, якія зрабілі такі магутны ўплыў на беларускую літаратуру XIX – пачатку XX стст. Зь перавыданьня беларускага перакладу «Пана Тадэвуша» разбудоўвалі сваю дзейнасьць першыя буйныя арганізацыі беларускіх нацыяналістаў, што паўсталі на золку XX ст.: пецярбурская суполка «Загляне сонца і ў наша аконца» ды віленская «Наша Ніва».

Сёньня вядзецца беларуска-польскі і літоўска-польскі культурны дыялёг. Лекцыя Вэнцлавы даводзіць вялікую патрэбу дыялёгу паміж сучаснымі літоўскімі і беларускімі інтэлектуаламі. У тым, што супрацоўніцтва дагэтуль няма, ёсьць віна абодвух бакоў.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 4 (44) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/11

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 4 (44) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image] [image]2006

"дБ Зьнешту"

[image] [image] [image]

ІРЫНА, дачка Францішка, ЖАРНАСЕК

Гутарка зь пісьменьніцай Ірынай Жарнасек Я не баюся слова «свабода» \

нар. 17.01.1953 г. у вёсцы Чаранкі Глыбоцкага раёну Віцебскай вобласьці ў сялянскай сям'і. Працавала загадчыцай сельскай бібліятэкі, загадчыцай чытальнай залі, карэспандэнткай газэты «Знамя новостройки» і «Химик». Пачала літаратурную кар'еру зборнікам апавяданьняў

— У сучаснай беларускай літа-ратуры ня так і шмат пісьменьнікаў, якія маюць адукацыю бібліятэкара. Ведаю яшчэ Андрэя Федарэнку. Ці ёсьць нейкая псыхалягічная цяжкасьць пачаць пісаць сярод мноства кніг у бібліятэчнай залі?

— Псыхалягічная цяжкасьць пачаць пісаць? Вядома, ёсьць. Больш за тое, яе проста ня можа ня быць, калі толькі ты да таго, як узяў на сябе сьмеласьць штосьці сказаць людзям і назваць тое сказанае творам, яшчэ ўзяў ды й не паленаваўся тое-сёе пачытаць. Мудры японец Акутагава раіць у такім выпадку: «Той, хто вырашыў заняцца пісьменьніцтвам, якім бы гарадзкім да мозгу касьцей ні быў, а павінен у душы ператварыцца ў барбара». Страшнаваценька? А як па мне, дык гэта цалкам нармальна – пабойвацца чыстага аркуша. Маю на ўвазе, вядома, ня вымытага ў лазьні Алеся Аркуша, але таго, нармалёвага – белага й папяровага. Больш за тое, баяцца паперы, лічу, трэба. Тады меней будзе небясьпекі нагарадзіць лухты. І меней граху, бо за тваю ж гэтую лухту нехта яшчэ і

грошыкі заплаціць, і, што яшчэ страшней, ты сваёй «Споведзь сына» (1986) скрадзеш у кагосьці ягоны час – найважнейшы і найкаштоўнейшы дар, атрыманы чалавекам ад Бога. Тут ужо не да жартачкаў, бо сказана ж: «Не крадзі!». Але гэта, вядома, бярэцца ў разьлік толькі тымі, хто ўвогуле прызнае такое паняцьце – адказнасьць літаратара за напісанае. І перад Тым, Хто даў яму здольнасьць (пабойваюся слова «талент») ствараць, і перад тым, хто аддасьць на прачытаньне ягонага твору свой час.

Але вернемся ў бібліятэку. Кажаш, страшна там пачынаць пісаць? А чытаць? Я хоць і няшмат прапрацавала ў бібліятэцы, але пасьпела зразумець, што такое «небясьпечныя» кнігі. На дварэ былі 1970-я. Увушшу – траскатня ад брэжнеўскіх лёзунгаў, накшталт «Экаміка павінна быць эканомнай». А яшчэ СССР гудзеў ад праведнага абурэньня на Салжаніцына. Беларусы, вядома, таксама абураліся. Ды было й такое, на што нібыта гучна і не абураліся, але й памяталі: не пушчаць! У бібліятэкі тады час ад часу прыходзілі загады сьпісаць кнігі то адных, то другіх аўтараў. На нарадах пужалі: «Няхай толькі знойдзем у кнігасховішчах тое, што падлягае сьпісаньню!..» Дык і сьпісвалі. Натуральна, што цікава было найперш самой пачытаць і зразумець, а за што ж іх?.. Пачытала, памятаю, паглядзела нейкія брашуркі, накшталт «Как вырастить высокий урожай картофеля». Думаю, што за лухта? Няхай бы сабе і рос той ураджай – на ліха сьпісваць? Але потым адзін дасьведчаны настаўнік цішком патлумачыў мне, што гэтыя кніжкі загадана ліквідаваць не за зьмест, а за прозьвішчы аўтараў, найчасьцей габрэяў, якія надумаліся ўцячы з самай дэмакратычнай краіны. Ну, паехалі й паехалі, зноў думаю, наіўная, шчасьлівай дарогі – навошта ж сьпісваць кнігі? Згадзіся, што збольшага тая сытуацыя падобная да нашай, сучаснай, калі лёс кніг вырашае нават ня іхны зьмест, а тое, «чэсны» альбо не іхны аўтар. Але аднойчы зьявіўся, памятаю, і такі загад: ня сьпісваць, але і ня ставіць на кніжныя паліцы «Яго батальён» Васіля Быкава. Што за ліха, думаю, гэты ж нібыта нікуды ня ўцёк? Пачытала. Потым яшчэ раз перачытала. І на ўсё жыцьцё палюбіла нашага Васіля Быкава. Тады ж і пасеяліся ў маёй душы першыя зернейкі дысыдэнцтва, глыбока ўтоенага, унутранага, словам, беларускага. Зернейкі прарасьлі потым у даволі трывалыя

парасткі, узмужнелі, хоць і ня надта прарываліся на паверхню нейкімі бунтарскімі ўчынкамі, на якія здольны быў, напрыклад, Вінцэсь Мудроў, як ён напісаў у сваёй кнізе «Ператвораныя ў попел». Адно што гэта дапамагло мне не ўступіцца ў партыю. Дык дзякуй Васілю Быкаву і за гэта. Прыкладна тады ж я прачытала і Караткевічавы «Блакіт і золата дня» ды «Чазенію». А апавяданьні Янкі Брыля ды ягоная «Жменя сонечных промняў» ужо тады былі «маімі» кнігамі. Дык ці лёгка пасьля ўсяго гэтага было пачаць пісаць? Акутагавы я тады яшчэ ж не чытала, таму ягонай парады зрабіцца барбарам скарыстаць не магла. Мала я, мабыць, тады думала пра тую боязь, а цябе ж таксама яшчэ і блізка не было. Памятаю, як пазьней на нарадзе ў Каралішчавічах Леанід Дайнека павучаў нас, маладых ды нявопытных, што літаратурны занятак увогуле не для сьціплых. Напэўна. Ды мая кароткая кар'ера бібліятэкара на той час ужо скончылася, я стала журналістам. А ці быў сьціплы Федарэнка? Наўрад. Але ж ты, Алесь, яшчэ пра Людку Сільнову забыўся! Ды і пра Марыю Баравік. А пра Вітаўта Кіпеля? Ого, колькі нас, аказваецца, нясьціплых ды самаўпэўненых!

— Ці паўплывала на тваё разьвіцьцё і як пісьменьніка, і як грамадзяніна наваполацкае літаб'яднаньне «Крыніцы», тагачаснае крынічанскае асяродзьдзе?

— Я проста ўдзячная лёсу, што ў маім жыцьці былі «Крыніцы». Думаю, ты таксама. Гэтак жа, як і Валянціна Аксак, Уладзя Арлоў, Сяржук Сокалаў-Воюш, Алег Мінкін, Лявон Баршчэўскі, Якуб Лапатка, Вінцэсь Мудроў, Лера Сом, нават аршанская Алена Танана і віцяблянка Ірына Сабачэўская ды цяпер ужо наша прадстаўніца ў аранжавай Украіне Іна Снарская. Як шмат, Алесь, нас, аднак, было! І як хораша нам было разам! І неяк жа вось часу хапала: на стварэньне твораў, а потым і на абмеркаваньне іх на «Крыніцах», на шматлікія сустрэчы ў школах ды бібліятэках, а потым і паміж сабой на кватэрах, на суботнікі па рэстаўрацыі Сафійскага сабору, на пошукі маленькіх беларусаў для першых беларускіх клясаў у Наваполацку, на паходы потым у тыя клясы...

У маім альбоме ёсьць адзін здымак, на якім усе мы пасьля чарговага пасяджэньня «Крыніцаў» сфатаграфаваліся каля

рэдакцыі «Химика». Ёсьць там сярод нас і незнаёмая маладзенькая дзяўчына. Неяк я думала-прыгадвала, хто ж гэта такая, а потым успомніла, як мы наагітавалі дзяцей у першую беларускую клясу, а потым грымнула новая бяда – няма настаўніцы. І тады тое дзяўчо ці хто прыслаў, ці падаслаў, ці сама заахвоцілася, але прыйшла яна на «Крыніцы» ды сказала, што хоча быць настаўніцай у беларускай клясе. Праўда, як наслухалася яна тады нас, а можа спалохалася Сержуковых песень ці мудроўскіх жарцікаў, дык толькі тады мы яе і бачылі. Так і скончылася ейная кар'ера нацыяналісткі, не пасьпеўшы пачацца. Адно што на здымку засталася. Настаўніцу тады мы ўсё ж знайшлі – добрую, разумную. А памятаеш, як Сяржук Цімохаў намаляваў такога вучонага і такога беларускага ката ў першай беларускай клясе? На ўсю сьцяну! Праўда, праз колькі гадоў, калі ўжо беларускасьць пачала спакваля станавіцца хоць і ня нормай, але ўжо й не дзівацтвам, настаўніца таксама праявіла ініцыятыву: купіла шпалеру (пашанцавала ж ёй недзе яе дастаць!) і заклеіла нашага сымпатовага ката. Шкада мне яго было – жах! Аказваецца, у самы неспрыяльны час можа стварыцца, забруіцца вось такое прыгожае асяродзьдзе. Крыніцы! Памятаеш Сержукова:

Былі крыніцы сінімі
І ад крыві чырвонымі,
А груганы над выспамі
Кружлялі натамлёныя…

Гэта потым ён пачаў гарлаць:«Фронт! Фронт! Фронт!», а тады былі «Крыніцы». Прыгадаўся вось і Алег Мінкін:

Над дахамі, над скарчанелым гольлем,
Як попел, узьвіліся крумкачы,
Злавесна засланілі далячынь,
Дзе вецер разьдзімаў зары вугольле…

А нядаўна ў Вінцэсевым апавяданьні «Сьвятая крыніца», якое яшчэ нідзе не друкавалася, прачытала пра аднаго рабацягу, які спрабаваў мыць у сьвятой крыніцы свае завэдзганыя кірзачы…

І ўсё ж я перакананая: ні груганы, ні крумкачы, ні цівуны і ні віжы ня здольныя перамагчы чысьціню людзкіх памкненьняў, мараў, бескарысьлівасьці. А зрэшты, крыніцы ўвогуле не чалавек стварае – яны нібыта самі па сабе. Прыйдзе час – зьявяцца, забруяцца… А зьменіцца ён – могуць і травою зарасьці альбо ўзяць дый пайсьці сабе пад зямлю. У маленстве такое чула і не магла паверыць, што гэтак можа быць. Цяпер разумею: бывае.

— Як здарылася, што раптам ты стала актыўна супрацоўнічаць зь беларускім каталіцкім друкам? Ты ня крыўдзісься, калі цябе называюць каталіцкай пісьменьніцай?

— Ну, па-першае, мне здаецца, што гэта толькі ты так мяне і называеш, дарэчы, з маёй жа падачы. Памятаю я, адкуль рогі растуць. Неяк на адной вечарыне я казала, што калі Франсуа Марыяк настойваў на тым, каб яго называлі каталіцкім пісьменьнікам, калі Клайв Стэйплз Льюіс ня быў супраць таго ж, то чаму б і не? Але, пажыўшы ды набраўшыся розуму, я думаю, што гэта не зусім слушна. Навошта ўвогуле ў літаратуру ўблытваць прыналежнасьць аўтара да канфэсіі, сьвядома звужаць рамкі? Тым больш што заўсёды ёсьць небясьпека не ўпісацца ў іх. Ды і адзін з аўтараў «ARCHE», Пётра Рудкоўскі ОП ня сьпіць у шапку. Гэты пільны дамініканец, што праўда, высьвятляе больш цяпер філязофскія стасункі з Акудовічам, але ж Акудовіч сказаў, што яго няма, а я нібыта ёсьць. Пакуль што, прынамсі.

А калі сур'ёзна, то для мяне сапраўды заўсёды найважнейшымі былі ідэалы і каштоўнасьці хрысьціянства. Яны для мяне – невычэрпная крыніца (зноў жа, бачыш, крыніца!) і думак, і натхненьня, і працы. І калі мне дазволена будзе яшчэ штосьці сказаць на паперы, то я хацела б гэта зрабіць па-хрысьціянску. Pro Christo! Для Хрыста! Так называецца выдавецтва, у якім

апошнім часам і ў мяне выйшлі тры кнігі: зборнік апавяданьняў «Гадара», раман пра Росіцкую трагедыю «Будзь воля Твая», і аповесьць-казка для дзяцей «Спрэчка анёлаў».

А як гэта я раптам, як ты кажаш, пачала актыўна супрацоўнічаць з каталіцкім друкам? Ды не, Алесь, гэта адбылося зусім ня раптам. Для мяне, вядома. Хрысьціянства прыйшло да мяне зусім не з гарбачоўскай перабудовай, калі дазволілі быць вернікам, а тады, калі марозным студзеньскім днём бацькі з хроснымі прывезьлі мяне, немаўлятка, з маіх Чаранкоў у задароскі касьцёл ды ахрысьцілі, за што я ім вельмі ўдзячная. Таму зусім не выпадкова я прыняла і свае журналісцкія псэўданімы: І. Студзеньская ды Ірэна Задарожная. Дый, калі на тое пайшло, то я ня проста пачала супрацоўнічаць з каталіцкім друкам, а разам з Хрысьцінай Лялько ды іншымі стаяла ля самага ягонага вытоку. А яшчэ раней, калі не было ніводнага рэспубліканскага каталіцкага выданьня, мы з ксяндзом Уладасам Пятрайцісам выдавалі ўжо газэту «Голас душы». Ён жыў тады ў Мёрах, я ў Наваполацку, але нават такая нязручнасьць, да таго ж, без кампутараў і электроннай пошты, не перашкодзіла нам гэта рабіць. Баюся зьбіцца на танны патас, якога і сама не люблю, і, здагадваюся, ты таксама, але бачыш, якая тут рэч: я веру ў такую таямнічую зьяву – пакліканьне. Вось, напрыклад, тваё пакліканьне, як я разумею, было стварыць ТВЛ. Дзіўна гучыць, праўда? А ты прааналізуй свой шлях да гэтага, прыгадай зьбег так званых выпадковасьцяў і, можа, згодзісься тады са мной. Альбо можна зірнуць зь іншага боку. Уяві, што ТВЛ стварыў ня ты, а… Алег Салтук ці Мікола Мятліцкі… Можаш такое ўявіць? Не. Ды і твой сябар Юры Гумянюк не зрабіў бы гэтага. Проста, у іх іншае пакліканьне, у кожнага яно сваё. А ў мяне вось такое. Гэта, калі хочаш, мая ніша. Я яе шчасьліва адшукала, а можа, вымаліла, бо надта ж ужо рэзаў мне вуха ды кульгаў на ўсе чатыры капыты савецкі пастулят: «религия – яд, береги ребят».

Памятаю, калі вучылася ў 10 клясе, настаўнікі прапанавалі мне паўдзельнічаць у нейкім надта ж ужо прэстыжным, як мне сказалі, рэспубліканскім конкурсе сачыненьняў на тэму: «Чаму я ня веру ў Бога». Я адразу ж катэгарычна адмовілася. Да таго часу я пісала ўжо нейкія там сачыненьні пра Гагарына,

абуралася на хунвэйбінаў, штосьці там яшчэ было, а тут коратка і ясна: «Ня буду». Вось што гэта было? Ні ў якім разе ня страх: «Божанька насварыцца!», ня сьмеласьць сказаць сваё «фэ» настаўнікам, ну і не лянота, бо я страшэнна любіла ўсялякія літаратурныя конкурсы. Як цяпер бачыцца, то, мабыць, ужо тады ўва мне прамаўляла маё пакліканьне.

— Задам табе пытаньне як чалавеку дасьведчанаму, які да таго ж мае сына ксяндза: як стаіць справа ў касьцёле зь беларускай мовай?

— Ну-у-у, як… У касьцёле проста моляцца па-беларуску. Цяпер, праўда, я ўжо і прызабыла, як 10–15 гадоў таму мне дорага было кожнае роднае слова ў касьцёле. Памятаю, на пачатку 1990-х гадоў грэка-каталікі ўстанаўлівалі ў Полацку крыж памяці па ахвярах сталінізму. Прыехаў маліцца згаданы ўжо тут ксёндз Пятрайціс зь Мёраў, я тады ўпершыню ў жыцьці пачула малітву па-беларуску. Тады ж мы пазнаёміліся і неўзабаве выпусьцілі першы нумар нашага «Голасу душы». Колькі было радасьці! А цяпер вось ужо больш за 10 гадоў рэгулярна выходзяць нашы часопісы «Ave Maria», «Наша вера», у якіх я часта друкуюся, часопіс для дзяцей «Маленькі рыцар Беззаганнай», які рэдагую. Пачыналася ж усё з нуля. Цяпер нікога ня зьдзівіш тым, што ў касьцёлах моляцца па-беларуску, а некалі на ўсю Беларусь быў адзін такі дзівак – ксёндз Уладзіслаў Чарняўскі зь Вішнева. Неяк давялося пачуць, што беларуская мова не загіне ўжо таму, што на ёй людзі гавораць з Богам. Прыгожа! А я вось яшчэ прыгадала, як на фэсьце ў Будславе хор з Чырвонага касьцёлу засьпяваў гімн «Магутны Божа». Я радасна падхапіла і… асеклася: людзі вакол мяне маўчалі, яны проста ня ведалі гэтага сьпеву, як і многіх іншых беларускіх песень ды малітваў. Калі б мела добры голас, то гэткай там бяды, а так паспрабуй адной сьпяваць разам з хорам, бліжэй да якога празь людзкі натоўп не праціснуцца… Ажно раптам чую: ззаду чыйсьці мужчынскі голас таксама падхапіў. Азірнулася, а там Алесь Жлутка зацягвае і, як мне здалося, таксама адчувае штосьці падобнае. Але так-сяк дасьпявалі – нас жа ўжо двое было, цэлы дуэт! На мінулым фэсьце ў Будславе мы зь ім прыгадалі тыя нашы пакуты ды шчыра пасьмяяліся, а вакол нас шматтысячны натоўп вольна й

прыгожа сьпяваў па-беларуску.

Але я кажу найперш пра Віцебшчыну, Меншчыну ды Магілёўшчыну, а за Берасьцейшчыну, Гомельшчыну ды Гарадзеншчыну не бяруся, бо даволі рэдка бываю там, прэса наша таксама туды менш трапляе, ды і «Магутны Божа» мне там не даводзілася сьпяваць. Можа, Жлутка і сьпяваў калі-небудзь, а я-то не. Тыя тэрыторыі, асабліва Гарадзеншчыну, добра ведае, зноў жа, Пётра Рудкоўскі ОП, ён можа падказаць.

— Як ты ўспрыняла стварэньне «альтэрнатыўнага» Саюзу пісьменьнікаў на чале з Чаргінцом? Ты ўдзельнічала ў працы сходу Літфонду, што перарос у нечарговы зьезд СБП, на якім абмяркоўвалася ўзьніклая сытуацыя. Як ты лічыш, ці рэалістычна яе ацэньвалі з трыбуны і ў кулюарах?

— Як успрыняла? Як тое, што павінна было адбыцца. Увесь ход апошніх падзеяў у Беларусі паказваў на гэта. Мы зь Вінцэсем Мудровым даўно гаварылі, калі ж гэта нарэшце зьявіцца «шыхт здаровых сілаў»? І вось сталася! А тое, што знайшліся, бачыце, такія дзівакі, якім не заманулася ірвануць у той шыхт, дык гэта ўжо іхныя праблемы, а значыць, і мае.

Як гэтыя праблемы абмяркоўваліся на тым сходзе? Усяго было. Пісьменьнікі – народ эмацыянальны і даверлівы. Таму адны гатовыя былі кінуцца на амбразуру, другія прапаноўвалі галадоўку, трэція, больш разважлівыя, заклікалі пачакаць і спрабаваць яшчэ і яшчэ раз высьветліць неяк адносіны з уладамі, а чацьвёртыя ўгаворвалі жыць, як вучыў мудры кот Леапольд: дружна. Апошняе, мне выдае, – абсалютная ўтопія. Як яны сабе тое ўяўляюць? Мабыць, як у той показцы, калі адзін партызан здаў другога немцам. Таго, другога, зьбіваюць на горкі яблык, ён плюецца ўласнымі зубамі ў твар свайму былому таварышу па барацьбе, а той, выцершыся: «Ты што, дружа, пакрыўдаваў?»

Нам цяпер што… Нам галоўнае цяпер падзяліць паміж пісьменьніцкімі саюзамі памерлых. Ну, бо як падзяліць майно і ўсё астатняе (імёны, статусы, званьні і&mbspг. д.) жывых, не ад нас жа залежыць. Ёсьць каму за нас гэта рабіць. А вось з тымі, хто ўжо не адзавецца, ня грымне кулаком па стале, ня скруціць

дуліну ды ня тыцне камусьці ў нос, складаней. Чуў жа і ты, нябось, выказваньні накшталт: «Мы, а не зарвавшиеся политиканы, – продолжатели традиций Купалы і Колоса!». Альбо: «Вот Короткевич им (чытай – нам) сказал бы!». Адна, праўда, радасьць ад такіх прэтэнзіяў усё ж ёсьць: на Быкава не замахваюцца, нам саступілі, «продолжать» ягоныя ідэі ім, вядома, не выпадае. Ну і што вось на такое скажаш? Размаўляць, як вядома, можна толькі тады, калі цябе жадаюць пачуць. Хіба што такімі аргумэнтамі крыць, як у свой час Міхал Юр'евіч грымеў: «Но есть и Божий суд, наперсники разврата! Он ждет, он не доступен звону злата…». Але ж і гэты аргумэнт толькі для тых, хто лічыцца з існаваньнем Бога і Ягонага суду. Вось мне, напрыклад, у гэтым пляне лягчэй. Але ж хацелася б і да Божага суду пажыць па-людзку. Калі ў Польшчы быў уведзены вайсковы стан, вялікая група польскіх артыстаў адмовілася выступаць па радыё і тэлебачаньні, абвясьціла байкот. Многія галадалі ў літаральным сэнсе, але трымаліся. Ведаеш, чытала кнігу «Komedianci. Rzecz o bojkocie» з інтэрвію тых актораў і плакала: якая годнасьць і любоў да радзімы!

Вось думаю, а калі ўсё ж уявіць такі цуд: грымне раптам нейкая перабудова, зьявіцца нейкі Гарбачоў у Беларусі… І што тады? Як бы мы зноў паціскалі адзін аднаму рукі? Як у той показцы: «Ты што, дружа, пакрыўдаваў?». Ды калі б праблема была толькі ў чыста чалавечых стасунках паміж пісьменьнікамі, то гэта яшчэ было б хоць і балюча, ды ўсё ж паўбяды. Але ж мы цудоўна разумеем, што на карту пастаўлены лёс беларускай літаратуры, культуры, нацыянальнай ідэі. Што, не разумее хтосьці з альтэрнатыўшчыкаў, як сваім маладушшам яны засланяюць дарогу да людзей Янку Брылю, Нілу Гілевічу, Рыгору Барадуліну, Ніне Мацяш, Дануце Бічэль, Валянціну Тарасу, Генадзю Бураўкіну?.. Гэты сьпіс можна было б працягваць вельмі доўга – тых, хто не пасьпяшаўся ў новы СП, ой як шмат! А можа, якраз гэта некаторым і лашчыць надзею на ўласны ўзьлёт – прастора ж павялічылася, а то неяк зашмат было пісьменьнікаў, не прапіхнуцца. Словы «ворагі народу» пакуль што ня вымаўленыя, а пячаткі ўжо прыпячатаны.

Мне адзін сьведка Росіцкай трагедыі распавядаў у той час, калі я зьбірала матэрыял для кнігі «Будзь воля Твая», як на ягоных

вачах паліцаі спалілі бацьку, забілі сястру, як у агні згінулі сваякі, суседзі, а самога яго разам зь іншымі «шчасьліўцамі» адправілі ў канцлягер. Распавядаў, як пасьля вайны ён вярнуўся на тыя папялішчы і як у адной ацалелай вёсцы ў хаце сваяка сустрэў паліцая зь мясцовых, свайго былога суседа – удзельніка і аднаго з выканаўцаў той карнай акцыі. Выпадкова сустрэліся. Сядзелі за адным сталом, бралі чарку, закусвалі салёнымі гуркамі і маўчалі. Ані слова ніхто не сказаў, не згадаў пра тыя падзеі. Мой суразмоўца проста ня змог слова зь сябе выціснуць, ну а паліцай, зразумела, не зацікаўлены быў весьці такія гутаркі. Так і разышліся. І таго ж вечара паліцай засіліўся. Вайну перажыў, усе тыя акцыі, зьверствы, усю сваю службу захопнікам неяк жа ператрываў, а чарка за сталом з былым суседам стала апошняй кропляй. Слабак, бачыш, такі быў.

Ды ладна, наганяю я тут жахаў…

— Які свой твор ты лічыш найбольшай творчай удачай?

– Няма такога твору. Шыкоўны хвост павы мне зусім не пасуе, дык і не прымерваю яго. Іншая рэч, што ёсьць кніга, найбольш мне дарагая, – зборнік апавяданьняў «Гадара». Магчыма, і не таму, што яна найбольш напакутавалася, пакуль выйшла ў сьвет. «Мастацкая літаратура» яе напачатку заплянавала, нават у тэматычным пляне ўжо стаяла, і мне з кнігарняў ужо тэлефанавалі ды раіліся, колькі браць асобнікаў, а потым яна неўпрыкмет вылецела з тых плянаў. Дзякуй Богу, што ёсьць выдавецтва «Про Хрысто»: у выніку «Гадара» выйшла, хоць і паменшаным аб’ёмам – празь недахоп сродкаў. Ды ўсё ж многае з таго, што мне карцела сказаць, я ў ёй сказала. Напрыканцы мінулага году, дарэчы, мяне запрашалі на сустрэчу ў Полацкі дзяржаўны ўнівэрсытэт на абмеркаваньне «Гадары», але на студэнтаў насоўвалася сэсія, і сустрэчу было вырашана адкласьці на пачатак лютага. Ды вось і люты скончыўся, а нешта ж ня клічуць. Кніга за гэты час пагоршала? Альбо аўтарка? Сама вінаватая: нячэснаю аказалася – у новы шыхт не пасьпяшалася.

Асобна ад усяго, мною напісанага, стаіць раман «Будзь воля Твая». Але тут ужо гаворка нават і не пра творчасьць, і не пра

літаратуру. Я яго пісала настолькі аголенымі нэрвамі й пачуцьцямі, што і да гэтага часу не магу як сьлед ачомацца. Не пакідае, разумееш, адчуваньне, што я яшчэ канчаткова ня выйшла з гэтае кнігі, з тых падзеяў, нібы яшчэ ўсё згараю на Росіцкім жудасным папялішчы. А можа тут рэч у іншым? Можа ўсё ж такія тэмы не для жанчын-пісьменьніц? А зь іншага боку, калі зьбірала матэрыял, а потым пісала – такога адчуваньня і блізка не было. Прабач за такую шчырасьць. Напэўна, такое ня варта казаць на шырокую публіку. Але ж ужо сказана.

— Як ты ўспрымаеш розныя цяперашнія экспэрымэнты ў творчасьці? Пэрформансы, вершы для мабільнікаў і г. д. Увогуле, як ты ставісься да мадэрнізму?

— Вершы для мабільнікаў? Цікава, а бібліятэкі такой літаратуры будуць? Уяўляю: «Вам якога Аркуша, эмтээсаўскага ці вэлкомаўскага?» Не ўжо, я на такога бібліятэкара не падышла б – усё на сьвеце пераблытала б. Дый несправядліва гэта: на мабільніку адны ж паэты будуць, а нам, суровым празаікам, куды? А вось пэрформансы… Памятаю, як ты ладзіў на Дзень беларускага пісьменства ў Полацку пэрформанс «Вершы на пяску». Ірына Дарафейчук, Андрэй Хадановіч і ты пісалі вершы на тым пяску, а я ды яшчэ колькі чалавек чыталі. Клясна! Плыла Дзьвіна ў Даўгаву, пілі гарэлку палачане, над плошчай гучалі палымяныя прамовы аблашчаных і дапушчаных літаратараў, якія цяпер, вядома ж, у «здаровых сілах», а на прыдзьвінскім абрывістым беразе, на пяску нараджаліся вершы. Цуд! Не падумай, што іранізую. Хочаш вер, хочаш не, але ў мяне і цяпер не прапала адчуваньне, што дзейства тое ня зьнікла назусім, што вецер не замёў ды чалавечыя сьляды не затапталі яго. Такое адчуваньне, што менавіта ў тым месцы ў той дзень у Полацку былі нацягнутыя нябачныя струны паміж небам і зямлёю. Таму дзякуй табе, Алесь, і Ірыне, і Андрэю за тое, што гэта было.

Мадэрнізм? Ай, не дуры ты мне галавы – я ў гэтым нічога не разумею. Спытай лепш пра тое ў Дубаўца, Жукоўскага, Тычыны, Тычкі альбо Гніламёдава. Яны ведаюць лепш, у тым ліку і тое, ці можа, да прыкладу, такі чалавек, як я, прымаць той мадэрнізм, дадзена яму гэта альбо не. У мяне ж усё вельмі

проста: я магу прырасьці душой да нейкага твору, зусім не задумваючыся, мадэрновы ён ці традыцыйны. Ну, але калі Аркуша, Сільнову, Аксак ды Хадановіча чытаю, то можа й не безнадзейна засела у традыцыйнасьці? Але ж я і Шамякіна ў свой час усяго прачытала… Словам, ніякай лёгікі.

— І традыцыйна, на завяршэньне, – пра пляны.

– Ведаеш, як можна насьмяшыць Пана Бога? Будуючы пляны. Во недзе павесяліўся Ён у часе савецкіх пяцігодак, плянаў разьвіцьця калгасаў-саўгасаў, розных паскарэньняў ды рынкавага сацыялізму! Таму гаворка пра пляны мною сьвядома адмятаецца. І ты мне не пярэч, тым больш у сакавіку, калі жанчыны былога СССР маюць хоць раз на год прывілей. А калі сур'ёзьней, то я сапраўды ніколі і нідзе не гавару пра пляны і задумы, бо, як правіла, яны потым усё адно ня збудуцца. А каб неяк лягічна скончыць нашую гутарку, давай лепш пагаворым пра мары. Ты вось пра што марыш у першыя дні вясны 2006 году?

— Учора быў гарачы дзень у Менску: Казуліна зьбілі, Мілінкевіч сустракаўся з выбаршчыкамі на вуліцы пад «аховаю» міліцыянтаў з гумовымі дручкамі і шчытамі. Дык сёньня мары толькі аб адным…

– Ты пра свабоду?.. Як сапраўдная прадстаўніца памяркоўнай нацыі я пазіраю цераз плот на ўрадлівы літаратурны гарод свайго сябра Ўладзімера Арлова і зайздрошчу яму. І мару я, грэшная, каб адзін ягоны твор раптам зрабіўся неактуальны, непапулярны, прынамсі, сярод нас, памяркоўных. Ведаеш, які? Ягонае эсэ «Незалежнасьць – гэта…». Добрае эсэ, але зайздросьцяць жа не благім. Так мне хочацца, разумееш, забыцца на слова «незалежнасьць»! А гэта можа стацца толькі тады, калі незалежнасьць будзе ў нас, як вада, як паветра. Мы ж ня думаем пра іх, калі яны ёсьць. Спахопліваемся, калі забракуе… Нядаўна прачытала ў мудрага Акутагавы: «Дайце мне Швайцарыю альбо хоць бы свабоду слова». Я пра Швайцарыю ня мару. Навошта мне яна, калі ў мяне ёсьць Беларусь! А мая мара, тым часам, ня толькі не пакідае мяне, але мацнее. Няхай мне даруе Ўладзя, але я не жадаю папулярнасьці ягонаму твору «Незалежнасьць – гэта…».

Нядаўна на перадвыбарным сходзе чула, як адна патэнцыяльная выбаршчыца крычала кандыдату ў прэзыдэнты Аляксандру Мілінкевічу, што яна ня хоча свабоды, яна ўжо баіцца слова «свабода», бо, маўляў, напужалі яе памаранчавая Ўкраіна, Грузія, Кіргізія…

Я не баюся слова «свабода». Я мару пра яго забыць, як забывае чалавек пра ваду, наталіўшы ёю смагу. *3.03.2006, Полацак*
Гутарыў Алесь Аркуш
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/07/11**
[image]

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

Андрэй Хадановіч

адзін зь лідэраў новай генэрацыі беларускіх пісьменьнікаў. Летась у кіеўскім выдавецтве «Факт» выйшлі яго вершы «From Belarus with Love» (па-беларуску!).

* * *

Прагрэс у літаратуры
Любоўная вайна
Як ножкі цыркуля…

Джон Дон

Крэсьлім новыя межы,
пажыраем чужыя тэрыторыі.

І я ўжо захапіў
палову сушы,
і ты ўжо захапіла
палову сушы.

А няўмелыя рукі
ўсё не навучацца трымаць
сваёй зброі.

Як ножкі двух цыркуляў,
пераплятаюцца твае і мае

драўляныя палачкі.

* * *

Она пришла с мороза,
Раскрасневшаяся…

Аляксандар Блок

Яна прыцягнулася з марозу,
падазрона чырвоная,
напоўніла пакой
водарам піва,
звонам мабілы
і не зусім цэнзурнай
размовай па ёй.

Яна зараз жа абрынула на падлогу
паўшафы маіх кніг,
адна зь якіх на сэкунду завісла ў паветры,
а пасьля балюча ўдарыла мяне па назе,
так што адразу стала здавацца,
што мне даўно пара мяняць кватэру
на большую з даплатай.

Калі спыніліся мае крыкі
і падскокі на здаровай назе,
яна захацела ў Інтэрнэт –
паказаць жывыя дзёньнікі
сваіх «фрэндоў».

Мы абодва расхвалявaліся:
я – адкрываючы для сябе
маладую літаратуру,
яна – назіраючы, як тоўсты руды кот
падкрадаецца да парачкі
бессаромных галубоў,

якія толькі што аддаліся каханьню, –
відаць, жадаючы быць трэцім.

На маю рэпліку,
што і я так магу
(я пра Інтэрнэт),
яна кінула бязьлітаснае
«аффтар, выпей йаду!..».

Я ўзрадаваўся – найбольш таму,
што трахаліся ня мы, а галубы,
і што мінулі часы
Сакрата й Боны Сфорцы.

ПРАГРЭС У ЛІТАРАТУРЫ

А ўсё-ткі меў рацыю
французскі казачнік,
які кляўся й бажыўся,
што ёсьць прагрэс у літаратуры.

Сёньняшні Гамэр
ніяк не залежыць
ад перабояў электраэнэргіі,
цалкам можа кіраваць
новай Нацыянальнай бібліятэкай,
хоць у душы крыху зайздросьціць
Рансару й Бэтговэну:
найлепшыя творчыя вечарыны
ладзіліся ў ДК таварыства глухіх.

Сапфо
больш не балятуецца на пасаду
дзясятай музы,
бо адмовілася на карысьць кінэматографу;
і хоць не спазнала шчасьлівага каханьня,

затое атрымала свой нобэль
за прапаганду паліткарэктнасьці,
апярэдзіўшы Вэрлена, Рэмбо і Жорж Санд.

Стары Анакрэёнт
даўно кінуў піць
і можа толькі мроіць пра дзяўчатак,
затое ўключаны ў праграму
ўсіх школ і ўнівэрсытэтаў Грэцыі.

Віён
напоўніцу адчуў
усёмагутнасьць праваабаронцаў,
хоць у краіне так і не скасавалі
сьмяротнага пакараньня,
а нават калі скасуюць –
што зьменіць купка дысыдэнтаў
з транспарантамі «дзе Віён?»?

Усімі адрынуты Гюго
на ўласным досьведзе зьведаў,
што выраз «мець гемарой»
мае ня толькі пераносны сэнс.
Затое цяпер ёсьць шоў-бізнэс
і можна пісаць словы на музыку.

Ганкур
вядзе жывы дзёньнік у Інтэрнэце.
Пакутуе на падваеньне асобы.

Фолкнэр і Маркес
канкуруюць на рынку турпаслугаў,
прапануючы гарачыя туры
ў Ёкнапатафу і Макондa.

І толькі Катул
не адчуў асаблівых зьменаў:
як дзьве тысячы зь нечым год таму,
ён аплаквае вераб'я сваёй каханай.
Птушыны грып, знаеце…

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/11
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 4 (44) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image] [image]2006

выбары 2006 • аналітыка • **літаратура** • гісторыя • эсэістыка

[image] [image] [image]

ПАТРЫК ОЎРЖАДНІК (Patrik Ouředník, нар. 1957) — паэт, пісьменьнік, перакладчык, з 1985 г. жыве ў Парыжы. Перакладае творы французскіх пісьменьнікаў (Рабле, Жары, Кено, Бэкет, Мішо, Віян і інш.) на чэскую мову і чэскіх (Грабал, Забрана, Голан, Скацал і інш.) на французскую. Па-чэску сярод іншага выдаў

Патрык Оўржаднік Еўрапеана Кароткі нарыс гісторыі дваццатага стагоддзя

Амерыканцы, што загінулі ў 1944 годзе ў Нармандыі, былі рослыя хлопцы, у сярэднім 173 сантыметры, і калі б іх пакласці аднаго за адным ушчыльную ступакамі да цемені, то атрымаўся б ланцуг даўжынёю 38 кіламетраў. Немцы таксама былі рослыя хлопцы, але ўсё ж самыя высокія былі сенегальскія стралкі Першай сусветнай, тыя былі ростам у сярэднім 176 сантыметраў, і таму іх заўсёды пасылалі на перадавую, каб нагнаць на немцаў страху. Пра Першую сусветную вайну казалі, што людзі падчас яе падалі, як снапы, а рускія камуністы пазней падлічылі, колькі з аднаго кіламетра трупаў атрымаецца ўгнаенняў і колькі грошай можна зэканоміць на дарагіх замежных угнаеннях, калі замест гною скарыстаць трупы здраднікаў і злачынцаў. А англічане прыдумалі танкі, а немцы газ, якому далі назву іпрыт, таму што немцы яго ўпершыню скарысталі пад горадам Іпр, але кажуць, што гэта недакладныя звесткі, а яшчэ гэты газ называлі «гарчыца», бо ён шчыпаў у носе, не раўнуючы як гарчыца з Дыжона, і гэта, відаць, праўда, бо некаторыя вайскоўцы, што вярнуліся пасля вайны дадому, ужо больш ніколі не хацелі есці дыжонскай

гарчыцы. Пра Першую сусветную вайну казалі, што гэта была вайна імперыялістычная, бо немцам здавалася, нібыта ў той краіны супраць іх перадузята настроеныя і таму застаецца ім дарогу, не даючы зрабіцца імперыяй і здзейсніць такім чынам нейкае гістарычнае наканаванне. А большасць людзей у Еўропе: у Германіі, Аўстрыі, Францыі, Сербіі альбо Расіі — былі перакананыя, што гэта вайна патрэбная і справядлівая, і што яна ўсталюе ў свеце мір. А яшчэ шмат людзей мяркавалі, што вайна ажыўляе ў чалавеку добрыя якасці, якія ў мірны прамысловы свет занядбаў, — такія як любоў да радзімы, адвага і самаахвярнасць. А бяднейшыя людзі не маглі дачакацца, як праедуцца на цягніку, а вяскоўцы не маглі дачакацца, як пабачаць вялікія гарады і як патэлефануюць ці раённую пошту і прадыктуюць жонцы тэлеграму: «УСЁ ДОБРА, СПАДЗЯЮСЯ, ШТО Ў ЦЯБЕ ТАКСАМА ЎСЁ ДОБРА». Генералы з нецярплівасцю чакалі, калі пра іх пачнуць пісаць у газетах, а людзі з нацыянальных меншасцяў радаваліся, што будуць ваяваць разам з тымі, хто гаворыць без акцэнту, і разам з імі будуць спяваць шыхтовыя песні і вясёлыя куплеты. І ўсе думалі, што вернуцца дадому на збор вінаграду ці, думаю, позняе — на Каляды.

Некаторыя гісторыкі пазней казалі, што дваццатае стагоддзе пачалося, па сутнасці, у 1914 годзе, разам з пачаткам вайны, бо гэта была першая ў гісторыі вайна, у якой узяло ўдзел татальна ўсе краіны і палегла гэтулькі народу, і гэта была першая вайна, падчас якой лёталі дырыжаблі і аэрапланы і бамбілі тылы, і гарады, і цывільных жыхароў, а падводныя лодкі тапілі караблі, а гарматы стралялі навесным агнём на адлегласць дзесяць ці нават дванаццаць кіламетраў. А немцы вынайшлі газ, а англічане — танкі, а навукоўцы вынайшлі ізатопы і прыдумалі тэорыю адноснасці, згодна з якой не было нічога метафізічнага, а ўсё было адносным. А калі сенегальскія стралкі ўпершыню ўбачылі самалёт, то падумалі, што гэта такая свойская птушка. А адзін сенегальскі салдат выразаў з забітых коней кавалкі мяса і кідаў іх як мага далей ад сябе, каб адцягнуць увагу самалётаў. І салдаты насілі зялёныя уніформы і камуфляж, бо не хацелі, каб вораг іх заўважыў, і да таго часоў гэта было надзвычай прагрэсіўна, бо ў папярэдніх войнах салдаты насілі вельмі кідкія каляровыя уніформы, каб іх было

Ротаб Ю. Ў. Ёсць Бог ці няма Яго? — Мінск: Беларусь, 1995.
Ротаб Ю. Ў. Дзівосны свет. — Мінск: Беларусь, 1992.
Ротаб Ю. Ў. Мяне ўсё цікавіць. — Мінск: Беларусь, 1996.
Ротаб Ю. Ў. Што я ведаю. — Мінск: Беларусь, 2004.

Оўржаднік — аўтар нашумелага слоўніка табуяванай лексікі чэшскай мовы «Smitbuch jazyka českého» (1988) і слоўніка вобразных выслоўяў «Anž jest co nového pod sluncem» (1994).

Адлічэнне пачынаецца ад 1914 года. Аўтаматычныя стралялі дырыжаблі і аэрапланы, і таму коні часта пудзіліся. А пісьменнікі і паэты шукалі спосаб, як усё гэта найлепш перадаць у сваіх творах, і ў 1916 годзе прыдумалі дадаізм, бо ім здавалася, што ўвесь свет з'ехаў з глузду. А у Расіі прыдумалі рэвалюцыю. А салдаты насілі на шыі ці на запясці бірку са сваім імем і нумарам палка, каб было вядома, хто есць хто і куды пасылаць спачувальную тэлеграму, а калі выбухам салдату адрывала галаву ці руку і бірка гублялася, у ваенным штабе вырашалі, што гэта быў невядомы салдат, і ў многіх сталіцах такім салдатам узвялі вечны агонь, каб людзі пра іх не забыліся, бо агонь захоўвае памяць пра нешта даўняе. А палеглых французаў было цалкам 2681 кіламетр, а палеглых англічан было 1547 кіламетраў, а палеглых немцаў — 3010 кіламетраў пры сярэдняй даўжыні аднаго трупа 172 сантыметры. А ўсяго па ўсім свеце загінула 15 508 кіламетраў салдат. А ў 1918 годзе па ўсім свеце распаўсюдзіўся грып, які называлі «іспанка», і гэты грып забіў больш за дваццаць мільёнаў чалавек. Пацыфісты і антымілітарысты пазней казалі, што гэта таксама былі ахвяры вайны, бо і салдаты, і цывільнае насельніцтва жылі ў дрэнных гігіенічных умовах, але эпідэміёлагі сцвярджалі, што грып забіў больш людзей у тых краінах, дзе вайны не было: на ціхаакіянскіх выспах, у Індыі альбо ў Злучаных Штатах, а анархісты казалі, што так і павінна быць, бо свет прагніў і блізіцца да свае пагібелі.

Шыхтовыя спевы

Немцы вынайшлі газ

Свет блізіцца да пагібелі

Аднак іншыя гісторыкі казалі, што насамрэч дваццатае стагоддзе пачалося раней, што ля яго вытокаў стаяла прамысловая рэвалюцыя, якая разбурыла традыцыйны свет, і што ва ўсім вінаваты лакамотывы і параходы. А іншыя, нядаўняе, сцвярджалі, што дваццатае стагоддзе пачалося тады, калі стала вядома, што людзі паходзяць ад малпаў, а некаторыя людзі казалі, што паходзяць ад малпаў у меншай ступені, чым астатнія, бо яны хутчэй пасунуліся наперад у сваім развіцці. Потым людзі пачалі параўноўваць мовы і разважаць, чыя мова самая развітая і хто найдалей прасунуўся у цывілізацыйным працэсе. Чаецей за ўсё рабілася выснова, што гэта французы, бо у Францыі адбываліся розныя цікавыя рэчы, і французы умелі камунікаваць, і ўжывалі кан'юнктыў і назамінулы ўмоўны лад, і спакусліва ўсміхаліся жанчынам, а

Цывілізацыйны працэс

Еўропа ў заняпадзе

Салдаты стралялі навесным агнём

«Тойстая Берта»

Калі салдаты палілі ноўвалі

Пазітывізм

Парадак узнік з хаосу

Віртуальная рэальнасць

На парозе новага веку

Вульгна на памылках мінулага

Жанчыны, галавецыя істоты

Вынаходніцтва кантрацэпцыі

Канец свету

канчаны танцавалі канкан, а мастакі прыдумалі імпрэсіянізм. Немцы ж казалі, што сапраўдная цывілізацыя павінна быць германскай, і што гэта яны прыдумалі рамантызм, і шмат нямецкіх паэтаў пісалі пра каханне, а ў Англіі ўсе пішуць пра кроў. Немцы казалі, што менавіта яны — сапраўдныя прадстаўнікі еўрапейскай цывілізацыі, бо яны ўмеюць думаць і ведаюць, а таксама ладзіць розныя забавы. І яшчэ казалі, што французы фанабэрыстыя, а англічане пагардлівыя, а немцы нецывілізаваныя. І ўжо ніхто не спадзяваўся, што да Калядаў вернецца дадому, і ўсе пачуваліся пакінутымі, непатрэбнымі і нялюбымі. З ваенных штабоў

Першую сусветную вайну таксама называлі «акопнай», бо праз тыдні і месяцы пасля яе пачатку фронт знерухомеў і салдаты хаваліся ў акопах, якія ператварыліся ў багну, а ўначы ці на досвітак кідаліся ў атаку, каб адваяваць дваццаць, трыццаць ці пяцьдзесят метраў варожай тэрыторыі. І ўсе насілі зялёныя ці шэрыя вайсковыя уніформы і бамбілі адзін аднаго, і стралялі адзін у аднаго. У немцаў былі мітамёты, а ў французаў снарады, і таму яны магли страляць адны ў адных навесным агнём. Калі якая-небудзь рота кідалася ў атаку, салдатам даводзілася пераскокваць праз чужыя траншэі, перарэзваць калючы дрот і не забывацца пра міны, а вораг тым часам страляў па іх з кулямётаў. І ў гэтых акопах салдаты сядзелі дні і месяцы і называлі гады, яны нудзіліся, баяліся, гулялі ў карты і прыдумвалі для акопаў, траншэяў і калідораў розныя назвы. Французы прыдумалі назвы «У СЛІМАКОЎ», «ПЛОШЧА ОПЕРЫ», «ГАЛЕЧА», «НЯЎДАЧА», «У ДЭЗЕРТЫРА», «НЯНАВІСЦЬ», «ГАЛАВАЛОМКА», а немцы прыдумалі назвы «ГРЭТХЕН», «БРУНГІЛЬДА», «ТОЎСТАЯ БЕРТА» і «СВІНІНА З КАПУСТАЙ». Немцы казалі, што французы фанабэрыстыя, а французы казалі, што немцы нецывілізаваныя. І ўжо ніхто не спадзяваўся, што да Калядаў вернецца дадому, і ўсе пачуваліся пакінутымі, непатрэбнымі і нялюбымі. З ваенных штабоў

Імперыялізм
Прыватная ўласнасць
Дыктатура пралетарыяту
Капітал
Сацыялізм
Новы чалавек
Страта каштоўнасцяў
Еўропа у заняпадзе
Нямецкі салдат
Вялікі гуманны свет
Асацыяльныя элементы
Невядомы салдат
Контрыбуцыя

даходзілі весткі, што вайна памалу сунецца да свайго канца і што не трэба маркоціцца і падаць духам, а трэба мець цярплівасць і думаць пазітыўна. А ў 1917 годзе адзін італьянскі салдат пісаў у лісце сваёй сястры: «Я адчуваю, як усё добрае, што было ўва мне, паціху знікае, і я з кожным днём здаюся сабе ўсё больш пазітыўным». А для дактароў было вялікай загадкай, чаму ў гэтых траншэях не пачаўся паморак, бо разам з салдатамі там жылі пацукі, якія карміліся трупамі, а жывых грызлі за пальцы і насы. У ваенных штабах баяліся, што пачнецца эпідэмія і вораг зможа заняць абарончыя пазіцыі, і таму абвясцілі ўзнагароду за кожнага забітага пацука, і салдаты стралялі ў пацукоў і адрэзвалі ім хвасты, а ўвечары здавалі іх спецыяльна прызначанаму адказнаму за пацучыныя хвасты, які іх падлічваў і казаў, хто колькі за дзень зарабіў, але грошай ніхто так і не ўбачыў, бо на гэта не былі вылучаныя сродкі. Разам з салдатамі таксама жылі вошы. Здаралася, што, падпільноўваючы ворага, салдаты чулі, як варожы салдат шкрабецца, і гэткім чынам даведваліся, дзе той схаваўся. Потым у тое месца стралялі і кідалі гранаты, аднак вошай менш не рабілася і ворагаў таксама.

У дваццатым стагоддзі адбыўся адыход ад традыцыйнага веравызнання, бо калі людзі даведаліся, што паходзяць ад малпаў, і што могуць падарожнічаць на цягніку, і тэлефанаваць, і плаваць на падводнай лодцы, яны пачалі паступова адыходзіць ад рэлігіі, і чым далей, тым менш хадзілі ў храм і казалі, што ніякага Бога няма, і што рэлігія робіць народ цёмным і забітым, і што яны за пазітывізм. Пазітывізм была такая філасофская дактрына, якая абвяшчала, што чалавечае разуменне свету — гэта вынік напрацовак прыродазнаўчых і сацыяльных навук, і што праўдай можна лічыць толькі тое, што можна навукова праверыць, і што метафізіка — гэта лухта. Пазітывісты не верылі ні ў якага Госпада Бога, хаця некаторыя спачатку казалі, што існуе нейкая вышэйшая сіла, што навукова гэта цалкам дапушчальна, хоць гэтага і нельга спраўдзіць. Аднак навукоўцы казалі, што жыццё — гэта ўсяго толькі вынік збегу акалічнасцяў, і што парадак узнік з хаосу, і не верылі, што свет быў створаны шэсць тысяч гадоў таму, як сцвярджала хрысціянская традыцыя. А астрафізікі казалі, што ўсё гэта

толькі кваркі, атамы і газы, і што ўзрост сусвету — дванаццаць ці нават пятнаццаць мільярдаў гадоў, і што сусвет увесь час расце, але не ведалі, ці будзе ён расці бясконца, ці мо аднойчы зноў пачне сціскацца альбо нават выбухне. Вернікі ж казалі, што няхай сабе чалавек і паходзіць ад малпаў, няхай сабе й складаецца з кваркаў, атамаў і газаў, аднак гэта нічога не мяняе, бо ўсё ж такі нехта павінен быў стварыць малпаў і кваркі. І што зусім не важна, ці ўзнік сусвет шэсць тысяч альбо пятнаццаць мільярдаў гадоў таму, бо галоўнае тое, што было да стварэння сусвету, а пра гэта навука маўчыць. Астрафізікі казалі, што перад гэтым не было нічога, а вернікі казалі, што менавіта так і сказана ў Бібліі. З цягам часу пазітывізм страціў сваю прыцягальнасць, бо людзі не ведалі, як быць з падлодкамі і з атамнай бомбай, і пачалі шукаць шляхоў, каб дасягнуць сякой-такой трансцэндэнцыі. А некаторыя вучоныя меркавалі, што навуковыя доследы зусім не абвяргаюць Госпада Бога, і нягледзячы на тое, што навука не можа прывесці бясспрэчных доказаў існавання Бога ці нейкай вышэйшай сілы, усё ж такі навука здольная даць абгрунтаваны адказ на вечныя чалавечыя пытанні, бо сэнс жыцця і божы замысел — гэта адно і тое ж. А філосафы разважалі, ці не мог бы Бог існаваць хаця б віртуальна, аднак гэта ўжо быў аксюмаран.

Напрыканцы дзевятнаццатага стагоддзя людзі ў гарадах чакалі наступу новага веку з яўнай нецярплівасцю, бо ім здавалася, што дзевятнаццатае стагоддзе вызначыла шляхі, па якіх чалавецтва будзе крочыць наперад. І што ў будучым усе будуць тэлефанаваць, і падарожнічаць на параходах, і ездзіць на эскалатарах з рухомымі парэнчамі, і паліць якасным вугалем, і мыцца ў ванне хоць сабе кожны тыдзень. А электрамагнітны тэлеграф і бяздротавы тэлефон будуць пераносіць чалавечыя думкі і мары ў прасторы з хуткасцю маланкі, і гэта дапаможа чалавечай супольнасці дасягнуць гармоніі, каб жыць у міры і згодзе. І вялікай падзеяй была выстава ў Парыжы ў 1900 годзе, якая на парозе новага веку адзначала надыход светлай будучыні і адкрыццё новых шляхоў, па якіх чалавецтва будзе крочыць наперад, і наведнікі ездзілі на эскалатарах, і захапляліся вынаходніцтвамі, і дзівіліся новым мастацкім кірункам. І ўсе былі ўпэўненыя, што дваццатае стагоддзе дасць рады галечы і цяжкай фізічнай працы, і што магчымасці, якія

дае электрычнасць, пераўзыдуць самыя неверагодныя мары. І што ўсе будуць атрымліваць сацыяльнае забеспячэнне і будуць мець тыдзень аплатнага адпачынку. І што людзі будуць жыць камфортна, гігіенічна і дэмакратычна, і што дэмакратычна будуць жыць нават жанчыны, і яны будуць мець права голасу і браць удзел у выбарах дэпутатаў. І ўсе з нецярплівасцю чакалі дваццатага стагоддзя і казалі, што ў чалавецтва ёсць новы шанец, і што трэба вучыцца на памылках мінулага. Жанчыны атрымалі права голасу ў 1906 годзе ў Фінляндыі, а ў 1913 годзе ў Нарвегіі, а ў 1915 годзе ў Даніі і г. д., а з цягам часу таксама захацелі вучыцца і атрымліваць дыпломы, і займацца палітыкай і навукай, і ваяваць у шэрагах арміі за справядлівы мір. Большасць мужчынаў не згаджалася з патрабаваннямі жанчын напоўніцу і лічыла, што жанчыны добра спраўляюцца перадусім з сямейнымі абавязкамі і дробнай працай па гаспадарцы, а мужчыны лепш разбіраюцца ў арганізацыі грамадства, маюць больш развітае абстрактнае мысленне і пачуццё калектывізму і лепш умеюць ладзіць забаўляльныя мерапрыемствы. А ў некаторых дэмакратычных дзяржавах быў прыняты закон, што ў парламенце павінна быць аднолькавая колькасць мужчынаў і жанчын, але некаторыя жанчыны казалі, што гэта недэмакратычна, бо жанчыны — гэта, перш за ўсё, чалавечыя істоты. І што несправядліва, каб яны толькі нараджалі дзяцей, мылі пялюшкі і ўсё такое і чакалі, калі муж прынясе заробак. А некаторыя мужчыны казалі, што яны з большай ахвотай засталіся б дома і мылі б пялюшкі і ўсё такое замест таго, каб хадзіць на працу, а ў Швецыі, дзе была моцная сацыяльная палітыка, было шмат мужчынаў, якія атрымлівалі грошы за тое, што іхнія жонкі ходзяць на працу. І, згодна са шматлікімі даследаваннямі, многія людзі лічылі, што самай вялікай падзеяй стагоддзя было вынаходніцтва кантрацэпцыі, бо адгэтуль жанчыны маглі класціся ў ложак, калі і з кім ім захочацца, і ўжо не мусілі баяцца зацяжарыць, і такім чынам змаглі дасягнуць сексуальнай, а адначасова і эканамічнай незалежнасці, бо цяпер яны маглі з большым поспехам прэтэндаваць на важныя пасады і ўжо больш не млелі, убачыўшы мыш, бо перасталі падпарадкоўвацца маскулінным стэрэатыпам пра жанчын. Сацыёлагі казалі, што традыцыйная мадэль жанчыны ў заходнім грамадстве незваротна пераадоленая, бо жанчыны, якія стагоддзямі жылі паводле

законаў натуральнай гаспадаркі, дзякуючы кантрацэпцыі перайшлі да дагаворнай сістэмы. І што эмансіпацыя жанчын — гэта, па сутнасці, парадокс прымусовай свабоды, бо жанчыны маюць чым далей тым большыя абавязкі і нясуць большую адказнасць, і нават тое, што раней лічылася вялікімі сацыяльнымі здабыткамі і прывілеямі, напрыклад, забарона начной працы альбо дэкрэтны адпачынак і да т. п., цяпер успрымаецца жанчынамі як форма ўціску.

У канцы дваццатага стагоддзя людзі дакладна не ведалі, калі трэба святкаваць пачатак новага тысячагоддзя — у 2000 ці ў 2001 годзе. Для людзей, якія чакалі канца свету, гэта было прынцыпова, аднак большасць людзей у канец свету не верыла, і ім было на гэта пляваць. Іншыя людзі чакалі канца свету, аднак лічылі, што ён настане ў які-небудзь звычайны дзень. А некаторыя хрысціяне казалі, што на самай справе ўжо ўсё адно 2004 год, бо Ісус нарадзіўся на чатыры гады раней, чым прынята лічыць. А паводле габрэйскага календара ўжо быў 5760 год, а паводле мусульманскага ўсяго толькі 1419, але і паводле юліянскага календара было менш, чым паводле грыгарыянскага, і таму, напрыклад, Кастрычніцкая рэвалюцыя адбылася ажно ў лістападзе. А будыстам было таксама ўсё адно, бо паводле будысцкага календара быў 2542 год будашакараянскай эры, і будыстаў хутчэй цікавіла, кім яны будуць у наступным жыцці — жабай альбо малпай і да т. п. Будызм і даасізм у дваццатым стагоддзі здабылі ў Еўропе шмат прыхільнікаў, якія ляскалі ў гонгі, дыхалі дыяфрагмай, вялі гутаркі пра інь і ян, пісалі містычныя кніжкі і казалі, што ў свеце поўна таямніц, але толькі на першы погляд, бо на самай справе ўсюды пануе гармонія. А калі з кім-небудзь здаралася штосьці загадкавае, ён пісаў пра гэта кніжку, бо настала медыяльная эра, і кожнаму хацелася напісаць кніжку. І больш, чым канца свету, людзі баяліся тэрарыстычных актаў і аварый электронных сістэм, якія б маглі вывесці са строю і тэлевізары, і відэамагнітафоны, і мікрахвалёўкі, і банкаматы, і аэрапорты, і электронныя шыльды на дарогах, і святлафоры ў гарадах, і ліфты ў новабудоўлях. Тэрарыстычныя акты ў дваццатым стагоддзі значна пачасціліся, бо гэта быў спосаб, як прадэманстраваць, што нехта з чымсьці глыбока ня згодны, і самым вядомым было забойства ў Сараеве ў 1914 годзе

спадкаемца аўстрыйскага трону, якое сталася зачэпкай для развязання Першай сусветнай вайны, а тым самым адзначыла пачатак дваццатага стагоддзя. Аварыю электронных сістэм, ад якой засцерагалі навукоўцы, называлі «Памылка 2000» альбо «MILLENNIUM BUG», і яна магла адбыцца 31.12.99 апоўначы, калі дата мянялася на 1.1.00, таму што большасць праграм карысталася двухскладнікавым летазлічэннем, і была небяспека, што электронныя сістэмы будуць успрымаць 2000 год як 1900, нібыта дваццатага стагоддзя і замаху на жыццё спадкаемца аўстрыйскага трону ніколі і не было.

Жанчыны адыгрывалі падчас Першай сусветнай вайны вялікую ролю, бо шмат мужчынаў ваявала на франтах, а жанчыны за іх павінны былі працаваць на заводах, у грамадскім транспарце і да т. п. Падчас Першай сусветнай узнікла таксама і ваенная прапаганда, бо вайна была ўсюды, у тым ліку і ў тыле, і каб яна як мага хутчэй скончылася, людзі павінны былі рашуча ахвяраваць сабою. І аўстрыйскія жанчыны з плакатаў гукалі: «WIR HALTEN DURCH!», а брытанскія жанчыны з плакатаў гукалі: «WOMEN OF BRITAIN SAY — GO!», а венгерскія жанчыны з плакатаў гукалі: «HA MAJD EGISZER MINDNYAJAN VISSZAJOENNEK!», а італьянскія жанчыны з плакатаў гукалі: «SEMPRE AVANTI!», а французскія жанчыны з плакатаў гукалі: «ILS SONT BRAVES, NOS GARS!», а амерыканскія жанчыны з плакатаў гукалі: «GEE! I WISH I WERE A MAN! I'D JOIN THE NAVY!». І ўсё гэта азначала: Мы вытрымаем, наперад, аднойчы ён да нас вернецца, толькі наперад, нашыя хлопцы самыя смелыя, гэй, каб я была мужчынам, то адразу б пайшла ў маракі. Неўзабаве на плакатах пачалі з'яўляцца і дзеці, а на адным англійскім плакаце было намалявана яйка, з якога вылазіла немаўля са стрэльбай і штыком пад надпісам: «ЦІ ЁСЦЬ ТУТ ЯШЧЭ ЯКІ ФРЫЦ?». А ў міністэрствах асветы разважалі, якім чынам найлепш паспрыяць канчатковай перамозе. А немцы казалі, што французы ядуць жабаў, а рускія малых дзяцей, а французы казалі, што немцы ядуць малых дзяцей і каровіныя рубцы. Жанчыны таксама пасылалі невядомым салдатам на фронт пасылкі і лісты, а салдаты ім адказвалі і хацелі ведаць, колькі ім гадоў. Магло стацца, што салдат гінуў, не дачакаўшыся ліста, і тады камандзір шукаў у сваім падраздзяленні кагосьці з такім самым імем, каму ніхто

не пісаў. А жанчыны пасылалі лісты, і працавалі на зброевых заводах, і выраблялі бомбы і атрутныя баявыя газы. У Англіі на зброевых заводах працавала мільён жанчын, і з іх прыкладна 18 у дзень слеплі і яшчэ колькі паміралі, атруціўшыся газам. У жанчын, якія працавалі на зброевых заводах, былі аранжавыя валасы і жоўтыя твары, і людзі называлі іх «канарэйкамі». А дактары лічылі, што дзве траціны з іх пасля вайны будуць бясплодныя. Баявыя газы выкарыстоўваліся для дэмаралізацыі варожых салдатаў, але прарваць варожую лінію фронту газ не мог. А салдаты, якія не паспелі надзець газаахоўнікі, махалі рукамі, быццам танулі. Хто ўмеў плаваць кролем, рабілі рухі, як пры плаванні кролем, а хто кролем не ўмеў, тыя плавалі брасам альбо па-сабачаму. І стараліся выплысці з газу куды-небудзь, дзе можна было дыхаць.

Перад Першай сусветнай вайной людзі ў гарадах свяцілі газніцамі, а на вёсцы свечкамі ці лучынамі, а ў печы палілі вугалем альбо дровамі, але неўзабаве да гарадоў дайшла электрычнасць, дзякуючы якой у новым стагоддзі мусілі здзейсніцца самыя неверагодныя мары. Людзі ў вёсках спачатку электрычнасці баяліся, да таго ж яны не ведалі, на якое ліха яна ім трэба, бо радыё ці грамафон былі мала ў каго. Толькі пасля Другой сусветнай вайны, калі пачалі выпускацца лядоўні, пральныя машыны, сокавыціскалкі і тэлевізары, людзі на вёсцы вырашылі, што будуць слухаць радыё і глядзець тэлевізар, каб ведаць, што робіцца ў гарадах, і патрабавалі ад уладаў, каб тыя паскорылі электрыфікацыю. Інжынеры называлі радыё «бяздротавая тэлефанія», і некаторыя старэйшыя людзі думалі, што радыё — гэта нешта накшталт тэлефона, і што яны плацяць грошы, каб ім нехта тэлефанаваў і казаў, дзе пачалася вайна. А калі людзі ўпершыню глядзелі тэлевізар, то думалі, што гэта як кінапраектар, які яны бачылі на выставе-кірмашы, і што нехта ў хаце — нявестка ці ўнук — жартуе з іх, круцячы ў суседнім пакоі ручку. А яшчэ некаторыя старэйшыя людзі адказвалі на пытанні, якія задавалі тэле- ці радыёвядучыя, напрыклад, калі нехта ў тэлевізары альбо ў радыё казаў: «ЯК ВЫ ДУМАЕЦЕ, ЧЫМ ГЭТА СКОНЧЫЛАСЯ?», людзі адказвалі: «ДАЛЬБОГ, НЕ ВЕДАЮ», альбо калі ў тэлевізары ці ў радыё казалі: «А ЯКОЕ Ж ЗАЎТРА БУДЗЕ НАДВОР'Е?», адказвалі «ХАЙ БЫ ЎЖО ДОЖДЖЫК ПАЙШОЎ, А

ТО Ж ПАГАРЫЦЬ УСЁ». Таксама былі дасягнутыя вялікія поспехі ў галіне гігіены, бо перад Першай сусветнай вайной людзі мыліся рэдка, а нават калі і мыліся, то ўся сям'я — у адной балеі, ці нават уся сям'я разам з суседзямі і да т. п. У багатых людзей у гарадах з'явіліся ўласныя ванны, а з цягам часу і гарачая вада. Але астатнія людзі — і гараджане, і вяскоўцы — доўгі час цёплай вады баяліся, бо думалі, што ў ёй жывуць мікробы. Яны яшчэ дакладна не ведалі, што гэта такое, але ўяўлялі іх сабе як нешта, што да здаровага жыцця не пасуе. А дактары неслі ў народ асвету і тлумачылі, што ў цёплай вадзе мікробаў не больш, чым у халоднай, хоць гэта і не да канца высветлена. Такім чынам паступова было дасягнута тое, што і ў вёсках людзі пачалі рэгулярна мыцца — раз на месяц, ці на чатырнаццаць дзён, ці нават раз на тыдзень. А ў канцы стагоддзя людзі ў развітых краінах мыліся і прымалі душ двойчы на дзень ці нават часцей, і ва ўсіх былі унітазы і адрыўная туалетная папера ў рулонах. Адрыўную туалетную паперу прыдумаў адзін швейцарскі вытворца паперы ў 1901 годзе ў той самы дзень, калі швейцарскія ўлады выдалі Італіі анархіста, якога падазравалі ў замаху на жыццё італьянскага караля, і ў газетах пісалі, што гэта непрыкметнае, але важнае вынаходніцтва. А ў 1914 годзе адна французанка прыдумала бюстгальтар, і газеты пісалі, што вынаходніцтва бюстгальтара падорыць жанчынам, якія мараць пра спартовы і сучасны лад жыцця, новыя магчымасці, а канец гарсэтаў — гэта канец старога свету, які, нібыта гарсэтам, быў сціснуты рознымі забабонамі. А ў 1935 годзе амерыканцы прыдумалі бюстгальтар з паралонавымі кошыкамі для жанчын з малымі грудзямі. А ў 1986 годзе ў заходніх гарадах жанчыны хадзілі на маніфестацыі за правы жанчын і наўмысна здымалі з сябе бюстгальтары перад журналістамі, каб паказаць, што правы павінны быць аднолькавыя як для мужчынаў, так і для жанчын. А спажыванне вады на аднаго жыхара вырасла з дзесяці літраў да ста пятнаццаці, і па ўсім свеце ўпаў узровень падземных водаў, і з'явілася пагроза, што праз пяцьдзесят ці праз сто гадоў вады пачне не ставаць.

У першы год ці мо паўтара пасля пачатку вайны часам здаралася, што салдаты перастаўалі страляць адзін у аднаго, і на некалькі гадзін усталёўвалася нікім не абвешчанае

замірэнне, і салдаты паводзілі сябе так, нібыта ніякай вайны няма. Пад Вакуа навучаны сабака бегаў ад нямецкіх ліній да англійскіх і назад і насіў салдатам хлеб, цыгарэты, шакалад і каньяк. У немцаў былі цыгарэты і шакалад, але не было хлеба і каньяку, а ў англічан хапала хлеба і каньяку, але было мала цыгарэт. А каля Прэдацца аўстрыйскія салдаты паслалі італьянцам ката з паперкай, на якой было напісана: «ПАСЫЛАЕМ ВАМ НАШАГА КАТА З ЦЫГАРАЙ». Цыгара была прывязаная матузком кату да спіны. Італьянцы скурылі цыгару, а ката забілі і з'елі. А ля Карансі на Шчадрэц у 1914 годзе нямецкія і французскія салдаты разам спявалі калядныя песні, пілі за здароўе і гарлалі адно аднаму анекдоты. А немцы крычалі французам, ці праўда, што тыя ядуць жабаў, а французы пыталіся ў немцаў, ці праўда, што ад піва расце барада. А ў ваенных штабах на гэтыя неабвешчаныя замірэнні заплюшчвалі вочы, бо для салдатаў гэта была магчымасць адпачыць, а значыць, можна было зэканоміць на звальненнях. А пазней нямецкае найвышэйшае камандаванне вырашыла, што было б шкада не выкарыстаць гэтыя неабвешчаныя замірэнні дзеля прапаганды і інфармавання ворага, і пачалі друкаваць улёткі і паштоўкі, якія потым нямецкія салдаты пасылалі цераз мінаае поле разам з цыгарэтамі. На ўлётках было напісана, што англічане толькі ўдаюць, быццам дапамагаюць французам, што ўсходняга фронту ўжо няма, і што рускую армію ўжо загналі за Урал. А на паштоўках былі фатаграфіі французскіх салдатаў, што патрапілі ў нямецкі палон, і ў іх былі загарэлыя твары і чыстая уніформа.

Былі таксама людзі, якія з нецярплівасцю чакалі дваццаць першага стагоддзя і казалі, што для чалавецтва гэта новы шанец, што трэба вучыцца на памылках мінулага і ствараць новага чалавека, які будзе лепш адпавядаць новаму часу. І што калі людзі ўлічаць памылкі мінулага, не будзе больш ні войнаў, ні хваробаў, ні паводак, ні землятрусаў, ні эпідэмій, ні таталітарных рэжымаў, бо новы чалавек будзе дынамічны, талерантны і пазітыўны. Пра дваццатае стагоддзе казалі, што яно было самым знішчальным і жахлівым, і што так ці інакш горш ужо не будзе, але іншыя казалі, што горш можа быць заўсёды, ці прынамсі гэтак жа дрэнна. Некаторыя людзі, якія чыталі Біблію, казалі, што чалавецтва непапраўнае, і што ў

Бібліі ўсё зашыфравана ў анаграмах, і што там, напрыклад, сказана, хто на каго і калі ўчыніць замах, дзе і калі будзе ўрадавы крызіс альбо пачнецца вайна, хто, дзе і як доўга будзе прэзідэнтам, альбо што там, напрыклад, напісана: «МІЛЬЁН ЗАБІТЫХ ПАД ВЕРДЭНАМ», ці: «ЦЫКЛОН Б», ці: «ХВАРОБА СНІД», ці: «ПАДЗЕННЕ КАМУНІЗМУ Ў РАСІІ», і ўсе даты і падрабязнасці, папросту ўсё, што было і што будзе, але што гэта нельга ведаць наперад, бо мы проста не ведаем, што трэба шукаць, а калі б мы ведалі, што трэба шукаць, то маглі б знайсці ўсё своечасова, але тады б ужо нічога не спраўдзілася, таму і няможна нічога знайсці. Яны казалі, што гэта можа падацца дзіўным, але што яны дасягнулі прасвятлення. А некаторыя казалі, што канец свету настане ўжо вельмі хутка, а іншыя казалі, што давядзецца яшчэ пачакаць. А антраполагі казалі, што канец свету для асобы і для супольнасці — гэта вельмі важна, бо памяць пра яго дае магчымасць перамагчы страх і агрэсіўнасць і скарыцца перад уласнай смерцю. А псіхолагі казалі, што важна, каб чалавек мог на нечым спагнаць агрэсію, і што лепш за ўсё для гэтага падыходзяць спартовыя спаборніцтвы, бо падчас іх усе пазбаўляюцца ад агрэсіі, а мёртвых пры гэтым нашмат менш, чым у вайну.

У нямецкай арміі ў 1944—1945 гадах ваявала паўмільёна жанчын, і некаторыя з іх працавалі ў так званых сапёрных брыгадах, каб нямецкім вайскоўцам было як адступаць, а іншыя жанчыны збівалі варожыя самалёты, што бамбардавалі нямецкія гарады. А чатыры мільёны жанчын працавалі ў цывільнай абароне, і выцягвалі мерцвякоў з-пад абломкаў разбамбардаваных дамоў, і адвозілі іх у брацкія магілы, каб не пачаўся паморак. А ў некаторых гарадах для жанчын былі арганізаваныя спецыяльныя курсы, як спальваць трупы. Курсы доўжыліся чатыры дні і былі арганізаваны для групаў з пятнаццаці ці дваццаці слухачак. Тыя вучыліся карыстацца прыстасаваннямі для драблення костак, зараўноўваць яму, у якую складалі мерцвякоў, прасейваць глебу, каб у гэтую яму пазней можна было пасадзіць дрэвы. Дрэвы ў гарадах мелі вялікае значэнне, бо забяспечвалі ўзнаўленне кісларoду, а попел з трупаў мог быць выкарыстаны ў якасці ўгнаення для садовых дрэваў і гародніны, бо арганічных угнаенняў у Германіі пачало бракаваць. Мерцвякі пад абломкамі дамоў

былі скручаныя калачыкам, а часам здаралася, што два ці тры трупы трымаліся за рукі ці сціскалі адзін аднаго ў абдымках, і каб вызваліць, іх даводзілася адпілоўваць пілой. А адна жанчына не хацела адпілоўваць трупы, і камандзір брыгады па разборы завалаў загадаў расстраляць яе за сабатаж, але салдаты, што павінны былі прывесці загад у выкананне, тым часам дэзертавалі.

Іпрыт быў самы дзейсны з усіх баявых газаў, таму ён паступова выціснуў астатнія баявыя газы, такія як хлор, фасген, хлорпікрын, сінільную кіслату ці арсін, і з поспехам выкарыстоўваўся яшчэ доўга пасля Першай сусветнай вайны. Тым часам навукоўцы прыдумалі новыя баявыя атрутныя газы: люізіт, табун, зарын ці заман. Выкарыстанне баявых газаў забаранялася на розных канферэнцыях у 1899, 1907, 1922, 1925, 1946, 1954, 1972, 1990 і 1992 гадах. А на франтах і ў тыле праходзілі газаахоўныя вучэнні, і вайскоўцы і цывільныя вучыліся як найхутчэй нацягваць газаахоўнікі і мусілі пры гэтым сачыць, каб у фільтр не трапіў пясок альбо друз. У 1915 годзе французы прыдумалі спецыяльныя газаахоўныя маскі для коней, а ў 1922 годзе немцы прыдумалі спецыяльныя газаахоўныя маскі для сабак. А ў канцы стагоддзя дактары прыдумалі лекі для прафілактыкі атручання газам, аднак праз некаторы час выявілася, што гэтыя антыдоты выклікаюць гепатыт, туберкулёз, мігрэнь і правалы ў памяці. Падчас Другой сусветнай вайны немцы выраблялі 18 000 тон баявых газаў за год, аднак нямецкія стратэгі лічылі, што выкарыстанне баявых газаў запавольвае прасоўванне войска наперад, а таксама ўскладняе адступленне. Немцы выкарыстоўвалі газы для вынішчэння цыганоў і габрэяў у канцэнтрацыйных лагерах. Яны прыдумалі газ, які атрымаў назву «Цыклон Б» і дазваляў забіваць вялікую колькасць людзей танна і хутка. «Цыклон Б» паводле свайго складу належаў да групы дэзінфекцыйных рэчываў і ўпершыню быў апрабаваны ў 1940 годзе ў канцэнтрацыйным лагеры Бухенвальд на 250 цыганскіх дзецях, якіх чэшская паліцыя затрымала ў горадзе Брно. І тэст пацвердзіў, што для такой мэты ён падыходзіць лепш, чым іншыя газы.

Вялікім расчараваннем дваццатага стагоддзя было тое, што

абавязковая школьная адукацыя, тэхнічны прагрэс, асвета і культура не вядуць да таго, каб чалавек рабіўся лепшым і больш чалавечным, як верылі ў дзевятнаццатым стагоддзі, і што мноства катаў і масавых забойцаў любілі мастацтва, і слухалі оперы, і хадзілі на выставы, і пісалі вершы, і вывучалі гуманітарныя навукі і медыцыну і да т. п. А сярод філосафаў чым далей, тым больш прыхільнікаў набывала думка, што дваццатым стагоддзем скончылася эра гуманізму і пачалася новая эра, якая атрымала назву «постгуманістычная», бо пакуль што не было зразумела, якое ёй даць вызначэнне. Гісторыкі і філосафы казалі, што гуманізм быў культурай пісьменства, і што ён дапамагаў кіраваць грамадствам як супольнасцю чытачоў, і што пасля з'яўлення ў 1918 годзе радыё, а ў 1945 годзе тэлебачання, а пасля — тэхналагічнай рэвалюцыі васьмідзесятых і дзевяностых гадоў гэты прынцып больш не працуе. І што апошні ўдар гуманізму нанесла біяінжынерыя. А некаторыя казалі, што ўсё ў парадку, што гуманізм — гэта вялікі падман у гісторыі чалавечага мыслення, і што ён за цэлыя стагоддзі не быў здольны чалавека аптымізаваць. І што біятэхналогіі даюць новы шанец для аптымізацыі чалавека, бо ўпершыню ў гісторыі чалавецтва паўстала пытанне пра прэнатальную селекцыю. І што ў будучыні першаснай задачай будзе пошук адпаведнага коду аптымізацыі. А іншыя казалі, што гэта няпраўда, і што гуманізм аптымізаваў чалавека ў тым сэнсе, што зрабіў яго адказным за свае ўчынкі, і што гэта ўжо быў вялікі прагрэс. Але чым далей, тым больш людзей прыходзіла да высновы, што адказнасць сёння ўжо незапатрабаваная, і што ёй на змену прыйшла прадукцыйнасць і мэтазгоднасць. І што новы чалавек будзе не адказны, а прадукцыйны. І што калі прадукцыйнасць — натуральны прынцып уладкавання свету, то адказнасць — гэта гуманістычная прыдумка і эўфемістычная назва непрадукцыйнасці.

Пасля Першай сусветнай вайны ў Еўропе пашырыліся камунізм і фашызм, бо многія людзі схіляліся да думкі, што стары свет прагніў, і што трэба шукаць новых шляхоў, і што дэмакратычны рэжым выявіў сябе няздольным прадухіліць сусветную вайну, і што капіталізм прывёў да эканамічнага крызісу. Камуністы і фашысты казалі, што трэба прыдумаць новага чалавека, які

будзе і горды, і моцны, і працавіты, і сумленны, і будзе мець пачуццё вышэйшай справядлівасці і калектывізму. Вышэйшая справядлівасць азначала, што людзі не абсалютна роўныя, як гэта сцвярджалі папярэднія дэмакратычныя рэжымы, канстытуцыі якіх прызнавалі за кожным з грамадзян роўныя правы. Камуністы і фашысты лічылі, што правы чалавека служаць толькі прыкрыццём інтарэсаў буржуазіі, якая эксплуатуе рабочых, а тыя казалі, што свет трэба пазбавіць ад буржуазнай гнілоты, каб было магчыма раз і назаўсёды развітацца са старым светам і ўсталяваць новы. Фашысты казалі, што ў новым свеце ўсе будуць рабочымі, як калісьці ўсе былі хрысціянамі, а камуністы казалі, што ў новым свеце будзе створана бясклясавае грамадства, у якім усе будуць працаваць у імя ўсеагульнага дабрабыту. І казалі, што камунізм — гэта заканамерны канчатковы этап чалавечай гісторыі. І што да абеду людзі будуць выконваць фізічную працу, а пасля абеду — разумовую. Першая камуністычная партыя была створана ў 1918 годзе ў Савецкім Саюзе, а першая фашысцкая партыя была створана ў 1919 годзе ў Італіі, а з Італіі фашызм распаўсюдзіўся па ўсёй Еўропе, бо людзям здавалася, што палітычная ўлада карумпаваная і што шматпартыйная сістэма адно толькі патрабуе вялікіх выдаткаў, а ў выніку нічога не дае. Камуністы і фашысты былі супраць шматпартыйнасці і казалі, што шматпартыйнасць і дэмакратыя вядуць да дэградацыі грамадства і страты каштоўнасцяў. І што калі яны прыйдуць да ўлады, яны гарантуюць добрае і шчаслівае жыццё ўсім, акрамя тых, хто гэтага не заслугоўвае, і што трэба даць магчымасць свабодна развівацца здароваму ядру грамадства і пазбавіцца ад паразітаў, якія не хочуць адмовіцца ад старога свету, бо няздольныя думаць па-рэвалюцыйнаму. А ў Германіі ўзнік нацызм, які падкрэсліваў неабходнасць захавання расавай чысціні, гэта значыць, што арыйцы не павінны былі змешвацца з непаўнавартаснымі расамі, каб не сапсаваць арыйскай крыві. Пазнаць арыйца было проста: яны былі светласкурыя і светлавалосыя і мелі суадносіны шырыні чэрапа да яго даўжыні меншыя за 0,75, і былі адораныя творчымі здольнасцямі і пачуццём калектывізму. Нацысты казалі, што прырода жорсткая, але справядлівая. І казалі, што той, хто хоча ўсталяваць новыя рэвалюцыйныя ідэі і каштоўнасці і вышэйшую справядлівасць, таксама павінен быць жорсткі, але

справядлівы. І што гісторыя — гэта вечны бой паміж праўдай і маной. І што яны, нацысты, і ёсць праўда. І што кожны чалавек павінен вырашыць, на якім баку ён будзе стаяць, бо інакш яго змяце ўраган гісторыі.

Нацысты прыдумалі газавыя камеры і «Цыклон Б», які дазваляў забіць шмат людзей танна і хутка, каб уратаваць арыйскую расу ад дэгенерацыі. Нацысты лічылі, што арыйская раса найлепшая, і што найлепшы з арыйскіх народаў — гэта немцы, бо яны ўмеюць ваяваць, гандляваць і ладзіць масавыя забавы. А яшчэ яны казалі, што Еўропа перажывае заняпад, але яны змогуць прадухіліць разлажэнне, бо кінуць Еўропу на волю лёсу да поўнага яе заняпаду было б вялікай памылкай. І яшчэ казалі, што трэба ачысціць Еўропу ад тых, хто нічога не варты: ад цыганоў, ад славянаў, ад блазнаў, ад гомасексуалістаў і да т. п., але галоўнае — ад габрэяў, бо габрэі маюць намер згвалціць Еўропу. І ў Германіі, і ў акупаваных краінах ладзіліся аблавы на габрэяў. Іх вывозілі ў канцэнтрацыйныя лагеры, дзе іх распраналі дагала і пасылалі ў спецыяльныя памяшканні, якім далі назву «газавыя камеры». Гэта былі вялікія залы з адзіным уваходам без вокнаў, па столі цягнуліся трубкі, і калі ў залы напіхвалі людзей, з трубак на іх пускалі газ, і людзі душыліся. У атручаных людзей вырывалі залатыя зубы, а з некаторых сцягвалі скуру і з гэтай скуры выраблялі абажуры на лямпы для найвышэйшага камандавання і для выбітных палітычных дзеячаў. А перад тым, як паслаць у газавыя камеры, людзей абстрыгалі дагала, а валасы пасля выкарыстоўвалі для набівання матрацаў ці на парыкі лялькам. А навукоўцы прыдумалі, як з тлушчу задушаных людзей вырабляць мыла для нямецкіх салдатаў. Да пяці кілаграмаў тлушчу трэба было дадаць 10 літраў вады і кілаграм кальцынаванай соды. Сумесь варылася ў катле тры гадзіны, пасля трэба было дадаць крыху солі, яшчэ трохі паварыць і пакінуць, каб сумесь ахалодала, пакуль не ўтворыцца скарынка, якую трэба было зняць, растаўчы і зноў паварыць. Перад тым, як варыва канчаткова ахалоджвалі, у яго дадаваўся адмысловы раствор, каб мыла не смярдзела. У Гданьску адзін нямецкі салдат страціў розум, таму што да вайны ў яго была каханая дзяўчына, пра якую ён не ведаў, што яна габрэйка, і якую потым адвезлі ў канцлагер Асвенцім, а сябры яму дзеля жарту сказалі, што мыла, якім ён

мыецца — з яго каханай, што ім гэта сказаў начальнік гданьскага інстытута анатоміі, куды вазілі трупы, каб рабіць з іх мыла. І таго салдата пасля давялося везці ў Германію ў вар'ятню.

З цягам часу вернікі ў большасці пагадзіліся, што Біблія — хутчэй сімвалічная, чым навуковая кніга, і што са стварэннем свету не ўсё да канца зразумела, але гэта не важна, бо Біблія — гэта алегорыя, а алегорыя і ёсць ключом да таямніцы ўладкавання сусвету і наканаванасці чалавечага лёсу, а гэта ўсё падпарадкавана той самай найвышэйшай волі. І што тут не ўсё так проста. А некаторыя засноўвалі секты і верылі ў розныя рэчы. Іншыя абвяшчалі, што чалавек можа зрабіцца Богам, яны верылі ва ўсеагульнае паўстанне з мёртвых і складалі генеалагічны архіў, каб было вядома, хто ёсць хто, калі надыдзе ягоная чарга. Іншыя не елі мяса, не пілі алкаголю, не курылі, спадзяваліся на хуткае прышэсце Хрыста і не маглі дачакацца, калі пойдуць у рай, а іншыя верылі, што ў кожным чалавеку схаванае святло, і што калі яны будуць доўга медытаваць, то Святы Дух у іх гэтае святло запаліць. Але самыя вядомыя былі Сведкі Еговы, пяцідзесятнікі і амішы, якія былі супраць электрычнасці і свяцілі газніцамі, хадзілі ў чорнай вопратцы і казалі, што дасягненні навукі і тэхнікі вядуць да таго, што чалавек аддаляецца ад Бога, а адыход чалавека ад Бога — гэта мэта Антыхрыста, які хоча забіць у чалавеку душу. Сведкі Еговы ў несмяротнасць душы не верылі, аднак верылі, што пасля смерці вернуцца на зямлю і будуць жыць у вечным шчасці, і што разам з імі таксама вернуцца на зямлю дваццаць два біблейскія патрыярхі, для якіх Сведкі Еговы пасля вайны пабудавалі ў Каліфорніі вялікі дом. І што людзі забудуць зямныя мовы і будуць камунікаваць сілаю веры і думкі. А напрыканцы стагоддзя развялося шмат апакаліптычных сектаў, якія хацелі паскорыць надыход апакаліпсісу і пабудаваць новы лепшы свет, шлях у які будзе адкрыты толькі тым, хто своечасова дасягнуў прасвятлення. І чым менш рабілася хрысціянаў, тым больш рабілася людзей, якія былі перакананыя, што нейкі Бог існуе, але што трэба шукаць яго ў іншым месцы. А іншыя людзі верылі, што жыццё на Зямлі, ці, прынамсі, чалавек, узнікла ў выніку ўмяшання незямных сілаў, што нейкія іншапланецяне прызямліліся калісьці даўно на

Зямлі і распылілі ў атмасферы кісларод ці апладнілі нейкую малпу, каб магла ўзнікнуць разумная істота. А ў 1954 годзе адзін амерыканец прыдумаў саенталогію. Ён казаў, што саенталогія — гэта адзіны сапраўдны шлях да свабоды, і што яна зробіць магчымым вызваленне ўсяго чалавецтва. Яшчэ ён казаў, што свет створаны не Госпадам Богам, а людзьмі, створаны калісьці даўно, калі ўсе людзі былі несмяротнымі адухоўленымі элементамі. Пры стварэнні свету здарылася аварыя, і людзі згубілі сваю моц і гэтак дэградавалі, што забыліся, што яны несмяротныя і адухоўленыя. Аднак саенталогія можа вызваліць іх з кайданоў матэрыі, прасторы і часу і дапамагчы ім зноў здабыць усведамленне саміх сябе, а значыць і згубленую моц.

На пачатку стагоддзя вялікія надзеі ўскладаліся на пазітывізм, і на электрычнасць, і на вынаходніцтвы, і на біялогію, і на эвалюцыю сысуноў, і на псіхалогію, і на сацыяльную фізіку, якую яшчэ называлі сацыялогія, і навукоўцы лічылі, што, выкарыстаўшы перадавыя веды і сродкі, якія сучасная навука дае чалавецтву, будзе магчыма вывесці больш дасканалага чалавека і такім чынам пабудаваць новы, больш рацыянальны і больш гуманны свет. На мяжы дзевятнаццатага і дваццатага стагоддзяў набыла вядомасць еўгеніка, якая вывучала магчымасці ўдасканалення чалавечага роду. Еўгеністы казалі, што чалавечы род побач са здаровымі і паўнавартаснымі індывідамі ўключае таксама менш каштоўныя асобіны, гэта, напрыклад, блазны, злачынцы, п'яніцы, прастытуткі і да т. п., і менавіта яны развіццё чалавечага роду запавольваюць. І еўгеністы прапаноўвалі ўладам, каб тыя выдалі закон, які б дапамог прыбраць са шляху развіцця чалавецтва біялагічна заганныя элементы, якія пакутуюць ад прыроджанай спадчыннай схільнасці да асацыяльнага жыцця. І казалі, што біялагічна заганных асоб трэба стэрылізаваць, каб пазбавіцца ад заган і каб ядро засталося здаровае. І выпрацавалі статыстыку, і казалі, што, напрыклад, васьмідзесяцітрохгадовая алкагалічка цалкам будзе мець 894 нашчадкі, 67 з якіх будуць злачынцамі-рэцыдывістамі, 7 — забойцамі, 181 — прастытуткамі, 142 — жабракамі, а 40 — блазнамі, цалкам — 437 асацыяльных элементаў. І падлічылі, што дзяржаве гэтыя асацыяльныя элементы будуць каштаваць столькі ж, колькі

будаўніцтва 140 шматкватэрных дамоў. Нацысты ж пазней падлічылі, што і стэрылізацыя, і кастрацыя, і прымусовыя аборты, і ўтрыманне ў спецыяльных установах каштуюць грамадству грошай, якія можна было б скарыстаць на больш патрэбныя рэчы, і што прасцей за ўсё пазбаўляцца ад асацыяльных элементаў з дапамогай эўтаназіі. І больш за 200 000 асацыяльных элементаў было змешчана ў канцэнтрацыйныя лагеры і забіта ў газавых камерах, што дало магчымасць нацыстам выпрабаваць і ўвесці ў эксплуатацыю газавыя камеры яшчэ перад абвяшчэннем канчатковага вырашэння габрэйскага пытання. Асацыяльныя элементы ў канцэнтрацыйных лагерах насілі на грудзях чорную зорку, а габрэі насілі жоўтую зорку, а палітычныя вязні насілі чырвоную зорку, а гомасексуалісты, якія ўтваралі асобную катэгорыю асацыяльных элементаў, насілі ружовы трохкутнік.

Пасля Першай сусветнай вайны пачалі будавацца помнікі палеглым салдатам, каб пра іх не забыліся. Гісторыкі казалі, што помнікі палеглым салдатам былі ўжо перад Першай сусветнай вайной, але толькі ў дваццатыя гады яны зрабіліся універсальным сімвалам памяці для заходняй цывілізацыі, а скульптары і каменячосы радаваліся, бо мелі шмат замоў. Помнікі палеглым часцей за ўсё рабіліся ў выглядзе стэлы ці абеліска. Наверсе быў певень, Святы Георгій альбо арол — у залежнасці ад таго, якой нацыянальнасці былі палеглыя салдаты, пасярэдзіне быў салдат з рашучым выразам на твары і са зброяй, а ўнізе — жанчыны і дзеці, і антраполагі і этнографы казалі, што гэта мае вялікае значэнне для індаеўрапейскай культуры. Імёны палеглых салдатаў звычайна пісаліся паводле алфавіту. Часцей за ўсё на помніках сустракаліся словы «РАДЗІМА», «ГЕРОІ», «ПАКУТНІКІ» і «ПАМЯТАЙ». Часам на помніку таксама быў надпіс «ХАЙ БУДЗЕ ПРАКЛЯТАЯ ВАЙНА!», а ў некаторых гарадах паставілі помнікі салдатам, якія падчас вайны былі пакараныя смерцю альбо прысуджаныя да прымусовых работ за тое, што не хацелі падпарадкоўвацца загадам. А ў 1916 годзе пад Жувенкурам быў пакараны смерцю салдат, у якога не было форменных штаноў, бо ён не захацеў апрануць штаны забітага таварыша, таму што яны былі брудныя і перапэцканыя ў крыві. А ў 1920 годзе французы прыдумалі помнік невядомаму салдату з вечным агнём, які

карыстаўся вялікай папулярнасцю ў Англіі, Бельгіі і Італіі, а таксама ў новых краінах, якія пакуль што не мелі гісторыі — у Чэхаславакіі, Югаславіі і г. д. Невядомым салдатам мог зрабіцца салдат, якому пры выбуху адарвала галаву, ці салдат, якому варожая куля прастрэліла апазнавальную бірку, ці салдат, якога заваліла зямлёй, ці салдат, якога засмактала багна. Адзін бельгійскі салдат праваліўся каля Куртэ ў балота па калена, і чатыры ягоныя сябры не маглі яго выцягнуць, а ўсе коні ўжо былі мёртвыя. А калі праз два дні яны адступалі гэтай самай дарогай, салдат яшчэ быў жывы, але з дрыгвы тырчала толькі ягоная галава, і ён ужо не крычаў.

А калі нацысты прайгралі вайну, дзяржавы-пераможцы арганізавалі міжнародны суд, і юрысты думалі, як на ўсё рэжым канчатковае вырашэнне габрэйскага пытання і розныя пляны ліквідацыі цыганоў і славянаў і да т. п., і прыдумалі паняцце «генацыд». Гісторыкі меркавалі, што ў дваццатым стагоддзі ў свеце адбылося прыкладна шэсцьдзесят генацыдаў, але не ўсе ўвайшлі ў гістарычную памяць. Гісторыкі казалі, што гістарычная памяць не ёсць часткай гісторыі, бо з гістарычнай сферы яна перасунулася ў сферу псіхалагічную, і што такім чынам усталяваўся новы рэжым памяці, калі гаворка ідзе ўжо не пра памяць падзей, а пра памяць памяці. І што псіхалагізацыя памяці ў людзях абудзіла адчуванне, быццам яны павінны аддаваць мінуўшчыне доўг, але не было зразумела, які і каму. Канчатковае вырашэнне габрэйскага пытання пазней атрымала назву «галакост», альбо «шоа», бо габрэі казалі, што тут гаворка не можа ісці пра генацыд, але пра нешта іншае, нешта яшчэ горшае за генацыд, нешта, што выходзіць за межы чалавечага разумення, і не хацелі, каб галакост ставіўся ў адзін шэраг з іншымі генацыдамі, і казалі, што трэба разглядаць яго як нешта спецыфічна габрэйскае. І многім людзям здавалася, што габрэі генацыд прыўлашчваюць, і яны казалі, што ахвяра любога генацыду ўспрымае свой досвед як нешта, што пераўзыходзіць чалавечае разуменне, і што габрэі падмяняюць гістарычную рэальнасць яе рэпрэзентацыяй і такім чынам парадаксальна спрыяюць таму, што большасць людзей уяўляе галакост як нейкую драматычную сцэну з фільма. А некаторыя рабіны казалі, што габрэі загінулі ў канцэнтрацыйных лагерах невыпадкова, што

Новыя
Новыя
Вясёлая ўдава
Габрэі на Мадагаскары
Тэазаалогія
Камунікацыя
Арыйская раса
Немцы дбалі пра гігіену
Злачынства супраць чалавечнасці
Фільтрацыйныя лагеры
Пераўтварэнне старога свету
Вяртанне да адухоўленасці
Стэрылізацыя
Байструкі
Падрыўная антыдзяржаўная дзейнасць
Непрыстасоўныя грамадзяне
Заняткі анатоміі
Ад стэрылізацыі няма карысці
Дзеці хацелі быць самастойнымі
Асацыяцыі пратэставалі
Перасцярога пакаленням
Кола агляду
Захаванне памяці
Габрэі ў Палестыне
Усё было агульнае
Лялькі з пенісам

Заклік да супраціву не памылка, а рэінкарнацыя душаў, якія ў
Універсалізм вырашаў і, бо вельмі мала людзей здольныя
Прабаецца ад душы богабаязнай і цнатлівай на працягу ўсяго
Грайцы ў мала жыцця. А гісторыкі казалі, што заходняе
Грамадства перайшло ад традыцыйнага разумення гісторыі як
Перамагаў памяць да ўяўлення пра памяць, якая
Як прыгнуць ў фрагменты гісторыі. А іншыя рабіны
Хацелі, робіў ад сталакоступіў адступіў убок, і што гэта не
Было канчаранне ў поўным сэнсе слова, а проста вяртанне свету
Да свайго сярод спачатку выгляду, да часоў, калі Бог яшчэ
Не ўстаў ўдаваў і даўжыў была толькі цемра над прорвай. А адна
Дабрачынная ўсё пераважыла вайну дзякуючы таму, што грала
На скрыпцы ў пероне ў Дахаў арыі з «Вясёлай удавы». А
Гісторыкі казалі, што эпоха ідэнтычнасці незваротна
Што чыла б, бо гістарыяграфія ўвайшла ў эру эпістэмалогіі.
Лёс чалавецтва
Гомасексуалісты і г. д.
Arbeit macht frei
Вычварэнскае мастацтва
Нямецкае мастацтва
Справядлівы гнеў
Моладзь
Амерыканцы прасунуліся наперад
Негры пачуваюцца найлепш
Каразук зук зук
Аднаўленне трансцэндэнтальнай інстанцыі
Залаты век
Чаму пачалі менш нюхаць табаку
Мілеіум
Змоўнікі
Канец Старога свету
Альбанскі этнас
Добры знак
Культурныя зрухі ў грамадстве
Паталагічны суб'ект змяніўся
Вербалізацыя трывогі
Канакі сядзелі перад буданамі
Маракі былі ўсцешаныя
Моладзь хацела займацца сексам
Нефармальныя думкі

Пра канчатковае развязанне габрэйскага пытання нацысты
пачалі думаць у 1940 годзе, калі вырашылі дэпартаваць усіх
еўрапейскіх габрэяў на Мадагаскар. У Еўропе павінны былі
застацца толькі тыя габрэі, якія мелі ўплывовых і багатых
сваякоў у Амерыцы і ў Аргентыне, і нацысты прыкінулі, што
габрэяў з заможнымі і ўплывовымі сваякамі ў Амерыцы і ў
Аргентыне набярэцца ў Еўропе каля 10 000, і іх меркавалася
размясціць у спецыяльным канцэнтрацыйным лагеры. А
астатнія прыкладна дзевяць мільёнаў габрэяў трэба было
дэпартаваць на Мадагаскар, дзе планавалася зрабіць
рэзервацыі з унутраным самакіраваннем, і габрэі былі б там
сярод сваіх і паступова б цалкам дэградавалі, бо прырода
выкінула іх са свайго ўлоння. І без прыліву арыйскай крыві,
якой яны сілкаваліся ў Еўропе, габрэі б з цягам часу ўсе
павымiралі. Ідэя перасялення ўсіх габрэяў на Мадагаскар
упершыню прагучала ў 1905 годзе ў кнізе аднаго венскага
экзэгета, які вывучаў Стары Запавет і заалогію, і прыдумаў
новую дысцыпліну, якую назваў тэазаалогія, і прыйшоў да
высновы, што Гасподзь Бог не існуе і што свет быў створаны
багамі, якія мелі чалавечую сутнасць, але ўмелі высылаць
электрычныя сігналы, і валодалі тэлепатыяй, і былі
несмяротныя і адухоўленыя, але паступова пачалі змешвацца з
людзьмі і жывёламі і зрабіліся смяротнымі. І ён казаў, што
найбліжэй да багоў і да першага пакалення богалюдзей

Знаходзяцца арыйцы, у якіх яшчэ можна адшукаць рэшткі
Электронная кніга
Нямецкія вучоныя на Мадагаскар, а ў Германіі заснаваць
ТЫСЯЧКІ ÖSTERREICH
Заканчваюць апладняцца арыйскімі самцамі, каб наноў
Сайт пра кнігі
Кампутарны рэгістрычных імпульсаў. Урэшце нацысты палічылі,
Злодзеі тавараў на Мадагаскар будзе каштаваць грошай, якія
Людзі патрэбныя на развіццё
Знішчэнне
Яны ніяк
Прастора
Чалавек, па сутнасці, малпа
Новы свет
Людзі марыць навуцыца думаць па-новаму
Сцёртае памяці
Людзі верылі фатаграфіям
Новыя думкі
Страта памяці
Памяць не есць канстытуцыйнай
Random Access Memory
Вярнуцце да карэнню мудрасці
Жыць у гармоніі з прыродай
Шэраг рабочых буйных радасным хваляваннем
Жанчыны жылі дружэй
Амерыканцы хацелі змяніць прэзідэнта
Лепш за усё жывецца у Канадзе
Будучыня поўная узрушэнняў
У свеце усталюецца мір
Вайна ніколі не заканчваецца
Еўрапейская ідэнтычнасць
Перарваная гісторыя
«Мокры герохора»
Універсальная мова
Перакладчыка адпусцілі у звальненне
Змога эсперантысту
Рэпутацыя Інтэрграмадзянаў
Камунікацыя
Канцэптуальныя структуры
Дажыткаў раене

Людзі падарожнічалі ў запламбаваных таварных вагонах, якія былі зачынены на працягу ўсяго шляху, ім не было куды сцэрціся ў прыватнасці, а калі нехта паміраў, то заставаўся ў вагоне. Некаторыя канцэнтрацыйныя лагеры былі прызначаныя для працы, іншыя для знішчэння габрэяў, якія ўяўлялі сабой небяспеку для арыйскай расы. Калі людзі прыязджалі ў лагеры смерці, немцы падзялялі іх на дзве ці тры групы: мужчыны — асобна, жанчыны — асобна, а часам і дзеці — асобна, загадвалі ім распрануцца, лагода і забіралі вопратку. Здаралася, што немцы сабе катэгорыі прыглядалі, калі ім быў патрэбны новы работнік, ці пераканаўшыся, ці маладая прыгожая служанка, а астатніх адпраўлялі ў газавыя камеры. На дарогу ад вагонаў да газавай камеры мужчынам хапала дзесяці хвілін, а жанчынам пятнаццаці: бо ў іх былі даўжэйшыя і гусцейшыя валасы і абстрыганне займала больш часу. Абстрыжаныя валасы пасля выкарыстоўваліся для набівання матрацаў і ішлі на парыкі пяльцам, а каб людзі на пероне не пачалі бунтаваць, нацысты казалі ім, што ўсе спачатку пойдуць у лазню, а часам ім нават раздавалі квіткі і казалі, што іх трэба будзе паказваць на ўваходзе. А на будынках вакол былі шыльды з надпісамі «БУФЕТ», «КАСА», «ТЭЛЕГРАФ» і да т. п., і людзі, калі іх пераклад чыталі, думалі, што яны на вакзале, і што распрануцца і абстрыгацца валасоў патрэбна з гігіенічных прычын, бо немцы вельмі дбалі пра гігіену, а за сто кілаграмаў валасоў кіраўніцтва лагера атрымлівала пяць рэйхсмарак. І людзі казалі сабе, што, памыўшыся, паедуць у іншы лагер, дзе будуць працаваць, бо руплівая праца — найлепшы шлях да

Тыпаграфія. У газавыя камеры людзі ўваходзілі з узнятымі
Стэрыльнасць забіхтуецца
Прыступкі да ўдзячнай прыроды
Адкрадаўся
Выпускны
Комінтэрн быў звольнены
Спажыванне крывяніка
Апакаліпсіс
Несвоечасовы
Сацыяльная імагінацыя
Этэрсберг
Пашпартовая картка у Тыргас
Эксперыменты з олізнятамі
У гаворцы быў крыху
Пазітыўныя думкі
Арыгінальныя ідэі
Запаветныя олізняты
У цэнтры быў цымляны позірк
Доўгагаловыя славяне
Крынка жыцця
Фашызм універсальны
Насустрач буду ішці
Мастацтва належыць усім
Арыгінальныя ідэі
Дыктатура пралетарыяту
Сілянне не хочуць выконваць задачы
Буржуазная плюта
Васпіпалонныя
Людзі беглі з воклічамі
Немцы шылі уніформы
Дробязныя канцылярыі
Чорная дзірка
Усе есць фікцыяй
Атамная бомба
Гэтыпыя умовы
Канчатковая перамога Германіі
Мяжа галавечыя адносіны
Погляд на свет
Народ і цывілізацыя
Упарадкаванне памяці

Першы генацыд дваццатага стагоддзя адбыўся ў Турцыі ў 1915 годзе. Спачатку ўлады арыштавалі і расстралялі 600 армянскіх сем'яў, якія жылі ў Цярградзе, потым абяззброілі і расстралялі салдатаў армянскага паходжання, якія служылі ў турэцкім войску, і ўсе армяне атрымалі загад пакінуць гарады і вёскі пягам дваццаці чатырох ці сарака васьмі гадзін, а турэцкая армія занядла пазіцыі каля гарадскіх брамаў, і калі людзі выходзілі, усіх мужчынаў перастралялі, а жанчын з дзецьмі пагналі ў пустыні Месапатаміі. І жанчынам з дзецьмі давялося ісці пешкі без ежы трыста ці пяцьсот кіламетраў, і большасць іх загінула. А французы, англічане і рускія падалі ноту пратэсту, у якой упершыню ў гісторыі пісалася пра злачынства супраць чалавечнасці. А адзін нямецкі афіцэр, які ў той час знаходзіўся ў турэцкім войску як інспектар, прывёз у Германію 66 фотаздымкаў армянскага генацыду і паслаў іх нямецкаму імператару, прыпісаўшы, што Германіі трэба больш мірна выбіраць сваіх саюзнікаў, таму што ганьба Турцыі кідае цень і на Германію. А ў 1928—1949 гадах рускія дэпартавалі дзесяць мільёнаў грамадзян падазронай нацыянальнасці: армянаў, татараў, літоўцаў, эстонцаў, украінцаў, палякаў, немцаў, малдаванаў, грэкаў, карэйцаў, калмыкаў, курдаў, ингушоў і інш. 30% з іх загінула па дарозе, а 20% памерла пягам пастуднага года. Камуністы пазней казалі, што гаворка ішла не пра дэпартацыю, а пра аптымізацыю геаграфічнай прасторы і што гэта быў першы крок на шляху да новай надзяржаўнай супольнасці, калі будзе важна не тое, дзе хто жыве, а тое, наколькі хто рупліва працуе дзеля ўсеагульнага дабрабыту. А ў 1934 годзе яны прыдумалі рэзервацыю для габрэяў і звярнуліся да ўсіх савецкіх габрэяў з заклікам туды пераселіцца. Рэзервацыя знаходзілася на мяжы з Кітаем у Хабараўскім краі, і зімой тэмпература там падала да –40°C, а камуністы казалі, што гэта не рэзервацыя, а аўтаномная вобласць, і што там габрэі змогуць жыць сярод сваіх і будуць мець уласнае самакіраванне. А ў 1944 годзе яны дэпартавалі ў

Казіўстан і Кіргізстан 477 000 чачэнцаў у 12 525 вагонах для
Прыёмы на 190 000 чачэнцаў памёрлі па дарозе ад голаду і
Сацыяльныя 1999 тыднасць
Чачэнцаў спецыяльныя лагеры, якія атрымалі назву «ізалятары
часовага ўтрымання». А ў 1948 годзе камуністы абвінавацілі
журналістаў, дактароў і інжынераў габрэйскага паходжання ў
касмапалітызме, сіянізме і буржуазных перакананнях, і
большасць з іх загадалі расстраляць, а астатніх адправілі ў
канцэнтрацыйныя лагеры. Колькасць ахвяр армянскага
генацыду склала паводле прыкладных падлікаў паўтара
мільёна чалавек, а туркі казалі, што армянскі генацыд не быў
сапраўдным генацыдам, і габрэі ў большасці з імі пагаджаліся.

Саентолагі казалі, што чалавек па сутнасці добры, але што
некаторыя людзі лепшыя за іншых, і яны падзялілі чалавецтва
на чатыры групы. Самыя лепшыя былі самі саентолагі, бо яны
ведалі тое, чаго не ведалі іншыя. Да другой групы належала
большая частка людзей, якія пакуль што не дасягнулі
прасвятлення, а пятую частку чалавецтва складалі людзі, якіх
называлі «магчымыя крыніцы праблем» (POTENTIAL TROUBLE
SOURCES), і гэта былі людзі, якія казалі, што саентолагі з'ехалі
з глузду. А два з паловай працэнта складалі SUPPRESSIVE
PERSONS, і гэта былі людзі, якія хацелі задушыць праўду і
знемагчыміць вызваленне чалавецтва. І саентолагі прыдумалі
72 спосабы для іх выкрыцця, каб у момант спірытуальнага
пераўтварэння старога свету яны не маглі схавацца сярод
астатніх. Каб выкрываць тых, хто не жадае вызвалення
чалавецтва, саентолагі прыдумалі спецыяльныя аддзелы
бяспекі, агенты якіх прымаліся на працу на тэрмін адзін
мільярд гадоў. Саентолагі казалі, што чалавецтва рана ці позна
дасягне вызвалення, але што на гэта можа спатрэбіцца нейкі
час. І казалі, што чалавек можа дасягнуць прасвятлення ўжо
падчас свайго зямнога жыцця і такім чынам забяспечыць сабе
вяртанне да адухоўленасці і несмяротнасці, але перш за ўсё
чалавек павінен вызваліцца з кайданоў матэрыі і часу. Чалавек,
пазбаўлены кайданоў матэрыі, мог вярнуцца ў часе аж на 75
мільёнаў гадоў назад і ўсвядоміць усе траўмы, якія за гэты час
перажыў. Траўмы сталі прычынай страты энергіі, і калі чалавек
хацеў зноў здабыць страчаную з-за траўмаў энергію, ён
найперш павінен быў адключыць у сваёй свядомасці энграмы,

што захавалі сляды чалавечай памяці. Адключыўшы энграмы, чалавек пазбаўляецца памяці і свайго чалавечага наканавання і можа падарожнічаць у часе і дасягнуць прасвятлення.

Першы закон аб стэрылізацыі непаўнавартасных і асацыяльных элементаў быў прыняты ў 1907 годзе ў Злучаных Штатах. Закон даваў дабро на стэрылізацыю закаранелых злачынцаў і псіхічна хворых, а ў 1914 годзе з ініцыятывы псіхіятраў быў пашыраны на злодзеяў-рэцыдывістаў і алкаголікаў, а ў 1923 годзе ў Місуры яго пашырылі таксама на злодзеяў-куракрадаў негрыцянскага і індзейскага паходжання, бо пра беласкурых куракрадаў меркавалася, што яны яшчэ здолеюць стаць на шлях выпраўлення і ўключыцца ў жыццё грамадства з дапамогай свядомай руплівай працы. А ў 1929 годзе закон аб стэрылізацыі выйшаў у Швейцарыі і Даніі, а ў 1934 годзе — у Нарвегіі, а ў 1935 — у Фінляндыі і Швецыі, і ў Швецыі заставаўся ў сіле ажно да 1975 года, і 13 810 шведаў і 48 955 шведак былі стэрылізаваныя паводле рашэння суда. У краінах з каталіцкай традыцыяй не было еўгенічных законаў, бо каталікі былі супраць тэорыі развіцця, стэрылізацыі і абортаў і казалі, што ніхто не мае права адбіраць у чалавека тое, што дадзена яму Богам, а пратэстанты пярэчылі, што ментальнасць развіваецца, і што адмаўленне прагрэсу тыповае для каталікоў, і што яны гэта гавораць ужо трыста гадоў. У камуністычных краінах для стэрылізацыі непаўнавартасных элементаў было дастаткова ўказання лекара, а ў Югаславіі, Румыніі і Чэхаславакіі былі таемна стэрылізаваныя таксама албанкі і цыганкі, таму што ўлады меркавалі, што колькасць албанцаў і цыганоў у сацыялістычным лагеры надта хутка расце. У Германіі закон аб стэрылізацыі быў прыняты ў 1933 годзе, калі да ўлады прыйшлі нацысты, і ў першую чаргу былі стэрылізаваныя дзеці, якіх называлі RHEINLANDBASTARDE, ці «рэйнскія байструкі», гэта былі дзеці, маці якіх былі немкі, а бацькі — чарнаскурыя салдаты французскага войска, якое ў той час акупавала Рэйнскую вобласць. І 514 рэйнскіх байструкоў былі стэрылізаваныя і накіраваныя ва ўстановы для псіхічна хворых, а маці рэйнскіх байструкоў былі асуджаныя за супрацоўніцтва з ворагам і за падрыў нямецкай дзяржавы і накіраваныя ў канцлагер у Равенсбруку. Лагер у Равенсбруку быў спецыяльны лагер для жанчын, і пазней туды накіроўвалі

жанчын, якія ажыццяўлялі падрыўную антыдзяржаўную дзейнасць з ваеннапалоннымі ці з рабочымі з акупаваных краін, што працавалі на нямецкіх заводах і фермах, і 92 350 жанчын у Равенсбруку загінулі. А ў канцэнтрацыйным лагеры ў Дахаў дактары мелі ў сваім распараджэнні баракамеру, у якой вывучалі паводзіны дзяцей, хворых на эпілепсію, і імкнуліся знайсці адрозненні паміж спадчыннай і няспадчыннай эпілепсіяй. А ў 1910 годзе амерыканцы стварылі Еўгенічны статыстычны інстытут, а ў 1922 годзе кіраўнік гэтага інстытута прапанаваў уладам спіс сацыяльна непрыстасоўных грамадзянаў, якіх у інтарэсах захавання здаровай паўнавартаснай супольнасці трэба было стэрылізаваць. Спіс быў падзелены на дзесяць групаў згодна з разнастайнымі медыцынскімі і сацыяльнымі крытэрамі і ўключаў грамадзянаў, залежных ад дзяржавы, грамадзянаў без сталага месца жыхарства і з нізкім узроўнем даходаў, грамадзянаў з прыроджанымі дэфектамі альбо з хранічнымі ці заразнымі хваробамі, асобаў са значным пагаршэннем зроку ці з сур'ёзным парушэннем слыху, бяздомных, блазнаў, злачынцаў, прастытутак, гомасексуалістаў, сіфілітыкаў, алкаголікаў, наркаманаў, сухотнікаў і эпілептыкаў. Медыкі таксама даследавалі, ці ёсць розніца паміж эпілепсіяй у людзей і ў трусоў, якіх кіраўніцтва лагера выпісвала з Вены. А Вена, у сваю чаргу, замаўляла ў лагеры ў Маўтгаўзене трупы для Інстытута анатоміі і для медыцынскага факультэта. Трупы мусілі быць свежыя і непашкоджаныя, і Інстытут анатоміі замаўляў 460 непашкоджаных трупаў у год, з іх большая частка прызначалася для прэпаравання на занятках анатоміі. А ў Нарвегіі пасля вайны ў адзінокіх матак былі адабраныя дзеці, бацькамі якіх былі нямецкія вайскоўцы, і накіраваныя ва ўстановы для псіхічна хворых. І шмат біёлагаў, генетыкаў, псіхіятраў і антраполагаў былі перакананыя, што еўгеніка — побач з вынаходніцтвам электрычнасці — ёсць найважнейшым для чалавецтва дасягненнем сучаснай навукі, бо гэтаксама як электрычнасць пераўтварыла матэрыяльныя ўмовы жыцця людзей і расчыніла перад светам дзверы ў новую эпоху, гэтак і еўгеніка радыкальна пераўтворыць біялагічны падмурак грамадства і паспрыяе пераходу свету да новай эры. Але некаторыя еўгеністы казалі, што ад стэрылізацыі карысці — як ад казла малака, і падлічылі, што спатрэбіцца дваццаць два

пакаленні, каб агульная колькасць блазнаў і псіхапатаў знізілася на 0,9 %, і яшчэ дзевяноста пакаленняў, каб колькасць блазнаў і псіхапатаў у папуляцыі стабілізавалася на адной статысячнай долі, і казалі, што трэба знайсці нейкі хутчэйшы сродак, каб зрабіць чалавецтва больш здаровым.

Разам з эмансіпацыяй жанчын і вынаходніцтвам кантрацэптываў, тампонаў і аднаразовых падгузкаў у Еўропе паменела дзяцей, але затое паболела цацак, садкоў, горак, дзіцячых пляцовак, сабак, хамякоў і да т. п. Сацыёлагі казалі, што дзіця зрабілася ў сям'і цэнтрам увагі, а паступова і самым уплывовым членам. І дзеці хацелі быць самастойнымі, і хацелі мець права быць асобамі, і не жадалі даношваць шапку ці боты пасля старэйшых братоў і сёстраў, а хацелі толькі новыя шапкі, і боты, і алоўкі, і канструктары, і новых мядзведзікаў, і новых лялек. У еўрапейскіх краінах у дваццатым стагоддзі было выраблена ў дванаццаць з паловай тысяч разоў больш лялек, чым у дзевятнаццатым, і замест дрэва ці габлюшак для іх вырабу цяпер выкарастоўвалася пластмаса, і з часам лялькі навучыліся плакаць і размаўляць, і чым далей, тым рабіліся больш самастойнымі, і казалі, напрыклад, «ДОБРАЙ РАНІЦЫ!» ці «СМАЧНА ЕСЦІ!», а некаторыя лялькі ўмелі крычаць, ці зрыгваць пасля яды, ці маглі праспяваць урывак з арыі. Самай вядомай была лялька, якую пачалі выпускаць у 1959 годзе і назвалі Барбі. Ростам яна была 30 сантыметраў і мела вялікія грудзі і клубы і тонкую талію, і гэта была першая лялька, якая паводзіла сябе, як дарослая. Неўзабаве і яна пачала размаўляць і казала: «УВЕЧАРЫ Ў МЯНЕ СПАТКАННЕ З МАІМ ХЛОПЦАМ», альбо «ШТО МНЕ АПРАНУЦЬ НА БАЛЬ?», альбо «ХАДЗЕМ СА МНОЙ КУПЛЯЦЬ СУКЕНКУ!». Спярша яна была апранутая як балерына, ці як артыстка, ці як мадэль, а пазней таксама як сцюардэса, настаўніца, ветэрынарка, бізнес-лэдзі, касманаўтка ці кандыдатка на пост прэзідэнта. А ў 1986 годзе з'явілася лялька Барбі ў паласатай шапачцы і ў паласатай робе, такой самай, якую насілі вязні ў канцэнтрацыйных лагерах. Розныя асацыяцыі былых вязняў пратэставалі і казалі, што гэта здзек з іхніх пакут і з памяці пра ахвяр, але вытворцы бараніліся і казалі, што гэта, наадварот, вельмі добры спосаб пазнаёміць маладое пакаленне з пакутамі ў канцэнтрацыйных лагерах, і што дзяўчынкі, якія набудуць ляльку ў паласатай вопратцы,

будуць сябе з ёю атаясамліваць, а пазней, калі зробяцца дарослымі, лягчэй зразумеюць, што гэта былі за пакуты. А ў 1998 годзе немцы надумаліся зрабіць у Берліне вялікі мемарыяльны комплекс ахвярам галакосту, бо задача мемарыяльнага комплексу — гэта не толькі ўслаўленне вялікіх гістарычных падзей, але таксама перасцярога будучым пакаленням. Некаторыя людзі меркавалі, што мастацкі твор — не самы прыдатны спосаб для адлюстравання галакосту, бо галакост і эстэтыка несумяшчальныя, а іншыя лічылі, што ідэальны быў бы такі праект, які б паказваў, што значнасць галакосту паказаць немагчыма. І чатырыста дзевяноста пяць мастакоў прыслалі розныя прапановы, як найлепшым чынам пакінуць перасцярогу нашчадкам, і адзін прапаноўваў зрабіць вялікую васьмікаляровую шасціканцовую зорку, якая б круцілася вакол уласнай восі, а іншыя прапаноўвалі зрабіць «кола агляду», на якім замест кабінак былі б вагоны з канцэнтрацыйных лагераў, а іншыя прапаноўвалі пабудаваць вялікі аўтавакзал з чырвонымі аўтобусамі і раскладам руху, дзе б канцэнтрацыйныя лагеры былі пазначаны як канцавыя прыпынкі, а нехта прапаноўваў усталяваць трыццаць дзевяць сталёвых слупоў, на якіх было б напісана «ЧАМУ?» на розных мовах: WARUM? WAAROM? VARFŘR? WHY? POURQUOI? PERCHÉ? DLACZEGO? CŮR? KUIDAS? MIKSI? MIÉRT? ZAKAJ? KODËL? HVORFOR? JIATH? PSE? NIÇIN? і г. д. Некаторыя людзі меркавалі, што трэба весці гаворку пра помнік не толькі ахвярам галакосту, але і ахвярам усіх магчымых генацыдаў, бо толькі ў такім разе ў ім будзе захавана жывая памяць гісторыі, бо інакш атрымаецца проста куча жалеза, якая праз пару дзесяцігоддзяў нікому нічога не скажа. А некаторыя гісторыкі сумняваліся, ці трэба ставіць помнікі, і казалі, што гэта ўвогуле спрэчнае пытанне, бо простае захаванне памяці пра нейкую падзею яшчэ зусім не гарантуе, што гэтая падзея не паўторыцца, і прыводзілі прыклады, калі захаванне памяці выклікала новыя канфлікты і войны.

Габрэі, якія перажылі галакост, казалі, што помнікі, музеі і да т. п. маюць вялікае значэнне, але самае лепшае — непасрэдныя сведчанні ахвяр, і хадзілі па школах расказваць вучням пра перажытае, і разважалі над пытаннем, як захаваць памяць пра галакост тады, калі яны памруць, і шведскае згуртаванне

былых вязняў-габрэяў рэкамендавала перадаць сведчанне якому-небудзь маладому чалавеку, які вывучыць яго на памяць і будзе хадзіць па школах і казаць школьнікам, што ведаў чалавека, які перажыў тое і тое, а перад смерцю перадасць сведчанне наступнаму маладому чалавеку і г. д. А ў 1945 годзе габрэі звярнуліся да сусветнай грамадскасці з патрабаваннем, каб у Палестыне была створана ізраільская дзяржава, дзе б габрэі былі сярод сваіх і болей не баяліся б новага галакосту. І яны змагаліся супраць арабаў і англічанаў, якія ў той час акупавалі Палестыну, і арганізоўвалі тэракты і таемныя акцыі па перасяленні. А ў 1939 годзе англічане ўвялі эміграцыйныя квоты, якія мусілі зменшыць колькасць перасяленцаў на 75 %, і прынялі закон, які забараняў габрэям набываць зямельныя надзелы. А ў ліпені 1947 года ў Палестыне прыстаў да берага карабель з нелегальнымі габрэйскімі эмігрантамі з Германіі, а англічане адправілі іх назад. А ў 1938 годзе шведскія ўлады звярнуліся да немцаў, каб тыя ставілі ў замежныя пашпарты габрэяў вялікае друкаванае «J», каб шведская паліцыя на мяжы магла пазнаць габрэя і ў тым разе, калі ён не выглядаў як габрэй. Карабель, які прыстаў у Палестыне, меў назву «EXODUS» паводле адной з кніг Старога Запавету, і падарожнічала на ім 4500 габрэяў, якія перажылі канцэнтрацыйныя лагеры і хацелі вярнуцца ў зямлю запаветную. А ў лістападзе Арганізацыя Аб'яднаных Нацый ухваліла стварэнне дзяржавы Ізраіль. І шмат людзей з Еўропы ездзіла ў Ізраіль, каб паглядзець, як узнікае новая дзяржава. А моладзь з Еўропы ездзіла працаваць у яўрэйскіх камунах, якія атрымалі назву «KIBBUTZUM», і ў якіх усе працавалі дзеля дабрабыту ўсіх. І ўсё было агульнае, і ўсе гуртам спявалі песні. А ізраільскія турыстычныя фірмы выпускалі плакаты, на якіх маладыя людзі з сур'ёзнымі тварамі назіралі за ўзыходам сонца над Іерусалімам, і пад гэтым было напісана: «НАШЫ ПАКУТЫ БЫЛІ НЕДАРЭМНЫЯ» і «Спяшайцеся! Сезонныя зніжкі!».

Сексолагі казалі, што лялька Барбі ёсць першым сродкам для станаўлення феміннага самаўсведамлення ў малых дзяўчатак, і што поспех, які яе напаткаў, ёсць доказам існавання дзіцячай сексуальнасці. Пра дзіцячую сексуальнасць у дваццатым стагоддзі было шмат размоў, асабліва калі выявілася, што малыя дзяўчаткі хацелі б мець дзіця ад свайго бацькі, і што

гэтае дзіця ёсць, па сутнасці, заменай пеніса, таму што дзяўчаткі таксама хацелі б мець пеніс, а лялька — гэта і дзіця ад бацькі, і пеніс адначасова. Лялькі доўгі час выраблялiся толькі ў выглядзе дзяўчатак, але пазней пачалі выраблящца і лялькі-хлопчыкі, а ў лялек-дзяўчатак пачалі рабіць паміж ног латачок, а ў лялек-хлопчыкаў — маленькі пеніс. А ў сямідзесятыя гады пачалася вытворчасць чорных і карычневых лялек, але іх часцей за ўсё куплялі белыя бацькі, якія тым самым хацелі прадэманстраваць, што яны не расісты. Расізм — гэта тэорыя, якая ўзнікла ў дзевятнаццатым стагоддзі. Яна сцвярджала, што чалавечыя расы маюць свае сталыя ўласцівасці і знаходзяцца на розных узроўнях развіцця, і што самыя развітыя — беласкурыя, бо яны ад прыроды валодаюць абстрактным мысленнем, уяўленнем пра арганізацыю грамадства і ўмеюць ладзіць масавыя забавы, такім чынам, расістам быў чалавек, які баяўся, што змешванне расаў паставіць пад пагрозу найлепшыя якасці белай расы і падточыць генетычны патэнцыял, які дазваляе белым крочыць на чале ўсяго чалавецтва. Людзі, якія не шанавалі габрэяў, былі не расістамі, а антысемітамі, таму што габрэі, калі разабрацца, не лічыліся непаўнавартаснымі, як, напрыклад, негры, альбо індусы, альбо цыганы і да т. п., — хутчэй іх трэба было разглядаць як памылку прыроды. Слова «антысеміт» з'явілася напрыканцы дзевятнаццатага стагоддзя і абазначала чалавека, які не жадае, каб габрэі авалодалі светам, і заклікае іншых грамадзянаў да супраціву. Расізм зрабіўся важнай палітычнай праблемай пасля Другой сусветнай вайны, таму што ў багатых еўрапейскіх краінах атабарыліся вялікія нацыянальныя меншасці, якія грамадства мусіла абсарбаваць. Існавалі дзве палітычныя мадэлі абсорбцыі нацыянальных меншасцяў: інтэграцыя і асіміляцыя. Інтэграцыю праводзілі краіны, якія верылі, што ў грамадзянскай супольнасці могуць суіснаваць розныя культурныя мадэлі і што лепш іх паміж сабой не змешваць, а захаваць кожнай свае спецыфічныя рысы, а асіміляцыю праводзілі краіны, якія верылі ва універсалізм і лічылі, што існуе вышэйшы грамадскі інтарэс, якому падпарадкоўваюцца ўсе этнічныя і культурныя асаблівасці. Інтэграцыю абвяшчалі, галоўным чынам, пратэстанцкія краіны — Англія, Швецыя і г. д., а за асіміляцыю выступалі, галоўным чынам, краіны з каталіцкай традыцыяй — Францыя, Італія

альбо Бельгія. Доўгі час здавалася, што асіміляцыйная мадэль мае большы поспех, чым інтэграцыйная, бо ў краінах, якія яе прытрымліваліся, не было расавых канфліктаў, як у Англіі ці ў Амерыцы, ды і колькасць змяшаных шлюбаў у іх была значна большая, але напрыканцы стагоддзя пачалі гаварыць пра глабалізм і мандыялізм. Універсалізм выйшаў з моды, і кожны хацеў мець сваю адметнасць, жыць у гармоніі з традыцыямі, шанаваць свае карані і быць за мультыкультурнасць.

Секс у дваццатым стагоддзі ў Еўропе набыў вялікае значэнне, нават большае за рэлігію, і амаль такое ж, як грошы, і ўсе хацелі кахацца ў розных пазіцыях і рознымі спосабамі, і мужчыны мазалі сабе чэлес какаінам, каб ён даўжэй вытрываў у эрэкцыі, хоць какаін і быў забаронены ўсімі магчымымі спосабамі. А пасля Другой сусветнай вайны ў фільмах пачалі з'яўляцца сцэны, у якіх героі займаліся сексам, што раней лічылася непрымальным, бо яшчэ шмат людзей верыла ў Госпада Бога, і на любошчы часцей за ўсё толькі намякалася тым, што ў кадры з'яўляўся ложак, альбо гадзіннік, альбо раптам цямнела. А жанчыны хацелі кожнага разу мець аргазм, а мужчыны праз гэта нерваваліся, і ў іх з'яўляліся праблемы з эрэкцыяй, і яны спрабавалі розныя афрадызіякі і хадзілі да псіхааналітыкаў, каб даведацца, у чым прычына, ці не перанеслі яны ў дзяцінстве нейкую траўму, пра якую не ведаюць. Псіхааналіз у 1900 годзе прыдумаў адзін венскі неўролаг, які хацеў вывучаць псіхічныя працэсы, і выяўляць асаблівасці суб'ектаў з дапамогай падсвядомасці, і лічыў, што неўроз, істэрыя і да т. п. ёсць сімптомамі сексуальных траўмаў у дзяцінстве, і прыдумваў для гэтага новыя метады і паняцці, такія як прынцып асалоды і разрадка афекту альбо цэнзура, эга, супер-эга, лібіда і комплекс, які мог быць кастрацыйны альбо Эдыпаў. А ў 1938 годзе гэты неўролаг уцёк ад нацыстаў у Лондан, а чатыры ягоныя сястры памерлі ў канцэнтрацыйным лагеры. А калі пацыент даведваўся, чаму ён прыгнечаны і неўратычны, яму адразу ж рабілася лепей, бо гэта было нармальна. Камуністы казалі, што людзям, якія жывуць у камуністычным грамадстве, секс непатрэбны, бо найбольшую асалоду чалавек павінен атрымліваць ад добра выкананай працы, тым часам як пры капіталізме людзі ад сваёй працы радасці не адчуваюць, бо іх эксплуатуюць, і таму ім патрэбныя

розныя сурагаты. І яшчэ яны казалі, што без класавай свядомасці секс не можа прынесці задавальнення, нават калі будзе паўтарацца бясконца. Камуністы баяліся, што калі людзі пачнуць хадзіць да псіхааналітыкаў і захапляцца рознымі сурагатамі, гэта паставіць пад пагрозу згуртаванасць сацыялістычнага лагера. А яшчэ яны не хацелі, каб людзі чыталі ўпадніцкую літаратуру, насілі кідкую вопратку і прычоскі, жавалі жуйкі і да т. п. Жавальную гумку прыдумаў адзін амерыканскі аптэкар, а ў Еўропе яны пачалі прадавацца ў 1903 годзе, але папулярнымі зрабіліся галоўным чынам у пяцідзесятыя і шасцідзесятыя гады. Жавалі іх у асноўным маладыя людзі, якія такім чынам дэманстравалі сваё стаўленне да супольнасці і яшчэ не мелі ў зубах пломбаў.

У пяцідзесятыя гады кінагероі кахаліся на росных гонях, бо росныя гоні сімвалізавалі маладосць і новае жыццё, якое адкрывалася перад маладымі героямі, а вецер гайдаў каласы, а на гарызонце садзілася сонца, а ў жанчын уздымаліся грудзі, а ў шасцідзесятыя гады кінагероі кахаліся ў марскім прыбоі на беразе акіяна, бо гэта было рамантычна, і пясок прыставаў да іхнае скуры, і былі відаць іхныя азадкі, а над вадою ўздымалася пара. У шасцідзесятыя гады з'явіліся і першыя парнаграфічныя фільмы, у якіх героі ўвесь час кахаліся ў розных месцах. А ў часопісах для маладых дзяўчат больш дасведчаныя рэдактаркі тлумачылі, як правільна рабіць мінет і ўсё такое. А ў часопісах для маладых хлопцаў больш дасведчаныя рэдактары тлумачылі, як заўчасна не эякуляваць і як незаўважна нацягнуць прэзерватыў. А рэкламныя агенцтвы прыдумвалі рэкламы прэзерватываў і разважалі, як найлепш прыцягнуць увагу маладых гледачоў, і адно агенцтва прыдумала рэкламныя ролікі, у якіх займаліся сексам розныя казачныя персанажы — Беласнежка, Папялушка, Асліная Шкура і Шахерэзада. У мастацкіх фільмах таксама кахаліся чым далей, тым больш, аднак крытыкі казалі, што гэта іншае, бо гэта не палавы акт сам сабою, а ягоная рэпрэзентацыя. А калі ў нейкім мастацкім фільме было шмат сексу, яны казалі, што гэты фільм выражае наш энтамалагічны падыход да кахання, і што гэта правільна, бо гэта дае нам магчымасць паразважаць пра ролю сексу не толькі ў антрапалагічным, культурным ці палітычным кантэксце, але і ў жыцці чалавека. У сямідзесятыя гады

кінагероі кахаліся пераважна ў аўтамабілях, бо гэта было арыгінальна, а жыццё рабілася ўсё больш імклівым, а маладыя гледачы, якія аўтамабіля не мелі, так маглі ўявіць, што іх чакае ў жыцці. А мужчыны чым далей, тым часцей былі знізу, а жанчыны на іх сядзелі, бо тым часам адбылася эмансіпацыя. А ў васьмідзесятыя гады ўзнік секс па тэлефоне, і мужчыны тэлефанавалі на розныя нумары, дзе ім жанчыны казалі ў слухаўку: «Я АДЧУВАЮ, ЯК РАБЛЮСЯ ВІЛЬГОТНАЙ», альбо «УСАДЗІ МНЕ ЯГО ДА КАНЦА», альбо «ЦІ ТЫ ДАСІ МНЕ ЯГО ПАКАШТАВАЦЬ?» і да т. п.

Псіхааналіз у Заходняй Еўропе значна пашырыўся ў шасцідзесятыя і сямідзесятыя гады, і на яго хадзілі людзі, якія не былі хворыя, але пачуваліся безабароннымі і пакінутымі і хацелі ведаць, ці не было ў іх траўмаў, і калі чалавек пераадольваў сарамлівасць і разнявольваўся, ён расказваў псіхааналітыку пра сваё дзяцінства, і гэта называлася перанос, таму што чалавек нарэшце ўспамінаў нешта, што ў дзяцінстве выціснуў з памяці, бо не ведаў, што ў духоўным жыцці нічога не мінае бясследна, і тое, што аднойчы здарылася, канечне, часова магло быць выціснута з памяці, але недзе яно заставалася і пакідала вербальныя сляды, якія псіхааналітык мог расчытаць. З памяці нешта выціскалася, напрыклад, тады, калі ў хлопчыка ці ў дзяўчынкі ўзнікала жаданне, якое не адпавядала нормам маралі, і тады гэтае жаданне адсоўвалася на ўзровень падсвядомага, але калі дзеці вырасталі і рабіліся дарослымі, то ім сніліся нейкія дзіўныя сны, і тады было зразумела, што ў іх траўма. А Эдыпаў комплекс бываў тады, калі дзяўчынка хацела забіць маці, каб кахацца з бацькам, а хлопчык — бацьку, каб мець магчымасць кахацца з маці, але ж яны добра ведалі, што так рабіць нельга. Пра Эдыпаў комплекс сярод спецыялістаў вяліся спрэчкі, бо некаторыя лічылі яго універсальным, а іншыя схіляліся да думкі, што ён праяўляецца толькі ў некаторых культурах, у Вене і да т. п. А ў 1918 годзе ў Будапешце адбыўся кангрэс па пытаннях псіхааналізу і яго ролі ў ваенны час, і большасць псіхіятраў пагадзілася з тым, што неўроз падчас вайны мае такую ж прычыну, як і неўроз у мірны час. І розныя псіхіятры прапаноўвалі лячыць неўроз электрашокам, і лячылі салдат электрашокам да тае пары, пакуль салдаты не абвяшчалі, што пачуваюцца абсалютна

здаровымі. Але іншыя псіхіятры з гэтым не пагаджаліся і казалі, што электрашок, уласна кажучы, траўму не лечыць, а толькі адсоўвае яе ў падсвядомасць. А іншыя казалі, што некаторыя салдаты толькі прыкідваюцца, быццам у іх траўма, каб пераседзець вайну ў вар'ятні, гуляючы з іншымі блазнамі ў карты на грошы альбо на цыгарэты.

За часоў Першай сусветнай адбылося значнае развіццё гуманітарных арганізацый і дабрачынных суполак, таму што Першая сусветная вайна была ў многіх адносінах наватарская, і бакі-ўдзельнікі мелі ў распараджэнні больш стралковых і знішчальных сродкаў, а абавязковая вайсковая служба давала магчымасць задзейнічаць у вайне большую колькасць салдат, а дальнабойныя гарматы, дырыжаблі і аэрапланы дазвалялі ваяваць таксама супраць мірнага насельніцтва і наносіць эфектыўныя ўдары ў тыле, каб падрываць баявы дух працiўніка. А ў 1905 годзе дванаццаць дзяржаў падпісалі дэкларацыю, у якой гарантавалі, што будуць ратаваць параненых салдатаў незалежна ад таго, на чыім баку тыя ваююць, бо салдат — гэта не толькі прадстаўнік нейкай нацыянальнай супольнасці, але і чалавек. Некаторыя генералы з гэтым не пагаджаліся і перасцерагалі перад індывідуалістычным разуменнем ролі салдата, і казалі, што салдаты — гэта сыны сваёй айчыны, і яны павінны выконваць усё, што айчына ім загадае. А пацыфісты і гуманісты, наадварот, казалі, што чалавек павінен быць лаяльным у дачыненні да чалавецтва, а не да радзімы. А ў 1929 годзе розныя краіны падпісалі дэкларацыю, у якой абяцалі, што яны таксама будуць прыстойна абыходзіцца з ваеннапалоннымі, і што тыя змогуць атрымліваць лісты і пасылкі ад бацькоў, і ад жонак, і ад дабрачынных суполак, і ад гуманітарных арганізацый. А ў 1941 годзе савецкая ўлада абвясціла, што не жадае, каб гуманітарныя арганізацыі дапамагалі савецкім салдатам, якія патрапілі ў палон, і каб не перадавалі ім лісты і пасылкі, а савецкія генералы казалі, што гэта дэзертыры, якія прысвоілі сабе права называцца савецкімі салдатамі, бо сапраўдны савецкі салдат лепш памрэ, чым здасца ў палон. Гуманітарныя арганізацыі рабілі першую медыцынскую дапамогу, пастаўлялі арміям лекі і перавязачныя матэрыялы і ездзілі на інспекцыі ў лагеры для ваеннапалонных, каб пераканацца, ці прыстойна абыходзяцца з вязнямі, і самы

вядомы быў Чырвоны крыж. А ў 1942 годзе прадстаўнікі швейцарскага Чырвонага крыжа даведаліся пра газавыя камеры ў канцэнтрацыйных лагерах і вырашылі гэтую інфармацыю не афішаваць, бо баяліся, што немцы могуць скарыстацца сітуацыяй, каб дыскрэдытаваць гуманітарныя арганізацыі і больш не пусціць іх у лагеры для ваеннапалонных і ў шпіталі. А ў 1944 годзе немцы знялі для Чырвонага крыжа і розных міжнародных камісій дакументальны фільм пра жыццё ў канцэнтрацыйным лагеры ў Тэрэзіне. У фільме было занята 270 актораў, 1600 дзяцей і некалькі тысяч дарослых статыстаў, з ліку якіх папярэдне выключылі тых, хто меў светлыя валасы, бо яны выглядалі недастаткова па-габрэйску. Фільм меў назву «ЯК ХОРАША БЫЛО Ў ТЭРЭЗІНЕ», і габрэі ў ім хадзілі ў кавярні, вырошчвалі гародніну ў гародзіках, скакалі ўніз галавой у басейн, хадзілі ў банк па грошы і на пошту па пасылкі, слухалі оперы і дыскутавалі ў мясцовай бібліятэцы пра будучыню еўрапейскай цывілізацыі. А калі здымкі скончыліся, немцы арганізавалі адзінаццаць спецыяльных эшалонаў, і ўсіх, хто ў фільме быў задзейнічаны, адправілі ў лагер смерці ў Асвенціме. А калі савецкія ваеннапалонныя пасля вайны вярнуліся дадому, улады паслалі іх у канцэнтрацыйныя лагеры, каб яны руплівай працай кампенсавалі недахоп самаахвярнасці падчас вайны. І калі ў папярэдніх войнах у пяць разоў больш вайскоўцаў паміралa ад розных хваробаў і эпідэмій, чым ад кулі, то ў часе Першай сусветнай вайны, дзякуючы дапамозе гуманітарных арганізацый, дасягненням у хірургіі, новай зброі і да т. п., прапорцыя кардынальна змянілася, і гэта таксама было наватарскім.

Камуністы і нацысты казалі, што трэба ўсталяваць свет, які будзе адпавядаць натуральнаму стану рэчаў. Гісторыкі і антраполагі пазней казалі, што камунізм і нацызм замянілі рэлігійную веру на веру рэвалюцыйную, і што людзі ішлі за камуністамі і нацыстамі з тых самых памкненняў, што і ў касцёл, і сярод гэтых памкненняў самым моцным было пачуццё прыналежнасці да абраных, у руках якіх надалей будзе лёс чалавецтва. Нацысты меркавалі, што заўтрашні гарманічны свет будзе складацца з моцных, самаахвярных і салідарных асоб, а агульныя інтарэсы і духоўная роднаснасць усіх будуць утвараць перашкоду для разлажэння свету, якое адбылося

дзякуючы гуманістам і асветнікам. У сваю чаргу, камуністы меркавалі, што ў новым свеце ўсе грамадзяне будуць узаемазамяняльныя, і што людзі ператворацца ў адзінае маналітнае цэлае, і што ні ў кога не будзе ўласных інтарэсаў, бо ўсё будзе агульнае, і што гэта будзе перашкодай для разлажэння свету, да якога давялі эгаістычныя інтарэсы паноўных класаў. І тыя, і другія абвяшчалі непазбежнасць тэрору, бо толькі з яго дапамогай можна паспяхова змагацца супраць дэмакратыі, якая ўсё падточвае і вядзе да таго, што людзі робяцца гомасексуалістамі, анархістамі, паразітамі, скептыкамі, індывідуалістамі, алкаголікамі і г. д. І выступалі супраць гомасексуалістаў, дармаедаў і п'яніцаў, а ў камуністычнай Расіі дзеці алкаголікаў павінны былі кожную нядзелю хадзіць па плошчы з таблічкай, на якой было напісана: «ТАТА, НЕ ПІ, Я ХАЧУ МЕЦЬ МЕСЦА Ў НОВЫМ СВЕЦЕ», а ў нацысцкай Германіі п'яніцы павінны былі хадзіць па плошчы з таблічкай: «Я ЎСЁ ПРАПІЎ, І МАЁЙ СЯМ'І НІЧОГА НЕ ЗАСТАЛОСЯ». А калі п'яніцы не выпраўляліся, іх пасылалі ў канцэнтрацыйныя лагеры, каб яны там працавалі дзеля ўсеагульнага дабрабыту. У нямецкіх канцлагерах над уваходнай брамай былі словы «ПРАЦА РОБІЦЬ СВАБОДНЫМ», а ў савецкіх канцлагерах над уваходнай брамай былі словы «МЭТАНАКІРАВАНАЙ ПРАЦАЙ — ДА ВЫКАНАННЯ ПЛАНА». А замест «ДОБРЫ ДЗЕНЬ» камуністы казалі «СЛАВА ТРУДУ!», бо яны былі перакананыя, што праца мае вялікае значэнне, і што калі ўсе будуць працаваць, то камунізм пераможа ва ўсім свеце. А людзі, якія замест «СЛАВА ТРУДУ!» казалі «ДОБРЫ ДЗЕНЬ», альбо «ВІТАЮ», альбо «ПАМАГАЙ БОГ», былі падазроныя, і суседзі пра іх казалі, што яны несапраўдныя патрыёты.

А калі нацысты ў 1933 годзе выйгралі выбары, яны прынялі законы, якія забаранялі габрэям розныя рэчы. Габрэі не маглі займаць пасады ў грамадскіх установах, служыць у войску, працаваць у судзе і ў сродках масавай інфармацыі, не мелі права наведваць басейны і кінатэатры, а ў парку маглі сядзець толькі на адмыслова прызначаных лаўках, якія былі пафарбаваныя ў жоўты колер, каб адразу кідаліся ў вочы. А габрэйскія дзеці не маглі хадзіць у школу і на каруселі, і нацысты спадзяваліся, што габрэі зразумеюць, што Германія не для іх, і паедуць куды-небудзь у іншае месца. Нацысты таксама

ладзілі выставы вычварэнскага мастацтва, ENTARTETE KUNST, дзе выстаўляліся вычварэнскія і распусныя творы габрэйскіх або габрэізаваных мастакоў і скульптараў, каб перасцерагчы нямецкі народ перад небяспекай, якую нясе з сабой нездаровае мастацтва. Нацысты падкрэслівалі важную ролю мастацтва і лічылі, што вычварэнскае мастацтва — гэта першы крок да грамадства, у якім будзе вычварэнскім усё, і менавіта ад гэтага яны імкнуліся нямецкі народ засцерагчы. Яны ладзілі парады і спартакіяды з алегорыямі і жывымі карцінамі з чалавечых целаў, і казалі, што нямецкі народ не можа існаваць без мастацтва, бо мастацтва ўваткнута ў нямецкі народ, нібы вастрыё сякеры ў калоду, і запрашалі нямецкіх рабочых на нямецкія оперы, ладзілі парады і г. д., і казалі, што не варта хаваць нямецкае мастацтва ў музеях, галерэях і буржуазных салонах, таму што мастацтва — гэта здабытак масаў і яно належыць усім. А ў 1935 годзе выйшаў закон, які забараняў змяшаныя шлюбы паміж габрэямі і негабрэямі, каб уратаваць арыйскую кроў і нямецкае мастацтва ад небяспечнага габрэйскага ўплыву. І габрэі мусілі насіць на грудзях і на спіне шасціканцовую зорку Давіда і не мелі права ездзіць на аўтобусах і трамваях і карыстацца паслугамі арыйскіх пральняў. А адной лістападаўскай ночы ў 1938 годзе агенты нямецкай тайнай паліцыі ўчынілі набег на габрэйскія крамы і рабавалі іх, і пападпальвалі сінагогі, і забівалі ўсіх габрэяў, што траплялі ім на вуліцы, каб нагнаць на габрэяў страху і паскорыць іх сыход з Германіі. А міністр прапаганды казаў, што гэта адплата нямецкага народу за замах на жыццё нямецкага ваеннага аташэ ў Парыжы, бо той тэракт ажыццявіў адзін польскі габрэй. Пазней тую ноч пачалі называць «крышталёваю ноччу», бо 7200 вітрын у габрэйскіх крамах былі выбітыя і ўсе вуліцы былі засыпаныя аскепкамі. А нямецкія ўлады далі габрэям калектыўны штраф у памеры аднаго мільярда рэйхсмарак за тое, што тыя выклікалі справядлівы гнеў нямецкага народу. А ўлады Швейцарыі звярнуліся да немцаў з просьбай ставіць у замежныя пашпарты габрэяў пячатку з вялікай друкаванай «J», каб швейцарская паліцыя на мяжы пазнала габрэя нават у тым разе, калі ён не выглядаў, як тыповы габрэй. А ў краінах, дзе былі моцныя нямецкія меншасці, у Польшчы і ў Чэхаславакіі, пасля вайны былі арганізаваныя масавыя высяленні немцаў, а ў горадзе Брно

немцы павінны былі насіць на рукаве белую стужку з вялікай друкаванай «N» і не мелі права ездзіць на трамваі ці на тралейбусе. Швейцарскія ўлады баяліся, каб усе нямецкія габрэі не атабарыліся ў Швейцарыі і тым самым не парушылі этнічную раўнавагу і нацыянальны кансэнсус. А немцамі лічыліся таксама габрэі, якія да вайны былі запісаныя ў мясцовай управе як немцы альбо мелі нямецкае прозвішча, а таксама габрэі, якія хоць і мелі чэшскае прозвішча, але не ўмелі гаварыць па-чэшску, а літара «J» азначала «JUDE», габрэй, а этнічная раўнавага і нацыянальны кансэнсус былі стаўпамі швейцарскай канфедэрацыі.

А яшчэ пасля Другой сусветнай вайны ў дэмакратычных краінах пачала набываць вялікае значэнне моладзь, бо пачало ўтварацца спажывецкае грамадства, а калі маладыя людзі бачылі рэкламу чаго-небудзь маладога, яны адразу прасілі сваіх бацькоў, каб ім гэтую рэч купілі. У спажывецкім грамадстве пакаленні дзяцей выраставалі ў матэрыяльным дабрабыце: яны мелі і шапкі, і боты, і алоўкі, і канструктары, і смяяліся з бацькоў, калі тыя расказвалі, што ім даводзілася хадзіць у школу боскі альбо насіць адну шапку па чарзе з братамі і сёстрамі. А калі дзеці павыраставалі, яны пачалі казаць, што спажывецкае грамадства прыгнятае чалавека і робіць з яго раба і што трэба прыдумаць новы свет, дзе больш ніхто не будзе рабом. І ў шасцідзесятыя гады маладыя людзі пачалі пратэставаць і супраць спажывецкага грамадства, і супраць прыгнёту, і супраць войнаў, і супраць расізму і да т. п. Найперш маладыя людзі пачалі бунтаваць у Злучаных Штатах, бо амерыканцы якраз у той час ваявалі ў В'етнаме і ў стварэнні спажывецкага грамадства прасунуліся наперад далей за іншых, і мелі ванну, і тэлефон, і не надта шанавалі чарнаскурых, тым часам як маладыя людзі казалі, што негры з'яўляюцца здабыткам для чалавецтва. Вайна ў В'етнаме была першай тэлевізійнай вайной у гісторыі, гэтаксама як Другая сусветная была першай радыёвайной у гісторыі, а чарнаскурыя грамадзяне ў Амерыцы не мелі права займаць камандныя пасты ў войску, сядаць у аўтобусах на іншыя месцы, акрамя спецыяльна прызначаных, і хадзіць у прыбіральні для белых. У некаторых выпадках уваходзіць у прыбіральню мелі права толькі белыя грамадзяне, а чарнаскурым даводзілася шукаць

іншую. А часам прыбіральня была раздзеленая на два пакоі, на адным з якіх было напісана «БЕЛЫЯ», а на другім — «КАЛЯРОВЫЯ», бо надпіс «НЕГРЫ» мог неграў абразіць. Таксама і агульнаадукацыйныя школы былі двух відаў, асобна — для белых, і асобна — для чорных, а таксама каруселі, дзіцячыя пляцоўкі і пясочніцы, лаўкі ў парках, а ў некаторых месцах — і тэлефонныя будкі. Прыхільнікі асіміляцыйнай эміграцыйнай мадэлі казалі, што гэта праява сегрэгацыі, якая ёсць заканамерным вынікам палітыкі інтэграцыі, а прыхільнікі інтэграцыйнай мадэлі казалі, што гэта не сегрэгацыя, а дыферэнцыялізм і што негры ўсё адно найлепш пачуваюцца сярод сваіх і не надта імкнуцца ў кампанію белых.

Калі людзі перасталі верыць у Госпада Бога, яны пачалі шукаць сродак, каб паказаць, што гэты свет абсурдны, і прыдумалі футурызм, экспрэсіянізм, дадаізм, сюррэалізм, экзістэнцыялізм і тэатр абсурду. Дадаісты хацелі пакласці канец мастацтву і рабілі мастацтва з рэчаў, з якіх яно раней не рабілася: з дроту, з запалак, з лозунгаў, з газетных загалоўкаў, з тэлефонных даведнікаў і да т. п., і казалі, што гэта новае абсалютнае мастацтва. А футурысты пісалі вершы, у якіх было шмат выклічнікаў, напрыклад, «КАРАЗУК ЗУК ЗУК ДУМ ДУМ ДУМ», і выступалі за экспрэсіўную графіку, а экспрэсіяністы і дадаісты пісалі вершы на новых невядомых мовах, каб паказаць, што ўсе мовы між сабой — роўныя: як зразумелыя, так і незразумелыя, напрыклад: «БАМБЛА О ФАЛЛІ БАМБЛА», а сюррэалісты прыдумалі аўтаматычнае пісьмо і шукалі арыгінальныя метафары, і пісалі, напрыклад, «мая коркавая ванна нібы тваё вока дажджавога чарвяка», і тлумачылі, што сэнс гэтага верша струменіць з яго сам сабою, і што гэта праява фізічнага і метафізічнага адначасова. Экзістэнцыялісты казалі, што метафізіка знаходзіцца ў заняпадзе і што ўсё суб'ектыўна, аднак аб'ектыўнасць усё ж існуе, але што сама пастаноўка пытання — памылковая, бо ўсё роўна галоўнае — інтэрсуб'ектыўнасць. І што трэба, каб усё было аўтэнтычнае, і што гісторыя і яе ход вынікае з філасофскага пытання, ці здольны чалавек аўтэнтычна камунікаваць, а калі так, то гісторыя магла б набыць большы сэнс, чым мела дасюль, калі б магла быць адноўленая трансцэндэнтальная інстанцыя. А лінгвісты казалі, што камунікацыя — гэта толькі пытанне

спосабу дэканструкцыі, і што дэканструяваць можна рознымі спосабамі. А старыя людзі казалі, што з камунікацыяй справы дрэнь, бо людзі ўжо развучыліся глядзець адно аднаму ў вочы і адводзяць позірк, як толькі сутыкнуцца вачыма з кім-небудзь іншым, і што сёння людзі дажыліся да таго, што глядзяць у вочы толькі сляпцам.

У Першай сусветнай вайне загінула дзевяць з паловай мільёнаў мужчынаў і шэсцьсот тысяч жанчын, а шэсць мільёнаў мужчынаў і дзвесце тысяч жанчын былі пакалечаныя на ўсё астатняе жыццё. А сем мільёнаў жанчын страцілі ў вайне мужа, а дзевяць мільёнаў дзяцей засталіся пасля вайны без бацькі. А краіны мелі вялікія даўгі, і ўрады друкавалі грошы, за якія нельга было нічога купіць, і інфляцыя расла, і ў 1923 годзе выросла ў Германіі на 2,3 мільёна працэнтаў, і адно яйка каштавала каля 810 більёнаў марак, і калі нехта ішоў купіць булку хлеба, то мусіў везці з сабою грошы на тачцы. І многія людзі хацелі ад самых асноваў змяніць стары свет і ўступалі ў камуністычныя і фашысцкія партыі. А іншыя ўспаміналі даваенную Еўропу і сумавалі па старых часах, якія пачалі называць «LA BELLE ÉPOQUE», альбо «ЗАЛАТЫ ВЕК». Залаты век — гэта былі часы, калі ў развітых прамысловых краінах усяго хапала, а ў крамах каланіяльных тавараў прадавалася экзатычная садавіна, шакалад і пасціла, і людзі верылі, што новае стагоддзе дасць рады галечы і цяжкай фізічнай працы, і што людзі будуць жыць з выгодамі і гігіенічна, а абавязковая школьная адукацыя зробіць чалавека лепшым і больш чалавечным. У залаты век людзі былі больш ветлівыя адно да аднаго, і нават злачынцы былі больш абачлівыя і не стралялі ў паліцыянтаў, а маладыя людзі ставіліся адно да аднаго з пашанай і стрыманасцю і не спалі разам, пакуль не пабраліся, а калі які-небудзь маладзён дзе ў полі часам і згвалціў вясковае дзяўчо, што вярталася з працы, а дзяўчына потым зацяжарала, то яна магла аддаць дзіця ў сіроцкі прытулак, дзе на дзяржаўныя грошы пра яго клапаціліся, а калі які-небудзь аўтамабіліст пераяжджаў куру на дарозе, то ён спыняўся, выходзіў з машыны і за курыцу плаціў. А мужчыны здымалі капелюшы і не спыняліся позіркам на жанчыне, з якой не збіраліся вітацца, а ў Англіі мужчыны чакалі, калі ім жанчына дасць сігнал, што не супраць, каб з ёю павіталіся, а ў Францыі

мужчыны цалавалі жанчынам пальчаткі, а жанчыны ўпускалі з рук насовачкі, якія потым мужчыны падымалі і з паклонам жанчынам вярталі, і жанчыны не курылі, таму што гэта лічылася вульгарным і эксцэнтрычным, а мужчыны курылі толькі вірджынскія цыгары, нюхалі табаку і пагладжвалі сабе бароды. А ў нядзелю людзі хадзілі на імшу, а гараджане ездзілі цягнікамі на лецішчы, а дамы насілі карункавыя каптуры, а мужчыны клятчатыя брыджы, і гулялі ў вадзе з мячом, і смяяліся, а сюррэалісты і псіхааналітыкі пазней казалі, што гэты мяч быў, па сутнасці, сексуальным сімвалам. Пасля вайны стала больш пазашлюбных дзяцей, сіроцкіх прытулкаў і вар'ятняў, але менш сталі нюхаць табаку, бо гэта было негігіенічна.

Сведкі Еговы верылі, што Хрыстос вярнуўся на зямлю яшчэ ў канцы дзевятнаццатага стагоддзя, але што ён нябачны і што яго могуць пабачыць толькі абраныя і прасветленыя. У пачатку XX стагоддзя яны падлічылі, што ў 1914 годзе скончыцца эра паганства і пачнецца міленіум, час, калі вернікі змогуць уратавацца, а пасля Хрыстос з'явіцца ўсім. А калі ў 1914 годзе пачалася Першая сусветная вайна, яны сказалі, быццам гэта знак таго, што на небе адбылася вялікая бітва, і што Сатана быў скінуты на зямлю, і што з гэтага вынікаюць усе няшчасці дваццатага стагоддзя, і што гэта апошняе выпрабаванне, якое нам спаслаў Гасподзь, і апошні шанец для тых, хто хоча ўратавацца. Першая сусветная вайна пачалася, калі ў Сараеве быў учынены замах на аўстрыйскага эрцгерцага пры ўдзеле змоўнікаў з тайнай арганізацыі «ЧОРНАЯ РУКА». Змоўнікі прачыталі ў газеце, якой дарогай эрцгерцаг паедзе да ратушы, дзе бургамістр ужо падрыхтаваў прамову і бутэрброды, і яны пасталі абапал набярэжнай, трымаючы ў кішэнях гранаты і рэвальверы, і чакалі, калі эрцгерцаг паедзе паўз іх. А Аўстрыя абвясціла вайну сербам, а немцы абвясцілі вайну рускім, французам, бельгійцам і г. д. Канец свету быў першапачаткова прызначаны на 1925 год, але калі гэты год пачаўся, а канца свету не было, Сведкі Еговы сказалі, што гэта не галоўнае, і што больш важнае пытанне, хто патрапіць на нябёсы, і падлічылі, што абраных будзе 144 000, і што гэтыя абраныя будуць, седзячы на нябёсах, кіраваць справамі на Зямлі. А тыя, хто пры жыцці далучыўся да іхнага вучэння, будзе жыць на

Зямлі ў вечным шчасці, калі ўсталюецца новы свет. Новы свет павінен быў настаць пасля канца старога, і Сведкі Еговы казалі, што гэты канец набліжаецца, але ніякага больш дакладнага тэрміну ўжо не прыводзілі. А аўстрыйская паліцыя, пра якую казалі, што яна найлепшая ў свеце, затрымала пяцёх галоўных змоўнікаў і аддала іх пад суд, які прысудзіў іх да пажыццёвага зняволення. Змоўнікі адбывалі пакранне ў турме ў Тэрэзіне, у Чэхіі, трое з іх падчас вайны памерлі, а двое, што засталіся, пасля вайны зрабіліся народнымі героямі. І адзін з іх стаў прафесарам філасофіі ў Бялградскім універсітэце і ў 1937 годзе прапанаваў югаслаўскім уладам выгнаць з краіны косаўскіх албанцаў, бо гэты этнас у складзе югаслаўскай федэрацыі як бяльмо на воку, а калі ў 1990 годзе гэты прафесар памёр, сербы пазачынялі ў Косаве албанскія школы, забаранілі албанскія газеты, паразганялі албанскія палітычныя арганізацыі і заснавалі народную міліцыю, якая павінна была падвесці албанцаў да думкі, што ў Югаславіі для іх няма месца. Самы надзейны спосаб, як албанцам гэта растлумачыць, былі розныя тэракты, а яшчэ падпальванне дамоў, рабаванне крамаў і да т. п., а ўлады заходніх краін вырашылі, што гэта, па сутнасці, генацыд, і распачалі авіяналёты на Сербію, каб прымусіць югаслаўскія ўлады пачаць перамовы. Авіяналёты на Сербію працягваліся семдзесят восем дзён, і гэта быў першы міжнародны ваенны канфлікт у Еўропе з 1945 года, а таксама гэта была першая вайна, у якой не загінуў ніводны салдат з арміі пераможцаў, і ваенныя стратэгі казалі, што гэта добры знак і што ў будучым у войнах не будзе гінуць ніхто, акрамя ворагаў.

Псіхіятры казалі, што Першая сусветная вайна ў многіх людзей выявіла траўмы, якія дасюль былі схаваныя ў падсвядомасці, і што ў дваццатыя і трыццатыя гады людзі парабіліся неўротыкамі, бо не змаглі адаптавацца да ўнутранага ці знешняга стану рэчаў, а ў шасцідзесятыя гады ў Еўропе 25 % жанчын і 15 % мужчынаў пакутавалі на неўроз, і журналісты казалі, што гэта хвароба стагоддзя. А ў сямідзесятыя гады пачала расці колькасць людзей, схільных да дэпрэсій, а ў канцы стагоддзя ад дэпрэсій пакутаваў кожны пяты еўрапеец. Сацыёлагі казалі, што неўрозы і дэпрэсіі — гэта наступства культурных зрухаў, што адбыліся ў дваццатым стагоддзі ў

заходнім грамадстве. І што неўроз узнікае ў грамадствах, дзе дамінуе дысцыпліна, іерархія і грамадскія забароны, і што гэта паталагічная праява пачуцця віны. І што дэпрэсія — гэта праява ўсведамлення ўласнай немачы і пачуцця пустэчы. І што напачатку людзі былі неўротыкамі, таму што хацелі рабіць забароненыя рэчы, але не маглі, бо яны былі забароненыя, а калі людзі наважваліся гэтыя забароны парушыць, то пачуваліся вінаватымі. А пазней, калі ўжо амаль усё было дазволена, людзі пачалі падлягаць дэпрэсіі, бо не ведалі, што, уласна, яны б хацелі рабіць, і ператвараліся ў новых паталагічных суб'ектаў, а псіхіятры казалі, што за гэты час паталагічны суб'ект абсалютна змяніўся. А сацыёлагі казалі, што дэпрэсія — гэта кампенсацыя за свет, у якім асабістая свабода ўжо ўяўляе сабой не ідэал, да якога мы мусім у пакутах прабівацца, а перашкоду, якую нам даводзіцца ў пакутах пераадольваць. І што неўроз — гэта быў страх перад парушэннем забаронаў, а дэпрэсія — гэта страх перад цяжарам свабоды. А некаторыя людзі імкнуліся ва ўсім адшукаць нейкі сэнс і пакутавалі на экзістэнцыйную фрустрацыю. А ў канцы васьмідзесятых гадоў Сусветная арганізацыя аховы здароўя абвясціла, што дэпрэсія — самая пашыраная паталогія ў заходнім свеце. А са Злучаных Штатаў тым часам пачалі пашырацца новыя грамадскія забароны, напрыклад, што непажадана курыць, альбо моцна саліць, альбо расказваць анекдоты пра гомасексуалістаў, альбо дармаеднічаць і да т. п. І наадварот, дазвалялася рабіць розныя рэчы, якія раней былі забароненыя. Такім чынам, некаторыя людзі былі неўротыкамі, а іншыя былі схільныя да дэпрэсіі, а некаторыя былі нават неўротыкамі, схільнымі да дэпрэсіі запар, і людзі прымалі псіхатропныя лекі, а псіхааналітыкі казалі, што людзі псіхатропнымі лекамі злоўжываюць і недастаткова часта ходзяць на сеансы псіхааналізу. І што лекі толькі адсоўваюць траўмы глыбей у падсвядомасць, а вылечыць чалавека можа толькі вербалізацыя ягоных трывог і вяртанне да самаго сябе.

У залаты век людзі былі расістамі, але яшчэ пра гэта не здагадваліся, і негры і папуасы выклікалі іхную цікаўнасць, а заапаркі ў вялікіх гарадах ладзілі этнаграфічныя відовішчы з дзікунамі, якія сядзелі ў набедраных павязках са шкур перад бамбукавымі буданамі і рабілі розныя рэчы, а людзі хадзілі

глядзець, як жывуць папуасы, ашанты і зулусы, і кідалі ім цукеркі і кавалачкі цукру. Этнаграфічныя відовішчы былі надзвычай папулярныя, бо людзям хацелася ведаць, як жывуць у іншых месцах на свеце, а на сусветнай выставе ў Парыжы ў 1900 годзе развітыя краіны дэманстравалі побач з тэхнічнымі навінкамі, сучасным мастацтвам і новай архітэктурай таксама сцэнкі з жыцця тубыльцаў са сваіх калоній — нубійцаў, дагамейцаў, карыбаў, малайцаў і канакаў. Канакі сядзелі ў павільёнах ля сваіх бамбукавых буданоў у набедраных павязках са шкур і крэменем вастрылі каменныя дзіды, хоць датуль не трымалі ў руках ані крэменю, ані каменнай дзіды, бо гэта былі шараговыя працаўнікі з каланіяльнай управы, якіх французскія ўлады нанялі ў дзяржаўных інтарэсах. А калі Сусветная выстава скончылася, Каланіяльны музей выправіў іх у турнэ па Еўропе — у Бельгію, Германію, Данію, і канакі пісалі звароты да кіраўніцтва музея і пыталіся, калі яны змогуць вярнуцца дадому і зноў прыступіць да выканання сваіх службовых абавязкаў, але адказу не было, і аднойчы ўсе канакі ўцяклі з вагона, у якім падарожнічалі па Германіі, і вярнуліся ў Францыю, а там употайкі селі на карабель, які, па чутках, павінен быў плысці ў Новую Каледонію, але на самай справе накіроўваўся ў Ліван. І калі маракі знайшлі іх у труме і даведаліся, што гэта канакі з Сусветнай выставы, то былі ўсцешаныя, што тыя выбралі менавіта іх карабель, і не давалі ім працаваць, і насілі ім ежу, і распытвалі, колькі ў Новай Каледоніі вырабляецца каменных дзідаў у год. Пасля Першай сусветнай вайны этнаграфічныя відовішчы паступова страцілі сваю прыцягальнасць, бо 1 700 000 дзікуноў ваявала ў вайне ў шэрагах саюзнікаў, і людзі да іх папрывыкалі і ўжо не былі такія цікаўныя.

Маладыя людзі казалі, што расізм — гэта хвароба старога свету, і што свет трэба прыдумаць наноў, і што тэлевізар і лядоўня меней важныя за каханне і шчасце. І не хацелі, каб бацькі ім казалі, на каго ісці вучыцца, забаранялі курыць, займацца сексам, насіць доўгія валасы і г. д. І ў 1968 годзе ў Заходняй Еўропе пачаліся студэнцкія хваляванні, і студэнты рабілі барыкады і хадзілі на заводы, каб пераканаць рабочых у тым, што грамадства трэба мяняць, пачынаючы ад самых асноў, і пісалі на сценах «БЛАКІТ ЗАСТАНЕЦЦА ШЭРЫМ, ПАКУЛЬ

ЯГО НЕХТА НЕ ПРЫДУМАЕ!», альбо «БУДЗЬЦЕ РЭАЛІСТАМІ — ПАТРАБУЙЦЕ НЕМАГЧЫМАГА!», альбо «ЗАБАРОНЕНА ЗАБАРАНЯЦЬ!», альбо «ФАНТАЗІЯ ПРЫХОДЗІЦЬ ДА ЎЛАДЫ!», і займалі аўдыторыі і тэатры, і курылі, і займаліся сексам рознымі спосабамі, і дыскутавалі пра палітыку. Шасцідзесятыя гады пазначылі ў гісторыі заходняга грамадства важны пералом, бо пачалося панаванне матэрыяльнага дабрабыту, для жанчын зрабіліся даступнымі кантрацэптывы, а моладзь стала важкім складнікам грамадскай думкі, а з цягам часу і старэйшыя людзі пачалі займацца спортам, маладжава апранацца, займацца сексам рознымі спосабамі і выказваць арыгінальныя і нефармальныя думкі, а хто не быў малады, хаця б духам, аўтаматычна далучаўся да старога свету. А сацыёлагі казалі, што буржуазнае грамадства аджыло, і што яму на змену прыйшла новая форма арганізацыі грамадства, і называлі яе ювенальнай, і казалі, што гэта сведчыць пра кардынальны пералом у развіцці заходняга грамадства і што варта пра гэта паразважаць. А некаторыя філосафы казалі, што культ маладосці — гэта адно з найвялікшых глупстваў у гісторыі чалавечага духу і што нездарма яго прынеслі фашысты і камуністы, а дэмакратычныя грамадствы былі настолькі неразумныя, што гэты культ ад іх перанялі, а іншыя, наадварот, казалі, што ўсё так, як мае быць, што маладосць мо і дурная, затое дынамічная, а гэта пазітыўна. Сацыёлагі казалі, што быць пазітыўным — гэта новая вартасць для заходняга грамадства і што яна замяняе традыцыйныя гуманістычныя каштоўнасці, якія ўжо не адпавядаюць стану супольнасці. Быць пазітыўным значыла смела крочыць насустрач будучыні, займацца спортам, весці здаровы і гарманічны лад жыцця, рэгулярна хадзіць да лекара, дажываць да глыбокай старасці і рупліва працаваць, каб потым на пенсіі прыемна бавіць час і маладжава апранацца. І ніхто ўжо не хацеў быць бедным, і ўсе хацелі мець і лядоўню, і мабільны тэлефон, і сабаку, і котку, і чарапаху, і вібратар, і займацца спортам, і хадзіць да псіхааналітыкаў. Каталіцкія філосафы казалі, што ва ўсім вінаватыя пратэстанты, якія падкрэсліваюць важнасць матэрыяльнага поспеху і жывуць паводле формулы «Дапамажы сабе сам, і Бог табе дапаможа», тым часам як каталікі вераць, што «Каго Бог любіць, таму крыж дае». Пратэстанцкія ж філосафы казалі, што заняпад каталіцкага касцёла сведчыць пра тое, што ён не здольны

крочыць у нагу з часам, і што ментальнасць развіваецца, і што яны сучасныя, і што пастары могуць жаніцца і атрымліваць сексуальнае задавальненне і такім чынам больш эфектыўна сеяць хрысціянскія ідэі ў грамадстве, апанаваным нігілізмам. І людзі ў гарадах заводзілі і сабак, і катоў, і чарапах, і марскіх свінак, таму што нямое стварэнне не здрадзіць нават у адчужаным свеце. А для сабак і катоў былі створаныя спецыяльныя цырульні, салоны прыгажосці, трэнажорныя залы, санаторыі, трупярні, могілкі і да т. п. А амерыканскія салдаты, што вярнуліся з вайны ў В'етнаме, скінуліся і ўсталявалі помнік 4100 амерыканскім сабакам, што загінулі ў В'етнаме за свабоду і дэмакратыю. А ў развітых краінах адчыняліся фермы, якія называліся вясковыя музеі альбо вясковыя куткі, куды людзі з гарадоў ездзілі глядзець, як выглядае конь, ці авечка, ці карова, ці курыца, бо свойская жывёла паступова з гарадоў знікла. Зрабілася менш і іншых жывёл — барсукоў, сычоў, жабаў, матылёў і жукоў на дарогах, і эколагі казалі, што віной таму забруджанае паветра, пестыцыды, выхлапныя газы і да т. п. А некаторыя эколагі нападалі ўначы на медыцынскія і фармацэўтычныя даследчыя лабараторыі, дзе ставіліся доследы на жывёлах, і выпускалі на волю малпаў, трусоў, хамякоў, сабак, змей і жабаў. І чым далей, тым больш людзей думала, што звяроў трэба абараняць, і засноўваліся таварыствы аховы жывёлаў, а часам людзі пераапраналіся ва ўборы мядзведзя ці пустальгі, і маніфеставалі на вуліцах супраць паляванняў, супраць карыды і супраць навуковых доследаў на жывёлах, і казалі, што забіваць звяроў бесчалавечна. Некаторыя з гэтых людзей былі вегетарыянцамі і харчаваліся морквай і да т. п. А паляўнічыя казалі, што палююць на звяроў, каб захаваць традыцыю, і што традыцыі страчваюцца, а яны ў сучасным свеце вельмі важныя. І што ні год здаралася, што які-небудзь паляўнічы замест дзіка забіваў іншага паляўнічага, і тады астатнія паляўнічыя скідваліся і куплялі ўдаве пральную машыну ці нешта падобнае, што магло быць карысным у гаспадарцы.

У залаты век у гарадах яшчэ жылі козы, куры і да т. п., а мужчыны курылі вірджынскія цыгары і пагладжвалі сабе бароды, а па вуліцах ездзілі электрычныя трамваі, дрожкі, омнібусы і конкі. Коней выкарыстоўвалі ў гарадах і для

перавозкі тавараў, бо грузавых аўтамабіляў амаль не было, а таксама ў войску і ў жандармерыі. У Першай сусветнай вайне шмат коней загінула, асабліва на Усходнім фронце, дзе ваявала руская, нямецкая і аўстрыйская кавалерыі, а ў 1916 годзе нямецкія шпіёны пракраліся ў стайню румынскай арміі і падкінулі ў печ хваробатворныя споры сапу, і 3055 румынскіх коней пагінула. На Заходнім фронце коні выкарыстоўваліся, галоўным чынам, пры выведных аперацыях, а таксама для транспартавання гармат, кулямётаў, харчоў і дошак, што ўжываліся пры будаўніцтве акопаў, а кавалерыйскія палкі ўвесь час былі напагатове, бо генералы спадзяваліся, што калі пяхота прарве лінію варожай абароны і зойме варожыя агнявыя кропкі, менавіта кавалерыя вырашыць зыход вайны смелай атакай на ворага. А ў 1915 годзе французы прыдумалі для коней спецыяльныя газаахоўнікі. Пасля вайны коней у гарадах і ў войску паменела, большая частка гарадскіх стайняў была разбураная ці перабудаваная ў дзіцячыя садкі, бо архітэктура стайняў адпавядала і патрэбам дзіцячых садкоў. У Другой сусветнай вайне ў большасці армій колькасць коней была кардынальна зменшаная, акрамя Чырвонай арміі, якая трымала напагатове васемсот тысяч коней і чакала, пакуль у немцаў скончыцца бензін альбо пакуль яны не загразнуць у балоце. Тым часам у Германіі і ў іншых еўрапейскіх краінах большая частка стайняў была ліквідаваная альбо выкарыстоўвалася для іншых мэтаў, а ў канцэнтрацыйным лагеры Біркенаў стайні служылі як баракі для вязняў, і ў адной стайні змяшчалася 52 кані альбо 1000 ці нават 1200 вязняў.

Захаванне традыцый і вяртанне да прыроды былі ў дваццатым стагоддзі вельмі важныя, бо дапамагалі супрацьстаяць крызісам маралі, якія пачасціліся з таго часу, як людзі займелі лакаматывы, параходы і фабрыкі і развучыліся жыць у гармоніі, а свет зрабіўся поўны гвалту, галечы і несправядлівасці. І ў 1906 годзе сабраўся гурт маладых нямецкіх і аўстрыйскіх анархістаў, якія імкнуліся адшукаць сапраўднае жыццё пад маскай цывілізацыі і пераехалі ў Швейцарыю, і там заснавалі камуну, якую назвалі «MONTE VERITA», і ўсе там былі вегетарыянцы, і жылі натуральным жыццём у гармоніі з прыродай, і насілі доўгія валасы, і танчылі вакол вялікага вогнішча, і вяшчалі ідэі. І з цягам часу ўзнік рух, да якога

далучаліся маладыя людзі з розных краін. Яны вызнавалі новае абсалютнае мастацтва ў гармоніі з прыродай і казалі, што мастацтва — гэта рэч не эстэтычная, а біялагічная, і што самае абсалютнае мастацтва — гэта танец, таму што ён першасны, і што танец можа быць крыніцай натхнення для стварэння новага палітычнага ладу, а ў трыццатыя гады большасць з іх далучылася да нацыстаў, бо нацысты вызнавалі прыродную гармонію і зліццё індывіда з зямлёй і расай і выступалі супраць габрэяў, якія, як лічылася, не любяць прыроду і маюць намер забрудзіць чалавечую свядомасць і выкінуць з яе тое, што дае магчымасць чалавеку жыць у гармоніі. А адзін з чальцоў камуны зрабіўся ў нацысцкай Германіі вядомым харэографам і прыдумаў танец жэстаў для нямецкіх рабочых, каб падвысіць прадуктыўнасць працы на зброевых заводах. А ў 1917 годзе адзін італьянскі салдат пісаў у лісце сваёй сястры: «Я З КОЖНЫМ ДНЁМ ЗДАЮСЯ САБЕ ЎСЁ БОЛЬШ ПАЗІТЫЎНЫМ». А ў 1930 годзе адзін французскі лекар абвясціў надыход новай эры, якая пройдзе пад знакам Вадаліва і якая народзіць новага чалавека і ўсталюе новы свет, без войнаў і гвалту. А ў 1921 годзе адзін шатландскі настаўнік адчыніў у Германіі эксперыментальную школу, дзе хацеў апрабоўваць новыя, рэвалюцыйныя, антыаўтарытарныя метады навучання і казаў, што навучанне павінна ператварыцца ў дыскусію на розныя цікавыя пытанні, бо традыцыйнае навучанне ў сваёй сутнасці недэмакратычнае і прышчэплівае вучням агрэсіўнасць. Школа была прызначаная дзецям ад пяці да шаснаццаці гадоў, а калі ім не хацелася браць удзел у дыскусіях, дзеці маглі застацца дома, ці катацца на ровары, ці будаваць з сябрамі таемную схованку, і менавіта ў гэтым была рэвалюцыйнасць. І чым далей, тым больш людзей верыла, што чалавецтва стаіць на парозе новай эры, якую пачалі называць «НОВЫ ВЕК», і якая павінна была пачацца, як толькі Сонца ўвойдзе ў сузор'е Вадаліва, і працягвацца 2160 гадоў, цягам якіх мусіла адбыцца зліццё правага і левага паўшар'яў мозга, ментальная мутацыя чалавецтва і нараджэнне новай духоўнасці. Новы век мусіў быць гарманічны, адухоўлены і інтэрактыўны, і ніхто нікога больш не павінен быў прыціскаць, бо чалавецтва мусіла ўзняцца на новы ўзровень пазнання, і ўсе людзі мусілі стаць духоўна і экалагічна свядомымі. Людзі, якія верылі ў Новы век, казалі, што Вадаліў вельмі трапна сімвалізуе змены, што

надыходзяць, бо людзі прагнуць чагосьці новага, і Вадаліў гэтую прагу спатоліць. І казалі, што стары свет быў матэрыялістычны, механістычны і аналітычны, і што аналітычны метад разбівае рэальнасць, і што меркаваць пра рэчаіснасць можна толькі шляхам сінтэзу. І што заходняя культура навучыла чалавека лічыць дрэвы ў лесе, але ніхто не бачыць самога лесу. Людзі, якія верылі ў Новы век, хацелі вярнуцца да духоўных каранёў чалавечай паспалітасці і зліцца з касмічнай энергіяй і меркавалі, што трэба перагледзець падыходы да выхавання моладзі, бо Новы век не можа праявіцца ў поўнай ступені, пакуль людзі думаюць па-старому, і казалі, што самае галоўнае — гэта гармонія, бо толькі яна дазволіць паўшар'ям мозга свабодна камунікаваць, а камунікацыя мазгавых паўшар'яў дасць магчымасць кожнаму дасягнуць другога берага ў самім сабе.

А ў 1950 годзе папа рымскі абвясціў, што эвалюцыйная тэорыя, згодна з якой чалавек паходзіць ад малпаў, вустрыц і кваркаў, зусім не супярэчыць веры ў чалавека і ў місію, якую яму наканаваў Бог, і калі цялесная абалонка ўзнікла з нейкай жывой матэрыі, якая ёй папярэднічала, то душу стварыў Гасподзь. І што ён стварыў яе непасрэдна ў той момант, калі чалавечае цела набыло канчатковы выгляд. А іншы папа ў 1996 годзе абвясціў, што эвалюцыйная тэорыя, хутчэй за ўсё, праўдзівая, аднак яна не тлумачыць метафізічнага, і што менавіта дзеля гэтага і трэба рэлігія. І сказаў, што навука, верагодна, здольная адказаць на пытанне, як узнік чалавек, затое Біблія, у сваю чаргу, адказвае на пытанне, чаму, уласна, ён узнік, і дазваляе зразумець супярэчнасць паміж фізічнай пераемнасцю жывёльных відаў і анталагічнай непераемнасцю, выкліканай прыходам чалавека. Людзі, якія не верылі ні ў Госпада Бога, ні ў Новы век, ні ў іншапланецянаў, ні ў спірытуальныя элементы, ні ўва што іншае, казалі, што чалавек узнік з чыстае выпадковасці, і што свет абсурдны, і што нават прыродзе нельга верыць, бо яна вычварэнская, а шукаць у ёй нейкі сэнс — сапраўднае вар'яцтва. А іншыя людзі, якія верылі ў Госпада Бога і ў стварэнне свету, казалі, што эвалюцыйная тэорыя — гэта спроба Сатаны разбэсціць чалавека, і што папа — д'яблаў халуй, а ў 1930 годзе адзін баптысцкі пастар змайстраваў адбітак чалавечай нагі, узрост якога быў сто

восемдзесят мільёнаў гадоў, каб даказаць, што чалавек такі ж старажытны, як і дыназаўр. Эвалюцыяністы казалі, што гэта скандал, а крэацыяністы казалі, што скандальна сцвярджаць, нібыта чалавек паходзіць ад малпы, і што тэорыя развіцця — гэта ідэалагічнае махлярства, якое адбірае ў чалавека самае галоўнае — усведамленне самога сябе, імкненне да самаўдаканалення, патрэбу працаваць і да т. п. Эвалюцыяністы казалі, што ўсведамленне самога сябе і імкненне да самаўдасканалення можна бачыць і ў звяроў, а камуністы казалі, што чалавек — гэта, па сутнасці, малпа, якая пачала працаваць, але некаторыя эвалюцыяністы з гэтым не пагаджаліся і казалі, што ў прыроды свая логіка і праца тут ні пры чым. Іншыя эвалюцыяністы, аднак, лічылі, што праца грае важную ролю, і што сацыяльнай навуцы ўласцівыя тыя самыя законы і механізмы, што і біялогіі, і што занадта пільны клопат лекараў, сацыяльнае забеспячэнне і да т. п. падахвочваюць чалавека да ляноты і запавольваюць развіццё чалавечай супольнасці.

Камуністы казалі, што Госпада Бога няма, і што існуе толькі матэрыя, і што трэба збудаваць новы свет, дзе над усімі, хто прыкладзе руку да агульнай справы, будзе ўладарыць справядлівасць, і ніхто нікому не будзе зайздросціць, бо ўсе будуць мець усё, і ні ў кога не будзе нічога такога, чаго б не было ў іншых. Але перад усталяваннем новага свету неабходна вырваць стары свет з карэннем, а людзям трэба навучыцца думаць па-новаму, бо без новага мыслення не можа быць новага свету. І казалі, што кожны чалавек мусіць вырашыць, ці ён хоча стаяць на баку прагрэсу, і калі не, то яго змяце ўраган гісторыі. Камуністы лічылі, што Кастрычніцкая рэвалюцыя — гэта, па сутнасці, канец гісторыі, бо камунізм — гэта пік гістарычнага развіцця чалавечай супольнасці, і што толькі пытанне часу — калі камунізм пераможа ва ўсім свеце, і што гісторыі ўжо не будзе сэнсу працягвацца. І казалі, што камунізм — гэта не палітычны рэжым, а гістарычная катэгорыя, а для тых, хто гэтага не разумеў і думаў па-старому — для здраднікаў, эгаістаў, зайздроснікаў, распуснікаў, алкаголікаў і да т. п., — прыдумалі адмысловае месца, якое назвалі «звалкай гісторыі», таму што да той пары, пакуль камунізм пераможа ва ўсім свеце, было важна даведацца, каму ў гісторыі няма месца.

Гісторыкі пазней казалі, што камунізм прынёс новую небяспеку для чалавечай цывілізацыі — сціранне гістарычнай памяці, і што раней розныя дыктатуры рабілі цэнзуру памяці ў бібліятэках, музеях і да т. п., а камуністы пашырылі знішчэнне памяці на ўсе сферы грамадскага і прыватнага жыцця і ўвялі яго ў ранг юрыдычнага прынцыпу, і што гэта было арыгінальна. А ў 1917 годзе камуністы прыдумалі рэвалюцыйныя трыбуналы, якія судзілі здраднікаў і распуснікаў і за паўдня паспявалі вынесці ажно да трохсот пяцідзесяці смяротных прысудаў, што ў судзе са старым мысленнем было б немагчыма, і адначасова ўвялі больш сучасныя спосабы катавання, якія дазвалялі атрымліваць ад здраднікаў і распуснікаў прызнанні і адрасы іншых здраднікаў і распуснікаў. Самымі вядомымі спосабамі катавання былі наступныя: ВУШКА, ЛАСТАЎКА, ПАПЛАВОК, МАНІКЮР і СЛАНЯНЯ. Сэнс апошняга палягаў у тым, што распусніка прывязвалі да крэсла ці да стала і на галаву яму надзявалі газаахоўнік, але без кісларoду, а потым камуністы пачыналі лупіць распусніка палкай, а распуснік задыхаўся і страчваў прытомнасць, а камуністы сцягвалі з яго газаахоўнік, і ўваскрашалі яго, і патрабавалі прызнання і адрасоў. Арыгінальным было таксама тое, што замест простага выкрэслівання некаторых гістарычных падзей камуністы часам якую-небудзь падзею ў гісторыі пакідалі, але прыдумвалі яе абсалютна па-новаму. І з фотаздымкаў розных урачыстасцяў, з'ездаў і гістарычных падзей паступова пачалі знікаць тыя камуністы, якія тым часам паспелі здрадзіць радзіме, альбо спрычыніліся да змовы, альбо выказалі буржуазныя погляды ці няправільныя думкі, і на фатаграфіі, дзе напачатку было, прыкладам, восем камуністаў, урэшце заставалася ўсяго два ці тры. Гістарычныя камісіі надавалі фотаздымкам вялікую ўвагу, бо калі людзі перасталі верыць таму, што было напісана, яны яшчэ некаторы час верылі фатаграфіям, і камуністы лічылі, што фатаграфіі неабходна прыстасоўваць да патрабаванняў часу, гэтаксама як да патрабаванняў часу прыстасоўваюцца новыя лакаматывы і ўсё такое. А ў 1919 годзе яны прыдумалі спецыяльнае псіхіятрычнае лячэнне, бо лічылі, што той, хто супраць рэвалюцыі, — альбо распуснік, альбо вар'ят. І распуснікаў адпраўлялі ў канцэнтрацыйныя лагеры, а вар'ятаў — у вар'ятні, дзе яны праходзілі спецыяльнае лячэнне, якое

называлася «прамыванне мазгоў». Хворыя мазгі трэба было прамыць, каб у іх не засталося нічога старога і каб туды можна было ўкласці новыя думкі.

У канцы стагоддзя людзям у дэмакратычных краінах пачало здавацца, што дэмакратыя і спажывецкае грамадства таксама спрыяюць страце памяці, і яны казалі, што празмерная колькасць інфармацыі гэтак жа небяспечная, як і камуністычная цэнзура, і што людзі адарваныя ад традыцый і каранёў і да т. п., і што спажывецкае грамадства непазбежна імкнецца да забыцця, бо яно геданістычнае. І што празмерная колькасць інфармацыі ў доўгатэрміновай перспектыве яшчэ больш небяспечная, чым камуністычная цэнзура, бо выклікае не абурэнне і пратэст, а стомленасць і абыякавасць. І што дэмакратычныя рэжымы вядуць да знікнення ўсіх культурных і гістарычных здабыткаў і да дыктатуры уніфармізму. Але іншыя людзі звярталі ўвагу на тое, што памяць — гэта, па сутнасці, інтэракцыя паміж захаваннем і сціраннем якойсьці падзеі, і што яна паводле прыроды сваёй селекцыйная, і што калі б яна такой не была, гэта ўжо была б не памяць, а псіхічнае адхіленне. А іншыя людзі дадавалі, што памяць не ёсць канстытуцыйнай для заходняй цывілізацыі, і што менавіта гэта адрознівае заходнюю цывілізацыю ад іншых, і што для заходняга грамадства важнейшымі за памяць з'яўляюцца універсальныя прынцыпы і агульная воля, што і дазволіла яму перайсці ад гетэраноміі да аўтаноміі, і што дэмакратыя базуецца не на памяці, традыцыях і да т. п., а на дамоўленасці паміж індывідам і дзяржавай, і гэтая дамоўленасць сама па сабе не мае ніякай гістарычнай альбо антрапалагічнай вартасці, аднак дазваляе рэгуляваць грамадскія зносіны. І што заходняму грамадству ўласцівы прынцып авангарду, які скіраваны на будучыню і дзейнічае як у мастацтве, так і ў навуцы альбо ў палітыцы. І што роля памяці ў заходнім грамадстве хутчэй адпавядае разуменню слова «памяць» у кампутарнай тэхніцы. Праграмісты адрознівалі два тыпы памяці: ROM і RAM, але большасць людзей, гаворачы пра памяць кампутара, мела на ўвазе RAM, АПЕРАТЫЎНУЮ ПАМЯЦЬ, і людзі, якія меркавалі, што дэмакратыя і спажывецкае грамадства спрыяюць сціранню памяці, казалі, што гэта прадвесце свету без памяці, у якім усё будзе

выпадковае.

Маладыя людзі лічылі, што неабходна вярнуцца да каранёў мудрасці, і што прамысловае грамадства і абавязковае наведванне школ змянілі стаўленне чалавека да сапраўднага пазнання, і казалі, што тое, што раней ведала кожнае дзіця, сёння ведае толькі кучка спецыялістаў, і што раней дзеці ведалі розныя расліны, умелі ставіць пасткі на трусоў, плесці мячыкі са свежай травы і круціць цыгаркі з сунічнага ліста, а потым паласкаць рот адварам з крапівы, каб дома не атрымаць у каўнер. А старэйшыя людзі казалі, што тое, што раней ведала толькі кучка спецыялістаў, сёння ведае кожнае дзіця, напрыклад, квадратны корань і да т. п. Але маладыя людзі казалі: а на чорта патрэбны той квадратны корань, і ездзілі ў Індыю і Непал, каб спасцігнуць усходнюю мудрасць, і лічылі, што хрысціянская мараль робіць з чалавека раба, і што людзі ў Еўропе ўмеюць толькі лічыць дрэвы, тым часам як індусы бачаць лес. І яны не хацелі жыць у свеце гвалту, галечы і забруджанага паветра, і з'язджалі ў незаселеныя раёны Амерыкі, Шатландыі ці Францыі, і засноўвалі там камуны, і курылі гашыш і марыхуану, і займаліся сексам, і спявалі песні, і вучылі сваіх дзяцей, як жыць у гармоніі з прыродай, і захоўвалі традыцыі, і ляскалі ў бубны, і скакалі вакол вогнішчаў, і вяшчалі ідэі. У камуністычных краінах усё гэта было забаронена, і ўсе павінны былі вывучаць тое самае і не маглі паехаць, куды ім хацелася. У камуністычных краінах лічылася прагрэсіўным тое, што ўсе працуюць дзеля дабрабыту працоўнага чалавека, і самым важным быў рабочы клас, таму што працоўны люд мае ў грамадстве натуральны аўтарытэт, і кожны хацеў быць паходжаннем з рабочых. У дэмакратычных краінах быць прагрэсіўным — хутчэй значыла тое, што было б лепш, калі б не было ніякіх аўтарытэтаў, і людзі рабілі б, што ім прыйдзе да галавы, але нягледзячы на гэта паводзілі б сябе адказна, бо былі б вальнадумныя і з павагай ставіліся б адно да аднаго. У камуністычных краінах прагрэсіўныя пісьменнікі пісалі раманы з рабочага асяроддзя, каб паказаць, што быць рабочым — гэта самае лепшае, што можа напаткаць вальнадумнага чалавека, альбо пісалі пра людзей, якія спачатку пазіралі на рабочы клас з пагардай, але потым раптам зразумелі, што шэрагі рабочых бурляць радасным хваляваннем,

і таксама захацелі зрабіцца рабочымі ці прынамсі працоўнай інтэлігенцыяй, каб дапамагаць рабочым новымі адважнымі ідэямі. А ў дэмакратычных краінах прагрэсіўныя пісьменнікі пісалі пра вальнадумных людзей, якія не прымалі аўтарытэтаў, не згаджаліся з усталяваным парадкам і хацелі застацца свабоднымі, нават за кошт таго, што ўступалі ў канфлікт з грамадствам. І ўзнікалі суполкі, дзе маладыя пісьменнікі выпрабоўвалі новыя спосабы пісьма і эксперыментальныя метады, каб паказаць, што свет абсурдны.

У канцы стагоддзя мужчыны курылі на траціну больш за жанчын, а таксама часцей кіравалі аўтамабілем, а больш за ўсё аўтамабіляў у пераліку на аднаго жыхара было ў Амерыцы і ў Германіі, а грэкі больш за ўсіх курылі. Жанчыны жылі даўжэй за мужчынаў, і радзей канчалі жыццё самагубствам, і за дзень прамаўлялі прыблізна ўтрая больш слоў, а людзі ў гарадах езділі на роварах і займаліся спортам, а ўранку бегалі па вуліцах, каб прачысціць лёгкія. Ранішнія прабежкі прыдумалі амерыканцы, якія адмыслова куплялі бліскучыя спартовыя трусы і боты з надзьмутымі пругкімі падэшвамі, каб не скрывіўся хрыбет, а ў 1985 годзе ў ста трыццаці пяці амерыканцаў падчас ранішняй прабежкі здарыўся інфаркт. Людзі ў канцы стагоддзя хацелі застацца маладымі і дынамічнымі, але разам з тым быць паліт- і сексуальна карэктнымі, а гэта значыла, што яны не павінныя былі заляцацца да жанчын, юрліва ім усміхацца і да т. п., а таксама расказваць анекдоты пра жыдоў і немцаў і пра гомасексуалістаў. А некаторыя жанчыны падавалі ў суды пазовы на сваіх начальнікаў, бо тыя вялі эратычна афарбаваныя размовы альбо прапаноўвалі падвезці тых дадому і пры гэтым кідалі распусныя позіркі, а адзін амерыканскі адвакат у 1997 годзе быў вымушаны заплаціць чатыры мільёны амерыканскіх долараў сваёй сакратарцы ў якасці маральнай кампенсацыі за тое, што насыпаў ёй у дэкальтэ шакаладных цукерак. А ў 1998 годзе некаторыя амерыканцы хацелі зняць свайго прэзідэнта, які быў у некарэктных стасунках з адной стажоркай, і лапаў ейныя грудзі, і пхаў ёй у вагіну кубінскую цыгару, а яна яму рабіла мінет, калі ён, напрыклад, размаўляў па тэлефоне з прэм'ер-міністрам і да т. п., а амерыканцы тым часам бамбілі Ірак, і іракцы казалі, што такім чынам тыя імкнуцца адцягнуць

увагу ад некарэктных сексуальных паводзін свайго прэзідэнта. Еўрапейцы таксама хацелі быць карэктнымі палітычна, але трохі менш сексуальна, бо здраджванне жонкам, асабліва ў лацінскіх краінах, мела вялікую культурную традыцыю, тым часам як Амерыка была хутчэй пурытанская. Сярэдні ўзрост, да якога дажывалі жыхары дэмакратычных краін, быў большы, чым у камуністычных краінах, бо людзі там часцей хадзілі да дактароў і елі свежую гародніну і да т. п., а ў камуністычных краінах жыхары больш курылі, бо не разумелі як след, навошта весці здаровы лад жыцця і дажываць да глыбокай старасці, а менш за ўсё жылі ў развіццёвых краінах, альбо інакш — краінах трэцяга свету. У развітых краінах людзі ў канцы стагоддзя дажывалі ў сярэднім да 78 гадоў, а самае кароткае жыццё было ў жыхароў Сьера-Леонэ, якія жылі ў сярэднім 41 год. А сацыёлагі казалі, што паводле розных крытэраў лепш за ўсё людзі жывуць у Канадзе і ў Францыі. А Злучаныя Штаты былі на 18-м месцы, а Сьера-Леонэ на 187-м месцы. Людзі ў гарадах жылі даўжэй за людзей на вёсцы і прамаўлялі ў сярэднім у пяць разоў больш словаў. А дактары казалі, што пры правільным рэжыме і аптымальным медыцынскім даглядзе людзі маглі б дажываць да 110 ці нават да 130 гадоў, а некаторыя людзі верылі, што аднойчы чалавек зробіцца практычна бессмяротны, і што ідэальнае грамадства настане тады, калі людзі будуць паміраць толькі ў выніку непрадказальных аварый і самагубстваў. Псіхолагі казалі, што той, хто хоча дажыць да глыбокай старасці, не павінен разважаць пра мінулае, а павінен глядзець у будучыню, бо развагі пра мінулае з пункту гледжання доўгажыхарства непрадуктыўныя, тым часам як будучыня поўная напружання, узрушэння і невядомых велічынь, і людзі могуць сабе ўяўляць, як гэты свет будзе выглядаць праз дваццаць альбо праз пяцьдзесят гадоў, а псіхіятры казалі, што індывідуальныя ўспаміны ўсё адно не адпавядаюць рэчаіснасці, а маніпуляцыі з аб'ектыўнай рэальнасцю — гэта ахоўны механізм чалавечай свядомасці, і што калі б чалавек не меў магчымасці маніпуляваць мінулым, ён паміраў бы намнога раней. Падчас Першай сусветнай вайны сярэдняя працягласць жыцця ў розных краінах знізілася на 10 ці нават 12 гадоў, але сярод прадстаўнікоў рабочага класа сярэдняя працягласць жыцця, наадварот, падвысілася, бо не было беспрацоўя і рабочыя хадзілі да заводскага лекара і

атрымлівалі талоны на харчаванне ў рэстаранах, каб мець сілы лепш працаваць дзеля канчатковай перамогі. І шмат людзей дамагалася, каб у шпіталях была ўзаконеная эўтаназія, а некаторыя лабараторыі прапаноўвалі людзям змясціць іх пасля смерці ў лядоўню, дзе б яны засталіся да таго часу, пакуль не будзе знойдзеная магчымасць зрабіць чалавека бессмяротным, альбо пакуль не будзе магчыма чалавека кланаваць, бо дагэтуль можна было кланаваць толькі апалонікаў, імшанак, вадзяных блох, жаб, авечак, кароў і да т. п. Кланаванне — гэта была тэхналогія, якая давала магчымасць стварыць генетычную копію якога-нібудзь жывога арганізму з клеткі, і гэта быў адзін са спосабаў дасягнуць несмяротнасці.

Першую сусветную вайну таксама называлі АПОШНЯЙ З АПОШНІХ. На пачатку вайны яе так называлі паўсюль, таму што ўсе былі ўпэўненыя, што яе выйграюць і што больш ніякія войны не спатрэбяцца, бо ў свеце ўсталюецца мір. Пасля вайны так казалі толькі ў краінах, якія вайну выйгралі, бо людзі там меркавалі, што больш ніякая вайна не патрэбная, аднак у краінах, якія яе прайгралі, людзі ў гэтым упэўненыя не былі. Першую сусветную вайну выйгралі, галоўным чынам, французы і англічане, а прайгралі яе, галоўным чынам, немцы, а Другую сусветную вайну выйгралі амерыканцы і рускія, а прайгралі яе, зноў жа, перадусім немцы, а вайну, якая пачалася потым і якую называлі «халоднай», бо падчас яе не было непасрэдных узброеных канфліктаў паміж дэмакратычнымі і камуністычнымі краінамі, а іх прадстаўнікі ваявалі ў розных іншых краінах, выйгралі амерыканцы, а прайгралі, галоўным чынам, рускія. А некаторыя гісторыкі казалі, што вайна — гэта заканамерны працяг палітычнай дзейнасці, аднак іншыя гісторыкі не згаджаліся і казалі, што, наадварот, палітычная дзейнасць ёсць працягам вайны, і што вайна, між іншым, усё адно ніколі не заканчваецца, што яна толькі маскуецца і праяўляецца іншым спосабам. А ў 1989 годзе прыйшоў канец камунізму ў Еўропе, і шмат людзей былі ўпэўненыя, што дэмакратыя канчаткова перамагла, бо яна перамагла два самыя крывавыя рэжымы ў гісторыі чалавецтва — нацызм і камунізм. І казалі, што гэта зручны момант для ўсталявання новага сусветнага парадку. Пра камунізм казалі, што ён вінаваты ў смерці дзевяноста ці нават ста мільёнаў чалавек, але былыя

камуністы казалі, што, па-першае, гэта не зусім праўда, а калі нават і так, то нельга гэта так называць, бо камуністы хацелі як лепш. А гісторыкі казалі, што камунізм — гэта надта свежая гістарычная рэальнасць, таму пакуль што яе нельга разглядаць як прадмет даследавання, але што з цягам часу і камунізм будзе прадметам даследавання, і на яго можна будзе зірнуць па-новаму, больш аб'ектыўна. Перад падзеннем камунізму Савецкі Саюз і краіны Усходняй Еўропы атрымалі назву ЎСХОДНІ ЛЕДАВІК, бо жыццё ў гэтых краінах было застылае і нерухомае, нібы замарожанае, а ў 1989 годзе шмат людзей у Заходняй Еўропе думалі, што ўсходнія краіны мусяць як мага хутчэй далучыцца да Еўрапейскага Звязу, і казалі, што гэта б узбагаціла еўрапейскую ідэнтычнасць. А людзі, якія не маглі дачакацца дваццаць першага стагоддзя і лічылі, што дэмакратыя раз і назаўжды перамагла, казалі, што таталітарныя рэжымы ў будучыні ўжо не змогуць існаваць, бо прынцып функцыянавання таталітарнага рэжыму — гэта кантроль і абмежаванне доступу да інфармацыі, і што цяпер гэта ўжо не будзе магчыма, бо Інтэрнэт дасць людзям магчымасць абменьвацца думкамі і памкненнямі з хуткасцю маланкі, пераадольваючы неверагодныя адлегласці. А на Салавецкіх выспах, дзе былі канцэнтрацыйныя лагеры, камуністы павынішчалі чаек, гагар і крачак, таму што баяліся, каб які-небудзь вязень не паслаў з чайкай ліст за мяжу і каб людзі не даведаліся, што робіцца ў канцэнтрацыйных лагерах. А вязні з канцэнтрацыйных лагераў па берагах рэк Об і Іртыш, якія працавалі на лесанарыхтоўках, адсякалі сабе пальцы і прывязвалі іх да бярвёнаў, якія сплаўлялі па рацэ ў вялікія гарады, і спадзяваліся, што нехта іх палец заўважыць і здагадаецца, што ў канцэнтрацыйных лагерах робіцца нешта благое. Але з цягам часу стала відавочна, што людзям з посткамуністычных краін еўрапейская ідэнтычнасць да лямпачкі і што людзі з Усходняй Еўропы ставяцца да еўрапейскай гісторыі з недаверам. Некаторыя заходнееўрапейскія гісторыкі казалі, што трэба даць людзям ва Усходняй Еўропе трохі часу, што ў іх адсутнічае адчуванне гістарычнай дынамікі, бо сорак гадоў камунізму зрабілі ў гісторыі дзірку. Аднак людзі з усходнееўрапейскіх краін бачылі сітуацыю інакш, ім здавалася, што яны маглі б даць Заходняй Еўропе шмат цікавага досведу, і адчувалі сябе пакінутымі,

непатрэбнымі і нялюбымі. А псіхааналітыкі казалі, што перарваная гісторыя — гэта тое самае, што і перарваны палавы акт, і што кульмінацыя ўжо не ёсць прыроджаным працягам спантаннага акту, а толькі спосабам, як пазбегнуць фрустрацыі.

Пяцідзесятнікі казалі, што калі чалавек шмат моліцца і медытуе, ён можа камунікаваць са Святым Духам. Пяцідзесятнікі, якія камунікавалі са Святым Духам, размаўлялі на невядомых старажытных мовах і казалі, напрыклад, «МОКРЫ ГЕРОХОРА ШМЭТХАНА», ці «ХАРЫ САГАНА ЭНТРАПІХО КЭШЭГЕР», ці «ІЛАЖЫЖОКО ЭЎТОКАЙ ЭЯНАВАВО КРОКАМ», а псіхалінгвісты казалі, што пяцідзесятнікі ажыўляюць падсвядомую метамоўную дзейнасць, якая прысутнічае ў свядомасці кожнага чалавека, а сацыялінгвісты казалі, што гэта рэакцыя на дыскрэдытацыю рэлігійнага і палітычнага дыскурсаў, якая нас у сваю чаргу вядзе да дыскрэдытацыі моўных канвенцый, да страты веры ў сэнс жыцця і гісторыі і да неабходнасці кардынальнай змены, якая і выказваецца нейкай новай ці невядомай мовай. Патрэба ў новай мове адчувалася ўсё вастрэй з таго часу, як прамысловы свет выціснуў традыцыйныя рэлігійныя і грамадскія вартасці, і некаторыя людзі прапаноўвалі прыдумаць універсальную мову і казалі, што, калі ўсе людзі пачнуць размаўляць на адной мове, у свеце ўсталюецца мір, і прыдумалі такія мовы. Падчас Першай сусветнай вайны часам здаралася, што салдаты з нацыянальных меншасцяў альбо з абласцей, дзе гаварылі на дыялекце, не разумелі мовы, на якой камандзіры аддавалі ім загады, і гэта вяло да розных непаразуменняў і стратэгічных хібаў. А аднаму брэтонскаму салдату ў 1916 годзе варожая куля адстрэліла палец на руцэ, і лейтэнант паслаў яго да доктара, але той палічыў, што адцягваць ягоную ўвагу такім нязначным раненнем непатрыятычна і аддаў салдата пад трыбунал, паводле рашэння якога салдат быў расстраляны, бо перакладчык, які б мог растлумачыць, што брэтонскага салдата паслаў да доктара ягоны камандзір, тым часам якраз быў адпушчаны ў звальненне. На мяжы дзевятнаццатага і дваццатага стагоддзяў з'явілася дзвесце семдзесят пяць універсальных моваў, і самай вядомай была мова эсперанта, і аматары эсперанта казалі, што эсперанта — гэта як тэлеграф, толькі лепш. А ў 1909 годзе эсперантысцкі рух распаўся на дзве

плыні, бо сярод аматараў эсперанта былі як хрысціяне, так і антыклерыкалы і анархісты, і эсперантысты-вернікі казалі, што эсперанта можа паскорыць прыход панавання божага на зямлі, а эсперантысты-антыклерыкалы і анархісты, у сваю чаргу, казалі, што эсперанта — гэта праява грамадскай свядомасці і першы крок да сусветнай рэвалюцыі. Спачатку эсперанта моцна прапагандавалі камуністы, але ў 1937 годзе савецкая ўлада абвінаваціла эсперантыстаў у касмапалітызме і ў змове супраць савецкай улады, і пяць з паловай тысяч эсперантыстаў былі расстраляныя ці сасланыя на прымусовыя працы ў канцэнтрацыйныя лагеры. А адзін савецкі лінгвіст прадказаў, што калі камунізм пераможа ва ўсім свеце, новы свет абыдзецца зусім без мовы, бо сімбіёз усіх працоўных людзей будзе такі, што размаўляць будзе залішне, і людзі паступова зусім забудуць мову і будуць камунікаваць толькі непасрэдным кантактам і сілай рэвалюцыйнай думкі.

Людзі, якія з нецярплівасцю чакалі дваццаць першага стагоддзя, казалі, што ліквідацыя кантролю над інфармацыяй — гэта ліквідацыя інстытута ўлады і апошняя фаза дэмакратызацыі, бо ўлада надалей будзе ў руках кожнай асобы альбо суполкі грамадзянаў, аб'яднаных агульнымі інтарэсамі. І што гэта прывядзе да адмірання палітыкі ў традыцыйным разуменні, і што карыстальнік Інтэрнэту ўяўляе сабой новы тып грамадзяніна, якога сталі называць гіперграмадзянін. Гіперграмадзянін — гэта першы наднацыянальны і абсалютна свабодны грамадзянін у гісторыі, і ім мог зрабіцца кожны, хто быў здольны перастаць думаць па-старому і пачаць думаць інакш, бо на наступным этапе ўпарадкавання свету праца, капітал і сыравіны не будуць мець ніякага значэння. І што на змену парламенцкай дэмакратыі прыйдзе гіперграмадзянская дэмакратыя, і што кожны гіперграмадзянін будзе роўны з усімі астатнімі гіперграмадзянамі, і ўсе будуць жыць ва ўзаемадзеянні. І ў сярэднім кожны тыдзень гінула адна мова і 35 000 гектараў лесу. І 96 % жыхароў Зямлі размаўлялі на 240 мовах, а 4 % жыхароў размаўлялі на 5821 мове, а на пяцідзесяці адной мове размаўляла ўжо толькі па адным чалавеку. А ў 1996 годзе Арганізацыя Аб'яднаных Нацый абвясціла праграму пад назвай «UNIVERSAL NETWORK LANGUAGE», і шмат анархістаў вывучалі эсперанта, а ў 1910

годзе на эсперанта выйшаў падручнік, дзе тлумачылася, як падрыхтаваць замах на палітычных дзеячаў, а ў 1921 годзе адзін французскі анархіст заклікаў эсперантыстаў-пралетараў, каб яны выйшлі з буржуазных эсперантысцкіх структур і пайшлі за ім, і засноўвалі новыя ячэйкі. І трыста семдзесят мільёнаў чалавек са ста васьмідзесяці розных краін мелі доступ да Інтэрнэту, і маглі мець зносіны з тымі, хто меў такія самыя ці падобныя інтарэсы, і далучыцца, напрыклад, да аб'яднання швейцарскіх мацярок, якія раілі, як трэба наладжваць стасункі з дзецьмі пераходнага ўзросту, ці маглі адшукаць розных людзей, якія спірытычна камунікавалі з іншапланецянамі і жадалі падзяліцца ўражаннямі з іншымі грамадзянамі, ці маглі наладзіць сувязь з вучнямі пачатковай школы з Вініпега, якія на школьнай экскурсіі знайшлі нежывую ласку і напісалі творчую працу пра жыццё ласак. А камуністы выпрацавалі асаблівую мову, так званую «дубовую», на якой людзі мусілі пачаць размаўляць з таго моманту, калі навучацца ладзіць камунікацыю сілай рэвалюцыйнай думкі. Лінгвісты казалі, што мэта дубовай мовы — зрабіць кароткае замыканне камунікацыі ў грамадскай і пазаграмадскай сферах, каб разбурыць у чалавечай свядомасці кагнітыўныя моўныя структуры. Дубовая мова праяўлялася ў тым, што на словы ў ёй накладваліся складаныя канатацыі, якія адсылалі да дзяржаўных уладных механізмаў. У словаў такім чынам паступова адбіраўся іх першапачатковы сэнс, які замяняўся сэнсам, які быў тым шырэйшы, чым больш трывала сядзеў моўнік у палітычнай іерархіі. І калі адзін камуніст сустракаў другога камуніста, ён мог сказаць, напрыклад, «ЯК У ВАШЫМ РАЁНЕ ІДЗЕ ЖНІВО?», а другі казаў «КОЖНЫ КАМСАМОЛЕЦ ВЫЗНАЧЫЎ СВАЁ МЕСЦА Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ЎРАДЖАЙ», ці «МЫ САБРАЛІ ЗЕМЛЯРОБАЎ, КАБ ПЕРАВЫКАНАЦЬ СЁЛЕТНІ ПЛАН», ці «МЫ ЭНЕРГІЧНА РОБІМ АПОШНІЯ КРОКІ ДЗЕЛЯ ДАСЯГНЕННЯ НАШЫХ МЭТАЎ», ці «ТАВАРЫШЫ ВЫСТУПІЛІ З РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКАЙ ПРАПАНОВАЙ». Спачатку на гэтай мове гаварылі, галоўным чынам, пра працу і пра дзяржаўныя палітычныя рашэнні, аднак паступова людзі навучыліся на гэтай мове размаўляць пра ўсё: пра надвор'е, пра адпачынак, пра тэлеперадачы альбо пра тое, што жонка пачала піць і не хоча хадзіць на бацькоўскія сходы.

Тэлеграф у Першай сусветнай вайне выкарыстоўваўся, галоўным чынам, для перадачы сакрэтных звестак. Таксама з яго дапамогай лавілі варожыя паведамленні і пасылалі фальшывую інфармацыю, каб збіць з панталыку ворага. А ў час Другой сусветнай вайны англічане прыдумалі кампутары, каб расшыфроўваць сакрэтныя паведамленні, а ў шасцідзесятыя гады амерыканцы прыдумалі Інтэрнэт, бо баяліся, што ў якой-нібудзь з будучых войнаў рускія могуць утаіць інфармацыю, жыццёва важную для свабоды і дэмакратыі. І трыста семдзесят мільёнаў людзей мелі доступ да Інтэрнэту і маглі абменьвацца сваімі думкамі свабодна і без перашкод. А некаторыя турыстычныя агенцтвы прапаноўвалі праз Інтэрнэт за выгадны кошт віртуальныя падарожжы ў далёкія краіны, на асабісты выбар кожнага гіперграмадзяніна. А жанчыны маглі праз Інтэрнэт замовіць сабе сперму ад ананімнага донара, а некаторыя лабараторыі прапаноўвалі сперму асабліва якасных мужчынаў: астрафізікаў, інжынераў, баскетбалістаў і да т. п. І жанчыны маглі выбраць сперму паводле ста пяцідзесяці розных крытэраў: грамадзянства, паходжання, расы, веравызнання, узроўню адукацыі, прафесіі, росту, вагі, групы крыві, колеру валасоў, гушчыні абваласення, велічыні яечак і г. д., напрыклад, яны маглі купіць сперму трыццацішасцігадовага амерыканскага біёлага афганскага паходжання з чорнымі валасамі і блакітнымі вачыма, альбо сперму саракадвухгадовага авіяінжынера з Канзаса баптысцкага веравызнання і галандска-ўкраінскага паходжання, альбо сперму семнаццацігадовага таленавітага шахматыста кітайскага паходжання з малымі яечкамі. Адна порцыя спермы каштавала прыблізна тысячу пяцьдзесят амерыканскіх долараў уключна з аплатай паштовых паслуг, а яшчэ жанчыны маглі дадаткова замовіць касету з запісам голасу вытворцы спермы. Запіс быў наступны: «ПРЫВІТАННЕ! СЁННЯ ЦУДОЎНЫ ДЗЕНЬ, ПРОСТА СТВОРАНЫ ДЛЯ ПРАГУЛАК НА ЎЛОННІ ПРЫРОДЫ. СПАДЗЯЮСЯ, ШТО ВЫ МНОЙ БУДЗЕЦЕ ЗАДАВОЛЕНЫЯ». А адна жанчына, якая замовіла сабе запіс, пыталася, ці не маглі б ёй зрабіць дзесяціпрацэнтную зніжку, бо донар спермы выявіўся картавым.

А яшчэ з развіццём прамысловага грамадства ў Еўропе і ў Амерыцы значна пашырыўся алкагалізм, і многія людзі лічылі,

што алкаголь — напасць чалавецтва, і што ён перашкаджае нармальнаму развіццю грамадства. Амерыканцы лічылі, што алкагалізм — тыповая хвароба еўрапейцаў і што ў Амерыку яе заносяць перадусім ірландцы і італьянцы. І некаторыя амерыканцы патрабавалі, каб у гэтым кірунку былі прынятыя захады і каб больш ірландцаў і італьянцаў не пускалі ў Злучаныя Штаты без папярэдняга псіхіятрычнага і сацыяльнага абследавання. А ў 1919 годзе амерыканскія ўлады забаранілі продаж і ўжыванне алкаголю, а ў 1921 годзе ўвялі ўязныя квоты, якія знізілі колькасць ірландскіх і італьянскіх перасяленцаў на 85 %. А ў 1914 годзе амерыканскія псіхіятры дамагліся таго, каб алкаголікі былі тэрмінова стэрылізаваныя ў інтарэсах захавання здаровага, паўнавартаснага грамадства. Амерыканцы ганарыліся тым, што ў Злучаных Штатах можна жыць здаровым паўнавартасным жыццём, тым часам як у Еўропе людзі курылі, пілі алкаголь і дыхалі забруджаным паветрам. А ў 2000 годзе амерыканцы адмянілі ў Алабаме закон, які забараняў змяшаныя шлюбы з неграмі. А амерыканскія дактары раілі, каб людзі дыхалі свежым паветрам, займаліся спортам і ездзілі на роварах, бо гэта быў спосаб, як падтрымаць сябе ў форме. На роварах належала ездзіць, галоўным чынам, мужчынам, бо жанчынам ровар з пэўных прычынаў не падыходзіў, дактары казалі, што ровар для жанчыны — гэта перадусім сексуальны партнёр, бо трэнне сядла аб палавыя губы і клітар жанчын узрушае і вядзе ў далейшым да вычварэнскіх сексуальных практык. Каб не дапусціць у жанчын такіх вычварэнскіх сексуальных практык, нейкі час нават выраблялiся ровары са спецыяльнымі сёдламі, у якіх пасярэдзіне была прарэзаная адтуліна, але тыя сёдлы былі не надта зручныя. Ездзіць на ровары стала вельмі папулярна ў васьмідзесятыя і дзевяностыя гады, бо людзі ў развітых краінах хацелі падтрымліваць здаровы лад жыцця, займацца аздараўленнем і да т. п. У бяднейшых краінах людзі таксама ездзілі на роварах, бо ў іх не хапала грошай на машыну альбо на матацыкл, а ў Сьера-Леонэ ўласны ровар меў 31 % паўнагадовых жыхароў. А ў багатых краінах, дзе было шмат аўтамабіляў, веласіпедысты ездзілі ў кіслародных масках, каб не атруціцца выхлапнымі газамі, якія былі шкодныя для здароўя. Выхлапныя газы забруджвалі паветра і вылучалі ў атмасферу аксід вугляроду, што спрыяла

ўзнікненню такой з’явы, як «парніковы эфект», праз які тэмпература на Зямлі падвышалася. Спачатку парніковы эфект быў неабходны дзеля таго, каб на Зямлі магло ўзнікнуць жыццё і разумныя істоты, але з таго часу, як людзі стварылі прамысловасць, канцэнтрацыя газаў у атмасферы ўвесь час павялічвалася, і навукоўцы казалі, што гэта прывядзе да парушэння кліматычнага балансу. А ў Германіі шэфы фірмаў патрабавалі ад падначаленых, якія ездзілі на старых машынах, каб яны не паркаваліся перад цэнтральным уваходам, бо гэта магло зрабіць дрэннае ўражанне, а ў 1999 годзе адзін коміваяжор быў звольнены, бо ў яго было старое і бруднае аўто, але ён ненавідзеў яго мыць і ўсё адно паркаваўся перад уваходам і не прыслухоўваўся да папярэджанняў. У Германіі людзі мылі машыны дзевятнаццаць разоў на год, у Англіі — чатырнаццаць разоў на год, у Францыі — дзесяць разоў на год, а ў Амерыцы — дваццаць восем разоў на год. Аўтамабілі мелі большае значэнне ў германскіх і англасаксонскіх краінах, чым у раманскіх, дзе больш важным было тое, хто элегантней апрануты альбо хто больш густоўна падабраў гальштук і боты і да т. п. А ў 1939 годзе немцы прынялі закон, які забараняў габрэям кіраваць аўтамабілем, і калі габрэя лавілі за стырном, яго адпраўлялі ў канцэнтрацыйны лагер.

Амішы былі супраць Інтэрнэту, супраць вайны, супраць спажывецкага грамадства, супраць курэння, супраць алкаголю, супраць электрычнасці, яны святілі газніцамі, жылі на хутарах, ездзілі ў горад на концы, прадавалі экалагічна чыстыя прадукты, экалагічныя млынкі на каву, экалагічныя ацяпляльнікі, газніцы, свечкі, качэргі, калатоўкі для падбівання бялкоў і чакалі апакаліпсісу, які пакладзе канец Інтэрнэту, войнам і да т. п. і дасць ім магчымасць увайсці ў кола абраных і сесці праваруч ад Бога. А Сведкі Еговы казалі, што курэнне і алкаголь забруджваюць кроў, і не хацелі есці вантрабянку і крывянку, і не прызнавалі пералівання крыві, бо змешванне крыві супярэчыць божым запаветам, гэтаксама як і спажыванне крывянкі і алкаголю альбо як пазашлюбны секс. І яны не хацелі ісці служыць у войску і казалі, што належаць царству божаму, а да свецкіх спраў ім няма клопату, і шмат іх загінула ў канцэнтрацыйных лагерах у Германіі і ў Савецкім Саюзе, бо сваёй пазіцыяй яны падрывалі рэвалюцыйны ідэал і

распаўсюджвалі ў грамадстве асацыяльныя і контррэвалюцыйныя ідэі. Камуністы адрознівалі шаснаццаць катэгорый асацыяльных і контррэвалюцыйных элементаў, а ў 1919 годзе завялі квоты для асобных адміністрацыйных адзінак Савецкага Саюза: першая кантрольная лічба вызначала колькасць асацыяльных і контррэвалюцыйных элементаў, якія ў дадзеным рэгіёне мусілі быць расстраляныя, а другая вызначала колькасць элементаў, якіх трэба было саслаць у канцэнтрацыйныя лагеры. Савецкая ўлада таксама прыдумала спіс крытэраў, паводле якіх сярод грамадзянаў размяркоўваліся прадуктовыя карткі, і гэта называлася «класавы паёк». Першапачаткова ў спісе было пяць пунктаў, якія адпавядалі пяці групам насельніцтва, але пазней камуністы палічылі, што колькасць крытэраў не адпавядае сацыяльнаму і палітычнаму клімату ў грамадстве, і пашырылі спіс да трыццаці трох катэгорый, і да першай належалі чырвонаармейцы і народныя камісары, а ў апошняй была буржуазная гнілота, дармаеды, хуліганы, папы, грамадзяне падазроных нацыянальнасцяў і іншыя асацыяльныя элементы, якія чакалі, калі іх адправяць у канцэнтрацыйныя лагеры. А калі ў 1917 годзе адбылася Кастрычніцкая рэвалюцыя, некаторыя папы казалі, што гэта пачатак апакаліпсісу і што людзям трэба рыхтавацца да канца свету. Апакаліптычныя секты ў дваццатым стагоддзі вельмі пашырыліся, і некаторыя з іх арганізоўвалі масавыя самагубствы сваіх чальцоў і прыхільнікаў, бо гэта быў самы надзейны спосаб забяспечыць сабе светлую будучыню на тым свеце. А некаторыя секты будавалі вялікія падземныя бункеры з уласнымі электрастанцыямі і каналізацыяй, каб іх чальцы і прыхільнікі мелі дзе схавацца ў часе паміж канцом свету і апошнім судом. А ў 1999 годзе амішы прадалі ў дванаццаць разоў больш млынкоў на каву, свечак, калатовак для падбівання бялкоў і да т. п., чым звычайна, бо людзі баяліся, што MILLENNIUM BUG выведзе са строю бытавую тэхніку і парушыць электразабеспячэнне. Сацыёлагі казалі, што страх перад аварыяй электронных сістэм, якая зробіць немагчымым карыстанне тэлевізарам, мікрахвалёўкай і банкаматамі, струменіць з падсвядомага і прыхаванага міленарызму, а некаторыя людзі меркавалі, што гэта будзе лёсавызначальны момант у гісторыі заходняй цывілізацыі, які прывядзе да хаосу, сацыяльных хваляванняў і да т. п. і дасць магчымасць

заходняму грамадству вырвацца з тэхнакратычнай дыктатуры і ўступіць у новы век, які будзе гарманічны, адухоўлены і містычны. А ў некаторых краінах улады друкавалі грошы ў запас, а ў Канадзе ўлады арганізавалі вучэбную эвакуацыю насельніцтва, а ў Англіі і Данііжыхары рабілі запасы цукру і мукі ў ваннах, а ў Фінляндыі людзі паскуплялі ў аптэках усе запасы ёду, які рэкамендавалася прымаць у выпадку ядзернай катастрофы, бо фіны баяліся, што MILLENNIUM BUG выведзе са строю сістэмы бяспекі на атамных электрастанцыях у Расіі. Сацыёлагі казалі, што MILLENNIUM BUG уступае ў логіку сацыяльнай імагінарнасці сучаснай эпохі, і што ў дваццатым стагоддзі зло прыняло выгляд чагосьці мікраскапічнага, і што людзі ўжо баяцца не вялікіх і складаных рэчаў, лакаматываў і да т. п., а атамаў, вірусаў, генаў і прыёнаў. А псіхааналітыкі казалі, што MILLENNIUM BUG адыгрывае ў жыцці грамадства ролю бацькаабойства, якое падорыць свабоду, асалоду і задавальненне новаму тэхналагізаванаму пакаленню.

У канцэнтрацыйным лагеры ў Бухенвальдзе над уваходнай брамай быў надпіс «КОЖНАМУ ПА ЗАСЛУГАХ». Лагер Бухенвальд знаходзіўся недалёка ад горада Этэрсберг і спачатку так і называўся. Назва Этэрсберг была ў нямецкай гісторыі слаўная, бо ў васемнаццатым і дзевятнаццатым стагоддзях туды з'язджаліся знакамітыя пісьменнікі і філосафы, і там шпацыравалі, і паседжвалі сабе пад дубам, і дыскутавалі пра сэнс еўрапейскай цывілізацыі. Канцэнтрацыйны лагер Этэрсберг быў адчынены ў 1937 годзе, аднак праз год камітэт па культуры нацысцкай партыі ў Веймары палічыў, што нядобра атаясамліваць назву канцлагера з культурнай спадчынай нямецкага народу, і звярнуўся да ўладаў з прапановай перайменаваць яго. А з 1937 па 1945 гады ў Бухенвальдзе загінула 50 000 ворагаў нацысцкай Германіі, а з 1945 па 1950 год у Бухенвальдзе загінула 7000 ворагаў Савецкага Саюза і Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Лагер Бухенвальд быў полівалентны канцэнтрацыйны лагер, бо сумяшчаў у сабе лагер працоўны і лагер смерці, і вязням адразу пасля прыбыцця выколвалі на руцэ парадкавы нумар. А ў першыя месяцы вайны вязням давалі паштовыя карткі з надрукаваным тэкстам, якія яны мусілі пасылаць сваякам. На картках было напісана: «ЖЫВЕМ ТУТ З КАМФОРТАМ,

ПРАЦУЕМ, АБЫХОДЗЯЦЦА З НАМІ ПРЫСТОЙНА, ДОБРА КЛАПОЦЯЦЦА». Калі родныя атрымлівалі такую картку, яны, сумуючы па адпраўшчыку, ішлі да немцаў і выказвалі жаданне далучыцца да сваіх сваякоў у тым ці іншым лагеры. А адзін вязень-грэк з Бухенвальда паслаў картку свайму бацьку ў Піргас, і калі бацька да яго праз тры месяцы прыехаў, сын накінуўся на яго на пероне і паспеў задушыць хутчэй, чым немцы яго самога застрэлілі.

У канцэнтрацыйных лагерах таксама рабіліся навуковыя доследы. Пераважна яны датычылі розных метадаў стэрылізацыі і кастрацыі альбо тэстаў на трываласць і праводзіліся галоўным чынам на маладых, моцных вязнях, якім, напрыклад, адрэзвалі кавалак нагі ці здзіралі мяса з костак і г. д., а таксама рабіліся розныя эксперыменты з блізнятамі, што давала магчымасць фармуляваць новыя гіпотэзы ў генетыцы, пра якую ў навуковых колах вяліся вялікія дыскусіі. А калі сярод вязняў трапляўся чалавек, які меў выразную габрэйскую знешнасць, яму адрэзвалі галаву, прэпаравалі і адпраўлялі ў нямецкія школы, каб і малодшыя школьнікі маглі пазнаць габрэя з першага погляду. Габрэяў можна было пазнаць адразу паводле таго, што ў іх былі кручкаватыя насы, подлыя вочы, уніклівы позірк і доўгія кашчавыя пальцы, а яшчэ габрэі часта бывалі слабыя і хваравітыя, бо прырода выкінула іх са свайго ўлоння. Медыцына ў дваццатым стагоддзі дасягнула вялікіх поспехаў, вучоныя вынайшлі пеніцылін, абавязковыя прышчэпкі, пераліванне крыві, кантрацэпцыю і сродкі для стымуляцыі эрэкцыі, а жанчыны нараджалі ў радзільнях і атрымлівалі грашовую дапамогу па цяжарнасці, і людзі больш не паміралі дома, а паміралі ў шпіталях, абкружаныя тым найлепшым, што можа даць сучасны медыцынскі догляд. А галандскія навукоўцы прыдумалі трансгенных кароў, якім у эмбрыён перасаджвалі чалавечыя гены, і калі каровы выраслі, яны давалі чалавечае малако, якое рэкамендавалася для прафілактыкі рассеянага склерозу. Аднак людзі, якія верылі ў Новы век, казалі, што сучасная медыцына забівае ў чалавеку здольнасць да самарэгулявання, і замест наведвання дактароў і правядзення прафілактыкі прапаноўвалі спецыяльныя метады аўтатэрапіі, пры якіх пацыент мадыфікаваў свае ментальныя

структуры пазітыўнымі думкамі і такім чынам пераходзіў у новы фізіялагічны стан, у якім пазбываўся хваробаў. І казалі, што сапраўдныя змены ў свеце выкліча зусім не навуковая рэвалюцыя, і нават не новая рэлігія альбо палітычныя і эканамічныя рэформы, а індывідуальная спірытуалізацыя, якая зробіць чалавека адказным і талерантным і заменіць гістарычную памяць касмічнай. А амерыканцы ўзаконілі ў Арэгоне самагубства пад медыцынскім наглядам, а галандцы ўзаконілі эўтаназію. І ніхто больш не быў зусім бедны, і кожны меў лядоўню, тэлевізар і аплатны адпачынак і да т. п., а навукоўцы вынайшлі вініл, бакеліт, цэлафан і мікрапрацэсары, а вынаходнікі прыдумалі розныя аднаразовыя прадметы, напрыклад, аднаразовую запальнічку, аднаразовую асадку, аднаразовыя станкі для галення, цэлафанавыя мяшэчкі, аднаразовыя бутэлькі, пракладкі, памперсы, аднаразовыя фотаапараты і шпрыцы, і сацыёлагі казалі, што грамадства ўвайшло ў новую культурную эру — эру аднаразовых прадметаў, а развітыя краіны багацелі, а беспрацоўе расло, бо чым менш людзей працавала, тым яны былі багацейшыя. А рэкламныя агенцтвы прыдумвалі арыгінальныя і дасціпныя рэкламы, а страхавыя фірмы абвяшчалі: «БУДЗЬЦЕ РЭАЛІСТАМІ — ПАТРАБУЙЦЕ АД НАС НЕМАГЧЫМАГА!», а вытворцы аўтамабіляў абвяшчалі: «ФАНТАЗІЯ НАРЭШЦЕ ПРЫЙШЛА ДА ЎЛАДЫ!», а вытворцы пральных парашкоў абвяшчалі: «БЛАКІТ ЗАСТАНЕЦЦА ШЭРЫМ, ПАКУЛЬ ЯГО НЕХТА НЕ ПРЫДУМАЕ!», а ў дэмакратычных краінах прынялі закон, паводле якога прэзідэнт не мае права займаць сваю пасаду даўжэй за адзін ці два тэрміны, які часцей за ўсё працягваўся чатыры ці пяць гадоў, каб забяспечыць прыток новых арыгінальных ідэй і дынамічнае абнаўленне грамадства. А філосафы казалі, што сучасны свет — гэта цывілізацыя копій, што ўсё навокал — гэта копіі копій іншых копій і г. д. А медыкі прыдумалі спосаб, як рабіць дзяцей без палавога кантакту, змясціўшы яйцаклеткі і сперматазоіды ў інкубатары. Пра дзяцей, якія нарадзіліся такім чынам, казалі, што гэта дзеці з прабіркі, і першае дзіця з прабіркі нарадзілася ў 1978 годзе, і лекар, які гэты метад прыдумаў, прапанаваў аплодненую яйцаклетку ў інкубатары расшчапіць, каб можна было рабіць запасных блізнятаў. Першы з блізнятаў перасаджваўся ў маціцу да маці, а другога хавалі ў маразільнік, і блізня з маразільніка

пазней магло быць донарам органаў для блізняці з маціцы, калі тое вырасце і ягоныя органы зносяцца.

Іншымі непаўнавартаснымі расамі былі цыганы і славяне. У цыганоў быў цьмяны позірк, абмежаваны патэнцыял інтэлекту і прыроджаная схільнасць да крадзяжоў і забойстваў. У славянаў таксама быў абмежаваны патэнцыял інтэлекту, што праяўлялася ў прыроджанай схільнасці да паслужлівасці і рабства, але разам з тым яны былі лянівыя і няздольныя засяродзіцца нават на самых простых працоўных задачах. Нацысты называлі славян UNTERMENSCHEN, а гэта значыла, што яны стаяць на ніжэйшай ступені развіцця, чым людзі — MENSCHEN. А ў доўгагаловых славянаў, якія маглі даказаць наяўнасць у іх нямецкай крыві, павінны былі забіраць дзяцей і аддаваць іх у прыёмныя нямецкія сем'і. Нацысты прыкідвалі, што доўгагаловых славянаў прыблізна 12 % у Польшчы, 25 % у Закарпацці, 35 % ва Украіне і ажно 50 % у Чэхіі. Цыганы і габрэі былі LEBENSUNWERT, а гэта значыла, што яны не вартыя жыцця, і ў канцэнтрацыйных лагерах загінула паўмільёна цыганоў і тры мільёны габрэяў, а больш за два з паловай мільёна габрэяў загінула ў гета, пры аблавах, пры масавых расстрэлах і па дарозе ў канцэнтрацыйныя лагеры. А ў 1941 годзе спецыяльныя ваенныя аддзелы EINSATZGRUPPEN атрымалі загад перастраляць на акупаваных тэрыторыях як мага больш габрэяў, і за паўгода іх было застрэлена 800 000. А ў 1905 годзе нямецкі Камітэт па цыганскім пытанні выдаў ZIGEUNERBUCH, цыганскую кнігу, дзе псіхіятры, антраполагі і біёлагі тлумачылі, чаму цыганы непаўнавартасныя і чым яны могуць нашкодзіць грамадству. А ў 1922 годзе немцы прыдумалі для цыганоў антрапаметрычны пашпарт, які замяняў пасведчанне аб нараджэнні, а ў 1939 годзе яны вырашылі сабраць цыганоў у канцэнтрацыйных лагерах і прыступіць да канчатковага вырашэння пытання, тады гэта называлася глабальная эўтаназія. А ў 1936 годзе яны заснавалі арганізацыю, якая атрымала назву LEBENSBORN, КРЫНІЦА ЖЫЦЦЯ, і ў ёй апладнялі нямецкіх жанчын, якія марылі падараваць сваё дзіця дзяржаве. Арганізацыя складалася з васьмі апладняльных установаў, чатырнаццаці радзільняў і шасці дзіцячых дамоў, дзе разам з дзецьмі нямецкіх жанчын, аплодненых абранымі мужчынамі з шэрагаў SCHUTZSTAFFEL,

выхоўваліся і дзеці доўгагаловых славянаў, а над уваходам у апладняльныя ўстановы вісела эмблема з выявай крыніцы і сузор'я Малой мядзьведзіцы з Палярнай зоркай, якая была сімвалам нардычнай крыві. А ў 1944 годзе кіраўніцтва лагера ў Біркенаў атрымала загад як мага хутчэй адправіць усіх цыганоў, якія засталіся, у газавую камеру, і кіраўніцтва лагера мусіла зрабіць спецыяльныя надзвычайныя начныя змены, якія называліся ZIGEUNERNÄCHTE, цыганскія ночы. А тым часам узнікалі новыя універсальныя мовы: космалінгва, лацінулус, мундыяль, косман, камун, нейтрал, сімпліма. А ў 1985 годзе Сусветная габрэйская рада выступіла з заявай, што габрэі глыбока спачуваюць цыганскаму народу, але ўсё ж такі эўтаназія цыганоў — гэта несапраўдны генацыд, бо яна палягала не на этнічнай аснове, а на падмурку сацыяльнага еўгенізму.

Пазней гісторыкі пачалі падзяляць палітычныя рэжымы дваццатага стагоддзя на тры групы: таталітарныя, аўтарытарныя і дэмакратычныя. Таталітарнымі рэжымамі былі камунізм і нацызм, аўтарытарнымі рэжымамі лічыліся фашысцкія і прафашысцкія дыктатуры, якія пасля Першай сусветнай вайны з'явіліся ў Італіі, Іспаніі, Партугаліі, Балгарыі, Грэцыі, Польшчы, Румыніі, Венгрыі, Эстоніі, Латвіі і г. д. Камуністы казалі, што фашызм і нацызм — гэта тое самае, але большасць гісторыкаў з гэтым не пагаджалася і казала, што фашызм па сваёй сутнасці універсальны і здольны прыжыцца дзе заўгодна, адразу прыстасаваўшыся да канкрэтных культурных і гістарычных умоваў, тым часам як камунізм і нацызм па сваёй сутнасці непрыстасоўныя, бо ў іх рэальнасць цалкам падпарадкаваная ідэалогіі. І менавіта таму гэтыя рэжымы — таталітарныя. А фашызм умее прыстасоўвацца і можа мець як правую, так і левую арыентацыю, і скіраваны ён як на старэйшых грамадзянаў, так і на рэвалюцыйна настроеную моладзь, бо першым ён абяцае навесці парадак, а другім — усталяваць новы свет, у якім усё будзе вечна маладое. Вечна малады свет імкнуліся стварыць і камуністы, але тыя не абяцалі наводзіць парадак для старэйшага пакалення. А маладыя людзі смела глядзелі ў будучыню, а вецер гайдаў каласы, і сонца ўзыходзіла на далеглядзе. А псіхааналітыкі казалі, што згода большасці немцаў з ідэалогіяй

нацызму — гэта праява сексуальнай фрустрацыі, і што немцы, уласна кажучы, шукалі бацьку, тады як вера ў камунізм — гэта, хутчэй, праява садамазахізму ў яго інфантыльнай фазе.

Камуністы абвяшчалі: «У ЗДАРОВЫМ ЦЕЛЕ — ЗДАРОВЫ ДУХ!», і лічылі, што псіхааналіз — сімптом разлажэння буржуазнага грамадства, дзе людзям даводзіцца кампенсаваць фрустрацыю і комплексы непаўнавартасці, якія ў іх выклікае капіталізм. А ў 1929 годзе Бюро па еўгеніцы ў Ленінградзе прапанавала выбраць з шэрагаў савецкіх рабочых асабліва руплівых і прадукцыйных і адчыніць цэнтры па інсемінацыі, дзе б выбраныя асобы апладнялі савецкіх жанчын, і ленінградскія еўгеністы падлічылі, што адзін надзвычай прадукцыйны рабочы можа даць савецкаму народу ажно 1100 кваліфікаваных рабочых і ўмацаваць тым самым здаровае ядро бяскласавага грамадства. Для працоўных на заводах і ў канторах камуністы арганізоўвалі ранішнія зарадкі, круцілі ім па радыё вясёлыя спевы, каб лепш працавалася, рабілі парады фізкультурнікаў і спартакіяды з алегорыямі і жывымі карцінамі з чалавечых целаў і казалі, што гэта новае мастацтва, якое бярэ свой пачатак у народзе. А нацысты казалі, што мастацтва — гэта рэч не эстэтычная, а біялагічная, і што сапраўднае мастацтва — гэта душа народу, і яно належыць усім. А камуністы казалі, што мастацтва павінна быць аптымістычным, як лярва, з якой вылазіць матыль, а таксама рашучым, як крок народу насустрач светлай будучыні. І яны прапагандавалі манументальнае мастацтва, якое было б відаць здалёк: скульптуры, альбо фрэскі, альбо вялікія палотны, каб і просты люд мог мастацтвам пацешыць вока. Нацысты казалі, што сучаснае мастацтва дэкадэнцкае і што новае мастацкае выяўленне павінна чэрпаць натхненне ў народзе, а камуністы падазравалі мастакоў у тым, што яны знарок робяць дэкадэнцкае мастацтва, каб такім чынам мацней адрозніваццa ад простага люду. І казалі, што трэба знайсці новую мастацкую форму і новыя арыгінальныя ідэі, але паступова арыгінальныя ідэі пачалі здавацца ім падазронымі, бо маглі быць праявай буржуазнага мыслення, якое пад шыльдай мадэрнізму чыніла перашкоды сапраўднай рэвалюцыйнай навізне. Ім пачалі здавацца падазронымі людзі, якія насілі вусы, альбо капялюш, альбо экстравагантнае паліто, альбо якія нешта малявалі ў

нататніку, седзячы ў кавярні. І яны казалі, што сапраўднае мастацтва павінна быць адлюстраваннем новага жыцця, аптымістычным і рашучым адначасова, і арганізоўвалі зарадкі, і круцілі працоўным па радыё спевы.

Канцэнтрацыйныя лагеры прыдумалі камуністы ў 1918 годзе, каб паскорыць перамогу рэвалюцыі і ўзмацніць дыктатуру пралетарыяту, а гісторыкі казалі, што ў савецкіх канцэнтрацыйных лагерах загінула пятнаццаць ці нават дваццаць мільёнаў чалавек, а цягам наступных трыццаці пяці гадоў у іх правёў частку жыцця кожны сёмы дарослы грамадзянін Савецкага Саюза. А ў 1916 годзе адбылася рэвалюцыя ў Ірландыі. А ў 1917 годзе з рускага войска дэзертавала больш за два мільёны салдатаў, якія хацелі вярнуцца дадому, каб не прапусціць перадзелу зямлі і жывёлы, які ім абяцала ўлада, што ўсталявалася пасля падзення царскага рэжыму. Ірландскую рэвалюцыю яшчэ называюць «Паэтычнай рэвалюцыяй», бо тры чвэрці ірландскай рэвалюцыйнай рады складалі паэты, якія хацелі заснаваць Ірландскую Рэспубліку і спадзяваліся на тое, што англійская армія не будзе мець дастаткова сродкаў для эфектыўнага адпору, бо большасць англійскіх салдатаў ваявала ў Францыі і ў Бельгіі супраць немцаў. Узмацніць дыктатуру пралетарыяту было важна, таму што акрамя буржуазіі камуністам даводзілася ваяваць супраць рабочых у гарадах і супраць сялянаў на вёсцы, бо тыя ўяўлялі сабе рэвалюцыю інакш, і баставалі, і не хацелі выконваць рэвалюцыйныя задачы. І шэсцьдзесят два паўстанцы і сто пяцьдзесят англійскіх салдатаў загінула падчас Паэтычнай рэвалюцыі. А ў сялянаў, якія не хацелі выконваць рэвалюцыйныя задачы, камуністы канфіскоўвалі ўраджай, кароў, курэй і г. д., а сялянаў, якія займаліся падрыўной дзейнасцю, і хадзілі красці каласы з калгасных палёў, і не хацелі аддаваць карову альбо курыцу дзяржаве, адпраўлялі ў канцэнтрацыйныя лагеры альбо расстрэльвалі. Пазней камуністы разважылі, што лягчэй за ўсё перамагчы супраціў сялянства, калі ў земляробчых абласцях — ва Украіне, на Паўночным Каўказе ці ў Казахстане — штучна выклікаць масавы голад. І яны адхілілі чыгуначны транспарт і перакрылі шляхі ўезду і ўвозу прадуктаў, пазачынялі крамы і забаранілі гандаль і да т. п., і шэсць мільёнаў чалавек памерла

з голаду. А некаторыя людзі прыхоўвалі трупы сваіх родных і прадавалі іх на чорным рынку альбо суседзям, а за атрыманыя грошы куплялі мяса з іншых трупаў, бо не хацелі есці мяса тых, з кім нядаўна былі шчаслівыя. А з касцей трупаў варылі булён, а з пячонкі рабілі начынку для піражкоў. А адзін селянін пасяліўся недалёка ад масавага пахавання ля хутара Багаслоўка і паварваў сабе мяса з трупаў, але камуністы знайшлі яго і застрэлілі, каб іншых не надзіла.
Канцэнтрацыйныя лагеры спачатку былі двух тыпаў: працоўныя і спецыяльныя. У першых свядомае імкненне да працы прышчэплівалася алкаголікам, хуліганам, паразітам і тым, хто не выканаў мінімальнай колькасці зменаў альбо пакінуў свой працоўны пост, не пераканаўшыся, што выканаў штодзённы рэвалюцыйны план, а ў другіх працавалі ненадзейныя і небяспечныя індывіды, сябры іншых палітычных партый, рабочыя, што бралі ўдзел у забастоўках, падазроныя чыноўнікі, буржуазная гнілота, распуснікі, блазны, анархісты, кулакі, бульбакрады і народныя камісары, якія не адправілі ў лагеры дастатковую колькасць контррэвалюцыянераў. А ў 1922 годзе працоўныя лагеры былі адмененыя і засталіся толькі спецыяльныя, дзе ўсе разам працавалі ў імя ўсеагульнага дабрабыту. А ў 1923 годзе з Масквы ў канцэнтрацыйны лагер у Мураме саслалі двух хуліганаў, якія насміхаліся з рабочых, што вярталіся з працы, і аднаго токара, які тройчы запар спазніўся на працу, і той токар аднойчы ўначы забіў абодвух хуліганаў жардзінай ад нараў за тое, што яны расказвалі антысавецкія анекдоты, а токар баяўся, што калі ён будзе слухаць антысавецкія анекдоты, нехта на яго «настукае» і камуністы яго расстраляюць. А пасля Другой сусветнай вайны ў канцэнтрацыйныя лагеры былі сасланыя рускія ваеннапалонныя, якія павярталіся дадому. Іх падазравалі ў браку баявога духу і ў схільнасці да індывідуалізму. Ваеннапалонных, якія вярнуліся ў Савецкі Саюз, было 2 270 000, і ў лагерах яны правялі ў сярэднім па дзесяць гадоў, калі толькі не памерлі раней ад знясілення альбо ад хваробаў і эпідэмій. Самай частай прычынай смерці ў канцэнтрацыйных лагерах былі абмаражэнні і гангрэна ног, бо людзі баяліся, каб у іх уначы хто-небудзь не скраў боты, і спалі абутыя.

Гісторыкі казалі, што абвяшчэнне мабілізацыі ў 1914 годзе

адпавядала грамадскаму настрою ў Германіі, Аўстрыі, Сербіі, Францыі, Італіі і г. д., і што Першая сусветная вайна была, магчыма, першая і апошняя сапраўды народная і патрыятычная вайна ў гісторыі. А калі салдаты калонамі ішлі па горадзе на вакзал, людзі беглі ім насустрач з патрыятычнымі воклічамі і пхалі салдатам у рулі стрэльбаў гваздзікі, а аркестр найграваў бадзёрыя мелодыі. А ў Англіі, дзе ў 1914 годзе не было абавязковай службы ў войску, у салдаты запісалася больш за паўтара мільёна добраахвотнікаў. І яны крочылі на вакзал і не маглі дачакацца, калі вайна ажывіць іхныя добрыя якасці, якія сучасны прамысловы свет адсунуў на задні план: любоў да радзімы, адвагу і самаахвярнасць. Але калі вайна зацягнулася і ўсё больш з'яўлялася мінаў, барыкадаў, каросты і пацукоў, салдаты гублялі ўпэўненасць і разуменне, чаму яны, уласна, ваююць, і адчувалі сябе пакінутымі, непатрэбнымі і нялюбымі. І яны стралялі па пацуках, рабілі попельніцы і сцізорыкамі вырэзвалі на іх надпісы: «НЯХАЙ ЖЫВЕ 25-Я ДЫВІЗІЯ», «НА ПАМЯЦЬ АБ ВАЙНЕ», «ВАША ЗДАРОЎЕ!» альбо «БОЛЬШ НІКОЛІ!». У Францыі і Англіі пасля Першай сусветнай вайны было шмат пацыфістаў, і грамадская думка была настроеная па-антымілітарысцку, а немцы тым часам шылі уніформы і выраблялі танкі і самалёты. А пацыфісты казалі, што мір — гэта найвялікшая каштоўнасць, але нацысты думалі, што найвялікшая каштоўнасць — гэта перамога, і што веліч чалавечага лёсу праяўляецца ў барацьбе дабра са злом, а камуністы лічылі, што неабходна прыспешыць перамогу камунізму, а ў Іспаніі пачалася грамадзянская вайна, а немцы напалі на Польшчу, Данію, Нарвегію, Галандыю, Бельгію і Францыю, а рускія напалі на Польшчу, Эстонію, Латвію, Літву, Фінляндыю і Румынію, і стала відавочна, што пачалася Другая сусветная вайна.

Некаторым гісторыкам больш даспадобы была Другая сусветная вайна, чым Першая, і яны казалі, што Першая сусветная была народная і патрыятычная, тым часам як Другая была цывілізацыйная. І што ў Першай сусветнай вайне людзі ваявалі за свае дробязныя канцэпцыі, якія ўжо тады былі ўчорашнім днём, тады як у Другой абаранялі ідэю чалавека. Пасля Другой сусветнай вайны людзі не парабіліся пацыфістамі, а хутчэй прыкідвалі, калі пачнецца Трэцяя

сусветная вайна паміж дэмакратычнымі і камуністычнымі краінамі. І паўсюль шасталі шпіёны і выведнікі. А ў міністэрствах адукацыі думалі, як паспрыяць канчатковай перамозе. А навукоўцы прыдумвалі новую зброю, новыя баявыя газы, атамныя бомбы, боегалоўкі, ракетаносцы, бомбы з парашутам, электрамагнітныя пертурбацыі, нейтроннае выпрамяньванне і макрамалекулярную цытатаксічнасць. І ствараліся новыя словы і словазлучэнні для абазначэння новых вынаходніцтваў, навуковых адкрыццяў і новых грамадскіх з'яваў і тэорый, напрыклад, ТЭОРЫЯ АДНОСНАСЦІ, ЧОРНЫЯ ДЗІРКА, ПСІХААНАЛІЗ, ТЭЛЕБАЧАННЕ, ЮГАСЛАВІЯ, ЗЛАЧЫНСТВА СУПРАЦЬ ЧАЛАВЕЧНАСЦІ, РАДЫЁ, МАДЭМ, ДАДАІЗМ, САЦЫЯГЕНЕТЫКА, ПОСТМАДЭРНІЗМ, ГЕНАЦЫД, БІЯЭТЫКА, ЕЎГЕНІКА, ТРАНСГЕНЕТЫЗМ, КУБІЗМ, ЭКЗАБІЯЛОГІЯ, АТАМНАЯ ДЭЗІНТЭГРАЦЫЯ, МІЖЧАЛАВЕЧЫЯ СТАСУНКІ і г. д.

Некаторыя філосафы казалі, што ўладкаванне свету адпавядае механізмам дыскурсу, які мае свае зменлівыя, але адначасова дадзеныя знакі, і што ўпарадкаванне знакаў, у прынцыпе, не мае ніякага сэнсу, і што ўсё гэта — гульня, выпадковасць, анархія, працэс, дэканструкцыя, інтэртэкст і да т. п., але што знак сам сабою — гэта носьбіт сэнсу, хоць мы дакладна і не ведаем, якога. Але іншыя філосафы, у сваю чаргу, казалі, што ў знакаў, з якіх пабудаваны дыскурс і свет, сэнс адсутнічае, і са стратай сэнсу разбураецца суб'ект і сама рэальнасць, і што гісторыя — гэта толькі бесперапынны бясформенны рух, які нічога не выражае, і што ўсё ёсць фікцыяй і сімуляцыяй. І што крызіс гуманізму заканамерны, бо гуманізм апынуўся ў тупіку менавіта таму, што дасягнуў сваёй мэты і сцвердзіў каштоўнасці, якія яму былі ўласцівыя: свабоду, індывідуалізм, плюралізм, празрыстасць і да т. п. І што гуманісты за што змагаліся, тое і маюць — індывідуалістычны, інтэрактыўны, пазітыўны, празрысты і аператыўны свет, які патанае ў сваёй уласнай сімуляцыі, і яго канчатковым вынікам будзе замена рэальнасці гіперрэальнасцю. А некаторыя матэматыкі казалі, што рэальнасць — гэта ілюзія, і што на самай справе гэта толькі матэматычная канструкцыя ў чалавечым мозгу, які інтэрпрэтуе частату, што паходзіць з нейкага іншага вымярэння, а тое вымярэнне трансцэндуе прастору і час, і што

мозг — гэта галаграма, што адлюстроўвае сусвет, які таксама ёсць галаграмай.

А ў 1907 годзе адзін француз пераляцеў цераз пратоку Ла-Манш на аэраплане, а ў 1910 годзе адзін перуанец на аэраплане пераляцеў цераз італьянскія Альпы, а ў 1911 годзе італьянцы скарысталі аэраплан у вайне з Турцыяй, а ў 1914 годзе канструктары прыдумалі, як да аэраплана прыладзіць кулямёт, каб самалёты маглі перастрэльвацца, а ў 1915 годзе прыдумалі, як скідваць з самалёта бомбы, а ў 1945 годзе амерыканцы прыдумалі атамную бомбу і скінулі яе на горад, які называўся Хірасіма. Самалёт меў назву «ENOLA GAY», і пілот пазней растлумачыў журналістам, што назваў яго так у гонар сваёй ірландскай бабулі, у якой было такое вясёлае імя. Выбух змёў большасць дамоў у радыусе трох кіламетраў, і ў неба ўзнялася хмара дыму, якую пазней назвалі «атамны грыб», бо яна выглядала, як грыб. Для параненых у мясцовай школе быў створаны пункт першай дапамогі, і школьнікі, якія перажылі выбух, выцярэблівалі палачкамі чарвякоў з ранаў пацыентаў, а калі тыя паміралі, адвозілі іх на тачках у крэматорый. А іншыя людзі паміралі ў наступныя месяцы ад хваробаў, якія атрымалі агульную назву «прамянёвая хвароба», ад лейкеміі, астэніі і інш. Людзі, якія засталіся жывыя пасля выбуху і прамянёвай хваробы, наганялі страх на іншых жыхароў, бо выглядалі, як пракажоныя, і паводзілі сябе, як блазны. Пазней многім здавалася, што з боку амерыканцаў было празмернай жорсткасцю скідваць атамную бомбу ў самым канцы вайны, але ваенныя стратэгі казалі, што калі б бомбу не скінулі амерыканцы, яе скінуў бы нехта іншы, бо хоць аднойчы яе трэба было выпрабаваць у рэальных умовах, каб у свеце ўсталявалася раўнавага тэрору, якая была б гарантам таго, што не пачнецца Трэцяя сусветная вайна. А ў 1944 годзе амерыканцы прыдумалі ляльку памерам з чалавека, якую назвалі РУПЕРТ. Той Руперт быў апрануты, як парашутыст, і быў напханы гранатамі і выбуховымі рэчывамі, і амерыканцы скідвалі такіх лялек з самалётаў на варожую тэрыторыю, і калі немцы альбо партызаны бачылі, як Руперт апускаецца на зямлю, то адразу беглі да яго, а як толькі Руперт дакранаўся да зямлі, ён выбухаў, забіваючы ўсіх, хто знаходзіўся побач. А ў 1918 годзе немцы прыдумалі гармату, якой далі імя «ТОЎСТАЯ

БЕРТА» і якая страляла на 128 кіламетраў, а ў 1944 годзе прыдумалі ракету з дыстанцыйным кіраваннем VERGELTUNGSWAFFE, якая дасягала хуткасці 5800 кіламетраў за гадзіну і мусіла вырашыць канчатковы зыход вайны на карысць Германіі. А ў 1947 годзе амерыканцы прыдумалі звышгукавы самалёт, а ў 1957 годзе рускія прыдумалі штучны спадарожнік Зямлі, а ў 1961 годзе адправілі ў космас першага чалавека, а ў 1969 годзе амерыканцы паслалі трох астранаўтаў на Месяц, і калі першы астранаўт саступіў з лесвіцы на паверхню Месяца, ён прамовіў гістарычную фразу: «ГЭТА МАЛЕНЬКІ КРОК ДЛЯ ЧАЛАВЕКА, АЛЕ ГІГАНЦКІ КРОК ДЛЯ ЧАЛАВЕЦТВА». Галоўным інжынерам амерыканскай касмічнай праграмы быў былы палкоўнік спецыяльных падраздзяленняў нямецкай арміі SCHUTZSTAFFELN, які ў 1944 годзе прыдумаў ракету з дыстанцыйным кіраваннем VERGELTUNGSWAFFE. Пазней вяліся спрэчкі пра тое, ці сам астранаўт прыдумаў гістарычную фразу альбо яе загадзя падрыхтаваў спецыяліст па сувязях з грамадскасцю. Ракета VERGELTUNGSWAFFE выраблялася ў канцэнтрацыйным лагеры ў Доры, а 528 мільёнаў тэлегледачоў сачыла за прызямленнем на Месяц у жывым эфіры, а палітыкі і спецыялісты па сувязях з грамадскасцю казалі, што гэта істотны крок у сусветнай камунікацыі і ў напаўненні глыбокім сэнсам міжчалавечых адносін.

А падчас Другой сусветнай вайны фізікі перагледзелі тэорыю адноснасці, а матэматыкі прыдумалі тэорыю інфармацыі, навізна якой палягала ў тым, што гэтая тэорыя адкінула ўбок семантычныя палі і пачала разглядаць інфармацыю як нешта, што ніяк не залежыць ад сэнсу. А некаторыя матэматыкі і астрафізікі казалі, што інфармацыя — гэта адзін з канструктыўных элементаў сусвету, і што арганізацыя сусвету — гэта раўнадзейная кантраверсійных суадносін паміж энергіяй і інфармацыяй, з аднаго боку, і інфармацыяй і матэрыяй, з другога. Філосафы казалі, што інфармацыя — гэта філасофскае паняцце, якое азначае наданне існаму пэўнай формы, і што нейкі змест знойдзецца заўсёды, але што змест сам сабою не мае ніякага сэнсу, акрамя руху, які ў ім змяшчаецца, аднак які можа адначасова працякаць і па-за формай, і яны ставілі пытанне, ці не звязаная адсутнасць сэнсу

ў інфармацыі з адсутнасцю сэнсу ў гісторыі. Некаторыя матэматыкі казалі, што тэорыя адноснасці стварыла матэматычны фундамент для новага погляду на свет, і што тэорыя інфармацыі яе лагічна дапаўняе. Нацысты спачатку не згаджаліся з тэорыяй адноснасці і казалі, што гэта эстэтычная і інтэлектуальная атака габрэяў, якія хочуць зрабіць шкоду нямецкаму народу, а камуністы казалі, што тэорыю адноснасці прыдумала буржуазія, якая хацела даказаць, што навука сама сабою — рэч адносная, і такім чынам паставіць пад сумнеў камунізм, які базуецца на непахісным навуковым падмурку.

Першая сусветная вайна была народная і патрыятычная, і многія людзі верылі ў патрыятычныя ідэі, у душу народу і ў помнікі палеглым салдатам, і яшчэ доўга пасля Другой сусветнай вайны, пра якую казалі, што гэта вайна цывілізацыйная, людзі працягвалі думаць хутчэй у маштабах нацыі, чым цывілізацыі, і кожная нацыя мела свае адметныя рысы. Англічане былі прагматычныя, а ў англічанак былі вялікія ногі, а ў італьянак — вялікія грудзі, а італьянцы былі бесклапотныя, а немцы клапаціліся пра гігіену і не мелі пачуцця гумару. А ірландцы былі ўвесь час пад мухай, а шатландцы былі добрыя хадакі, а французы былі дзёрзкія і фанабэрыстыя, а грэкі — закамплексаваныя, а чэхі — баязлівыя, а палякі ўвесь час — п'яныя, а італьянцы — крыклівыя, а балгары — адсталыя, а іспанцы — невясёлыя, а венгры — ганарыстыя. А скульптары і каменячосы былі радыя, што маюць шмат замоваў. А французы мелі паняцце SAVOIR VIVRE, а англічане мелі паняцце FAIR PLAY, а ва ўрачыстыя моманты дзеці стаялі каля помніка на ганаровай варце, каб паказаць, што памяць пра вайну застанецца вечна жывая і што людзі пра гэта павінны задумацца. Антраполагі казалі, што для роздумаў пра мінулае помнікі падыходзяць лепш, чым музеі альбо архівы, бо помнікі найперш звязаныя з памяццю, а ўжо пасля — з гісторыяй, і што памяць ажыўляе мінулае, тым часам як гісторыя робіць мінулае нежывым, застылым у часе. А гісторыкі казалі, што помнікі даюць магчымасць сартаваць успаміны грамадства, упарадкоўваць калектыўную памяць і змагацца як з забыццём у шырокім сэнсе, так і — перадусім — з забыццём канкрэтным, і што гэта, уласна кажучы, — спосаб стварэння новых формаў забыцця, а філосафы казалі, што і

забыццё можа мець структуру. Помнікі ставіліся ў розных месцах, на агульнай тэрыторыі, на ўлонні прыроды, уздоўж магістраляў альбо на палях бітваў, і антраполагі казалі, што змяшчэнне помнікаў на розных месцах прывяло ў дваццатым стагоддзі да рэарганізацыі сімвалічнай прасторы, і што арганізацыя прасторы ёсць для грамадства асновай індывідуальнага і калектыўнага самавызначэння, што яна — гэта адначасова і грамадскае ўтварэнне, і інтэлектуальны ўзор, а значыць, першасная ўмова стварэння любой гісторыі. Людзі, якія спыняліся каля помнікаў, мелі адчуванне, што ў некаторай ступені падзяляюць з салдатамі, партызанамі і вязнямі канцэнтрацыйных лагераў іхнае жыццё, і нават крыху іх смерць, а некаторыя гісторыкі казалі, што помнікі — гэта нібы ракавінкі, што застаюцца на беразе мора, калі прыходзіць адліў мора і памяці, альбо як перарэзаныя напалам дажджавыя чарвякі, у якіх яшчэ трапечуцца рэшткі жыцця, але ўжо жыцця не рэальнага, а сімвалічнага. А адна маладая габрэйка перажыла вайну дзякуючы таму, што грала на скрыпцы на пероне ў Дахаў арыі з «Вясёлай удавы». А мужчынам і жанчынам абстрыгалі валасы і раздавалі квіткі, якія яны павінны былі аддаць пры ўваходзе ў лазню. А ў 1917 годзе адзін італьянскі салдат пісаў сваёй сястры: «Я З КОЖНЫМ ДНЁМ ЗДАЮСЯ САБЕ ЎСЁ БОЛЬШ ПАЗІТЫЎНЫМ». А ў краінах, акупаваных немцамі, людзі пасля вайны рабілі аблавы на калабарантаў і здраднікаў радзімы і да т. п., а жанчынам, якія спалі з немцамі, абстрыгалі валасы, а адзін вязень вярнуўся з канцлагера дадому з паголенай галавой і пайшоў на танцы з сяброўкай сваёй сястры, якой мясцовыя жыхары абстрыглі валасы за тое, што спала з нямецкімі акупантамі, і яны танцавалі разам, прыціснуўшыся ілбамі, і некаторым людзям здавалася, што гэта недарэчна і нават пошла. А ў Іспаніі танцавалі фламэнка, а цыганы кідалі цьмяныя позіркі, а рускія мелі гонар, а шведы былі прагматычныя, а габрэі — крывадушныя, а французы — бесклапотныя, а англічане — фанабэрыстыя, а партугальцы — адсталыя. Але з развіццём спажывецкага грамадства і сродкаў камунікацыі жыццё людзей у Еўропе пачало паступова рабіцца аднолькавым, і некаторыя сацыёлагі і гісторыкі меркавалі, што мысленне ў маштабах нацыі — гэта ўчорашні дзень, і казалі, што самай выразнай рысай развітага заходняга грамадства ёсць касмапалітызм, і

што ніякіх немцаў, румынаў альбо шведаў, па вялікім рахунку, не існуе, што гэта проста праекцыя на сябе этнічных стэрэатыпаў і забабонаў. Але іншыя сацыёлагі з гэтым не пагаджаліся і казалі, што з развіццём спажывецкага грамадства і сродкаў камунікацыі людзі паступова згубілі большасць арыенціраў, і што нацыянальнае грамадства сёння парадаксальным чынам мае большы сэнс, чым раней. І што стэрэатыпы неабходныя для захавання калектыўнай і гістарычнай памяці, без якой заходняе грамадства згубіла б сваё культурнае адзінства, бо адзінства не можа не быць гетэрагенным. І што калектыўная памяць — гэта кампраміс між мінулым і сучаснасцю, і што плюс стэрэатыпаў і забабонаў у тым, што яны старэюць павольней, чым гісторыя, тэхнічныя навінкі і да т. п., і што стэрэатыпы — гэта апошняя і разам з тым самая актыўная галіна, дзе захоўваецца сацыяльная ідэнтычнасць. Этнолагі і антраполагі казалі, што гістарычнасць можа мець два выгляды, першы з якіх уласцівы грамадствам, якія жадаюць застацца ў сваім сімвалічным існаванні, а другі — грамадствам, якія чэрпаюць з нетраў гісторыі рух і энергію. І што заходняе грамадства традыцыйна належыць да другога тыпу, але ў дадзены момант, магчыма, пераходзіць у першую групу. А філосафы казалі, што павелічэнне хуткасці гісторыі, якое адбываецца ў дваццатым стагоддзі, выклікае страту пачуцця часу і гістарычнасці ў яе традыцыйным разуменні, і што калі павінна з'явіцца новая форма гістарычнасці, то трэба гісторыю запаволіць, і некаторыя з іх патрабавалі, каб да дэкларацыі правоў чалавека дадалі права чалавека на час. Ідэя паставіць салдатам помнікі, каб пра іх не забыліся, прыйшла падчас вайны, калі гарадскія старасты вырашылі, што спісы забітых салдатаў, якія вывешваліся на ратушах, неяк занадта афіцыйныя, сухія і недастаткова сімвалічныя. Пасля вайны помнікі салдатам ставілі як у краінах-пераможцах, так і ў краінах, якія вайну прайгралі. І ў краінах-пераможцах помнікі, галоўным чынам, услаўлялі перамогу, а ў пераможаных краінах — самаахвярнасць і адвагу. А ў 1989 годзе адзін амерыканскі палітолаг прыдумаў тэорыю пра канец гісторыі, згодна з якой гісторыя, уласна кажучы, скончылася ў 1989 годзе, бо сучасная навука і новыя сродкі камунікацыі далі людзям магчымасць жыць у дабрабыце, а ўсеагульны дабрабыт — гэта гарантыя дэмакратыі, а не наадварот, як гэта раней уяўлялі сабе

асветнікі і гуманісты. І што грамадзянін — гэта, па сутнасці, спажывец, а спажывец — таксама грамадзянін, і што ўсе формы грамадства развіваюцца ў кірунку ліберальнай дэмакратыі, і што ліберальная дэмакратыя, у сваю чаргу, прывядзе да падзення ўсіх аўтарытарных формаў улады, да палітычнай і эканамічнай свабоды і роўнасці і да новага веку ў гісторыі чалавецтва, які, аднак, ужо не будзе гістарычным. Але многія людзі пра гэтую тэорыю не ведаюць і працягваюць сабе рабіць гісторыю як нічога ніякага.

Пераклала з чэшскай Юлія Сматрычэнка паводле:
Ouředník, Patrik. Europeana. Stručné dějiny dvacátého věku. — Praha — Litomyšl, 2001.

❑

Уласціміл Гарл.
Фікцыя рэальнасці ці рэальнасць фікцыі?
(Пасляслоўе)
[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 4 (44) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/11
[image]

[image]

A R C H E П а ч а т а к № 4 (44) - 2006

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

[image]2006

выбары 2006 • аналітыка • літаратура • **гісторыя** • эсэістыка

[image] [image] [image]

Да гісторыі Беларускай Сацыялістычнай Грамады: агляд крыніцаў

[1] Вылучым брашуру Антона Адамовіча «Як дух змаганьня Беларусі»: (Да 100-х угодкаў нараджэньня І. Луцкевіча)» (Нью-Ёрк: Выданьне газэты «Беларус», 1983). Яна карысная занатаванымі ў ёй сьведчаньнямі Вацлава Іваноўскага

[2] Усе ўлёткі надрукаваныя кірыліцаю, але вядома, што кожная зь іх выдавалася, як правіла, кірыліцаю і лацінкаю. Так, у кнізе апублікаваны тэкст улёткі «Чым цар ратуецца», аднак у архіве маецца і яго адпаведнік «Czym car ratujecca» (НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 26, арк. 1).

Так сталася, што пасьля пэўнага ажыўленьня канца другое паловы 1980-х – пачатку 1990-х спынілася актыўнае дасьледваньне гісторыі Беларускае Сацыялістычнае Грамады. Пасьля артыкулу Міхася Біча «Стары змаганец», прысьвечанага рэвалюцыйнай дзейнасьці Аляксандра Бурбіса (Мастацтва Беларусі. 1986. № 3), супольнага артыкулу Міхася Біча і Станіслава Рудовіча «Беларуская Сацыялістычная Грамада» ў Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі, другое часткі супольнага расейска-беларускага дасьледаваньня «Кастрычнік 1917 і лёс палітычнай апазіцыі» (1993), у складаньні якога істотную ролю адыграў Мікалай Сташкевіч, пасьля перадруку ў зборніку «На суд гісторыі» (Менск, 1994) успамінаў Сьцяпонаса Кайрыса ды Юльяны Вітан-Дубейкаўскай пра Цётку, больш істотных публікацыяў з гісторыі беларускага сацыялістычнага руху не надаралася. Таму нельга было не парадавацца, што летась абаронена дысэртацыя Андрэя Ўнучка, прысьвечаная «Нашай Ніве» і, значыць, партыі, якая стварыла «Нашу Ніву».

Калі ў БССР, пачынаючы з 1929 г., дасьледаваньні і публікацыі крыніцаў з гісторыі БСГ былі пад забаронай, калі на эміграцыі беларускія гісторыкі дасьледваннямі з гісторыі БСГ не практычна не займаліся[1], дык у пасьляваеннай Польшчы гэтая праца вялася. Перш за ўсё я маю на ўвазе працы Аляксандры

Бэргман і асабліва Юр'я Туронка. Тут нельга не адзначыць дыскусію ў газэце «Ніва» (1981), у якой палеміка ішла вакол асобы Івана Луцкевіча, яго месца ў гісторыі беларускага руху, а таксама вакол замоўчваньня Антонам Луцкевічам факту існаваньня Беларускай Рэвалюцыйнай Партыі – папярэдніцы Беларускае Рэвалюцыйнае Грамады і Беларускае Сацыялістычнае Грамады. Такая дыскусія была немагчымая ў БССР.

У Заходняй Беларусі нямала ўвагі гісторыі БСГ надаваў Антон Луцкевіч. Ягоныя працы гэтай тэматыкі найбольш поўна прадстаўленыя ў кнізе «Да гісторыі беларускага руху» (Менск, 2003).

Калі згадваць публікацыі партыйных дакумэнтаў, дык тут на памяць прыходзяць артыкул Аляксандра Шлюбскага «Да гісторыі БСГ» (Полымя. 1925. № 5) і зборнік «Сацыялістычны рух на Беларусі ў праклямацыях 1905 году», укладзены Міхалам Мялешкам (Менск, 1927). У1927 г. зьявіўся і артыкул А. Шлюбскага «Новыя матэрыялы да гісторыі «Нашае Долі» (Полымя. № 3). А далей публікацыі спыніліся. І толькі ў 1993 г. ў трэцяй частцы дасьледаваньня «Кастрычнік 1917 і лёс палітычнай апазіцыі» зьявіліся публікацыя праграмы БСГ 1917 г., а яшчэ праз восем гадоў – у зборніку выбраных твораў Цёткі – Валянціна Коўтун апублікавала пяць улётак БСГ[2].

Каб палегчыць работу дасьледчыкаў, насьпела патрэба скласьці бібліяграфію і выдаць зборнік дакумэнтаў і матэрыялаў да гісторыі БСГ. Што тычыцца зборніка, дык ён ужо складзены. Пакуль знойдзецца фундатар, які возьмецца гэтую кнігу выдаць, лічу патрэбным пазнаёміць аматараў гісторыі і адмыслоўцаў зь яе структурай і з матэрыяламі, што не публікаваліся ў друку або публікаваліся надта даўно і захоўваюцца адно ў архівах.

I

Структура задуманай кнігі «БСГ у дакумэнтах і матэрыялах» даволі простая.

Першы разьдзел складаюць праграмныя дакумэнты партыі, дакумэнты яе канфэрэнцыяў і III зьезду, партыйных камітэтаў. У гэты ж разьдзел уключаныя і праекты дакумэнтаў.

У другім разьдзеле ўтрымліваюцца чатырнаццаць партыйных улётак, а таксама дзьве праклямацыі, якія партыя распаўсюджвала напачатку XX ст.

У трэцім разьдзеле друкуюцца артыкулы, якія мелі калі не дырэктыўны, дык праграмны характар. Як тлумачэньне аграрнай праграмы БСГ, у гэтым разьдзеле публікуецца таксама артыкул А. Луцкевіча «Места і вёска» (1923).

Самы вялікі разьдзел – чацьверты. Тут будуць зьмешчаныя ўспаміны і артыкулы або фрагмэнты ўспамінаў і артыкулаў, прысьвечаных гісторыі БСГ. Іх аўтары – сябры партыі Аляксандар Бурбіс, Зьміцер Жылуновіч, Антон Луцкевіч, Фэлікс Стацкевіч, Яўген Хлябцэвіч, а таксама Зігмас Анагрэціс і Аляксандар Шлюбскі.

У пятым разьдзеле будзе выдрукаваная біяграма Аляксандра Бурбіса, а ў шостым – нэкралёгі.

II

Праграмных дакумэнтаў, дакумэнтаў зьездаў і канфэрэнцыяў БСГ, а таксама партыйных камітэтаў БСГ выяўлена пакуль што няшмат. Мы ведаем, што дакумэнты партыі ў 1913 г. былі здадзеныя на захаваньне «несумленнаму чалавеку, які іх прысабечыў і адмовіўся вярнуць». Тым ня менш, захаваўся самы першы праграмны дакумэнт беларускага руху XX стагодзьдзя – зварот Беларускае Рэвалюцыйнае Партыі «Да інтэлігенцыі». Апублікаваны ў часопісе польскіх сацыялістаў «Przedświt», гэты зварот перадрукаваны ў кнізе д-ра Ю. Туронака «Wacław Iwanowski i odrodzenie Białorusi» (Варшава, 1992). Тэкст звароту, сапраўды, сьведчыць, што БРП была не палітычнай, а хутчэй культурніцкай арганізацыяй. Мне ўжо даводзілася пісаць[3], што інсьпіратар гэтага дакумэнту Вацлаў Іваноўскі хутчэй разьлічваў на паступовы, эвалюцыйны ход

падзеяў і дзейнічаў у адпаведнасьці з клясычнаю схемаю: асьвета–прапаганда–агітацыя. Гэта быў слушны крок. Іншы – таксама слушны – падыход быў у братоў Луцкевічаў. І гэта абумовіла адзначаныя А. Луцкевічам, а потым і Ю. Туронкам пэўныя рознагалосьсі паміж беларускімі сацыялістамі і «падзел працы» паміж імі: калі Вацлаў Іваноўскі, не парываючы сувязі з палітычнай арганізацыяй, засяродзіўся на выдавецка-асьветнай працы «Кругу беларускае народнае прасьветы і культуры», дык браты Луцкевічы (у першы чарод Іван), не адпрэчваючы Кругу, прыступілі да тварэньня ўласна палітычнае арганізацыі – Беларускае Рэвалюцыйнае Грамады. Ня будзем перабольшваць гэтых рознагалосьсяў. Браты Луцкевічы хутка ўсьвядомілі, што «голай палітыкай», якой спрабавалі займацца яны, і адным кнігавыдавецтвам, якім займаўся В. Іваноўскі, ува ўмовах Беларусі многага не дасягнеш. Спалучаючы ўласна палітычную працу з асьветнай, дзеячы БСГ ажыцьцявілі свой самы знакаміты палітычны і культурна-асьветніцкі праект – выданьне газэты «Наша Ніва»[4].

На жаль, да нас не дайшла праграма Беларускае Рэвалюцыйнае Грамады. Затое мы маем два тэксты – беларускі і расейскі нарысу праграмы Беларускае Сацыялістычнае Грамады. Нарэшце, у заплянаваным зборніку яны перадрукоўваюцца з кнігі «Сацыялістычны рух на Беларусі ў праклямацыях 1905 году» з працы Фёдара Турука «Белорусское движение» (Масква, 1907), факсымільна перавыдадзенай у 1994 г. у Менску.

[3] Гл.: Сідарэвіч А. Нарэшце ў Беларусі // Наша Ніва. 10 студзеня. 2013.

[4] У праекце ўстаноўчага з'езду сацыялістычнае партыі, распрацаваным Беларускай сацыялістычнай грамадой у кастрычніку 1906 г., адзначаліся, што «праца ў Беларусі ў цяперашні момант мае свае асаблівасьці, якія ўзьнікаюць з умоваў беларускага жыцьця, і таму Беларуская сацыялістычная грамада (пасля – Беларускі нацыянальны камітэт) лічыць, што ў Беларусі павінна быць самастойная сацыялістычная партыя, якая ўлічвала б гэтыя асаблівасьці». Гл.: Праект устаноўчага з'езду Беларускай сацыялістычнай партыі // Наша Ніва. 2005. 1 лістапада.

[5] Дакладней: «Беларускай сацыялістычнай грамады». Гэта і наступныя фактычныя памылкі ці недакладнасьці ў тэксце, на жаль, не адзіныя. Зноў-такі, ня будзем перабольшваць: ніводнае выданьне ня можа быць ідэальным, і ў гэтым сэнсе «Беларускія праекты» ня выключэньне.

Праект падрыхтаваны ў Цэнтры гісторыі грамадзянскай супольнасьці ЕГУ ў Беларусі пры падтрымцы Фонду Сораса.

краснаго)
Комитета Ивана А. Дагіс» ярыя бяцаю, када руху выбранаю
выкарыстоўвалася М. Бічом пры напісаньні артыкулу
«Беларуская Сацыялістычная Грамада». Арк. 18.
Некалькі спробнікаў гэтае брашуры на хоўваюцца ў НАРБ.
Тамсамы Арк. 16–17.
Увагу ў спамінах «За дваццаць пяць гадоў» А. Луцкевіч піша, што
ў 1906 г. адбылася яшчэ адна партыйная канфэрэнцыя у
канцы лета. Калі чэрвеньская канфэрэнцыя праходзіла на
кватэры Цёткі, дык другая – на кватэры Івана Кастэнкага
(Кудлы). На жаль, мы ня маем справаздачы аб гэтай
канфэрэнцыі. А між тым на ёй, як піша Луцкевіч, разглядалася
пытаньне пра выданьне легальнае газэты. Аднак мы ведаем,
што пытаньне аб выданьні газэты было вырашана на
канфэрэнцыі ў чэрвені. Не дадае яснасьці і артыкул А.
Луцкевіча «1906–14/IX–1926», у якім аўтар паведамляе, што
ўлетку 1906 г., калі «ў Вільні адбывалася канфэрэнцыя
Беларускае Сацыялістычнае Грамады», «Іван Луцкевіч выступіў
з праектам папробаваць выйсьці з падпольля на легальны грунт
і распачаць выдаваньне сваей газэты па-беларуску».

Паводле А. Луцкевіча, на канфэрэнцыі ў канцы лета разглядалася і пытаньне пра экспрапрыяцыю, учыненую менскімі грамадаўцамі «бязь ведама і згоды ЦК». Але з «Успамінаў» Ф. Стацкевіча мы ведаем, што экс адбыўся ў 1907 г. Да таго ж чэрвеньская канфэрэнцыя 1906 г., як мы можам пераканацца, даручала ўсім партыйцам «обратить самое серьезное внимание на усиление партийных финансов», дзеля чаго прапаноўвала і «устройство экспроприаций правительственных денег».

Ведаючы, што Луцкевіч, пакладаючыся на памяць, іншы раз зблытваў даты падзеяў, нельга сказаць, што канфэрэнцыя сапраўды адбылася ў канцы лета 1906 г. і з тым самым парадкам дня, пра які Луцкевіч піша. Але гэта не выключае самога факту канфэрэнцыі. Патрэбныя дадатковыя росшукі.

Дакладна нам вядома пра Докшыцкую канфэрэнцыю 1907 г. Думаю, гісторыкі зь цікавасьцю супаставяць, што пра яе пісалі А. Луцкевіч і Ф. Стацкевіч (фрагмэнты ягоных «Успамінаў»

будуць надрукаваныя ў «ARCHE»).

У гады рэакцыі партыйныя канфэрэнцыі і зьезды фармальна не праводзіліся. Першая ж канфэрэнцыя пасьля зьвяржэньня царызму адбылася, як пісаў А. Бурбіс у працы «Кароткі агляд беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху», «у сакавіку ў Менску». Мы ж можам сказаць, што канфэрэнцыя прайшла 25 сакавіка 1917 г. – у першы дзень Зьезду беларускіх нацыянальных арганізацыяў. У НАРБ захаваўся камунікат «Конференция организаций Белорусской Социалистической Грамады» (Ф. 325. Воп. 1. Адз. захав. 2. Арк. 5–6). Ён быў прызначаны для друку і даволі падрабязна выкладае прынятыя рашэньні. Пры раздрукоўцы тэксту гэтага камунікату на машынцы рабілася некалькі закладак. У НАРБ (Тамсама. Адз. захав. 7. Арк. 14) захоўваецца фрагмэнт яшчэ аднае раздрукоўкі. Паміж ім і адпаведнаю часткаю тэксту, які публікуецца ў «ARCHE», няма ніякіх істотных адрозьненьняў.

Асобнае і больш падрабязнае гаворкі заслугоўвае Петраградзкая канфэрэнцыя БСГ, што адбылася 4–6 чэрвеня 1917 г.

Як вынікае зь ліста Маскоўскага камітэту БСГ «Усім камітэтам, арганізацыям і членам Беларускай Сацыялістычнай Грамады»[6] , канфэрэнцыя зьбіралася як зьезд, які прыняў праграму партыі і абраў ЦК. Пра гэта мы чытаем таксама ў артыкуле Зьм. Жылуновіча «Алесь Бурбіс (рэвалюцыйная характарыстыка)» (Полымя. 1927. № 2). Пра тое ж піша ў нэкралёгу «Памяці А. Бурбіса. 20/III–1922 г.» Палута Бадунова. І з артыкулу Зьм. Жылуновіча, і з нэкралёгу П. Бадуновай мы ведаем, што супроць таго, каб канфэрэнцыя ў Петраградзе была кваліфікаваная як зьезд, рашуча выступілі «старыя заснавацелі БСГ», у першую чаргу кіраўнік Маскоўскага камітэту А. Бурбіс, які да таго ж 7 ліпеня 1917 г. выступіў з адмысловым лістом у газэце «Вольная Беларусь». У выніку гэтае інтэрвэнцыі зьезд быў перакваліфікаваны ў канфэрэнцыю, прынятая ім праграма партыі – у праект праграмы, а ЦК – у Часовы ЦК БСГ.

Да зьезду ў Петраградзе на машынцы быў раздрукаваны праект праграмы партыі «Чего хочет Белорусская Социалистическая Грамада» (НАРБ. Ф. 325. Воп. 1. Адз. захав. 7. Арк. 13).

Асаблівасьці стылю паказваюць, што гэты тэкст быў перакладам зь беларускае. На зьезьдзе (канфэрэнцыі) у Петраградзе праект быў дапрацаваны, аднак зь ведамых прычынаў яго зноў назвалі праектам праграмы, беларуская і расейская вэрсіі якога надрукаваныя ў брашуры «Чаго хоча Беларуская Сацыялістычная Грамада» (Менск: Выданьне Менскай арганізацыі Бел. Сац. Грамады, 1917)[7]. І толькі на III зьезьдзе партыі, у дзень бальшавіцкага пераварота (25 кастрычніка) праграма стала афіцыйным дакумэнтам партыі. У лістападзе яе выдалі ў Менскай друкарні інвалідаў па-расейску. Ня выключана, што мелася і беларуская вэрсія праграмы, але яна пакуль што ня выяўленая.

Ува ўкладзенай мною кнізе зьмешчаныя ўсе праекты і канчатковы тэкст праграмы партыі.

На жаль, дагэтуль не ўдалося адшукаць тэксту статуту БСГ – ні прынятага на II зьезьдзе партыі, ні папраўленага III зьездам.

Для паўнаты карціны партыйнага жыцьця ў 1917 г. у заплянаванай кнізе будуць надрукаваныя і ліст Маскоўскага камітэту «Усім камітэтам, арганізацыям і членам Беларускай Сацыялістычнай Грамады», і «Ліст Маскоўскага камітэту БСГ да партыйных арганізацыяў»[8].

Праект праграмы партыі пісалі ў Менску. Але вядомы таксама праект, пісаны нібыта А. Бурбісам. Машынапіс захоўваецца ў БДАМЛМ (Ф. 3. Воп. 1. Адз. захав. 139. Арк. 11–14). На ім рукою А. Луцкевіча пазначана: «Праект пісаны ў 1917 годзе А. Бурбісам пры ўчасьці Маскоўскае арганізацыі БСГ (Дыла?). Папраўкі на гэтым экзэмпляры зроблены, здаецца, рукой Цішкі Гартнага». Аднак на зьезьдзе ў кастрычніку перамог менскі праект. Зноў-такі, для адлюстраваньня паўнаты ідэйных пошукаў, ува ўкладзенай кнізе прадугледжана публікацыя таксама і нібыта Бурбісавага праекту праграмы. Публікуецца і пратакол III зьезду БСГ (дасюль яго пераказы друкаваў у сваіх працах «Дваццацілецьце Беларускае Сацыялістычнае Грамады» і «За дваццаць пяць гадоў» Антон Луцкевіч).

III зьезд БСГ скончыў працу ў дзень бальшавіцкага дзяржаўнага пераваротy. 27 кастрычніка 1917 г. БСГ разам з Часоваю

Цэнтральнаю Беларускаю Вайсковаю Радаю, Беларускім Выканаўчым Камітэтам Заходняга Фронту і Беларускай Народнай Партыяй Сацыялістаў прыняла «Грамату да Беларускага Народу», у якой заклікала «сабраць усе жывыя сілы нашае Бацькаўшчыны дзеля абароны і ўтрыманьня нашых вольнасьцяў», «не дапусьціць, каб віхор разладу згубіў нашу сьвятую нацыянальную справу абарону вольнасьцяў і правоў Беларускага Народу». Гэты дакумэнт, публікаваны ў «Белорусском движении» Ф. Турука, будзе зьмешчаны і ўва ўкладзеным зборніку дакумэнтаў і матэрыялаў. Тут ён апускаецца.

З пратаколу III зьезду БСГ мы ведаем, што з партыі быў выключаны кіраўнік Бабруйскага камітэту Фабіян Шантыр. Тут друкуецца «Адозва Цэнтральнага арганізацыйнага камітэту Беларускай Сацыялістычнай Грамады ў Бабруйску і Выканаўчага камітэту Бабруйскай Рады Салдацкіх Дэпутатаў»[9]. Ужо сама назва – Цэнтральны арганізацыйны камітэт Беларускай Сацыялістычнай Грамады ў Бабруйску – падказвае, што бабруйскія грамадаўцы меліся стварыць альтэрнатыўную БСГ. Апрача таго, яны заклікалі да «сазыва на Беларусі зьезду прадстаўнікоў салдацкіх, сялянскіх і рабочых дэпутатаў». Шкада, дакумэнт не датаваны, але думаецца, што ён быў рэакцыяй на падпісаную Выканаўчым Камітэтам Вялікай Беларускай Рады, Выканаўчым Камітэтам Цэнтральнай Вайсковай Беларускай Рады і Беларускім Выканаўчым Камітэтам Заходняга Фронту адозву «Ко всему Народу Белорусскому»[10], у якой утрымлівалася ідэя Краёвае Рады, а для яе абраньня прапаноўвалася склікаць 5 сьнежня 1917 г. зьезд прадстаўнікоў усяго беларускага народу.

Так у БСГ вызначаўся рэзкі падзел на два крылы. Зрэшты, ён пачаўся трохі раней у Петраградзе, дзе пачалося рэальнае стварэньне Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі на чале з дэлегатам III зьезду Аляксандрам Чарвяковым. Пройдзе яшчэ колькі месяцаў – і ў Петраградзе будзе заснаваная першая Беларуская сэкцыя Расейскай камуністычнай партыі (бальшавікоў)... А на Ўсебеларускім зьезьдзе вызначыцца «група Шантыра», якая, што праўда, істотнага ўплыву на яго працу не зрабіла. Шантыр і Чарвякоў, а

таксама абраны на III зьезьдзе старшыня ЦК БСГ Язэп Дыла стануць народнымі камісарамі ўва ўрадзе першай БССР (студзень–люты 1919 г.).

***

Ажыўленьне працы БСГ на тэрыторыі, акупаванай у 1915 г. нямецкімі войскамі, пачалося ў канцы таго ж году. Аднавіў працу Віленскі камітэт партыі. Ёсьць падставы меркаваць, што ўжо 6 студзеня 1916 г. на аснове прафсаюзных арганізацыяў паўстала Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Работніцкая Група як аўтаномная адзінка ў Віленскім камітэце. Лідэры партыі А. Луцкевіч і І. Луцкевіч узначальвалі – адпаведна – таемны Беларускі Народны Камітэт і легальны Беларускі клюб. Шырмаю для БНК быў Беларускі Камітэт Дапамогі Ахвярам Вайны на чале з А. Луцкевічам.

У Вільні ўжо ў канцы 1915 г. пачалі распрацоўваць мадэлі будучай незалежнай дзяржавы. Меркавалася, што гэта будзе беларуска-літоўская канфэдэрацыя або фэдэрацыя; распрацоўвалася ідэя Злучаных Штатаў ад Балтыйскага да Чорнага мора[11].

Этапнаю падзеяй была канфэрэнцыя Беларускага Народнага Камітэту, Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Работніцкай Групы і Віленскага камітэту Беларускай Сацыялістычнай Грамады на пачатку верасьня 1917 г. Унівэрсал гэтае канфэрэнцыі быў у свой час апублікаваны[12]. Будзе ён зьмешчаны і ўва ўкладзенай мною кнізе.

Ня выключана, што менавіта на гэтай канфэрэнцыі прынятыя «Асновы праграмы Беларускай Сацыялістычнай Грамады», машынапіс якіх ляжыць у БДАМЛМ (Ф. 3. Воп. 1. Адз. захав. 139. Арк. 15). Аўтарам гэтага дакумэнту (або яго праекту) без сумневаў зьяўляецца А. Луцкевіч, аднак яго рукапіс або праўлены рукою Луцкевіча машынапіс пакуль што ня знойдзеныя. Гісторыку беларускае сацыялістычнае думкі будзе цікава параўнаць гэты тэкст з праграмаю БСГ, прынятаю на III зьезьдзе партыі і з праектам А. Бурбіса.

Як вядома, літоўцы вялі сэпаратную палітыку, і ў сярэдзіне верасьня 1917 г. стала вядома, што немцы далі дазвол на скліканьне Літоўскае нацыянальнае канфэрэнцыі і на фармаваньне Краёвае Рады (Тарыбы), у якой беларусам прадугледжвалася адно-адзінае месца. З ініцыятывы беларускіх сацыялістаў 16 верасьня ў Вільні адбыўся мітынг сацыялістычных і дэмакратычных арганізацыяў. Накіды рэзалюцыі гэтага мітынгу і яе тэкст, пісаныя А. Луцкевічам, таксама захоўваюцца ў БДАМЛМ (Ф. 3. Воп. 1. Адз. захав. 140. Арк. 84, 91, 88). Хоць тэкст рэзалюцыі і не падпісаны партыяй, усё ж мэтазгодна было ўлучыць яго ўва ўкладзеную кнігу.

Яшчэ адзін дакумэнт зь дзейнасьці Віленскага камітэту БСГ – гэта «Прывітаньне з нагоды 20-х угодкаў арганізаванага жыдоўскага работніцкага руху». 2 кастрычніка 1917 г. у Работніцкім клюбе на Вароняй, 5 ладзілася сьвяткаваньне 20-х угодкаў Бунду. На гэтую ўрачыстасьць былі запрошаныя і беларускія сацыялісты (БДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. Адз. захав. 139. Арк. 18). Вось Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Работніцкая Група і Віленская Група (чамусьці не камітэт. – **А. С.**) БСГ і склалі прынагоднае віншаваньне, чарнавік якога, пісаны рукою А. Луцкевіча, захоўваецца ў БДАМЛМ (Ф. 3. Воп. 1. Адз. захав. 139. Арк. 17).

Думаецца, адзінаццаць апублікаваных ніжэй дакумэнтаў увойдуць у шырокі навуковы ўжытак.

ДАДАТКІ

№ 1

<ОТЧЕТ О КОНФЕРЕНЦИИ БСГ 3–4 ИЮНЯ 1906 г.>

Конференция БСГ, созванная по инициативе II Кр<аевого> Комитета 3 и 4 июня 1906 года и состоявшая из 15 лиц (представительства ЦК, I К<раевого> Ком<итета>, Минского Рабочего Ком<итета>, II Кр<аевого>

К<омитета>, Виленск<ой> группы раб<очих>, Вил<енской> орг<анизации> учащ<ейся> молодежи, С.-Петерб<ургской> гр<уппы>, местных организ<аций>: Лидского у<езда>, Дисненского у<езда> и Бельского у<езда>), приняв следующий порядок дня: I Тактика, II Отношение к ППС в Литве, III Работа на местах и IV Организация – и рассмотрев все указанные вопросы, приняла следующие резолюции:

I. По тактике:

1) Конф<еренция> БСГ, не переставая самым энергичным образом бойкотировать Госу<дарственную> Думу как неудовлетворяющую политическим воззрениям конференции форму народного представительства, все-таки будет поддерживать в населении те революционные требования, которые могут предлагаться некоторыми революционными элементами в Го Думе и не будут идти вразрез с программою БСГ.

Рассмотрев вопрос о высылке в Думу наказов и ходоков от крестьян, Конфер<енция> пришла к заключению, что эта мера имеет большое революционное значение в смысле развития самосознания крестьян и что она совершенно не идет вразрез с тактикой БСГ по отношению к Г<осударственной> Думе. Поэтому Конф<еренция> постановила:

a) поручить Комитетам и агитаторам партии и впредь содействовать высылке крестьянских наказов и ходоков в Г<осударственную> Думу;

b) поручить областным комитетам выработать общую форму наказов.

2) Не признавая принципиально никакой работы каких бы то ни было организаций самодержавно-бюрократического правительства, конф<еренция> считает необходимым бойкотировать как пассивно, так и активно те землеустроительные комиссии, которые предполагаются по проекту Стишинского.

II. Отношение к ППС в Литве.

Рассмотрев директивы Конфер<енции> ППС в Л<итве>[13], данные комиссии для выработки аграрной политики в нашем крае, Конфер<енция> БСГ признала, что руководящие принципы ППС в Литве по этому вопросу настолько расходятся с принципами БСГ, что слияние па почве общей аграрной политики невозможно. Однако, признавая, что политические принципы у ППС в Л<итве> и у БСГ общи, Конф<еренция> БСГ признает вполне возможным сообща бороться за осуществление таковых.

III. Работа на местах.

Были выслушаны доклады представителей местных комитетов о работе на местах и решено принять самые энергичные меры к тому, чтобы использовать существующее революционное настроение крестьянства в целях слияния крестьянского движения за землю с общим политическим движением.

IV. Организация.

a. Конф<еренция> поручает областным комитетам твердо стоять на почве организационного устава, принятого II съездом БСГ, причем поставить дело на следующих основаниях. Во главе всех работ партии в данной области стоит законспирированный *областной комитет*. В местах, имеющих большие рабочие организации, для руководства ими учреждаются *Рабочие Комитеты*, строго законспирированные, при которых находятся рабочие *советы*, состоящие из представителей районных рабочих организ<аций>. Делами каждой местности заведуют *местные комит<еты>*, находящиеся в зависимости от областных комит<етов> и составляемые обл<астными> ком<итетами> из лиц, принадлежащих к партии. *Областные ком<итеты>* для содействия себе учреждают из партийных людей комиссии для дел техники, финансов и т. д.

b. Конф<еренция> БСГ требует от ЦК отчета в его деятельности перед областн<ыми> ком<итетами> в самом коротком времени[14].

с. Конф<еренция> поручает всем обратить самое серьезное внимание на усиление партийных финансов, для чего предлагает: 1) устройство экспропр<иаций> правит<ельственных> денег; 2) обложение симпатиков; 3) сбор денег с организованных людей; 4) издание подписных листков; 5) коммерч<еские> предприятия; 6) издание каждым комит<етом> кассовых отчетов.

d. Конф<еренция> высказывает пожелание скорейшего созыва новой конфер<енции>, так как настоящая конф<еренция> была созвана в очень короткое время, а потому не все местные организации могли быть представлены на ней. При том Конф<еренция> считает, что более частые конференции могут принести большую пользу ввиду настоящего политического момента.

е[15]. Конф<еренция> высказывает свое весьма сильное пожелание, чтобы ЦК поскорее приступил к изданию партийного органа.

№ 2

КОНФЕРЕНЦИЯ ОРГАНИЗАЦИЙ БЕЛОРУССКОЙ СОЦИАЛИСТИЧЕСКОЙ ГРАМАДЫ

25 марта сего года в Минске состоялась конференция организаций Белорусской Социалистической Грамады, на которой были приняты решения:

1) Так как борьба со старым режимом еще не закончена вполне, то конференция считает необходимым поддержать борьбу Временного Правительства со старым порядком за упрочение нового. Трудовой же народ должен оказывать организованное давление на Временное Правительство, обязавшееся осуществить все политические свободы и созвать в самом скором времени Учредительное Собрание.

2) Поддерживая Временное Правительство в борьбе за укрепление нового строя, конференция БСГ считает крайне необходимым энергично готовиться к Учредительному

Собранию, пропагандируя федеративную республику и автономию Белоруссии, обращение всех земель в общенародное пользование и восьмичасовой рабочий день; минимум заработной платы; уравнение в правах всех народностей и т. п.

3) Пролетариат и трудовое крестьянство должны быть готовы дать ответ реакционным попыткам господствующих классов, для чего они должны организоваться на почве классовой борьбы за осуществление программы-минимум БСГ.

4) По вопросу о войне конференция высказалась следующим образом: конференция БСГ считает войну в настоящий момент войною революционной России с германским милитаризмом, имеющею целью защитить добытую Великой Революцией свободу от покушений извне, признавая, что немедленное прекращение войны на основе самоопределения национальностей и без территориальных приобретений возможно только по свержении немецким народом реакционного Вильгельма и воинствующего прусского милитаризма, считает необходимым вести в настоящее время вести войну самым энергичным образом до момента устранения опасности для свободы России и до очищения захваченных у нас и наших союзников территорий. Одновременно конференция БСГ признает необходимым бороться с аннексионистскими стремлениями как в России, так и в других странах, так как только мир без аннексии и контрибуций может быть прочным и длительным миром.

5) По аграрному вопросу высказываясь принципиально за общенародную собственность на землю и за то, что земля должна быть передана тем, кто сам на ней работает без наемной рабочей силы, конференция БСГ стоит за немедленную тщательную разработку аграрного вопроса в партийных организациях и за передачу его на суд трудового крестьянства. Конференция считает, что окончательное решение этого вопроса и способ перехода земли народу принадлежит краевому сейму автономной Беларуси. В настоящий момент конференция БСГ решила принять все меры к предотвращению неорганизованных анархических

выступлений на почве аграрных отношений и самым верным средством считает мощную организацию трудового крестьянства.

6) Высказываясь за автономную Беларусь в федеративной Российской Республике, конференция решила заняться тщательной разработкой этого вопроса, установлением границ автономной Беларуси и войти в связи с разрешением этого вопроса в сношение с соседями (литовцами, украинцами и др.).

7) Приветствуя народившееся среди русских социалистических партий стремление к образованию единой социалистической партии, конференция постановляет подвергнуть этот вопрос детальному и тщательному обсуждению.

8) Конференция БСГ призывает всех своих членов как к внутренней организационной работе, так и к самой энергичной и немедленной организации пролетариата и трудового крестьянства.

№ 3

УСІМ КАМІТЭТАМ, АРГАНІЗАЦЫЯМ І ЧЛЕНАМ БЕЛАРУСКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГРАМАДЫ

Таварышы.

Маскоўскі Камітэт БСГ па сагласу зь Петраградзкім і Мінскім клікаў усе арганізацыі БСГ на III партыйны Зьезд у Маскве 21–23 ліпеня (іюля). Абвесткі аб гэтым былі зроблены: 1) праз прадстаўніка Камітэту ўсім дэлегатам арганізацый БСГ, быўшым на зьезьдзе беларускіх арганізацый і партый у Мінску 8–10 ліпеня (іюля) г. г., 2) асобнымі павесткамі Маскоўскага Камітэту, разасланымі 6 ліпеня па ўсім адрасам, якія меў Маскоўскі Камітэт, і 3) абвесткамі ў сталічных сацыялістычных газэтах і ў «Известиях» Саветаў Дэпутатаў па ўсей Расеі (было паслана ўсім гэтым газэтам і надрукавана ў шмат якіх, як гэта ведама Маскоўскаму Камітэту).

Нягледзячы на ўсё гэта, на III партыйны Зьезд у Маскву *ніхто*

не прыехаў. Як бы ні глядзець на прашкоды, якія ставіць цяперака грамадзянскай справе сучасны мамэнт, утрымываючы людзей на мейсцах, адным гэтым тлумачыць самы факт нельга. Маскоўскі Камітэт лічыць, што найбольшая прычына такога індыфэрэнтызму ляжыць у тым легкадумным поглядзе на паважную партыйную працу, які знайшоў свае найлепшае заяўленьне[16] ў рабоце Петраградзскай Канфэрэнцыі[17], «з налёту» мяняўшай праграму старой партыі, выбраўшай Цэнтральны Камітэт і нават прадстаўніка на міжнародную сацыялістычную канфэрэнцыю ў Стакгольме. Выходзючы з гэтага і дбалы[18] аб добрае імя старой рэвалюцыйнай партыі БСГ, Маскоўскі Камітэт адкладае III партыйны зьезд яшчэ на некатары невялікі час з тым, што са сваей стараны ён прыложыць усе сілы дзеля таго, каб пэрсанальна сабраць на гэты Зьезд усіх, хто разьдзяляе погляд Маскоўскага Камітэту, т. е. што перш-наперш партыйная грамадзянская справа – гэта важная грамадзянская служба Бацькаўшчыне, а не палітычная забава; другое, што толькі партыйны зьезд як паўнамоцны, сувэрэнны партыйны орган (а не выпадковае савяшчаньне і не Канфэрэнцыя нават) мае права мяняць праграму, перапраўляць Статут, рабіць выбар цэнтральных устаноў партыі і таксама выбіраць прадстаўнікоў на сацыялістычныя канфэрэнцыі. Калі і гэтым разам ён дачакаецца такой самай дбаласьці аб партыйнай грамадзянскай справе, *ён парве саўсім з маладымі арганізацыямі БСГ*, і павядзе партыйную сацыялістычную працу тою пуцінаю, якой патрабуе і партыйная мінуўшчына старой рэвалюцыйнай партыі, і сталы партыйны розум, і сьвядомасьць аграмаднай важнасьці для рэвалюцыі і дэмакраціі агулам, у тым ліку і для беларускай.

З таварышоўскім вітаньнем

Маскоўскі Камітэт БСГ.

P. S. Па сагласу з другімі Камітэтамі тэрмін зьезду атрымаеце тэлеграфна.

[16] Мусіла б быць *выяўленьне*.

[17] Гаворка пра Петраградзкую партыйную канфэрэнцыю БСГ 4–6.06. 1917 г.

[18] Мусіла б быць *дбаючы*.

[19] II зьезд БСГ адбыўся ў канцы 1905 г. у Менску.

[20] Гаворка аб праекце праграмы БСГ, зацьверджаным

№ 4

ЛІСТ МАСКОЎСКАГА КАМІТЭТУ БСГ ДА ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯЎ

Таварышы.

Маскоўскі камітэт БСГ ад імя Арганізацыйнага камітэта, што склікаў звезду паведаміць таварышоў, што III партыйны зьезд БСГ (II быў у 1906 годзе ў Вільні[19]), назначаны на 21 ліпеня і неадкладна пачаўся, перанесены на 17 жніўня (аўгуста) і адбудзецца ў Маскве.

ПРАГРАМА ЗЬЕЗДУ

1. *Перагляд партыйнай праграмы, прынятай на II парт. зьезьдзе*. – есьцека даклады Арг. Камітэту па зямельнаму і нацыянальнаму пытаньням і два рэдакцыйных праекты направак у старую праграму – адзін прапанованы на Петраградзкай нарадзе і другі Арг. Камітэту[20].

2. *Арганізацыя партыі БСГ (яе формы, узаемныя адносіны і жыцьцё)*. – есьць праект даправак у старыя партыйныя статуты, апрацаваны Арг. Камітэтам.

2. *Выбары ў Цэнтральныя Ўстановы БСГ*.

3. *Тактыка БСГ*.

а) стасунак да вайны, да Часовага ўраду, да агульнарасейскіх установаў рэвалюцыйнай дэмакратыі (радаў дэпутатаў), да агульнарасейскіх сацыялістычных і нацыянальна-сацыялістычных партый;

б) стасунак да партый суседніх зь Беларусьсю народаў (латышоў, літоўцаў, палякаў, украінцаў, жыдоў);

в) стасунак да рожных «беларускіх» партый і арганізацый.

---

1 Гэтае слова ўпісанае.

2 Гэтае слова ўпісанае.

3 Гэтае слова ўпісанае.

4 Гэтае слова ўпісанае.

5 Гэтае слова ўпісанае.

6 Гэтае слова ўпісанае.

7 Гэтае слова ўпісанае.

8 Гэтае слова ўпісанае.

9 Гэтае слова ўпісанае.

10 Гэтае слова ўпісанае.

11 Гэтае слова ўпісанае.

12 Гэтае слова ўпісанае.

13 Гэтае слова ўпісанае.

14 Гэтае слова ўпісанае.

15 Гэтае слова ўпісанае.

16 Гэтае слова ўпісанае.

17 Гэтае слова ўпісанае.

18 Гэтае слова ўпісанае.

19 У машынапісе гэты сказ узяты ў квадратныя дужкі. Відавочна, меркавалася, што ён будзе асобным параграфам.

20 Гэты сказ упісаны.

21 Гэтае слова ўпісанае.

22 Гэтае слова ўпісанае замест выкасаванага *поля*.

23 Словы *слабейшых і мацнейшых* упісаныя.

24 Гэтае слова ўпісанае.

25 Словы *і Цэнтр. Устан.* упісаныя замест выкасанага «іх».

26 У супраціўленне машыністкі.

27 У с. 1906 год у Вільні.

28 Гэтае слова ўпісанае.

29 У машынапісе – «сацыялізмы».

30 Далей на машынцы выкасаваны сказ: «Згуртаваў гэту партыю вялікі вучоны».

31 Гэтае слова ўпісанае.

32 Маецца на ўвазе Вялікая французская рэвалюцыя.

33 Словы *а знача і беларускага* у *асобку* упісаныя.

34 Гэты знак, мабыць, замяняе знак параграфа.

35 У машынапісе гэты сказ узяты ў квадратныя дужкі.

36 Гэты сказ упісаны.

37 Гэтае слова ўпісанае замест выкасаванага «ўсе».

38 Гэты сказ упісаны.

39 Коска тут упісаная замест кропкі.

40 Слова «зьезда́ў» тут лішняе; што ж тычыцца канфэрэнцыяў, дык яны праводзіліся ў 1906 і 1907 гг. пяць разоў, як гэта адзначана ў Арг. Камітэце.

41 Гэтае слова ўпісанае.

42 Гэтае слова ўпісанае.

43 Гэтае слова ўпісанае.

44 Гэтае слова ўпісанае.

45 Гэтае слова ўпісанае.

46 Гэтае слова ўпісанае.

47 Гэтае слова ўпісанае.

48 Гэтае слова ўпісанае.

49 Гэтае слова ўпісанае.

50 Гэтае слова ўпісанае.

– Арганіз. камітэт зьезду прыгатуе праекты рэзалюцый па гэтым пытаньням і агульны даклад. Добра было б яшчэ да гэтага ўсяго мець асобныя даклады аб партыях народаў, сумежных з намі, боручыхся зь беларускім рухам.

5. *Прадвыбарная кампанія партыі ў Устаноўчае (Учрэдзіцельнае) Сабраньне.*

а) становішча ў Беларусі на мяйсцох (нашы партыйныя сілы, другія сацыялістычныя партыі і арганізацыі на Беларусі, іншыя палітычныя сілы ў Беларусі, арганізацыя і становішча мяйсцовых устаноў Ураду);

б) блёкі з аднымі і барацьба з другімі – агульнабеларуская і мяйсцовая;

в) тэхніка выбарнай кампаніі і выбары асобнага партыйнага Камітэту па выбарам дзеля агульнага кіраваньня прадвыбарнай кампаніяй;

г) апрацаваньне сьпіску партыйных кандыдатаў у Устан. Сабраньне.

– Арганізац. Камітэт бярэ на сябе толькі агульны даклад па тэхніцы і прынцыпах прадвыбарнай кампаніі: зь мейсц трэба атрымаць увесь матэр'ял па пункту а) і сьпісак мяйсцовых партыйных кандыдатаў у У. С.

6. *Кампанія па выбарам у установы мяйсцовага самаўпраўленьня (гарадзкога, местачковага, земскага)*.

а) як прайшла частка гэтых выбараў на Беларусі і што зрабілі ў гэтым нашы сілы;

б) якія выбары яшчэ адбудуцца, становішча партыйных сіл на мейсцах;

в) тэхніка кампаніі і прынцыпы яе; Арганіз. Камітэт просіць прывязьці з сабою матэрыял зь мейсц.

7. *Расейскі Інтэрнацыянал* (Рада нацыянальна-сацыялістычных партый у Петраградзе і канфэрэнцыя гэтых партый 5 жніўня

гэтага року).

– Арганіз. камітэт чакае дакладу па гэтаму пытаньню ад дэлегатаў БСГ, што будуць на канфэрэнцыі нац.-сац. партый.

8. *Міжнародная сацыялістычная канфэрэнцыя ў Стакгольме* і выбары на яе нашага прадстаўніка.

9. *Партыйная прэса і выдавецтвы БСГ*.

– Арг. Камітэт дасьць даклад аб газэце і даложыць праект партыйнага выдавецтва. Ля партыйнага архіву добра было б атрымаць па 2 экз. усіх мяйсцовых партыйных выданьняў. Дзеля гэтага просім прывязьці рожныя афішы, лятучкі, адозвы, усё, што выйшла за час рэвалюцыі.

10. *Грашовыя справы БСГ*.

11. *Усе іншыя пытаньні*, якія захоча паставіць і апрацаваць зьезд.

Трэці партыйны зьезд будзе першым зьездам БСГ, скліканым свабодна, безь перашкод, якія калісьці ставіла жыцьцё ў часе панаваньня самадзяржаўнага парадку. З 1906 року прайшло шмат часу, многае зьмянілася ў Расеі і ў нас на Беларусі, у БСГ выйшлі[21] новыя маладыя элемэнты. Практыка партыйнага жыцьця з 1 сакавіка месяца паказала, што робяцца абмылкі, нямашка сталага погляду на шмат якія справы, што партыйная моладзь часам забывае традыцыі старой рэвалюцыйнай партыі, есьцека рожнадум'я і сярод кіруючых партыйнаю працаю арганізацый.

Мы стаімо прад выбарамі ў Устаноўчае Сабраньне.

Дзеля ўсяго гэтага, каб стаць моцнаю сілаю, каб заняць на Беларусі тое мейсца, якое належыць БСГ як старой рэвалюцыйнай партыі працоўнага люду Беларусі і лічачай сябе адной з армій вялікага сусьветнага Сацыялістычнага Інтэрнацыяналу, і каб заняць гэтае мейсца па праву, нам трэба зрабіць працу III зьезду прадукцыйнай, *трэба даць на зьезд свае лепшыя сілы*, даць прадстаўнікоў ад кожнай партыйнай

арганізацыі, *зьехацца ўсім нашым тэарэтыкам і практыкам* як мінуўшчыны, так і цяперашнім.

Памятайце, таварышы, што ў вашых руках будучына БСГ, а зь ею і будучына працоўнай беднаты бацькаўшчыны нашай Беларусі, а значыць і самой Беларусі.

Дэлегатаў просім прысылаць з мандатамі, бо ня маючыя мандатаў ня будуць мець пастанаўляючага голасу. Вельмі просімо дэлегатаў прыехаць яшчэ 16 жніўня (аўгуста) і зьяўляцца па адрасу Маскоўскага Камітэту БСГ: Масква, Зубаўская пл., д. № 1 (Новікава), кв. 26. Пытацца Александра Лаврентьевича Бурбиса. Парадны ход з вуліцы, побач з крамай «Каапэрацыя», над парадным ходам вывеска «Сберегательная касса», тэл. Камітэту 3-14-85 чы № 3-23-49, пытацца А. Л. Бурбіса.

Арганізацыйны камітэт

ІІІ зьезду БСГ.

№ 5

Аляксандар БУРБІС

ПРАЕКТ ПРАГРАМЫ БЕЛАРУСКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГРАМАДЫ

Кожнаму з нас вядома, што жывецца на сьвеце горай ад усіх – гэта працавітай бядноце, а ляпей, як усім, жывецца паном-памешчыкам ды капіталістам (грашавікам). Тым часам кожны таксама ведае, што людзі на сьвеце ўсе роўныя і аднакія між сабою і душою, і целам, і ўсім устройствам сваім.

Чаму ж, калі гэтак, жыцьцё іх устроена не аднакава? Чаму ёсьць паміж людзьмі дужа дрэнны падзел, падзел на багатых і бедных? І ці справядліў такі падзел, ды адкуль ён узяўся?

Усе мы згодны ў тым, што падзел людзей на бедных і багатых

ня толькі рэч несправядлівая, а навэт і праступная. А ўзялася яна вось адкуль: калісь, спакон вякоў, людзі былі цёмныя ды жылі, як зьвяр'ё: ня мелі ні гарадоў, ні сёлаў, ні хатаў; елі ўсё, што пападалася пад руку, усякае зельле ды зьвяр'ё. Жылі яны паасобку ды ня мелі гуртоўнае сілы.

Такое жыцьцё мела шмат нявыгад для барацьбы зь дзікімі сіламі прыроды, як агонь, паводкі, засуха і інш., так і з варагамі ад другіх суседзяў. Сазнаўшы гэта, патрошку людзі прыйшлі да думкі, што трэба лучыцца ў гурты ды грамады, каб вясьці спорую барацьбу з усіма сваімі варагамі.

Гэта лучэньне скора прынясло ім вялікую карысьць: барацьба з прыродаю давала ім пабеду над ею. Жыцьцё паступавала ўперад і ўперад. Але, на бяду ўсяго чалавецтва, у сьвеце зьявіўся такі закон, які павёў людзкое жыцьцё па дужа дрэннаму шляху. Вядома – больш усяго памагалі гэнаму закону самі людзі, і вось як: калі толькі людзі злучыліся для агульнага грамадзкага жыцьця, дык хітрэйшыя ад іх, кемкія і дападкія, пачалі захопліваць сабе і землю, і другое дабро ды разам з гэстым вылічваць сябе з радоў другіх. Далей-болей, гэты хітрэйшыя ды зваротлівейшыя людзі забралі ў свае рукі ня толькі больш зямлі[22], на якой набудавалі дамоў, а і памаленьку ды патрошку і ўласьць над сваімі братамі. Гэту сваю ўласьць з кожным часам яны пашыралі, а потым давялі да таго, што тыя ж самыя людзі разьдзяліліся на два станы: багачоў-прыгнятацеляў і бедных-працоўнікаў, слабейшых і мацнейшых[23]. І на зямлі пачалося дрэннае права – гэта права моцнага над слабшым. І гэта права моцных над слабшымі, бач багатых над беднымі – чаго ўсяго дзіўней – падтрымоўвалася самімі беднымі. Вядома, такі парадак людзкога жыцьця на сьвеце быў выгадзен толькі тым, хто скарыстаў сваею хітрасьцю да праназаватасьцю выбіцца між сваімі суседзямі ды захапіць больш зямлі і валадарства – і зусім нявыгадным ён мусіў быць ля беднага працавітага люду. Хоць гэта і азнавалася працавітай беднатою, але, пад умовы ды ўгаворы папоў у цэрквах і касьцёлах, перавернутых у дамы зацьменьня розуму людзкога – даводзіла да таго, што яна, беднаta[24] , маўчала і мірылася з пануючым парадкам. Праўда, ня ўсім удавалася зацьміць вочы, бачучыя праўду. І многа, перш патрошку, потым болей і болей,

стала зьяўляцца людзей, якія спадціху, а далей і чутна казалі адзін другому і ўсім працавітым бедняком, што такі парадак дужа благі, што ён зусім не ад бога дадзен, што яго трэба пераіначыць так, каб на сьвеце стала справядлівасьць, каб усе людзі зажылі роўна багата, роўна шчасьліва. Гэты думкі сустракалі у многіх спагаду і часта-густа забіралі людзей за жывое: пачыналіся паўстаньні на багачоў і ўласьнікаў. Вядома, гэтыя паўстаньні канчаліся ўсьмірэньнем нездавольных; на старане маленькае кучкі багачоў ды начальнікаў меліся папы, туманіўшыя голаву цёмным, і войска. Валадыроў паўстаньня, бач тых людзей, якія хацелі шчаснага жыцьця і справядлівасьці ля работнікаў ды сялян і ля ўсіх бедных працоўнікаў, салдаты – сыны працавітага народу – вешалі і расстрэльвалі па прыказаньню начальства. Аднак і гэта не памагала: з кожным часам недавольных рабілася болей і болей, з кожным часам паўстаньні рабіліся часьцей ды крапчэйшымі бывалі. Нельга было гаварыць адкрыта – гаварылі ціха, падгаворвалі другім. Пачалі вырабляць пляны і стройныя формы, у якія складалі свае дамаганьні, а потым[25] намецілі сьветлую мэту – сацыялізму: такі парадак жыцьця на сьвеце, пры яком мусяць быць усе людзі роўнымі, усе дабро супольным. Ніхто ня можа сказаць ні на чога, што яно мае[26], уласнае. Усе[27] – мусі быць у[28] ўсіх. А намеціўшы сабе мэту – сацыялізм[29] і вырабіўшы пляновую пуціну барацьбы за гэту мэту – людзі пачалі лучыцца ў стройныя, крэпкія грамады, у круг іх. І гэты злучаныя грамады, як пашыраліся, прымалі назову партый. Многа было ўсякіх партыяў, якія ставілі сабе мэтаю барацьбу за агульналюдзкое шчасьце на зямлі. Але ніводная ад такіх партыяў ясна і зразумела, навукова даказана не аформіла будучыны чалавецтва, як зрабіла гэта партыя сацыялістаў[30]. Яна гуртавалася здавён, бесьперасьціханьня вяла сваю пропаведзь і шырыла свае[31] ідэі. У скоры час прыхільнікаў яе знайшлося па ўсім сьвеце, сярод усіх народаў. Сацыялістычныя партыі заўсюды бралі валадарства паўстаньнем працавітага люду супроць багацеяў ды правіцельства, напраўлялі гэта паўстаньне па роўнаму джаралу і многага дабіваліся ім. Такія паўстаньні пачалі званць – рэвалюцыямі. Кожны чуў, што такія рэвалюцыі былі ў усіх народаў, і асобна вядомая ды прымячацельная ад іх – гэта была рэвалюцыя французская[32].

Цяпер, як бачым, і мы, грамадзяне Вялікае Расейскае Рэспублікі, дайшлі да цяперашніх свабод праз рэвалюцыю нечуваную ў усім сьвеце – Вялізарную Расейскую Рэвалюцыю. Самую большую вагу і самую вялікшую працу над стварэньнем яе пранясьлі на сабе сацыялістычныя партыі. Як я ўжэ казаў, такія партыі маюцца ў усіх краёх і сярод усіх народаў. Ёсьць яна і ў нас, беларусаў. Завецца яна: БЕЛАРУСКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ГРАМАДА. Як і яе сёстры – партыі іншых народаў, – Беларуская Сацыялістычная ГРАМАДА маець сваей мэтай сацыялізм, але розьніцца ад другіх тым, што яна лучыць у сабе такіх беларусаў-сацыялістаў, якія маюць праканаьне, што дарога да сацыялізму бліжэй і вярней, калі яе пралажыць праз нацыянальнае самаапрадзяленьне ўсіх народаў, а знача і беларускага ў асобку[33]. Ідэі сацыялізму, калі іх зьясьняць на родным языку кожнага народу – бліжэй да яго лучацца, ясьней паказваюцца; грамата і прасьвячэньне народу на родным языку скарэй і паўней прывіваецца. Бо кожны народ маець асобную душу, асобае ўразуменьне згодна свае душы, акружваючага яго. Мы, беларусы, у ліку 9 м<ільёнаў> ёсьць таксама народ асобны, маючы свой язык, свой уклад жыцьця. Вось мы, беларускія сацыялісты, і мусім ісьці да ўсялюдзкога братэрства праз свой народ.

Наагул жа мы стаімо і борамся за правы людзкія разам з усіма, баронім і замацовываем самую шырэйшую свабоду ўва ўсім жыцьці і маем мэтай – сацыялізм.

Праграма наша гэтакая:

№[34]1. Канфіскацыя зямель казённых, удзельных, манастырскіх, царкоўных і памешчычых і аддача іх працавітаму народу на фундамэнце сацыялізацыі. Перадача зямлі народу ідзець праз Краёвую Беларускую РАДУ, выбраную на фундамэнце простага, роўнага, тайнага, агульнага і прапарцыянальнага ізьбірацельнага права[35].

№ 2. Зямлі даецца кожнаму столькі, колькі ён можа абрабіць яе сваімі рукамі. Ля павелічэньня ўраджаю, ля паляпшэньня гаспадаркі даецца гасударствам помач грашыма і сьвядомымі ў гаспадарсьцьве людзьмі; таксама адкрываецца шырокая пазычка грошы народнымі банкамі.

№ 3. Забясьпечаньне хворых, калек і ўсіх немагушчых працаваць на гасударсцьвенны кошт.

№ 4. Дарэмная доктарская помач усім.

№ 5. Самае шырокае падтрыманьне і патураньне свабодным супалкам: пазычковым, перакупным, гандлярным, хаўрусным банкам; поўнае права ля сялянскіх і гарадзкіх супалак абкладаць налогам уласнасьць багачоў, каб яна ля іх рабілася некарыснай і пераходзіла ў рукі працавітых.

№ 6. Аддача ў распараджэньне жыхароў вады, сьвету, дарог і інш.

№ 7. Васьмігадзінны рабочы дзень на хвабрыках і ў меньнях.

№ 8. Найменшы заработак, прызнаны законам (мінімальная заработная плата).

№ 9. Здаровыя варункі працы: чыстыя сухія хаты і ўсе будыніны; забарона працы дзяцям да ўстаноўленага ўзросту; а жанкам у некаторых хвабрыках, дзе варункі шкодзяць здароўю, недазвол працаваць зусім, у другіх жа даваць пабыўку бяз працы некулькі часу да радзін і посьля радзін. Кожнатыднёвы спачынак. Нагляд за работаю фабрычнай інспэкцыі, выбранай самімі работнікамі.

№ 10. Свабода і непакаранасьць забастовак, а таксама плата за час забастоўкі.

№ 11. Установа гасударсцьвеннага падаходнага налогу на даходы і насьледзтва. Адмена косьвеннага налогу, бач таго, што бярэцца з тавараў; адмена пошлін-налогу на тыя тавары, што ідуць з-за граніцы.

Гэта ў так званых эканамічных пытаньнях. Палітычныя пытаньні Бел. Сац. Грамады вось якія:

№ 12. Свабода слова, друку, сходак, супалак; недатычнасьць лічнасьці і яе дому.

№ 13. Агульнае ізьбірацельнае права на фундамэнце тайнага,

роўнага, простага і агульнага галасаваньня на асновах прапарцыянальнага прадстаўніцтва. Устаноўчае Сабраньне[36].

№ 14. Адлучэньне цэркві ад гасударства.

№ 15. Права выбарнасьці чыноўнікаў і начальства; адказнасьць іх перад ізьбірацелямі і падсуднасьць пры віне ды зьмена.

№ 16. Дарэмнасьць суду для ўсіх.

№ 17. Дарэмнае, агульнае прымусовае абучэньне.

У нацыянальных пытаньнях ГРАМАДА стаіць.

Лічучы за Беларусь вось які абшар: губ. Мінскую, Вітэбскую, і Магілёўскую цаліком, Віленскую і Гродзенскую чуць не цаліком[37]; Чарнігаўскай – Навазыбкаўскі і Старадубскі паветы; Смаленскай – Парэчанскі; Пскоўскай – Вялікалуцкі; Ковенскай – Новааляксандраўскі; Сувалкскай – Аўгустоўскі і Курляндзкай – Ілуцкі (ля поўнага апрадзяленьня граніц павінна быць выбрана асобная камісія з суседзямі), патрабуе:

№ 1. Аўтаноміі Беларусі з Краёвай Абласной Радай, выбары ў якую мусяць быць прапарцыянальныя; агульная з Расеяй манэта і міністэрства ўнешніх спраў; такі ж спосаб арганізацыі абароны ў хаўрусе і еднасьці з усей Расеяй. Перадача законаў, датычных Беларусі, Устаноўчым Сабраньнем – Краёвай Радзе[38].

№ 3. Краёвая Рада павінна ўвясьці: абучэньне на родным языку ў пачаткавых школах; вышэйшыя школы і гімназіі для падгатоўкі ўчыцялёў на родным беларускім языку; родны язык у судох і другіх краёвых устаноўчых мяйсцох і г. д.

Адным словам, Беларуская Сацыялістычная ГРАМАДА лічыць карысным усе тыя спосабы барацьбы, якія вядуць к перадачы працавітай бядноце усіх срэдств, вядучых да цывілізацыі, да прагрэсу (поступу), да ўсялюдзкога шчасьця на зямлі самымі карацейшымі пуцінамі.

Дык вось, таварышы, браты і грамадзяне беларусы, якая плятформа Беларускай Сацыялістычнай Грамады. Пэўна – яна можа быць прынята ўсім працавітым сялянствам і

работнікамі[39], бо яна хоча ля іх усяго болей шчасьця. Дык прылучайцеся ўсе да яе. Чымсь больш вас злучыцца, тым вялікшая будзе наша сіла і тым скарэй мы даб'емся таго, чаго хочам. Дык крычэм усім: ПРАЦАВІТАЯ БЯДНОТА ЎСІХ КРАЁЎ – ЗЛУЧАЙСЯ.

№ 6

ПРАТАКОЛ III ЗЬЕЗДУ БЕЛАРУСКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГРАМАДЫ

Зьезд адкрыўся 14 кастрычніка 1917 года ў Мінску ў «Беларускай хатцы» (Захараўскі зав., 6). На зьезьдзе былі прадстаўнікі ад гэткіх арганізацый Грамады: *Масква* – Яз. Дыла; *Петраград* – Варонка Яз., Зьм. Жылуновіч, Б. Тарашкевіч; *Слуцк* – Р. Астроўскі; *Мінск* – А. Прушынскі (Алесь Гарун), Смоліч, П. Бадунова, Л. Сівіцкая; *Гэльсінгфорс* – Муха; *XII армія* – Мамонька, Дадон; *Барысаў* – Шыцёнак; *N дывізія* – Мікалайчук; *Бабруйск* – Шантыр, Талчынская і Крычко; *Бакшты* – Бычкоўскі і Чэрнік; *Нарвская арганіз.* (Петраград) – Чарвякоў; *X армія* – Рак-Міхайлоўскі; *Мінская дружына* – В. Адамовіч; *N этапн. батальён* – Платон і інш.

Апроч таго, з дарадчым голасам былі сябры: Бандарчык, Шыла, Дварчанін, Ласко, В. Лявіцкая, Данілевіч і Галавач.

Зьезд пачаўся ў 6 гадз. вечара прамоваю прадстаўніка арганізацыйнага камітэту па скліканьню зьезду. Пасьля былі выбары прэзыдыуму. За старшыню выбралі Язэпа Дылу – аднагалосна, яго намесьнікамі – Мамоньку і Жылуновіча, пісарамі – Талчынскую і Смоліча.

Працу сваю зьезд пачаў з разгляду партыйнага статуту. Зроблены былі некаторыя зьмены, глаўным чынам рэдакцыйнага характару ў праекце паправак і дадаткаў да статуту, распрацаваным Маскоўскім Камітэтам. На першым сходзе прынята палавіна статуту, §§ 1–11.

На другі дзень зьезд, часова спыніўшы разгляд статуту, пачаў

разглядаць праект паправак да партыйнае праграмы. Прыняўшы за аснову праект паправак, распрацаваны Петраградзкай канфэрэнцыяй БСГ 4–6 чэрвеня 1917 г., зьезд зрабіў зьмены ў прадмове і ў §§ 1, 2, 3, 4, 6, 7, 8 і 12.

Разгледзіўшы справу сябра Шантыра, абгаворанага адным зь сяброў БСГ, зьезд прызнаў, што ён нічога супольнага з гэтым абгаворам ня мае.

На трэці дзень – 16 кастрычніка разглядалі агульную праграму. Пасьля доўгіх дэбатаў прыняты былі асноўныя прынцыпы рашэньня зямельнай справы:

1) Уся зямля – усяму народу.

2) Зямельнаю справаю загадуе Краёвая Рада.

3) Надзяленьня не вышэй працоўнай і не ніжэй харчоўнай нормы.

Далейшае распрацаваньне даручана рэдакцыйнай камісіі з тт. Варонкі, Смоліча, Тарашкевіча, Шантыра і Дылы.

На сходзе 17 кастрычніка была разгледжана справа с. Шантыра, выключанага 16/X за неўшанаваньне сходу Цэнтральнай Рады Беларускіх Арганізацый з Грамадзкай фракцыі Рады. Разгледзіўшы прысланы с. Шантырам з гэтага поваду ліст на імя зьезду, у якім ён сумысьля абражае III партыйны БСГ, зьезд пастанавіў – выключыць Шантыра з ліку сяброў Беларускай Сацыялістычнай Грамады.

З прычыны вайсковага беларускага зьезду Заходняга фронту праца III партыйнага зьезду спынілася на тыдзень. У гэтым часе працавалі толькі рэдакцыйная камісія і прэзыдыюм зьезду, якія і падгатавалі ўвесь патрэбны матар'ял да пленуму.

Апошні сход III партыйнага зьезду адбыўся 25 кастрычніка і цягнуўся цэльны дзень. Па дакладу рэдакцыйнае камісіі былі прыняты папраўкі ў §§ 12, 13, 20, 22, 23 і 27 агульнай часткі партыйнай праграмы, нанова рэдагаваны §§ 14, 27 гэтай часткі і § 2 з нацыянальнае праграмы; пасьля прынята ўся зьмененая

праграма ў цэласьці – аднагалосна.

Разгледзіўшы справу партыйнага дэвізу, пастаноўлена зьмяніць яго гэтак: «Працоўная бедната ўсіх народаў, злучайся!»

Пасьля таго былі разгледжаны апошнія §§ статуту партыі і ўрэшце ён увесь прыняты аднагалосна.

Дзеля ўсіх гэтых зьменаў мусіла пераіначыцца і нумарацыя §§ праграмы і статуту. Устанавіць новую нумарацыю §§, а таксама зрэдагаваць і выдаць праграму і статут пастаноўлена даручыць Цэнтр. Камітэту партыі.

Разгледзіўшы справу аднашэньня БСГ да нацыяналізацыі войска, прынялі гэткую пастанову: III партыйны зьезд БСГ вітае ўтварэньне беларускай народнай арміі і жадае, каб яна сталася рэвалюцыйнаю гвардыяй працоўнага народу беларускага і памагла яму дабіцца яго нацыянальных і сацыяльных мэтаў.

Заслухаўшы адчот прадстаўніка часовага Цэнтр. Камітэту Грамады Яз. Варонкі аб чыннасьці ЦК, зьезд пастанавіў: лічыць выбары празь Петраградзкую канфэрэнцыю БСГ 4–6 чэрвеня 1917 году «Часовага Цэнтральнага Камітэту БСГ» зробленымі дзеля вымогаў партыйнай працы і палітычнага мамэнту, а чыннасьць яго ўхваліў.

Усе пытаньні сучаснага мамэнту зьезд пастанавіў перадаць на кампэтэнцыю выбранага зьездам ЦК. Таксама на кампэтэнцыю ЦК здана апошняя рэдакцыя партыйных праграмы і статуту.

У канцы выбраны Цэнтр. К-т Бел. Сац. Гр. у ліку 12 сяброў: Прушынскі Алесь (Ал. Гарун), В. Адамовіч, П. Бадунова, С. Рак-Міхайлоўскі, А. Смоліч, І. Мамонька, Муха, Яз. Дыла, Зьм. Жылуновіч, Яз. Варонка, Б. Тарашкевіч і Мік. Шыла, а кандыдатамі да іх: Яўх. Ласко, Лузгін, Бандарчык, Пятроўскі, Петрашкевіч і Турук.

У 8 гадз. веч. 25 кастрычніка III партыйны зьезд БСГ закрыўся, споўніўшы сваю працу.

Старшыня зьезду *Яз. Дыла.*

Пісар *А. Смоліч.*

№ 7

Працоўная беднота ўсіх народаў, злучайся!

ПРАГРАМА БЕЛАРУСКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГРАМАДЫ

(прынятая партыйным Зьездам 14–25 кастрычніка 1917 году ў Мінску)

Беларуская Сацыялістычная Грамада задаецца справай увядзеньня сацыялістычнага парадку цераз разьвіцьцё клясавай барацьбы і сацыяльную рэвалюцыю.

Тым часам Беларуская Сацыялістычная Грамада дамагаецца вось якіх рэформаў:

(ПРАГРАМА-МІНІМУМ)

У палітычным парадку

§ 1. Вольнасьць слова, друку, сходак, грамадаў і хаўрусаў, незачэпнасьць асобы, дому, перапіскі, вольны выбар прафэсіі; вольнасьць сумленьня.

§ 2. Роўнае права ўсіх грамадзян, як мужчын, так і жанок, не зважаючы на кляс, нацыю і веру.

§ 3. Агульнае, простае, роўнае, патаемнае і прапарцыянальнае выбарчае права для кожнага даросшага 18 гадоў грамадзяніна, мужчын і жанок, пры выбарах у заканадаўчыя ўстановы і ў органы мяйсцовага самаўпраўленьня.

§ 4. Беспасярэдняе ўчасьце самога народу ў выдаваньні законаў: права заканадаўчай ініцыятывы і ўжываньне

рэфэрэндуму для рашэньня найбольш важных справаў.

§ 5. Установа ў Расеі Дэмакратычнай Фэдэратыўнай Рэспублікі.

§ 6. Аўтаномія тэрытарыяльная і пэрсанальная для ўсіх нацый; аўтаномія асобных краёў і грамадаў, вызначаных эканамічнымі і бытавымі варункамі.

§ 7. Установа міжнароднага суду, каб разьбіраў спрэчкі між гасударствамі.

§ 8. Адмена ваеннай службы і ўстанова заместа войска ўсенароднай міліцыі з тэрытарыяльна-нацыянальнаю сыстэмаю ваеннай службы і набору.

§ 9. Агульнае, абавязковае і дармовае навучаньне ўсіх дзяцей ува ўсіх школах; аплата іхняга пражыцьця, пакуль яны знаходзяцца ў школе.

§ 10. Выбарнасьць чыноўнікаў мяйсцовымі жыхарамі; атветнасьць іх перад судом і зьмена, калі таго патрабуе народ.

§ 11. Выбарнасьць судзьдзяў; дармовы суд і адвакацкая абарона; плата тым, каго бязьвінна асудзяць; зьніштажэньне кары сьмерцю ўва ўсіх судох.

§ 12. Аддзяленьне цэрквы ад гасударства; сьвецкая навука ў школах, аб'яўленьне веры прыватнай справай кожнага чалавека.

У эканамічным парадку

§ 13. Неадкладная забарона куплі і прадажы зямлі.

§ 14. Уся зямля пераходзіць бяз выкупу ў уладанне ўсяго народу.

§ 15. Уся зямля надзяляецца ў карыстаньне толькі тым гарадзянам, якія ўласнаручна на ёй працуюць; разьмер надзяленьня – не вышэй за працоўную норму і не ніжэй за

харчовую.

§ 16. Асобны падатак на найбольш прыбытковую (ураджайную, падгароднюю і г. д.) зямлю такога разьмеру, каб падраўнаваць аплату працы на беднай і багатай зямлі (канфіскацыя зямельнай рэнты).

§ 17. Усей зямельнай справы на Беларусі павінна даглядаць Беларуская Краёвая Рада, выбраная ўсім народам праз агульнае, роўнае, простае, патаемнае і прапарцыянальнае галасаваньне. Рада заведуе сама кавалкамі, патрэбнымі для перасяленьня, а рэшту атабранай зямлі перадае ў распараджэньне мяйсцовых органаў самаўпраўленьня.

§ 18. Пераход бяз выкупу ўсіх лясоў, рэк, азёраў і капальняў у ўсенароднае ўладаньне на распараджэньне Краёвай Рады.

§ 19. Дапамога арганізацыі і разьвіцьцю вытворчай (производительной) каапэрацыі; пашырэньне ідэі сацыялізацыі ўсяго вытвору праз школу і зашкольную прасьвету.

§ 20. Шырокае падтрыманьне і пашырэньне хаўрусных (каапэратыўных) арганізацый, хаўрусных крамаў, крэдытовых таварыстваў і г. д.

§ 21. Рабочы дзень – 8-мігадзіновы, і меншы на тых прадпрыемствах, дзе гэта неабходна; штотыднёвы адпачынак ня менш як 42 гадзіны, пэўны мінімум заработнай платы.

§ 22. Поўная забарона звышурочнай працы; забарона начной працы (з 9 гадз. вечара да 6 гадз. раніцы), акрамя тых выпадкаў, калі на такую працу дадуць згоду рабочыя.

§ 23. Забарона дзяцінай працы да 16-гадовага веку. Найбольшы рабочы дзень – 6 гадзінаў для работнікаў ад 16 да 18 гадоў.

§ 24. Забарона жаночай працы ў тых заводах, дзе праца шкодна для жанкі. Асвабаджэньне ад працы ў працягу 4-х месяцаў перад радзінамі і 6 тыдняў пасьля радзінаў з захаваньнем заработку за гэты час і бясплатнай дакторскай дапамогай. Отпускі ў часе працы сколькі будзе патрэбна каб карміць дзіця.

§ 25. Вольнасьць і бяскарнасьць забастовак; захаваньне заработнай платы за ўвесь час забастоўкі; заводзкі альбо прамысловы суд, якога выбіраюць работнікі.

§ 26. Выбарная інспэкцыя дзеля нагляду за фабрыкамі і заводамі. Выбарная дакторская камісія дзеля нагляду за тым, каб работнікі жылі і працавалі ў здаровых хатах і майстэрнях.

§ 27. Залажэньне біржаў працы і перадача іх у рукі работнікаў.

§ 28. Устанаўленьне крымінальнай адказнасьці капіталістаў за парушэньне законаў па ахове працы.

§ 29. Шырокая дапамога таварыствам і хаўрусам, што працуюць на карысьць працоўнага народу.

§ 30. Гасударственнае забесьпячэньне для асобаў, няздольных да працы; гасударственнае страхаваньне ад безрабоцьця, няшчасных здарэньняў і прафэсійных хваробаў.

§ 31. Завядзеньне паступовага падатку на даходы і спадчыну. Адмена няпростых падаткаў на тавары, апроч падатку на рэчы дзеля роскашы.

Па нацыянальнай справе

Дзеля таго, што сацыяльныя і палітычныя рэформы могуць удацца і ўмацавацца толькі пры радыкальным падняцьці культурнага ўраўня народных масаў, Беларуская Сацыялістычная Грамада лічыць патрэбным:

§ 32. Шырокае разьвіцьцё Беларускай народнай культуры як ядынай дарогі да разьвіцьця грамадзкасьці і агульнага падняцьця культуры масаў.

§ 33. Заканадаўчае прызнаньне права беларускай мовы на разьвіцьцё і выкарыстаньне ў школе, судзе, адміністрацыйных і грамадзкіх установах Беларусі.

§ 34. Шырокае самаўпраўленьне (аўтаномія) Беларусі з

заканадаўчым органам Краёвай Радаю, выбранай на аснове агульнага, роўнага, простага, патаемнага і прапарцыянальнага выбарчага права, для мяйсцовага заканадаўства, распрацаваньня і разьвіцьця законаў, выданых Расейскім Парлямэнтам.

§ 35. Каб не было мытных граніцаў паміж Беларусяй і іншымі часткамі Расейскай Фэдэрацыі.

§ 36. Поўныя палітычныя і эканамічныя правы для ўсіх нацый, жывучых на Беларускай зямлі.

№ 8

<АДОЗВА ЦЭНТРАЛЬНАГА АРГАНІЗАЦЫЙНАГА КАМІТЭТУ БЕЛАРУСКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГРАМАДЫ Ў БАБРУЙСКУ І ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БАБРУЙСКАЙ РАДЫ САЛДАЦКІХ ДЭПУТАТАЎ>

Таварышы сяляне, працаўнікі і салдаты беларусы.

Ад самых пачаткаў руху беларускага рэвалюцыйна-нацыянальнага адраджэньня і да нашых дзён нашы паны (буржуазея), апіраючыся на сваіх прыслужнікаў з дэмакратычнага лагеру, стараюцца захапіць гэты рух у свае рукі і, даўлеючы на нацыянальнае чуцьцё дэмакратыі, хочуць спыніць у нашым краі яе клясавую барацьбу.

У палітыцы быўшых Нацыянальнага Камітэту, Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый і цяперашняй Вялікай Беларускай Рады, гдзе ўслужлівая частка дэмакратыі, самазванна прыкрываючыся імянем Беларускай Сацыялістычнай Грамады, ідзе ў згодзе з панамі, – стала вядзецца праца к заглушэньню на Беларусі клясавай барацьбы дэмакратыі як чыста сацыялістычнай, для чаго гэтыя арганізацыі стараліся трымаць прабуджаўшыяся да нацыянальнай сьвядомасьці масы на дарозе шавінізму і крыклівага патрыятызму.

Таварышы, мэты сацыялістычнай дэмакратыі і буржуазеі ня могуць іці адным шляхам.

Для сацыялістычнай дэмакратыі барацьба за ідэал сацыялізму ўсё, а для буржуазеі яна сьмертны вораг.

Спыніць жа клясавую барацьбу дэмакратыі – гэта значыць: ня даць хлебаробам зямлі, працаўнікам – абарону іх эканамічных інтарэсаў, салдатам – абарону іх грамадзкіх і карпарацыйных праў.

Для нас, Беларускай рэвалюцыйнай дэмакратыі, нацыянальнае адраджэньне цесна зьвязана з клясаваю барацьбою. Дух нашай нацыі, Беларуская народнасьць і культура, праз доўгія вякі зьдзеку над гаротным народам, былі захованы толькі ў шэрых працаўнічых масах. Наша буржуазея ў прошлым адраклася ад усяго гэтага і прылучылася часьцю да польскай, а часьцю да расейскай культур.

Беларуская рэвалюцыйная дэмакратыя, стаўшы раз на шлях адраджэньня сваей нацыянальнасьці, беручыся за асвабаджэньне свайго чалавечага імені і сваей народнасьці – душы народу, без каторых яна як народ жыць ня можа, разам павінна бароцца і за сацыяльную праўду.

А ў гэтым усім нам з панамі і іх прыслужнікамі не па дарозе.

Браты, ніякага хаўрусу з буржуазеяю.

Мы толькі самі зможам каваць сваю долю, свае шчасьце.

Не, не вялікія рады маюць кіраваць прабуджаным гаротным беларускім народам, а ён сам сабою, праз свае Рады салдацкіх, сялянскіх і рабочых дэпутатаў.

Стаючы на абароне інтарэсаў беларускіх дэмакратычных мас, Цэнтральны арганізацыйны камітэт БСГ у Бабруйску заве вас, таварышы, да хутчэйшай працы сазыва на Беларусі зьезду прадстаўнікоў салдацкіх, сялянскіх і рабочых дэпутатаў, каторы адзін толькі можа быць правамочным.

Помніце, таварышы, што толькі Рады салдацкіх, сялянскіх і рабочых дэпутатаў змогуць затрымаць за народам зямлю і абараніць заваяваньні рэвалюцыі.

Цэнтральны арганізацыйны камітэт Беларускай Сац. Грамады ў Бабруйску.

Выканаўчы камітэт Бабруйскай Рады Салдацкіх Дэпутатаў.

№ 9

Працавітая бедната ўсіх краёў, злучайся!

АСНОВЫ ПРАГРАМЫ БЕЛАРУСКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГРАМАДЫ

Згодне з партыйнай праграмай, прынятай у 1905 г. другім зьездам БСГ, і пастановамі пазьнейшых зьездаў і канфэрэнцый[40] аснаўныя пункты праграмы Беларускай Сацыялістычнай Грамады ёсьць гэткія:

Беларуская Сацыялістычная Грамада ў барацьбе з капіталам, ідучы поруч з рабочымі масамі ўсяго сьвету, мае на мэце дайсьці такога ладу, пры каторым фабрыкі, заводы, варштаты, усялякая прылада да работы і зямля станавілі б меньне ўсяго працоўнага народу.

Арганізуючы дзеля гэтай мэты работнікаў і сялян, Беларуская Сацыялістычная Грамада стаўляе сабе гэткія задачы:

А[41]. *У работніцкай справе:*

Кіруючыся да сваей аканчацельнай мэты: пераходу ўсіх фабрык, заводаў, варштатаў і прылады да працы з рукамі таго да народу, БСГ дабіваецца ўжо цяпер такіх варункаў пры каторыя далі бы магчымасьць рабочым масам арганізавацца, жыць поўным культурным жыцьцём і бараніцца ад духовнага фізычнага заняпаду. Дзеля гэтага БСГ стаўляе ў сваей праграме гэткія дамаганьня на сягоньняшні дзень:

1) 8-гадзінны рабочы дзень;

2) агранічэньне працы нялетніх і забарона працы дзяцей;

[41] У машыніцтве ў працы, і завадзе, духовна і ейнаго.

АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ

гісторык,

3) устанаўленьне мінімальнай заработнай платы; роўныя ўмовы для мужчын і кабет пры роўнай рабоце;

4) поўная свабода рабочых арганізацый і забастовак; абавязковыя для абедзьвюх старон пасрэдніцкія суды між работнікамі і фабрыкантамі;

5) забясьпечаньне работнікаў на прыпадак утраты здольнасьці да працы, хваробы, старасьці і безрабоцьця;

6) агульная і прафэсіянальная навука работніцкіх дзяцей на кошт гасударства.

В. У зямельнай справе:

Уважаючы, што зямля і ўсялякае захованае ў ей багацьце павінна станавіць меньне ўсяго народу, БСГ жадае:

1) каб ня[illegible] ([illegible]) [illegible] [illegible] [illegible]

С. У справе палітычнага ладу:

Уважаючы,

1) што толькі незалежны гасударствены быт у постаці дэмакратычнай рэспублікі можа найлепей забясьпечыць правядзеньне ў жыцьцё памянёных дамаганьняў і

2) што Беларусь з эканамічна-гаспадарчага і праўна-дзяржаўнага пагляду становіць адзін суцэльны арганізм зь Літвой, і што пры сучасным палажэньні толькі захаваньне гэтай еднасьці Беларуска-Літоўскіх зямель дае магчымасьць найбольш поўнага разьвіцьця творчых сіл насялючых іх народаў, Беларуская Сацыялістычная Грамада жадае незалежнасьці і непадзельнасьці Беларусі і Літвы ў пастаці дэмакратычнай рэспублікі, абнімаючы ўсе Беларускія і ўсе Літоўскія землі – незалежне ад разьдзелу іх ваенным фронтам. Каб правясьці новы лад, павінен быць склікан у Вільні Ўстаноўчы Сэйм Беларусі і Літвы, зложаны з дэпутатаў усіх нацыянальнасьцей, выбраных агульнай, роўнай, тайнай, беспасрэднай і прапарцыянальнай падачай галасоў.

Гасударствены лад у будучай Беларуска-Літоўскай незалежнай дэмакратычнай рэспубліцы павінен быць збудован на гэткіх асновах:

1) аддача ўсей уласьці ў рукі народу;

2) унутранае разгранічэньне аўтаномных Беларускай і Літоўскай зямель паводлуг матчынай мовы жыхароў;

3) роўныя правы для ўсіх нацыянальнасьцей краю; нацыянальная аўтаномія для нацыянальных меншасьцей;

4) прызнаньне ўрадовых правоў за ўсемі мясцовымі мовамі; забясьпечаньне школьнай навукі ў матчынай мове вучняў.

Віленскі Камітэт Беларускай Сацыялістычнай Грамады.

Вільня, у верасьні 1917 г.

№ 10

<РЭЗАЛЮЦЫЯ МІТЫНГУ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ І ДЭМАКРАТЫЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯЎ 16 ВЕРАСЬНЯ 1917 г.>

Сабраўшыеся на мітынгу 16 верасьня ў салі Работніцкага Клюбу прадстаўнікі сацыялістычных і дэмакратычных кругоў літоўскай, беларускай, польскай і жыдоўскай нацыянальнасьцей прынялі гэткую рэзалюцыю аб будучыні Літвы:

Сабраўшыеся кіруюцца глыбокім пераконаньнем, што толькі дайшоўшы палітычнай самабытнасьці Літвы і збудаваўшы яе ўнутранае жыцьцё на асновах праўдзівага дэмакратызму, можна падняць наш Край з упадку і забясьпечыць яму найлепшыя варункі дзеля разьвіцьця яго творчых сіл, падняцьця дабрабыту і поўнага здаволеньня культурна-нацыянальных патрэб усіх пражываючых у Літве нацыянальнасьцей: літоўскай, беларускай, польскай і жыдоўскай.

Сабраўшыеся пераконаны, што сучасная вайна пры сваім канцы забясьпечыць Літве права свабодна пастанавіць самой аб сваей долі згодне агульнага кліча дэмакрацыі Эўропы.

Урэшце, сабраўшыеся станоўча заяўляюць, што разьвязаць пытаньне аб будучыні Літвы, аб яе ўнутраных парадках, яе адносінах да суседніх дзяржаў і асновах супольнага бытаваньня з сумежнымі краямі правамочан толькі ўстаноўчы сэйм Літвы[44], выбраны свабодна ўсім[45] насяленьнем Літоўска-Беларускіх зямель[46] бяз розьніцы нацыі, веры і полу агульнай, роўнай, тайнай, простай і прапарцыянальнай падачай галасоў.

Сабраўшыеся горача пратэстуюць проці кожнай спробы захвату вярхоўных правоў прадстаўніцтва Краю – яго ўстаноўчага сэйму, скуль бы яна ні выходзіла.

№ 11

<ПРЫВІТАНЬНЕ З НАГОДЫ 20-Х УГОДКАЎ АРГАНІЗАВАНАГА ЖЫДОЎСКАГА РАБОТНІЦКАГА РУХУ>

Вільня, 2 кастрычніка 1917 г.

Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Работніцкая Група і Віленская Група Беларускай Сацыялістычнай Грамады шлюць свой шчыры прывет і горача вітаюць Таварышоў-Жыдоў з прычыны дваццацілецьця арганізаванага жыдоўскага работніцкага руху, каторы палажыў нялічаныя ахвяры ў барацьбе з капіталам за спаўненьне работніцкіх ідэалаў.

Работнікі беларусы высказываюць сваю цьвёрдую веру, што ў дружным змаганьні за правы працоўнага народу ў нашым Краю Жыдоўскі і Беларускі пралетарыят будзе заўсёды ісьці разам у імя агульнага пралетарыяцкага кліча «Працавітая беднота ўсіх краёў, злучайся!»

Падрыхтоўка да друку і камэнтары Анатоля Сідарэвіча

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/12
[image]

ВІТАЛЬ ЗАЙКА
дасьледнік беларуска-жыдоўскіх дачыненьняў. Супрацоўнік нью-ёрскага «Цэнтру габрэйскай гісторыі».

Беларуская Мінарыя

Хто беларускі пэсыміст? – Той, хто думае, што горш ужо няма куды.

Хто беларускі аптыміст? – Той, хто думае, што яшчэ ня тое будзе.

Чаму мы дагэтуль ня выйшлі шчыльнымі радамі, не занялі свой пачэсны пасад між народамі, ня сталі людзьмі звацца? Не адну беларускую галаву і ўдзень, і ўначы турбуюць гэтыя пытаньні, якія маюць падставы зрабіцца клясычнымі, кшталту знакамітых расейскіх пра «кто» і «что».

«Чаму ён?» – так і засталося для мяне няясна.

Становішча ў сёньняшняй Рэспубліцы Беларусі ў грамадзка-палітычнай дзялянцы ня можа не выклікаць аналёгіяў з савецкім часам, тым больш што кіраўніцтва раз-пораз нагадвае масам пра сваю пераемнасьць з савецкім ладам. Той, савецкі таталітарызм сёньня, праз 15 гадоў, зьмяніў лёгкі таталітарызм, таталітарызм-light. З апазыцыйнымі партыямі, незалежнымі (хай і прыціснутымі) газэтамі, з альтэрнатыўнымі кандыдатамі на прэзыдэнцтва. Спосаб і мэтады кіраваньня, эканамічная практыка і вонкавапалітычныя прыярытэты рэжыму Лукашэнкі таксама паказваюць на савецкую спадчыну. Гэтая спадчына, якую так удала напоўніцу скарыстаў і

[1] Yurchak, Alexei. Everything was forever, until it was no more: the last Soviet generation. – Princeton, NJ: Princeton University Press, 2006.

[2] Сайт Казуліна.

працягвае скарыстоўваць рэжым, недастаткова вывучаная і прааналізаваная, нягледзячы на блізкае знаёмства зь ёю бальшыні насельніцтва краіны, а можа, і дзякуючы гэтаму знаёмству.

Аналёгія ні ў якім разе ня можа быць тоеснасьцю. Часы і людзі, безумоўна, памяняліся. Але ключ да разуменьня становішча, і праз гэта – да пошуку новых ідэяў і канцэптаў, ляжыць, так бы мовіць, у «савецкім сэйфе».

Прыгадаем, чым была савецкая сыстэма, прынамсі, у найбольш знаёмай інкарнацыі «эпохі застою». Гэта быў кшталт галавы швайцарскага сыру, зробленага з таталітарызму, але ў якім кожны індывід меў сваю дзюрачку зь нейкай ступеньню свабоды, абмежаванай савецкім рэжымам, якую трошкі маглі пашырыць індывідуальныя здольнасьці чалавека. За выняткам крайніх выпадкаў фанатычных камуністаў пераважная большасьць грамадзтва жыла ў культуры, адрознай ад афіцыйнай савецкай. Але гэта была ня контракультура, як у Польшчы часоў надзвычайнага стану, а паралельная культура, што займала нішы ўсярэдзіне вялізнага корпусу савецкай цывілізацыі.

Людзі пад саветамі адчувалі іррэлевантнасьць «пабудовы камуністычнага грамадзтва», «удасканаленьня матэрыяльна-тэхнічнай базы», «эканомнай эканомікі» ды іншых абстрактных формулаў камуністычнай ідэалёгіі ў дачыненьні да свайго штодзённага жыцьця, якое ішло сваім парадкам, адрозна ад дырэктываў ідэалягічных тэарэтыкаў. Падвышэньне ўзроўню жыцьця, пачынаючы з 1960-х гадоў, дало пэўную прастору (свае кватэры, лецішчы) і час (адзін, а потым два гарантаваныя выходныя плюс адпачынак), на якія ўзьдзеяньне афіцыйнай прапаганды й савецкага ідэалягічнага апарату было даволі абмежаваным. Утварылася пэўная «часапрастора» свабоды, якой яшчэ было далёка да свабодаў вольнага сьвету, але якая аддаліла грамадзтва ад наскрозь таталітарных часоў камуналак і даносчыцтва. Людзі маглі весьці цалкам нармальнае жыцьцё, рабіць кар’еру, гадаваць дзяцей, захоўваючы пэўную дыстанцыю ад афіцыйнай ідэалёгіі.

Сёньняшняя беларуская сытуацыя адметная тым, што агульная

тэндэнцыя рэжыму Лукашэнкі да ўзмацненьня кантролю над грамадзтвам, стварэньне грамадзкага настрою абложанай фартэцыі ёсьць працэсам, адваротным працэсу аслабленьня ідэалягічных цугляў у эпоху «позьняга сацыялізму». Дванаццаць гадоў улады Лукашэнкі паказалі, што навядзеньне пажаданага для рэжыму «парадку» ў межах параўнальна невялікай тэрыторыі мажліва нават без эксцэсаў сталінскіх часоў. Дастаткова стварыць паўсюдную кантрактную сыстэму і прыняць пару-тройку ўказаў – і глядзіш, «да Вас пацягнуцца людзі». У апошнія гады існаваньня рэжыму вялікая частка грамадзтва пачала адчуваць, што Лукашэнка – усур'ёз і надоўга, і што трэба неяк будаваць жыцьцё, рабіць выгляд, што ў нас усё нармальна, і нават лепш, чым у суседзяў.

Пра суседзяў, дарэчы. Дзесяцігодзьдзе, і нават болей ледзь не штодзённых паведамленьняў пра катаклізмы, войны й нястачы на ўсход ад Крычава і афіцыйныя прапагандысцкія заявы пра беспрацоўе й галечу на захад і на поўнач ад Сапоцкіна стварылі ілюзію заможнага й бясьпечнага жыцьця ў Беларусі. На гэтую ілюзію сярэднестатыстычны грамадзянін Беларусі гатовы абмяняць і свабоду, і свае чалавечыя правы. Дагэтуль Лукашэнка датрымліваў негалоснае пагадненьне позьняга савецкага часу, што ўлада ня лезе ў справы грамадзяніна, а грамадзянін не прэтэндуе на справаздачнасьць улады перад ім. Але ў шэрагу апошніх ініцыятываў улада, здаецца, перакрочыла рысу пагадненьня. Гэты сярэднестатыстычны грамадзянін разумее, што як мінімум частка афіцыйнай ідэалёгіі рэжыму, «інтэграцыйнае танга» і «пацалункі за энэрганосьбіты» – рэч няшчырая і фальшывая. І, хутчэй за ўсё, ня вечная.

Але ўзмоцнены кантроль рэжыму над грамадзтвам, зьнішчэньне незалежных СМІ і маргіналізацыя палітычнай апазыцыі змушаюць грамадзяніна думаць перш за ўсё пра ўласны лёс, а не пра лёс бацькаўшчыны. Энтузіязм і спадзяваньні больш «сумятлівых» і менш таталітарных 1990-х гадоў замяніла ў XXI стагодзьдзі прыстасаванства і страх. Сярод некаторых колішніх непрыхільнікаў рэжыму Лукашэнкі адбылася пэўная «зьмена вехаў», згортваньне палітычнай актыўнасьці. Асноўная ж частка насельніцтва працягвае займацца тым, чым і дагэтуль займалася ўсё жыцьцё –

адаптацыяй. Кожны ратуецца паасобку, сям'я застаецца асноўнай крыніцай сілаў і ўзаемадапамогі.

Што ж перашкаджае салідарнасьці, што разьядноўвае? Існуе мноства плоскасьцяў, на якіх ёсьць апазыцыі паводле прыкметы стаўленьня да пэўных веравызнаньняў, беларусізацыі, палякаў, Захаду, Расеі, камунізму, СССР і г. д. Успрыняцьце носьбітаў адрозных думак хоць і залежыць ад асабістых рысаў канкрэтнай асобы, тым ня менш, у пэўным сэнсе палярызуе грамадзка актыўную частку насельніцтва Беларусі адносна двух ідэалягічных полюсаў – незалежніцкага, праэўрапейскага, і постсавецкага, прарасейскага.

Да пэўнай ступені разьяднальную ролю выконвае сацыяльнае паходжаньне грамадзянаў Беларусі, водападзел між горадам і вёскай і ўзаемнае непрыняцьце, часам падсьвядомае, паміж некаторымі прадстаўнікамі адпаведных групаў.

Ня зьнік да канца і стары падзел на «ўсходнікаў» і «заходнікаў». Часам ураджэнцы ўсходніх абласьцей больш схільныя даваць «землякам», чымся ўраджэнцам заходніх абласьцей, і наадварот, хоць гэта тычыцца пераважна асобаў сярэдняга і старэйшага веку.

Усе пералічаныя тут рэчы, безумоўна, шырока вядомыя, але я не прыгадваю талковай працы – сацыялягічнай, антрапалягічнай ці нейкай іншай, якая была б прысьвечаная аналізу і ўзаемаадносінам разнастайных групаў у межах беларускага грамадзтва. Разам з тым, разнастайнасьць не цікавіць і сёньняшнюю ўладу, для якой, нягледзячы на прынагодныя заявы пра Беларусь як «радзіму ста нацыянальнасьцяў», больш выгадна паказваць народ як маналіт, што нязьменна галасуе за «ўсенароднага прэзыдэнта».

Адзіным новым ці, прынамсі, мадыфікаваным падзелам у параўнаньні з папярэднімі часамі ёсьць падзел на палітычна пасіўную і палітычна актыўную часткі грамадзтва. Палітычна актыўная частка ў савецкі час вызначалася адзінкавымі дысыдэнтамі й колькасна большай групай габрэяў-«адмоўнікаў», з аднаго боку, а з другога – пераважна партыйнымі публіцыстамі й ідэолягамі. Да апошніх варта

адносіць ня ўсіх «ідэолягаў», а хіба партыйных бюракратаў кшталту Івана Антановіча і літаратараў Эдуарда Скобелева і Ўладзімера Бегуна, што выходзілі за межы агульнапрынятай кампартыйна-ідэалягічнай рутыны ў змаганьні з «нацыяналізмам і сіянізмам» і ўкладалі ў гэтае змаганьне, што называецца, усю душу.

Сёньня палітычна актыўная частка грамадзтва значна вырасла ў параўнаньні з савецкім часам, і адбылося гэта пераважна за кошт асобаў, што падзяляюць эўрапейскія й нацыянальныя каштоўнасьці. Нават цяпер, у пэрыяд спаду палітычнай актыўнасьці, параўнальна з 1990-мі гадамі, на актывістаў апазыцыі насельніцтва не глядзіць як на вар'ятаў, як было з дысыдэнтамі ў савецкія гады. Тым ня менш, у апошні час заўважаецца пэўны рост актыўнасьці сярод беларускіх грамадзянаў менавіта ў падтрымку рэжыму Лукашэнкі й ягоных антыэўрапейскіх, антыбеларускіх «каштоўнасьцяў». Як канкрэтны прыклад можна прывесьці блогерства ў «Жывых дзёньніках» (Live Journal). За апошні год там павялічылася колькасьць беларускіх блогераў, якія выказваюць захапленьне Лукашэнкам і становішчам у Беларусі. Невядома, наколькі арганічная гэтая тэндэнцыя, але яна, безумоўна, да пэўнай ступені адлюстроўвае імкненьне асобаў адаптавацца да існай сыстэмы.

І тут варта зноў вярнуцца да савецкіх аналёгіяў. Адаптацыя яшчэ ня значыць поўнай падтрымкі. Прапагандысцкія накруткі рэжыму сёньня спрацоўваюць, бо дзякуючы, скажам, праблемам грузінскай энэргетыкі або нестабільнасьці палітычнага жыцьця ўва Ўкраіне няцяжка наскубсьці адмоўных карцінак пра «дэмакратызаваных» суседзяў – газ з Расеі застаецца параўнальна танным, а Лукашэнка з сваімі харызматычнымі рысамі стаіць на галаву вышэй за ўсіх лідэраў постсавецкай, а можа, і постсацыялістычнай прасторы. Дык вось, Савецкі Саюз ляснуў, як толькі былі крыху аслабленыя ланцугі, і з-за фасаду савецкага ладу вылезла жахлівая праўда пра пабудову гэтага ладу. Савецкае грамадзтва ўжо пры канцы 1970-х і на пачатку 1980-х гадоў не ўспрымала сацыялістычных каштоўнасьцяў за «намінальны кошт», і было гатовае да краху СССР, пачынаючы нават не зь перабудовы, а значна раней – з «адлігі» і анэкдотаў,

як гэта выдатна паказаў у сваёй нядаўнай кнізе антраполяг Аляксей Юрчак[1].

Тое ж з поўным правам можна сказаць і пра сёньняшнюю Беларусь. Няшмат знойдзецца людзей – нават у лягеры прыхільнікаў Лукашэнкі, – якія за намінальны кошт прымаюць ягоную «дзяржыдэалёгію». І цалкам магчыма, што новыя факты, скажам, пра зьніклых або пра банкаўскія рахункі, выклічуць актыўнае супрацьдзеяньне рэжыму з боку былых прыхільнікаў. Хоць гэтага нельга выключыць цалкам, але беларускі таталітарызм-light дзеля шэрагу прычынаў мае зашмат перашкодаў на сваім шляху, каб пераўтварыцца ў «нармальны» таталітарызм сталінскага альбо мааісцкага кшталту. Але ня гэта ўсё ж ёсьць мэтай маіх развагаў.

Турбуе мяне вось якая рэч: калі Лукашэнка сыдзе з палітычнага поля, ці будуць сёньняшнія палітычныя партыі й палітычныя дзеячы ў стане пераняць справы, запоўніць вакуўм пасьля гэтай моцнай і значнай (у адмоўным сэнсе) фігуры? Ці здолеюць яны пераканаць народ у слушнасьці дэмакратычнага і нацыянальнага выбару для краю, ці ня народзяць іхныя памылкі чараду палітыкаў і партыяў, ахвочых «продолжать дело Лукашенко»?

У прынцыпе, разнастайнасьць поглядаў ня лічыцца ў сусьветным дэмакратычным грамадзтве нейкай заганай ці недахопам нацыі, этнічнай групы. Аднак брак салідарнасьці, адсутнасьць кампрамісаў у крытычныя для жыцьця супольнасьці моманты паказвае на сур'ёзныя праблемы, якія сапраўды ёсьць непажаданай для нацыянальных інтарэсаў краіны зьявай. Калі за нацыянальныя інтарэсы Беларусі ўважаць пабудову дэмакратычнага грамадзтва, захаваньне і разьвіцьцё нацыянальнай культуры і рынкавыя эканамічныя адносіны, дык недалучэньне часткі апазыцыйных дэмакратычных сілаў да сваіх калегаў па дэмакратычным лягеры можна лічыць выступам супраць гэтых інтарэсаў. Гэты крок і брак волі да кампрамісаў – сцэнар і наступных прэзыдэнцкіх выбараў – нават калі яны будуць цалкам свабодныя.

«Зайздрасьць – першая беларуская хвароба», – казаў некалі мой

дзед. Я спадзяюся, вельмі спадзяюся, што зьяўленьне другога апазыцыйнага кандыдата было выклікана заўважанымі памылкамі ў тактыцы калегаў па апазыцыі, сваёй «узважанай пазыцыяй у найважнейшых пытаньнях жыцьця краіны», упэўненасьцю ў сваёй перамозе і г. д.[2].

Спадзяюся на гэта, але не выключаю, з свайго нью-ёрскага «далёка», што вінаватая тут і першая наша хвароба.

Між тым, усім беларусам, усім жыхарам Беларусі можна пераадолець і гэтую, і ўсе іншыя хваробы. Бо пры ўсёй шматлікасьці й разнастайнасьці таго, што нас падзяляе, усё ж мацнейшае тое, што нас лучыць. Гэта супольная наша зямля, супольны гістарычны лёс, і галоўнае – супольная будучыня. Будучыня. Як ні патэтычна гэта гучыць.

Нью-Ёрк

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 4 (44) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/12
[image]

ЮРЫ ЧАВУСАЎ
палітоляг, сталы аўтар «ARCHE». Яго апошняя публікацыя – агляд «Як выжыць падчас рэвалюцыі» (6/2005).

Юры Чавусаў Да апалёгіі здрады

Ничто так не взрослит, как предательство.

А. и Б. Стругацкие. Хромая судьба

1

Гістарычная веда ў сваёй навуковай форме ніколі не выклікала ў мяне нейкага асаблівага захапленьня. Захоўваючы да яе павагу, я, аднак, не магу падзяліць радасьцяў «гістарычнага адкрыцьця». Мяне не кранаюць пачуцьці навукоўца-першаадкрывальніка раней невядомых старонак гісторыі ці дагэтуль прыхаваных фактаў, незаслужана забытых постацяў альбо сапраўднага аблічча постацяў вядомых. Колазварот гістарычных інтэрпрэтацыяў нагадвае мне бясконцы шэраг футбольных чэмпіянатаў: працэс можа захапляць, дынаміка відовішча можа выклікаць азарт, наперад выходзіць то тая, то гэтая каманда, хтосьці абвяшчаецца «чэмпіёнам сэзону», камусьці яўна сымпатызуюць судзьдзі... Аднак пытаньне «Хто ўсё ж такі мае рацыю, хто валодае гістарычнай ісьцінай?» бессэнсоўнае, гэтаксама як было б бессэнсоўнае пытаньне «Хто ж абсалютны чэмпіён па футболе ўсіх часоў і народаў?» альбо «Чыёй перамогай урэшце скончацца сусьветныя спаборніцтвы па футболе?». Мы бачым толькі цыкль, і ў межах гэтага цыклю вызначаем адносную

ісьціну – у абсалютным жа вымярэньні пошук гэткай ісьціны выглядае марным.

Сьледам за Карлам Попэрам мы раз за разам пераконваемся, што сусьветнай гісторыі няма, ды хутчэй за ўсё яе і ня можа існаваць увогуле як сусьветнай гісторыі чалавецтва. Тое, што выкладаецца ў школах пад шыльдай «сусьветнай гісторыі», на самай справе ўяўляе сабой гісторыю палітычнай улады. У прынцыпе, з такім жа посьпехам школьнікаў маглі б адукоўваць у галіне сусьветнай гісторыі з пункту гледжаньня любога іншага грамадзкага інстытуту альбо сацыяльнай зьявы. Эвалюцыя культуры прыняцьця ежы, гісторыя моды альбо пахавальных традыцыяў, дынаміка сэксуальных звычаяў і разуменьня прыгажосьці, працэс навукова-тэхнічнага прагрэсу альбо зьмяненьне гаспадарча-эканамічных стасункаў ня менш за палітычную гісторыю заслугоўвалі б таго, каб быць стрыжнем унівэрсальнага гістарычнага наратыву (як гэта і робіцца ў рознага кшталту альтэрнатыўных гістарычных тэорыях). На шчасьце, існаваньне гэткага ўнівэрсальнага наратыву хутчэй за ўсё ёсьць усяго толькі інтэлектуальным канструктам, зручным мнэманічным правілам для запамінаньня датаў і ўзаемадачыненьняў паміж суб'ектамі. Гісторыю таксама можна бачыць калейдаскопам пераплеценых гістарычных сюжэтаў, кожны зь якіх можа быць разгледжаны дасьледнікам як самадастатковы і цэльны гістарычны наратыў. Гэтыя сюжэты таксама канструююцца суб'ектам дасьледаваньня штучна, гэта тэарэтычна-мэтадалягічны прыём дзеля вылучэньня сутнасных рысаў аб'екту дасьледаваньня.

Таму я бачу ў гістарычных тэорыях хутчэй не гіпотэзы, а наратыў, аповед, сюжэт. Кожнае гэткае апавяданьне цікавае ня столькі выкладзенымі фактамі і зробленымі высновамі альбо выведзенай маральлю, колькі самім працэсам аповеду, працэсам адбору фактаў і іх перадачы. Гэты працэс залежыць ад таго, хто і ў якім кантэксьце кажа цяпер пра мінулае і больш характарызуе тое, што ёсьць цяпер, чым тое, што было раней. Кароткі курс «Гісторыя Ўсесаюзнай Камуністычнай партыі (бальшавікоў)» 1938 г. было б сьмешна цяпер успрымаць сур'ёзна як тэорыю фармаваньня і разьвіцьця рэвалюцыйнага руху ў Расеі альбо Беларусі – аднак гэты тэкст дае надзвычай цікавы

матэрыял пра пэрыяд стварэньня самога гэтага гісторыяпісаньня і пра тых, хто яго пісаў. Ён больш характарызуе не прадмет дасьледаваньня, а самога дасьледніка. Так і курс «Вялікая Айчынная вайна савецкага народу (у кантэксьце Другой сусьветнай вайны)», і іншыя «гістарычныя» прадметы ідэалягічнага цыклю ў сучаснай беларускай школе дазволяць наблізіцца да разуменьня сэнсу гісторыі нашай краіны – але не як носьбіты гістарычных гіпотэзаў, а толькі як помнікі сучасных рэаліяў, каштоўныя артэфакты для будучых дасьледнікаў аўтарытарнай дзяржаўнай думкі, таталітарнай пэдагогікі і надзвычай спэцыфічнага комплексу ведаў адносна фармаваньня дыктатарскага рэжыму, «дэмакратычнага транзыту наадварот».

Зноў-такі, сам адбор фактаў адыгрывае ў гэтым гісторыяпісаньні прынцыповую ролю, вызначальную для таго ўражаньня, якое складзецца ў чытача. Які зь незьлічонага мора гістарычных сюжэтаў будзе абраны дасьледнікам для гісторыяпісаньня – важная рыса не гісторыі як такой, а сутнасная характарыстыка таго, хто гэтую гісторыю дасьледуе і піша. Адпаведна, сам гістарычны сюжэт робіцца ў гэтым кантэксьце не такім ужо важным – рэй вядзе пазыцыя дасьледніка, стыль аповеду, які складаецца з падкрэсьліваньня дэталяў і асьвятленьня быццам бы другасных фактаў. Гэта як у кіно альбо ў прыгожым пісьменстве – той самы зь нешматлікага набору адвечных сюжэтаў можна апавесьці па-рознаму. Такім чынам, і сюжэты зь невялікага набору магчымых сюжэтаў беларускай гісторыі можна апавесьці па-рознаму.

Згаданая тэза Попэра пра малаверагоднасьць існаваньня ўсеагульнай гісторыі можа быць справядлівая і для нацыянальнага ўзроўню. Беларусы адчуваюць гэта як ніхто іншы. Так, нават для непрафэсійнага пункту гледжаньня відавочная адсутнасьць агульнабеларускай канцэпцыі гісторыі. Брак нацыянальнай палітычнай гісторыі (які мае аб'ектыўны характар) прымушае шукаць субстытуты гэтага навукова-гістарычнага ядра ў выглядзе ягонага замяшчэньня сюжэтамі перш за ўсё гісторыі культуры, у тым ліку матэрыяльнай культуры, гісторыі дзяржавы і права ў непалітычным вымярэньні гэтых інстытуцыяў, гісторыі мовы, канфэсійнай і

рэлігійнай гісторыі. Гэты пошук абумоўлены нязручнасьцю пабудовы нацыянальнай гісторыі на базе гісторыі палітычнай улады ўва ўмовах, калі большасьць даступных гістарычных матэрыялаў сьведчаць пра палажэньне Беларусі як «негістарычнай нацыі», не суб'екту, а аб'екту гісторыі.

Сярод гэтых сюжэтаў не апошняе месца займаюць сюжэты здрады і зьвязанай са здрадай калябарацыі. Адным з выйсьцяў для гісторыяпісаньня беларускай нацыі ёсьць нацыянальная гісторыя як гісторыя здрады, што таксама не выключае контравэрсійных канцэпцыяў – прыгадайма савецкія і «антысавецкія» парадыгмы гісторыі Беларусі пад нацысцкай акупацыяй. Магчыма, гэта адна з ключавых праблемаў, якая падзяляе беларускіх гісторыкаў і вызначае зьмест той альбо іншай мадэлі інтэрпрэтацыі гістарычных падзеяў. Стаўленьне наратара, зьвязанае з грамадзкай ацэнкай здрады і здрадніцтва, звычайна задае кантэкст для ўспрыняцьця сюжэтаў, што палягаюць у гэтым рэчышчы. І тут як ніколі заўважная повязь старой мінуўшыны і сучаснага, тут як ніколі дасьледнік вымушаны грунтавацца на мэтадалягічных падмурках сучасных грамадзкіх уяўленьняў. Менавіта ў гэтым праяўляецца ідэалягічная функцыя гістарычнай веды.

2

Апошнія тры нумары часопісу «ARCHE» за 2005 г. утрымліваюць тры матэрыялы, якія закранаюць праблемнае поле здрады ў беларускай гісторыі. Тэксты зьявіліся адзін за адным і відавочна ўяўляюць сабой згаданы працэс «адбору фактаў» у канструяваньні гістарычнага сюжэту, прычым адбор адбываўся падвойны: аўтары артыкулаў ажыцьцявілі дасьледаваньні (дарэчы, артыкулы суправаджаюцца багатым архіўным матэрыялам і ўтрымліваюць спасылкі на ўсе выкладзеныя факты), а рэдактары часопісу зьмясьцілі іх у адзіны кантэкст, ствараючы гістарычны сюжэт. Зьмешчаныя тэксты зьяўляюцца прыкладам тварэньня гісторыі шляхам падбору фактаў – а факт іх апублікаваньня адзін за адным стварае адчуваньне сьвядомага канструяваньня навукова-гістарычнай канцэпцыі беларускай здрады. Мы тут сутыкаемся з канкрэтным

прыкладам тэхналягічнага падыходу да гісторыяпісаньня.

Два артыкулы закранаюць здраду непасрэдна на канкрэтных прыкладах – гэта тэкст Андрэя Вашкевіча і Дзяніса Нарэля «Сымон Якавюк: адраджэнец, спэкулянт, манархіст і савецкі дывэрсант» і тэкст Андрэя Чарнякевіча і Алеся Пашкевіча «Псыхалёгія здрады: беларускі нацыянальны рух вачыма канфідэнта II аддзелу польскага Генэральнага штабу».

Першы з матэрыялаў прысьвечаны жыцьцепісаньню асобы, якую «нельга аднесьці да ліку шырокавядомых нават сярод беларускіх гісторыкаў» – гэта дзеяч беларускага руху Другой Рэчы Паспалітай і Літвы Сымон Якавюк. Каля шасьцідзесяці старонак (незвычайны для «ARCHE» памер артыкулу!) даюць вычарпальныя зьвесткі пра жыцьцёвы шлях дзеяча, які меў «самае шчыльнае дачыненьне да беларускага руху на працягу больш чым дваццаці гадоў». Аповед заканчваецца публікацыяй уласнаручнага допісу старога Якавюка ў КДБ, у якім дзеяч аналізуе свае заслугі як агента НКУС, акцэнтуючы ўвагу на сваім удзеле ў ліквідацыі беларускага эмігранцкага ўраду і ў разьвіцьці беларускага руху на тэрыторыях, што да Другой сусьветнай вайны знаходзіліся па-за межамі тэрыторыі Савецкай Беларусі. Аўтары не даюць адказу на пытаньне, пры якіх абставінах быў завэрбаваны Якавюк, аднак выкладзеныя факты дазваляюць ідэнтыфікаваць яго менавіта як завэрбаванага здрадніка, а ня проста як засланага агента.

Другая публікацыя прысьвечаная дасьледаваньню жыцьцёвага шляху іншага здрадніка, які вядомы як «адзін зь піянэраў беларускага культурнага адраджэньня перашай паловы XX стагодзьдзя» – Рамуальда Зямкевіча. Гэты дзеяч беларускага руху міжваеннай Польшчы быў платным інфарматарам іншай спэцслужбы – польскай дэфэнзівы. Тэкст ілюстраваны шматлікімі грунтоўнымі рапартамі агента, якія поўняцца ня толькі апэратыўнымі зьвесткамі, але й разважаньнямі амаль філязофскага кшталту пра беларускае нацыянальнае адраджэньне, пра лёс беларускага пытаньня ў Польшчы. У адрозьненьне ад першага матэрыялу, у гэтым тэксьце робіцца аналіз ня толькі дзейнасьці агента, але таксама ягонай псыхалёгіі і вонкавых прычынаў здрады – аўтарскія тэзы

Чарнякевіча і Пашкевіча ўяўляюць сабою хутчэй прадмову альбо камэнтар да паведамленьняў, якія Зямкевіч накіроўваў сваім варшаўскім працадаўцам.

Да гэтых тэкстаў прымыкае апублікаваны раней за іх артыкул тых жа Андрэя Чарнякевіча і Алеся Пашкевіча пра іншую выбітную і надзвычай цікавую постаць. У артыкуле «Стары нямецкі агент, ці Бацька радзіміцкага народу» праз асобу, так бы мовіць, «беларуса нямецкага паходжаньня» Эдмунда Аляксандра Рамана Зуземіля асьвятляецца фэномэн здрады зь іншага ракурсу. Зуземіль пазыцыянуецца як «куратар з боку нямецкай адміністрацыі ўсяго беларускага руху падчас германскай акупацыі заходняй часткі Беларусі ў 1915–1918 гг.», прасочваецца ягоны ўдзел у беларускіх справах і пасьля акупацыі. Такім чынам, мы назіраем як бы адваротны бок мэдаля, адваротны бок здрады. Асоба Зуземіля ў артыкуле не ацэньваецца адназначна, аднак ягоная дзейнасьць відавочна зьвязаная з працай беларусаў дзеля інтарэсаў замежных спэцслужбаў. Зуземіль успрымаецца як шпіён, які сам дакладна ня можа зразумець, на каго ён працуе – настолькі ён прасякнуўся інтарэсамі тых, каго ён мусіў вэрбаваць для сваёй шпіёнскай працы на карысьць Нямеччыны. Па шчырасьці, параўнальна невялікі дваццацістаронкавы артыкул дае больш чым дастаткова матэрыялу для беларускага нацыянальнага бэстсэлеру – тут ёсьць элемэнты і шпіёнскага дэтэктыву, і баевіка, і псыхалягічнай драмы, і эпасу нацыянальнага адраджэньня.

Акрамя гэтых трох артыкулаў з «ARCHE» ў нізку матэрыялаў па гісторыі беларускай здрады мы аднясём і матэрыялы з кампэндыюму твораў Антона Адамовіча «Да гісторыі беларускае літаратуры». Складзены рэдактарам «ARCHE» Валерам Булгакавым манумэнтальны (1464 старонкі!) зборнік ня толькі знаёміць чытачоў з друкаванай спадчынай літаратуразнаўцы. Разгорнутая прадмова ад укладальніка рэпрэзэнтуе і іншы бок творчасьці Антона Адамовіча – як інфарматара савецкіх спэцслужбаў і даносчыка, але таксама як ідэоляга беларускай калябарацыі. Параўнальна з папярэднімі артыкуламі, у прадмове да гэтага зборніка праблемам здрады і здрадніцтва надаецца адносна няшмат увагі – усё ж такі тэма беларускага

літаратуразнаўства і крытыкі не вычэрпваецца жанрамі даносу і рапарту ў спэцслужбы. Аднак укладальнік робіць і высновы агульнага характару, якія распаўсюджвае ня толькі на постаць Адамовіча, але і на ўвесь беларускі рух, на нацыянальную эліту: «Такім чынам, мы маем справу з калектыўнай паталёгіяй у асяродзьдзі нацыянальнай эліты, для якой шырока зразуметы данос стаў спосабам барацьбы за існаваньне».

Мы ня будзем напаўняць гэты водгук падабенствам рэцэнзаваньня гэтай нізкі ўзаемазьвязаных тэкстаў. Нас у іх цікавіць ня зьмест гістарычнага сюжэту, а спроба канструяваньня гэткага сюжэту як альтэрнатывы папярэднім бачаньням гісторыі Беларусі. Відавочна – у 2005 г. у часопісе «ARCHE» і каля яго распачатая праца дзеля дасьледаваньня і канцэптуалізацыі фэномэну беларускай здрады, альбо, калі гэтая праца вядзецца па-за межамі часопісу, выданьне прынамсі выступае публічнай вітрынай для вынікаў гэтых рэфлексіяў. Згаданыя матэрыялы адрозьніваюцца тэмай, адрозьніваюцца яны і стылем. Але іх яднае своеасаблівая бесстароннасьць і дэкляраваная непрадузятасьць аналізу самога фэномэну здрады. Праблематызацыя здрадніцтва і калябарацыі адбываецца на ўзроўні аналізу вонкавых палітычных абставінаў і асабістых прычынаў, што выклікалі гэткі ўчынак пэўнай асобы, безь ягонай апалёгіі, але і без прадвызначанага маральнага асуджэньня. Здрада робіцца не аб'ектам этычнага аналізу, а аб'ектам гістарычна-псыхалягічнага дасьледаваньня. Гэтым дадзены шэраг матэрыялаў адрозьніваецца ад большасьці папярэдніх гістарычных дасьледаваньняў беларускага здрадніцтва, якія мелі спэкулятыўны характар і відавочна зыходзілі з прадвызначаных маральна-этычных ролевых ідэнтыфікацыяў, урэшце абумоўленых пэрсанальнай ідэалягічнай пазыцыяй аўтара-дасьледніка. А факусаваньне дасьледаваньня на дзеячах руху беларускага Адраджэньня (як выбітных, так і незаслужана забытых) надае канцэпцыі характар канструяваньня сюжэту, які можа быць адным з магістральных у беларускай нацыянальнай гісторыі.

Гэта своеасаблівы «Беларускі контар-рэзыстанс», не ў літаральным сэнсе аспрэчваньня ідэалягічнай лініі часопісу «Беларускі рэзыстанс», а ў сэнсе стварэньня іншага бачаньня

праблемы. Гэта адваротны бок нацыянальнага супраціву – нацыянальнае здрадніцтва, даўняя традыцыя здрады і калябарацыі. Гэтая традыцыя мае ня менш падставаў быць галоўнай лініяй беларускай гісторыі, чым таксама даўняя і больш шанаваная гісторыя беларускага супраціву альбо гісторыя прыгнёту і вызваленьня ад яго.

Ці сапраўды, беларусы – нацыя здраднікаў?

3

Здрада як фэномэн ёсьць тэмай, грунтоўна аналізаванай навуковымі і мастацкімі сродкамі. У хрысьціянскай традыцыі і апокрыфах існуе вялікая колькасьць тэорыяў, прысьвечаных учынку Юды – ад кананічных да правакацыйна-блюзьнерскіх. Як бы там ні было, хрысьціянская думка надае здрадзе дастаткова вялікую ўвагу з-за таго месца, якое здрада (ня толькі Юды, але й апостала Пятра) займае ў Новым Запавеце. Этыка і мараль звычайна адназначна асуджаюць здраду як амаральны ўчынак, але пры гэтым тэарэтычнай згоды адносна зьявы палітычнай здрады не назіраецца. Гэтак адбываецца праз рэлятывізм у палітычных ацэнках – тое, што сёньня лічыца здрадай, заўтра будзе лічыцца мужным грамадзянскім учынкам. Часам для здрады патрабуецца больш маральных сілаў і волі, чым для канфармізму і захаваньня лаяльнасьці паноўным у грамадзтве палітычным прынцыпам – тыя, хто здрадзілі Трэцяму Райху, тыя, хто казаў «не» Гітлеру, былі мужныя людзі, яны здрадзілі дзяржаве, але ня здрадзілі чалавецтву, засталіся верныя агульначалавечым каштоўнасьцям. «Іррацыяналізм здрады і разам з тым дыялектычнасьць гэтай зьявы (нярэдкае пераўтварэньне нэгатыўных аспэктаў здрады ў іх супрацьлегласьць) часам ускладняе адназначную ацэнку таго альбо іншага дзеяньня як нэгатыўнага і здрадніцкага»[1] . Адназначна нэгатыўная трактоўка забойства Юлія Цэзара здраднікам Юніем Брутам таксама можа быць аспрэчаная поглядам на гэтае злачынства як на апошнюю помсту рэспубліканскай традыцыі супраць прадстаўніка паноўнай імпэрскай дэспатыі. Ці ёсьць здрадай забойства тырана? Ці ёсьць здрадай адмова ад вернасьці, калі гэткая вернасьць навязваецца

сілай?

Дуалізм інтэрпрэтацыяў ёсьць і ў біблійнай традыцыі. Маршыруюць тут казаць пра найноўшую палітычную гісторыю. У яе гісторыя нацыянальна-вызвольных рухаў – ад заснавальнікаў Злучаных Штатаў Амэрыкі да дзеячаў, зьвязаных з развалам Савецкага Саюзу – утрымлівае біпалярныя ацэнкі. Здраднікі і абаронцы ў іншым палітычным кантэксьце выступаюць як вернікі і свайго народу, правадыры нацыяў, выратавальнікі і дабрыні.

1 Маршыруюць
Гісторыя
Злучаных
Штатаў
Амэрыкі
Гісторыя
Савецкага
Саюзу
міфы і
Дабрыні
2005. № 4 .

Згаданыя публікацыі апошняга часу ня толькі адлюстроўваюць неадназначнасьць фэномэну беларускай здрады – цяжка сабе ўявіць беларускага палітычнага дзеяча, які ў той альбо іншай ступені ці ня быў абвінавачаны ў здрадзе, ці не пазыцыянаваў сябе як ахвяру здраднікаў. Артыкулы «ARCHE» міжволі выводзяць нас у сучасную рэчаіснасьць, прымушаюць задумацца ня толькі пра генэалёгію беларускага здрадніцтва, але і пра актуальны стан рэчаў у беларускім грамадзтве. Ці ня бачым мы цяпер у залежных ад вонкавай падтрымкі (іншамоўных кансультантаў-стратэгаў і замежнага фінансаваньня) шматлікіх беларускіх нацыянальных арганізацыях, што змагаюцца супраць рэжыму, адпаведнікаў інсьпіраваных замежнымі агентамі беларускіх суполак першай паловы мінулага стагодзьдзя? Ці не прывядзе іх дзейнасьць да падобнага выніку, да зьмены аднаго антыбеларускага рэжыму іншым? Нават ужо сама мова згаданых артыкулаў міжволі (ці гэта сьвядомая лінія аўтараў?) стварае канатацыі зь сёньняшнім часам і актуальнымі палітычнымі падзеямі: «рабіў беларусам дробныя паслугі і даваў грошы на выданьне газэт»; «за справу арганізацыі выданьня беларускіх кніг у Кёнігсбэрзе... узяўся сур'ёзна»; «тэрмінова выяжджае ў Гданьск на нейкую нараду і сустрэчу з заморскімі гасьцямі»; «у Вільню інкогніта прыяжджаў нямецкі шпіён... гаворка ідзе пра арганізацыю беларускага паўстаньня»; «хоча пазнаёміцца з станам беларускага руху... прапануе матэрыяльную дапамогу ў выданьні газэт»; «што датычыць палітыкі, то ён раіць не саступаць, а чыніць пратэсты, нават скандалы і эксцэсы, што ў найбліжэйшай будучыні багата аплаціцца»; «ён паабяцаў, што ўсё мне прышле празь нямецкую амбасаду»; «аднаго са шматлікіх псэўдабеларускіх дзеячаў, якія дзеля грошай гатовыя ствараць новыя беларускія арганізацыі»; «грошай на выданьне

газэт і апэляцыю яны ня маюць. Украінцы абяцалі дапамагчы. Адкуль паходзяць гэтыя грошы ўкраінцаў – з краю ці з-за мяжы – высьветліць цяжка»; «абяцае фінансавую дапамогу для руху, асьветніцкую дапамогу ў гімназіях і чэскім унівэрсытэце для беларускай моладзі, якую перасьледуюць»; «праца сярод беларусаў у Амэрыцы толькі пачатая»; «апошнія вялікія арышты сярод тых... якія езьдзілі зь Вільні ў Менск і назад, перарвалі добра завязаную нітку стасункаў, асабліва дастаўку літаратуры і агітацыйнага матэрыялу»; «калі ўлады не дадуць дазволу на правядзеньне зьезду, ён адбудзецца нелегальна»; «значныя матэрыяльныя субсыдыі будуць давацца асобным людзям, калі... будзе выпрацаваная супольная плятформа»; «кантакт з украінцамі вельмі цесны... дзякуючы іх [украінскіх газэтаў] чытаньню сьвядомасьць і радыкалізм беларусаў расьце»; «камітэт статуту ня мае, ня быў зарэгістраваны, а быў адноўлены і існуе без аніякага права». Часам такое спалучэньне аналягічных сучаснасьці прыкметаў у падзеях векавой даўніны спараджае адчуваньне, што мы маем справу з майстэрскай містыфікацыяй кшталту тэкстаў Сяргея Балахонава[2], калі б гэтаму не перашкаджала сур'ёзная рэпутацыя паважаных аўтараў-навукоўцаў і шырокае цытаваньне архіўных крыніцаў.

Развагі над выкладзенымі прыкладамі здрадніцтва прыводзяць нас да разуменьня таго, што палітычная здрада такая ж, быць рознай у залежнасьці ад таго, *чаму* здраджваць: здрада на ўзроўні арганізацыйна-тэхналягічным, здрада на ўзроўні ідэяў і прынцыпаў. І нарэшце, здрада на арганізацыйным узроўні. Зь іншага боку, захоўваючы вернасьць асуджанаму на паразу палітычнаму праекту, ці ня здраджваеш чалавек мэтам, дзеля якіх гэты праект ажыццяўляецца? Гаворка не пра прынцып «мэта апраўдвае сродкі», а пра бессэнсоўнасьць захоўваньня вернасьці асуджаным на паразу і неэфэктыўным сродкам. Але такім чынам апраўдваюць свае злачынствы здраднікі ўсіх часоў і народаў...

Прынамсі, ёсьць у Эўропе адзін народ, для якога фігура здрадніка, нацыянальнага здрадніка, зьяўляецца трагічнай і праблемнай – адной з цэнтральных постацяў нацыянальнай міталёгіі. Ірляндзкая традыцыя супраціву іншаземным

[2] Гэта, напр., Балахонаў С. Мой Залеля пад нявольнікі Фэнікса // ARCHE 2004. № 5.

акупантам, падзел ірляндзкай нацыі на пратэстантаў і каталікоў, на рэспубліканцаў і ляялістаў, гістарычна пашыраная эміграцыя спарадзілі вялікую колькасьць здраднікаў. «Калі б мы ведалі, колькі сярод нас здраднікаў, то ўва ўсіх бы апусьціліся рукі», – гавораць удзельнікі ўсіх даўніх пратэстных рухаў на ўсім сьвеце, так гавораць і даўнія дзеячы беларускага супраціву. Андрэй Чарнякевіч і Алесь Пашкевіч кажуць пра адчуваньне смутку ад веды пра тое, колькі «шкілетаў у шафе» маецца ў дзеячаў нацыянальнага беларускага руху. Напэўна, кампрамэтоўныя ўчынкі і нават здрада характэрныя ня толькі для беларускай гісторыі – гэтая традыцыя лягічна сягае і нашых часоў. Але было б памылкай рабіць выснову, што інфільтраваны агентамі і здраднікамі нацыянальны дэмакратычны рух асуджаны на фіяска. Здраднікаў сярод беларусаў, напэўна, ня больш, чым у любым іншым руху супраціву. Досьвед адчыненых архіваў суседніх краінаў сьведчыць – колькасьць здраднікаў і інфарматараў мае значэньне для посьпеху пэўных арганізацыяў і нават вызваленчых ініцыятываў, аднак яна ня ў стане спыніць працэсу вызваленьня. Латвія, Чэхія альбо Польшча дэманструюць – тамтэйшыя рухі супраціву былі спрэс інфільтраваныя агентамі і інфарматарамі. Але яны дамагліся посьпеху – справа ня толькі ў пісьменнай арганізацыі працы, але і ў вызначэньні прынцыповай мэты барацьбы. Наяўнасьць здрады ня можа перашкодзіць перамозе руху, які карыстаецца народнай падтрымкай, але яна ў стане спыніць той супраціў, які адмовіўся ад свайго народнага характару і пераўтварыўся ў змоўніцкі, кансьпіратыўны рух.

Гэтая тэза адлюстраваная ў тэорыі сыстэмаў. Сыстэма, складзеная з эфэктыўных элемэнтаў, можа працаваць неэфэктыўна. І наадварот, сыстэма, складзеная з неэфэктыўных, заганных элемэнтаў, можа працаваць эфэктыўна, калі яна пабудаваная адмысловым чынам з улікам хібаў сваіх складнікаў і з улікам функцыянальнай задачы сыстэмы. Неэфэктыўныя элемэнты могуць быць аб'яднаныя ў эфэктыўную машыну. Гэта – навука беларускаму вызваленчаму руху, якая выходзіць за межы праблемы здрады.

Калі мы ведаем, дзеля чаго мы змагаемся, калі мы ведаем мэту

нашага рушаньня – тады ніякая здрада ня можа парушыць нашага адзінства, ня можа перашкодзіць нашай перамозе. Калі нашыя мэты ня вызначаныя і туманныя, калі мы ня ведаем сэнсу нашага супраціву, калі мы ня маем прынцыповых падмуркаў нашай дзейнасьці, тады яна пераўтвараецца ў дзейнасьць дзеля дзейнасьці, у гульню замежных суб'ектаў, што кіруюцца ўласнымі мэтамі, тады здрада разбурае саму нашу чыннасьць, асуджаную на паразу і нават бяз здрады.

Сучасны рэжым і апазыцыя аб'яднаныя тым, што ў абодвух іх вялікая ўвага надаецца паняцьцю здрады. Я не заклікаю любіць і шанаваць здраднікаў сярод нас. Я не заклікаю да паляваньня на вядзьмарак. Я толькі пазначаю патрэбу вывучэньня праблемы і побач з маральным прынцыпам «не судзі» прапаную ўлічваць магчымасьці зразумець гэтую зьяву. І гэта трэба ўлічваць – інакш апынёмся адныя і без паплечнікаў.

З чаго ж нам рабіць дабро? Трэба рабіць дабро са зла – бо больш яго няма з чаго рабіць (Томас Эліёт).
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/07/12**
[image]

ЮРЫ ЧАВУСАЎ
паэт, дасьледнік мовы і літаратуры, выкладчык Гарадзенскага ўнівэрсытэту імя Янкі Купалы.

Юры Чавусаў Да апалёгіі здрады

Почет писание твоея любве, яже аще и медмено бысть, почюдихся и, въ чин въспоминовения приних зѣло, дивихся благоразумию твоему, возлюбленный ми о господе брате Фомо. Имать писание твое наказание с любовию к нашему тщеславию...*

Климент Смаляцiч. «Ліст да Фамы»

** Прачытаў я твой зычлівы ліст і хоць забавіўся, але падзівіўся зь яго, думкі мяне надта пранялі, дзівіўся я кемлівасьці тваёй, каханы мой дзеля Госпада браце Фамо! Ёсьць у лісьце тваім вычлівае найпрамінанне да нашага славалюбства.*

Не пасьпеў высахнуць атрамант мае зацемкі «Куды вядзе лёгіка балцкага аўтахтанізму?», як на стол ужо лёг спрытны адказ спсп. Дзерманта і Санька — маіх адрасатаў і... нібыта апанэнтаў. Яны нават падзякавалі («былі вельмі ўсьцешаныя») за нагоду шырэй разгарнуць свае пагляды. Але, чытаючы, я неўзабаве пераканаўся, што падзяка гэтая хутчэй рытуальная. І разгортваць свае пагляды яны таксама не зьбіраюцца, прынамсі, адну з такіх нагодаў акурат упусьцілі. Затое зьнішчыць свайго ўяўнага праціўніка (само сабою — рытуальна) не прамінулі.

Чытаючы першую частку, я з прыемнасьцю ўсьміхаўся: гэта ж трэба, гэтулькі імпэту патраціць на драбязу! Чытаючы другую і пачатак трэцяе — кісла крывіўся: што тут яны мне

прыпісваюць? І толькі пад канец адчуў знаёмае палемічнае хваляваньне, калі здаецца, быццам ты кавы перапіў. Найболей зьдзівіў настрой адказу: ніякіх перамоваў і кампрамісаў! Як бы гэта лепш яго схарактарызаваць... Агонь на поўнае зьнішчэньне? Татальная «зачыстка»? Хіба так. Сьцісла кажучы, я толькі задаў пытаньне: «Што вы мелі на ўвазе?» І пачуў ветлівы адказ, які можна перафразаваць: «Сам дурань!»

Наўрад ці разумна даводзіць сваю «разумнасьць», нават калі сам у гэтым хоць трохі бачыш праўды. На жаль, мушу нешта казаць! Хаця б дзеля часопісу... І тут мне ўспомнілася адна сытуацыя. Некалі іранскі містык Аль Газалі, гэткі мусульманскі Бэрнар Клервоскі, напісаў трактат «Tahafut al-Falasifa», што значыць аспрэчаньне, ці, даслоўна, зьнішчэньне філязофіі. З Гішпаніі, новым трактатам, яму адказаў Ібн Рушд: «Tahafut al-Tahafut» — зьнішчэньне зьнішчэньня. (У лацінскім перакладзе XIII ст. — «Destructio philosoforum» ды, адпаведна, «Destructio destructionis».) Вельмі хораша гучыць, усё роўна, як кот фуфыкае! А мо й я фуфыкну?

УДАРЫМ ДЭКАНСТРУКЦЫЯЙ ПА ФАЛЬСЫФІКАЦЫІ?

Усё ўдае на тое, што аўтары надумаліся пахаваць мяне пад заваламі цытатаў. Дзеля гэтага былі ўзятыя на ўзбраеньне Гэракліт, Арыстотэль, Ф. Ніцшэ, Ж. Дэлёз, Ф. Гватары дый ці мала яшчэ хто... І не шкада ж ім чытача! (Праўда, апэляваць да чытача яны мне катэгарычна забаранілі.) Тады спытаемся, дзеля чаго ўся гэтая буйная артылерыя? Навошта гэтая эсэнцыялісцкая і постмадэрнісцкая «контра»? Выяўляецца, я моцна схібіў: спаслаўся на здаровы розум. Ах, спадарове, і ахвота ж вам страляць з тае буйной артылерыі па вераб'ёх? Дый няўжо я такі аплэвух, каб ня ведаць, што кажу? Гадоў гэтак дваццаць, пятнаццаць таму, калі мне асабліва імпанаваў Зэнон Элейскі, я, далібог, ня схібіў бы. А цяпер... то да кінікаў, то да сафістаў зьвяртаю пагляд... Міжволі ўспамінаецца стары савецкі анэкдот:

Здае студэнт экзамэн з марксізму-ленінізму. Пра што яго ні запытаюць — нічога ня ведае. Уздыхнуў прафэсар дый кажа:
—Ну, а хто такія Карл Маркс, Фрыдрых Энгельс, Уладзімер

Ленін? Хоць гэта вы ведаеце?
А той злосна падымае голаў і заяўляе:
—А ты ведаеш, хто такі Хведзька Касы, а Ванька Крывы?.. Не?!
Дык чаго ты мяне сваёй кодлай палохаеш?

Што было асабліва прыемна: аўтары амаль дакладна вызначылі маю «кодлу», а таксама арыентацыю (у пэўнай ступені) на рыторыку, а не на філязофію. Але, спадарове, здаровы розум вы ўсё ж не чапайце. Так, я думаў: ужываць гэтае выслоўе ці не? І чакаў, што вы за яго ўчэпіцеся. Адно не спадзяваўся на такую колькасьць спэкуляцыяў. Тым горш для вас. Няўжо вы не разумееце, што гэтым самым пераходзіце на асобы? Калі я задаю вам шэраг пытаньняў і скептычна ацэньваю адзін з сэгмэнтаў вашай тэорыі, дык вы ў адказ пачынаеце дэканструкцыю ўсяго майго дыскурсу. Хораша, нічога ня скажаш! А каб я на канфэрэнцыі задаў падобныя пытаньні? Вы мне морду пабілі б? І чым вы лепшыя за тую «навуковую даму», якую я ўспамінаў? Толькі плюс на мінус памянялі?

На шчасьце, ня ўсе філёзафы ганяць здаровы розум. Мантэнь, Кант, якіх я вельмі цаню, апэлявалі да здаровага розуму. Джордж Бэрклі пісаў: «Я за «здаровы розум». І гэта ж не замінала яму адмаўляць існаваньне матэрыяльнага сьвету! Затое скрайне антыпатычны мне Гэгель выказваў зьнішчальную крытыку здаровага розуму. Марксісты ставіліся да цьвярозага глузду дваяка, і, прыкладна як і Санько ды Дзермант, прывязвалі да пабытовага мысьленьня. Але ці абмяжоўваецца той побытам? Думаю, не! Нават падазраю, што ўсё якраз наадварот: у побыце людзям найчасьцей бракуе праўдзівага цьвярозага глузду.

А вось у навуцы здаровы розум, як тая нітачка Арыядны, ніколі не дае зьбіцца з дарогі. Здаровы розум — гэта нашая здольнасьць, што дазваляе знаходзіць аптымальнае выйсьце з усякага наяўнага становішча. Трэба выйсьці з хаты — і мы, «не задумваючыся», ідзём празь дзьверы. Але калі ў хату б'юцца ворагі, калі пажар, ізноў жа, «не задумваючыся», уцякаем праз акно, праз гарышча, праз комін і г. д. Калі б нашыя веды былі вычарпальнымі, як у Бога, даволі было б «чыстага розуму», але

з увагі на абмежаванасьць нашага досьведу — лепей усё ж карыстацца «здаровым». Здаровы розум большы за нас самых. Гэта толькі пыха філёзафаў яго адпрэчвае. А варта было б не адпрэчваць, а вывучаць. Здаровы розум — гэта тая Божая іскра, якая дазваляе рухацца ў «цемры быту», і рухацца з найменшай колькасьцю гузакоў. Ён нейкім цудам дазваляе імгненна схапіць тое, што ня схопіш нават па доўгіх развагах. А найперш — гэта *лягічна ясны* розум.

Наагул жа, пры чым тут крытыка здаровага розуму? Хіба гэтая фраза, якую я ўжыў сьведама, нават правакацыйна, — падстава да ігнараваньня праблемы? Успомнім казку пра голага караля і краўцоў, якія сшылі яму «найтанчэйшае» адзеньне. Аб тым, што кароль голы, першым загаварыла дзіця. Дык можа, здаровы розум і ёсьць тое «дзіця», якое выгукнула праўду? А што адказваюць мае апанэнты? Ня слухайце! Гэта толькі дзіця! Навошта малечу слухаць! Не, спадарове, так ня пойдзе. Супярэчнасьці застаюцца супярэчнасьцямі, і зглуміўшы мяне, вы ўхіліліся ад адказу. Гэта горш, чым я спадзяваўся — адказ выяўляе эсэнцыялісцкую лёгіку аўтараў і іх карпарацыйную (лічы племевую!) закрытасьць. А апэляцыя да Гэракліта ці Арыстотэля, і, наадварот, супроціны з сафістамі, якія на думку Карла Попэра былі першымі ідэолягамі адкрытага грамадзтва, толькі пацьвярджаюць гэта.

Чамусьці спсп. Дзерманту і Саньку заманулася крытыкаваць мяне як постмадэрніста. Яны нават шчодра ўсыпалі сваю палеміку цытатамі з майго даўнейшага тэксту, які зусім не датычыць нашага спакмяня. Заўважу, цытавалі ці няўважліва, ці аблудна: спачатку мой антыэгалітарызм падалі як эгалітарызм, у іншым месцы ўчынілі мантаж. І ўсё гэта яны назвалі дэканструкцыяй. Але калі б спадары ўважлівей прачыталі той тэкст, дык маглі б заўважыць, што мяне куды больш цікавіць крытычны рацыяналізм. І мэта мая была сьціплейшая і, адначасна, сур'ёзьнейшая: вызначыць контуры фальсыфікацыі тэорыі балцкага аўтахтанізму, пакуль што адно контуры! Тая неадэкватнасьць рэакцыі, якую мне спрабуюць прыпісаць шаноўныя аўтары, пасуе акурат ім. Гэта называецца: ударым дэканструкцыяй па фальсыфікацыі!

Каб упэўніцца, што ўсё гэта vanitas vanitatum, параўнайма, што казаў я:

Здавён лічыў сябе прыхільнікам канцэпцыі балцкага субстрату і ніколі ня думаў, не гадаў, што мне давядзецца выказваць запярэчаньні на даную тэму. На жаль, Аляксей Дзермант ды Сяргей Санько так старанна даводзілі балцкае паходжаньне беларусаў, што ўпершыню прымусілі мяне засумнявацца ў слушнасьці гэтае ідэі. Зрэшты, яны не пахіснулі маіх ранейшых паглядаў, а хутчэй прымусілі задумацца над абсягамі тарнаваньня данае тэорыі. Мала таго, я нават не прэтэндую на тое, каб аспрэчваць іхныя меркаваньні, бо не лічу сябе досыць кампэтэнтным для падобнае крытыкі.

І таксама параўнайма, што мне закідваюць спадары:

Раней пад аналягічнымі лёзунгамі («нацыяналістычная дывэрсія супраць адзінства ўсходнеславянскіх народаў») рэпрэсаваліся дасьледаваньні балцкай асновы этнагенэзу беларусаў, таму ёсьць усе падставы засьцерагацца, ці ня трапяць сюды ж, прыкладам, штудыі беларускіх балтызмаў, якія непазьбежна будуць выяўляць іх усё большую колькасьць і, такім чынам, «псаваць» славянскае аблічча беларускае мовы?

Адбываецца нейкая падмена ўсяго на сьвеце: мяне заклікаюць «зьмяніць сваю «прыродную ўстаноўку» на крыху больш крытычную» і пад тое крытыкуюць як постмадэрніста, нібыта забываючыся, што постмадэрнізм менш за ўсё «прыродны», адказваюць на *крытычныя* заўвагі ў форме *дэканструкцыі* і адначасна бяруць на ўзбраеньне тых самых постмадэрністаў. А ўрэшце раяць «пахадзіць па *зямлі*» (відаць, вярнуцца да прыроды). Ну, далібог, circulus vitiosus! Чаго вы хочаце, панове?!

А цяпер рацыяналізуем рыторыку і лёгіку маіх апанэнтаў:

1. *Інтэлектуальная гістэрыка*, жаданьне зьвінаваціць апанэнта ў «квазіаб'ектыўнасьці» і «ўесьці» як мага мацней.

Гэта робіцца ўскосна, празь Ніцшэ: «Усякі нападна сябе ён лічыць нападам на мараль… Ён умее дыскрэдытаваць сваіх супернікаў…». І наўпрост: «Маніцца надаць сваім разважаньням форму навуковай аргумэнтацыі». (Хто вельмі «маніцца» — відаць па колькасьці спасылак.) А ўсё дадзенае папуры каранує роспачнае «Не судзеце…». І гэта гаворыцца ад імя навукі? Ці мо гэта шантаж? (Заўважым, беручы пад увагу П. К. Фаерабэнда, навуку нельга ўважаць адзінай слушнай судзьдзёй, але калі ідзецца пра навуку, дык «Не судзеце…» заступае іншае: «Крытыкуйце! Толькі карэктна».)

2. *Маніпуляцыя паняткамі*, жаданьне прыпісаць апанэнту тое, чаго ён не казаў.

Спачатку ў віну закідваецца *здаровы розум*, зь яго выводзіцца як вінавачаньне (!) *абыдзённы розум*, а апошні чамусьці зьясьняецца як *практычны розум*. Хацеў бы заўважыць спадаром: і ў схаластыцы (у тым ліку беларускай), і ў Канта практычным розумам называлася этыка, але гэта зусім не падстава, каб ставіць знак роўнасьці паміж *этасам* і *этыкай*. А «небясьпечная рыторыка» няхай застаецца на вашым сумленьні, бо я пакінуў за сабою алібі: тыя тэрміны, якія ўжываў іранічна, узяў у дзьвюхкосьсі (дапамог досьвед постмадэрніста).

3. *Апрыярызм тэорыі*, а як вынік — неадрозьненьне ідэалёгіі ўва ўласным дыскурсе і пільнае вышукваньне ў чужым.

Пішучы свой тэкст, я старанна разьмежаваў крытыку навуковую і крытыку ідэалягічную. Апошняя — і гэта зразумела — выказана больш эмацыйна (я ня маю звычкі хаваць свае эмоцыі). Але, адначасна, да гэтае крытыкі я стаўлюся з моцнаю доляй іроніі, таму там гэтулькі дзьвюхкосьсяў. І ўсё ж аўтары знайшлі «геніяльнае» выйсьце: надумалі пакапацца ў маёй галаве (лепш бы сваёй заняліся) і там перамяшаць навуку з ідэалёгіяй. А ўдарыўшы па ідэалёгіі, адразу пачалі цешыцца, як «ня толькі спэцыялісты, але й некаторыя беларускія інтэлектуалы» падтрымваюць «балцкую ідэнтычнасьць беларусаў». І хіба гэта довад для навукі? Ці ўсё ж для ідэалёгіі? Дарэчы, можаце й мяне запісаць да сваіх сымпатыкаў, толькі крытычных. Ня хочаце сабе крытычнага сымпатыка? Не? Шкада!

А наагул, я перакананы, што ад ідэалёгіі, як і ад мэтафізыкі, ня вольны ніхто. Яе нельга элімінаваць з выказваньняў, але можна *легалізаваць*, а на падставе легалізацыі ўчыніць *дэмаркацыю* розных інтэнцыяў. Той жа, хто адмаўляецца ад легалізацыі, мае наіўную, «дакрытычную» паставу або сьцігуе патаемныя ідэалягічныя намеры. Ідэалёгіяў не бывае слушных і абмыльных, але ёсьць прыдатныя і непрыдатныя, горшыя і лепшыя. І, само сабою, з усякаю ідэалёгіяй трэба ўсталёўваць *дыстанцыю іроніі*. Праўда, татальная іронія часамі небясьпечнейшая за саму ідэалёгію, бо ў сваім лягічным канцы даўнімае татальную дэсакралізацыю ўнівэрсуму. Урэшце, не забываймася: жыцьцё не аднамернае, яно ляжыць на вялікім адцінку — *паміж урачыстасьцю і карнавалам*.

І яшчэ мяне асабліва пацешыла запытаньне:

Чаму ніяк не была пракамэнтаваная досыць падрабязная і забясьпечаная адпаведнай бібліяграфіяй частка нашага тэксту, прысьвечаная асаблівасьцям антрапалягічнага аблічча сучасных беларусаў і іх продкаў?

Чаму? Бо sub speciae aeternitatis, нічога ня маю супраць! У мяне, з грунту, няма *ўласнай* альтэрнатыўнай канцэпцыі этнагенэзу, я стаўлю ўзьніклыя пытаньні, не сьцьвярджаю. Але спсп. Дзермант і Санько не адказваюць, а шукаюць «блохі» ў маёй галаве, мала імкнучыся пачуць, што ж я пытаю. А тую частку няхай камэнтуюць антраполягі, генэтыкі, археолягі[1]. У мяне няма прэтэнзіяў на ўсёзнайства, пачынаючы ад археалёгіі і сканчаючы квантавай касмалёгіяй. З чаго ўсё пачалося? Прачытаў я тэкст у «ARCHE» ды на хвалі сваіх балцкіх сымпатыяў і павагі да сп. Санька (гэта не рытуальная заява! І нават мэтафара пра караля — палемічны ход, ні ў якім разе не ацэна!) меўся прапанаваць узяць удзел у адным праекце. А потым перачытаў колькі слабых месцаў ды наважыўся выказаць сумневы....

Але сустрэўшы такі адказ, наўрад ці захочаш больш[1] Сьведуньні «камэнтаваць». Калі аўтары прагнулі дабіцца толькі такога дыскалінаў, выніку, дык я іх віншую з посьпехам! Яны ўспамінаюць якімі я не пажаданьне Дубаўца зрабіць прывабнай балцкую тэорыю. Баюся, што гэтак балтафілы парастрачваюць сваіх аўторыяў. Успрымаю

сымпатыкаў. Каб я хацеў здыскрэдытаваць сваіх апанэнтаў, дык не зрабіў бы гэта лепш за іх. Само сабою, тэорыя не гіпакатая, калі яе носьбіты не гатовыя весьці адкрыты дыялёг, калі тэмпэратура спрэчкі ўздымаецца да таго градусу, дзе дзейнае розьніца паміж асабістым і агульным, дзе скепсіс тлумачыцца як балтафобія, дзе клопат пра беларускую мову (гэта адзінае месца, у якім я дазволіў сабе эмоцыю) падаецца як мушу дыскрэдытацыя іх навуковай аб'ектыўнасьці. Усё разам гэта можна абазначыць як *люстэркавы сындром*, калі ўласная агрэсіўнасьць праектуецца на аб'ект крытыкі, а аб'ект зьяўляецца па-за ўвагаю. Якая тут рада? Люстэрка на люстэрка-тахафут ут-тахафут!

У ЛЮСТРЫ АНТЫНОМІЯЎ

Колькі ні разважаў я над «балцкай палемікай», мяне абы час не пакідала пытаньне: у чым палягае прынцыповая *нязгода* паміж мной ды спсп. Дзермантам і Саньком? Урэшце я прыйшоў да некаторых высноваў.

1. Нам рупяць зусім розныя рэчы:

a) яны настойваюць на балцкім паходжаньні беларусаў, тым часам я нэўтральны да балцкай праблемы;

b) я настойваю на старажытным характары беларускае мовы, тым часам яны, відаць (самыя ж заяўляюць), катэгарычна супраць.

2. Формулы беларускасьці, адпаведна, таксама розныя:

a) іхная: *балты & славянскасьць → беларусы*;

b) мая: *балты & славяне → беларусы* (колькасьць % — ?).

Але... і тут ня ўсё адназначна.

Яны мне прыпісваюць тую формулу, якую я адпрэчыў зь першае старонкі:

c) савецкая: *славяне → беларусы* (успомнім «навуковую даму»).

прыклад, дык гэта такая, калі яе большыня людзей зводзіцца тэмпэратура. Каб дзіка: мушу вам гэта. А «балцкую кэтэрыю» я захаваю толькі ў тых аспэктах, дзе яна дачыняецца да лінгвістычнага матэрыялу.

(Таксама няясна: ці гэтую формулу яны мне прыпісваюць а) шчыра, зь непаразуменьня, ці b) сьведама, дзеля шальмаваньня апанэнта, ці c) эмацыйна, ад пакрыўджанага самалюбства?)

Мне (а таксама А. Казакевічу) падаецца, што формула Дзерманта—Санька выраджаецца ў наступную:

d) «літоўская»: *літоўцы & славянскасьць → беларусы*[2].

[2] Казакевіч А. «Druvis»: праект балцкае ідэнтычнасьці // ARCHE. 2006. №1–2. С. 56.

3. Пагадненьне можна знайсьці пры ўмовах:

а) я «прызнаю» балцкі субстрат (якога я і не адмаўляю!);

b) яны прызнаюць «беларускасьць» старабеларускае мовы.

Ведама, пагадненьне знайсьці можна, але такі *пакт* ніколі ня выйдзе за рамы ідэалёгіі. У ідэале, незалежна ад таго, на чыім баку праўда, ён застанецца самападманам. Мала таго, абодва бакі ў нечым прайграюць. Дык якая зь яго карысьць? Насамрэч, карысьць, як гэта ні дзіўна, таксама ёсьць. Згода, хоць бы адносная, зэканоміць сілы:

a) ня трэба будзе бясконца даводзіць, хто добры, а хто благі;

b) ня будзе спакусы рэагаваць на кожны выступ іншадумца;

c) ня будзе спакусы вышукваць дробныя хібы ў іншадумца;

d) ня трэба будзе чакаць неаб’ектыўнае крытыкі збоку;

e) пры патрэбе заўсёды можна будзе паяднаць сілы.

Тут дарэчы ўспомніць дужа павучальную гісторыю палемікі Канта і яго вучня Гэрдэра. Вучань надумаўся зьняпраўдзіць філязофію свайго папярэдніка. Настаўнік узяўся паставіць на месца нахабнага вучня. І ў выніку апошнія гады жыцьця Канта былі запоўненыя мала плённай палемікай, якая не дазволіла яму напісаць шэраг прац, а Гэрдэр, сваім парадкам, толкам не раскрыўся як філёзаф. Гісторыя гэтае палемікі тым больш дзіўная, што той самы няўступлівы Кант дапамог беларуска-габрэйскаму філёзафу Майману напісаць і выдаць крытыку на

яго самога, Канта, бо ўбачыў, што Майман згледзеў найслабейшыя месцы ягонае «рэчы ў сабе».

Імя Канта якраз вельмі дарэчы, бо цяпер засталося высьветліць тыя антыномії, якія нас разьядноўваюць і ў найбліжэйшай пэрспэктыве не гатовыя да *сынтэзу* на грунце навукі (пактаў тут не бывае і быць ня можа).

Спсп. Дзермант і Санько шукаюць нашы вытокі ў мітапаэтычнай памяці і, пэўныя ў сваёй праўдзе, кажуць:

Дык чаму мы павінны скептычна ставіцца да сьведчаньняў гэтай самай памяці, калі ідзецца пра нашую этнічную мінуўшчыну?

Я, сваім парадкам, шукаю нашы вытокі ў даўнейшых тэкстах і магу сказаць амаль тое самае:

Дык чаму мы павінны скептычна ставіцца да сьведчаньняў старажытнага пісьменства, калі ідзецца пра беларускую мову?

Вось дзе завязваецца той вузельчык, дзе этнагенэз супярэчыць глётагенэзу! Але разьвязацца ён мае ня тут, а ў больш канкрэтным кантэксьце.

А пакуль што, перш чым працягваць развагі, я б папрасіў, каб спадары пракамэнтавалі ў сьвятле свае тэорыі наступнае выказваньне Я. Карскага:

Народ ніколі ня помніць свайго паходжаньня; яно для яго схаванае мрокам няведанасьці або нікне ў міталягічных генэалёгіях, створаных за шмат пазьнейшым часам. Ня ведае ён таксама й свайго мінулага культурнага стану[3].

[3] Карский Е. Ф. Белорусы. Т. III. Очерки словесности белорусского племени: 1. Народная поэзия.

Гэта далёка не апошняя праўда, але... пэўнае эпахе для «мітапаэтычнага» мэтаду...

Адылі можа падацца, што прагматычныя ўстаноўкі ў нас ускрай супраціўныя, але з грунту й гэта ня так. Я імкнуся ня толькі і ня столькі вывучаць нашу даўніну, а перш-наперш актуалізаваць яе, зрабіць свойскаю для сучаснага беларуса, каб ён пачуваўся там, як у сваім доме. Я не прэтэндую на

навуковасьць не таму, што іду ў абход навукі, хутчэй наадварот, гатовы пільна рэагаваць на ўсякае адкрыцьцё. Але, адначасна, я іду далей за навуку. Гуманітарныя навукі зарыентаваныя толькі на фіксацыю фактаў, таму ў сваім закончаным выглядзе чысты навуковец падобны да філятэліста, які зьбірае маркі дзеля ўласнага задавальненьня або наагул ня ведае, дзеля чаго ён усё робіць. І, як вынік такога становішча — зьнікае крытэр навуковасьці, нельга нават правесьці лінію дэмаркацыі паміж прыгожым пасьянсам катэгорыяў і запраўдным навуковым адкрыцьцём, паміж вар'яцкай гіпотэзай, забясьпечанай навуковым апаратам, і новай пэрспэктыўнай галіной дасьледаваньня.

Навукоўцы звычайна хаваюць тую супярэчнасьць, перш-наперш ад свайго сумленьня, бо зацікаўленыя ў фінансаваньні ўласных праектаў, але за цынізм рана ці позна даводзіцца плаціць. Узьнікае пытаньне, каму ад гэтага лепш, а каму горш? Больш за ўсё такое становішча цешыць постмадэрністаў. Вось дзе можна рыбку палавіць у мутнай вадзе! А больш за ўсё засмучае крытычных рацыяналістаў. Адзінае, што тут прыходзіць на дапамогу, гэта той самы здаровы розум, а сьледам за ім і практычны (усё ж гэта розныя рэчы, бо здаровы розум можа лякалізавацца *ўнутры* тэарэтычнага, а практычны — толькі *пасьля*). Практыку актуалізацыі даўніны я б назваў моўнай інжынэрыяй. Заўважу пад тое: інжынэр ня будзе будаваць дом насуперак навуцы, бо рана ці позна такая канструкцыя абрынецца. Калі ж спсп. Дзермант і Санько кажуць, што зусім ня супраць таго, каб забясьпечыць балцкай тэорыяй новага прэзыдэнта, яны таксама не цураюцца практычнага розуму[4]. А адсюль — рукою дастаць да ідэалягічных наступнасьцяў нашых практык і адпаведных антыноміяў. Спсп. Дзермант і Санько ўпікаюць мяне, быццам я імкнуся падвысіць прэстыжнасьць беларускае мовы за кошт падаўжэньня яе старажытнасьці. Першае (яшчэ раз скарыстаю іхную аргумэнтацыю): а чаму я павінен адмаўляцца ад гэтай старажытнасьці? Другое: каму патрэбна мова, якая ўзьнікла толькі ўчора, а ўжо сёньня стаіць на парозе зьнікненьня? Чаму для людзей так важная старажытнасьць іхнай інстытутаў? Я ня ведаю. Гэта рэч іррацыянальная, але, так

[4] Гл. Ушачаткова, 1916. С. 5.

факт. Я шмат пра яе думаў, толькі тут ня месца для падрабязнага разважаньняў. Мой дзед некалі расказваў показку: аднаго хлопца запыталіся, а навошта ў мужчынаў цыцкі? Той падумаў цэлую ноч, а пад раніцу звар'яцеў. Таго ж кшталту і праблема даўніны. Мае апанэнты цьвердзяць: многім рупіць вытокі, асабліва суседзям з усходу, а я дадам: многім рупіць старабеларуская мова, асабліва суседзям з усходу, а заўсюдзей з поўначы, якія часам ня супраць сказаць: *гэтая мова і ваша, як і наша*.

[5] Гл. пра гэта: Сянько С. Культура як праблема // Vieda: Працы Беларускага інстытуту Эўропы. Вып. 1. Менск, 1993. С. 77).

Што б запраўды вымагала дэканструкцыі ў працах «аўтахтонаў», дык гэта той спэцыфічны *патас*, які нельга не заўважыць. Зьвярнуў на яго ўвагу (зусім зь іншае нагоды) і А. Казакевіч. «Настойлівасьць у прасоўваньні «балцкасьці» насам зьдзіўляе», — заўважае ён у рэцэнзіі на зборнік «Druvis», а ніжэй дадае: «Здаецца… «беларусы — славянамоўныя *балты*», а не «славянамоўныя літоўцы». Рэагуючы на «Этнагенез беларусаў» спсп. Дзерманта і Санька, я не палічыў патрэбным гэта акцэнтаваць, але пры такой нагодзе ўсё ж чапну. «Наперад, змагарна наперад!..» — вось тон публікацыі. Ніякіх сумневаў! Крытыкаваны імі К. Рэзьнікаў (якому я менш за ўсё спачуваю) выстаўляе «генэтычныя» довады славянскасьці, а яны — антрапалягічныя, ён называе канкрэтныя вынікі дасьледаваньняў, а яны яму — «папярэдні і фрагмэнтарны характар» тых фактаў. Дык, можа, лепш усё ж пачакаць канчатковых вынікаў і не сьпяшацца? Прынамсі, патас зьмякчыць.

Усё, што працуе на канцэпцыю «балцкага аўтахтанізму», ашчадна зьбіраецца ў скарбонку, а што супярэчыць яму — адпрэчваецца, часта не без снабізму і аплёмбу. Часам нешта замоўчваецца, як, прыкладам, альтэрнатыўныя меркаваньні наконт *пары ўзьнікненьня* аканьня. Ня ведаю, ці варта называць працы на дадзеную тэму, бо ў дасьведчанасьці сваіх апанэнтаў не сумняюся (прынамсі, яны ня могуць ня ведаць хоць бы нядаўна выдадзенай па-беларуску «Гістарычнай фаналёгіі беларускае мовы» П. Вэксьлера)[5]. У іншым месцы яны закідаюць мне ў віну «маральны аргумэнт», нібыта выкарыстаны супраць іх, хоць гэтага й блізка не было, але самыя ня грэбуюць такімі самымі аргумэнтамі ў дачыненьні да

расейскіх аўтараў. Прабачце ўжо, што мушу станавіцца на гэты грунт, але вы першыя з сваёй «дэканструкцыяй» адхіліліся ад тэмы!

Выказваючы трывогу з нагоды лягічных наступнасьцяў «балцкага аўтахтанізму», я меў на ўвазе толькі неправамерную пасьпешлівасьць у прасоўваньні больш чым сумнеўнай гіпотэзаў паходжаньня нашае мовы, але ні ў якім разе не «шкодніцкую» дзейнасьць аўтараў[6]. Тым больш ні прамую чысьціню славянскасьці ня дбаў, нідзе не казаў, нібыта балтызмы «псуюць» славянскае аблічча мовы». Затое тэарэтыкі «аўтахтанізму» *балцкую цягнітасьць* пільнуюць як заніма.

[5] Вэкслер П. Дзюрмантова балалогія // Беларускае Падзімар'е. Мінск, 2004.

[6] Зрэшты, «вучні і пасьлядоўнікі» доўга ня бавяцца з вынаваці. Улічваючы, што я крытыкую тэорыю, а не спісь. Дзермант і Санька, варта нагадаць, як «тэарэтычнае» аблічча аўтараў нават цікавіцца паходжаньнем, а не цікавіцца гэтым «дзівацтвам». Але, спадарове, дзе я казаў, што навука не цікавіцца паходжаньнем? «Паходжаньне» «праудзівасьць» («чысьціня») — зусім ня тое самае. Ад такой аргумэнтацыі хоць шэхаця на чысьці падазраваць, што аўтараў праўды не цікавіць паходжаньне, а толькі «чысьціня», — натуральна, апырэная, тая, якую вызнаюць «дзялегія» ці «навуковая каркэтны фасад — яшчэ не паказьнік».

[7] Приведу только один пример. Белорусский язык, как известно, в более древние времена этот язык также называли литовско-русским, что отражало его сущность. Белорусский язык сложился на основе древнерусского языка, и как там мы уже говорили, в XIV–XV веках он был языком, на котором говорили и писали славяне Великого княжества Литовского, в состав которого входила и большая часть территории современной Беларуси. Поэтому, когда мы говорим о белорусском языке, мы должны иметь в виду, что его территория в XIV–XV веках была больше, чем сейчас. Кроме того, в XIV–XV веках белорусский язык был языком официальных документов, языком канцелярии, языком литературы. Все это, конечно, накладывало определенный отпечаток на его развитие. Белорусский язык в XIV–XV веках был языком, на котором говорили и писали славяне Великого княжества Литовского, в состав которого входила и большая часть территории современной Беларуси. Поэтому, когда мы говорим о белорусском языке, мы должны иметь в виду, что его территория в XIV–XV веках была больше, чем сейчас. Кроме того, в XIV–XV веках белорусский язык был языком официальных документов, языком канцелярии, языком литературы. Все это, конечно, накладывало определенный отпечаток на его развитие. (Щерба Л. В. О влиянии одних языков на другие // Щерба Л. В. Избранные работы по языкознанию и фонетике. Т. 1.

Славянский или русский язык на наших просторах стал распространяться вместе с письменностью и новой религией – христианством. Впоследствии к русским добавились ещё и польские языковые влияния. В результате смешения этих трех, современной терминологией, например, в более древние времена этот язык также называли литовско-русским, что отражало его сущность. Белорусский язык сложился на основе древнерусского языка, и как там мы уже говорили, в XIV–XV веках он был языком, на котором говорили и писали славяне Великого княжества Литовского, в состав которого входила и большая часть территории современной Беларуси. Поэтому, когда мы говорим о белорусском языке, мы должны иметь в виду, что его территория в XIV–XV веках была больше, чем сейчас. Кроме того, в XIV–XV веках белорусский язык был языком официальных документов, языком канцелярии, языком литературы. Все это, конечно, накладывало определенный отпечаток на его развитие. (Щерба Л. В. О влиянии одних языков на другие // Щерба Л. В. Избранные работы по языкознанию и фонетике. Т. 1.

Лучка ред. 1958. С. 40). Гаварыць пра «мяшанне» моў, на мой погляд, не зусім карэктна, бо ў выніку ўзнікае не нешта трэцяе, а нейкая новая моўная сістэма, якая ўключае ў сябе элементы абедзвюх моў, якія ўзаемадзейнічалі. Гэта можа быць і пераход ад адной мовы да другой, і ўзнікненне новай мовы (Карский Е. Ф. Белорусская речь. Ее прошлое и настоящее. Пг., 1922. С. 3–4). Пытанне, ці можна лічыць беларускую мову «мяшанай» (Дзермант і Санько 2005: 5), таксама не новае (Дзермант і Санько 2005: 5). Ужо Карскі пісаў, што беларуская мова «не выходзіць за межы ўласна славянскіх моў» (Карский Е. Ф. Белорусская речь. Ее прошлое и настоящее. Пг., 1922. С. 3–4). Падобна выказваўся і Шчэрба, які лічыў, што «ніякіх прычын для таго, каб лічыць беларускую мову змешанай, няма» (Щерба Л. В. О понятии смешения языков // Щерба Л. В. Избранные работы... СПб., 2004. С. 42).

ПРА «НІТАЧКУ МОВЫ» І «ПАЦЕРКІ СЛОЎ»

Другое, што мяне даймала на меншу за тую нязгоду: у чым жа прынцыповая *абмыла* спсп. Дзерманта і Санька што да беларускае мовы? На шчасьце, яны мне самыя падказалі, дзе шукаць. Вось як бачаць гісторыю беларускае мовы мае апанэнты:

> Балтызмы — гэта ня ўзятыя звонку словы, а часьцінкі, што «ўтрымаліся» ў мове пасьля «вымываньня» з-пад яе балцкай асновы. Балцкі складнік беларушчыны — нібы «нітка», на якую нанізаныя славянскія «пацеркі».

На гэтым грунце яны й разгортваюць наступную аргумэнтацыю:

> Што да кірунку славянізацыі «горад» — «вясковая акруга», то за гэта могуць сьведчыць дадзеныя і 10 тамоў «Этымалягічнага слоўніка беларускай мовы».

Нічога *такога* ня сьведчаць гэтыя тамы![8] Тут я магу таксама адказаць словамі маіх апанэнтаў: балтызмы — факт, але іх месца і роля — гэта ўжо інтэрпрэтацыя, якая залежыць шмат ад якіх чыньнікаў. (І ня трэба, спадарове, шчыра адкопваючы свае балтызмы, падмалёўваць мне рогі ды хвост, «асьцерагацца рэпрэсіяў», выдумляць нейкую нялюбасьць да балтызмаў, нават балтафобію!)

Мае апанэнты лучаюць у досыць хітрую тэарэтычную ці, хутчэй, мэтадалягічную, пастку. Рэч у тым, што колькасьць далёка не заўсёды пераходзіць у якасьць, а ў якасьць вышэйшага парадку

[8] Тарайчам дадам, што ў беларускай мове, акрамя балтызмаў, ёсць і іншыя пласты лексікі, якія таксама патрабуюць увагі. Напрыклад, ужо Карскі пісаў, што ў беларускай мове «ёсць і нямала ўкраінізмаў» (Карский Е. Ф. Белорусская речь. Ее прошлое и настоящее. Пг., 1922. С. 3–4). Гэтыя словы, безумоўна, таксама заслугоўваюць увагі, але, на жаль, у нашых апанэнтаў яны не выклікаюць ніякага інтарэсу.

[9] Тут пад вышэйшай якасьцю даўнімаецца *сыстэма*, а пад ніжэйшаю — *набор элемантаў*, якія маюць складыці сыстэму.

— бадай *ніколі*[9]. Ілюзія таго, быццам якасьць можна падмяніць колькасьцю, дзе адна аўтаматычна пераходзіць у другую, — ня толькі абмыла дыялектыкі. Гэта досыць пашыраная ілюзія нашага мысьленьня. Мова — сыстэма, а ня куча друзу, ці, як сказалі б спадары, гароху, якая, калі да яе падсыпаць боб, адымаючы гарох, ператворыцца ў кучу бобу. Калі тая «нітачка» славянская, дык колькі на яе ні нанізвай балтызмаў, яна ня стане балцкаю, і наадварот. Наагул, гэтая мэтафара крыху хібіць, бо дзе ў мове «нітачка», а дзе «пацеркі» — вялікае пытаньне. Стараангельская мова на 50 % (а месцамі і на 80 %) складалася з англасаксонскіх словаў. Сучасная ангельская мова мае толькі 30 % гэтага пласту. І ўсё ж яе адносяць да моў германскіх.

Калі ўжо мадэляваць мову, дык я б сказаў, што гэта *герархічная стужка Мёбіюса*, якую можна апісаць праз тры характарыстыкі, уяўляючы іх увадначас:

1. Мову складаюць герархічныя роўні: 1) фанэмны, 2) марфэмны, 3) лексычны, 4) сынтаксычны.

2. Кожны ровень мае два пляны: *зьместу* і *формы*.

3. Тое, што ўтварае зьмест ніжэйшага роўню, служыць формаю для вышэйшага.

Першы пункт агульнаведамы і зразумелы, другі — ведамы, але не заўжды адэкватна зьясьняны, а трэці прымушае па-іншаму глянуць на сама звыклыя зьявы. У прыватнасьці, калі спсп. Дзермант і Санько спрабуюць мне нагадаць такія шкалярскія рэчы, што лексыка становіць сабою больш *рухомы* ровень мовы, а фаналёгія і сынтакс, наадварот, больш *устойлівыя*, дык я адкажу, што гэта так і не зусім так. А ўласна, што такое лексычны склад? Калі голыя словы, дык збольшага гэта так. А калі браць пад увагу іх сэмантыку, дык лексыка так шчыльна пераплятаецца з ідыяматыкай (словаспалучэньнем), з аднога боку, і дэрывацыяй (словаўтварэньнем), зь іншага, што пра рухомасьць не выпадае гаварыць. (Зрэшты, у кантэксьце данай спрэчкі тэза пра рухомасьць лексыкі мне больш на карысьць, ніж на шкоду.)

Падступную ролю і ў разьвіцьці, і ў вывучэньні мовы адыгрывае сэмантыка. Гэта, можна сказаць, *адваротны бок Месяца*. Месяц да Зямлі ўвесь час павернены толькі адным бокам. Гэтаксама й мова — заўжды відаць толькі з боку формы. А ў выніку аб сэмантыцы існуюць уяўленьні або сама дзікія, або ніякіх. Яна зьясьняецца як хімэрычныя канцэпты, як міталягізаваныя вобразы і пад. Чым ніжэйшы пласт, тым часьцей у ім адмаўляюць сэмантыку, а то й наадварот, перагружаюць фантастычным сымбалізмам. Ведама, усё гэта ня мае беспасярэдняга дачыненьня да нашае тэмы, але менавіта на гэтым грунце, нават у найвыдатнейшых навукоўцаў, часта ўзьнікаюць абмылы ды хібы. Самае падступнае ў сэмантыцы тое, што яе мы ўспрымаем рэчыўна, а тым часам сэмантыка задаецца не рэфэрэнцыяй, а самою сыстэмаю мовы, якую мы тарнуем падсьведама. Гэта, можна сказаць, «правілы гульні словам». Даную лёгіку я й паспрабую прасачыць.

З кампаратывістыкі мы ведаем: якасная *падобнасьць* адзінак, прыналежных да розных сыстэмаў, не гаворыць пра іх генэтычную тоеснасьць, затое *рэгулярнасьць* адменаў пры пераходзе з аднае сыстэмы ў другую якраз пацьвярджае такую тоеснасьць. Праўда, у мовах вельмі блізкіх захоўваецца і падобнасьць, і рэгулярнасьць. Але гэта далёка ня ўсё, што характарызуе адзінкі сыстэмы. Ня менш, калі не сказаць больш, важную ролю адыгрывае сэмантыка адзінак[10]. Яна недаступная воку і вуху, але шчыльна ўплятае іх у сыстэму мовы. Адпаведна, устойлівасьць сэмантыкі гаворыць пра ўстойлівасьць мовы як сыстэмы, а няўстойлівасьць, наадварот, пра эвалюцыю, выкліканую тымі ці іншымі чыньнікамі, зазвычай канвэргентнымі працэсамі. Вось жа, пры канвэргенцыі часта здараецца, што захоўваецца вонкавая тоеснасьць адзінак, але вымываецца іх аўтэнтычная сэмантыка.

Каб патлумачыць, што я маю на ўвазе, зробім некалькі простых параўнаньняў: 1) бел. *урода* ‘ураджай’, польск. *uroda* ‘краса’, чэск. *úroda* ‘ураджай’, рас. *урод* ‘пачвара’, баўг. *урод* ‘пачвара’; 2) бел. *пазор* ‘добры выгляд’, польск. *pozór* ‘відомасьць, уяўнасьць’, чэск. *pozor* ‘увага’, сэрб. *позор* ‘увага’, рас. *позор* ‘ганьба’, баўг. *позор* ‘ганьба’. Пры перакладзе ня доўга й абмыліцца, бо чэская *dobrá zpráva*, па-беларуску — *добрая вестка*, а ня *добрая справа*,

параўнайма расейскае — *справляться* ‘даведвацца’. І гэтакіх прыкладаў куды больш, чым можа падацца на першы пагляд. Вось жа, апрычонасьць мовы залежыць не ад яе матэрыяльных носьбітаў, а ад нутраной сэмантычнай структуры, яе «сэмантычных палёў».

Але дарма сэмантыку зьвязваць адно зь лексыкай. Прыкладам, і ў беларускай, і ў расейскай мовах ёсьць фарманты *-ка*, *-ушка*, а іх сэмантычна-функцыянальныя парамэтры — зусім розныя. Па-беларуску *-ушка* не ўжываецца як любосны суфікс, параўн. *девушка*, *Ленушка*, а бел. *дзевухна*, *Аленачка*. Затое ад слоўнай *пяюха* можна ўтварыць *пяюшка*, ад *нясуха — нясушка*. Таму часам беларуская «гендэрная» пара носьбітаў уласьцівасьці — *бягун — бягуха*, *крыкун — крыкуха*, а расейская — *бегун — бегунья*, *крикун — крикунья*. Праўда, і тут трэба пільнаваць, бо ёсьць расейскія «міта-абстракцыі» *бытовуха*, *мокруха*, *чернуха*, якія ня маюць нічога супольнага зь беларускай мовай зьявы, іх ня цяжка пазнаць — яны не ўтвараюць мужчынскіх пар (**мокрун*, **чернун*). Па-беларуску падобныя пэрсаніфікацыі маюць фармант *-іца*: *багавіца*, *бліскавіца*, *касавіца*, *пагібель* (зь якой адначасна — *завіруха*, *мадуха*, *мытуха*). Усё гэта (асабліва «чыстыя» няўлоўнае) і стварае той непаўторны мысьлёвы лад, які ўсмоктваецца з малаком маці, які можа адчуць толькі носьбіт мовы і які робіць мову тоеснай сабе самой.

Дзівосы пачынаюцца пры моўных кантактах. На адной з апошніх стадыяў асыміляцыі ўзьнікае фэномэн, ведамы як «адна мова з двума тэрмінамі»[11]. Якраз тады міжмоўныя амонімы ды паронімы зазнаюць наймацнейшы ціск. У сучаснай беларускай мове адбываецца акурат гэты працэс, які дае два

[10] Параўн. назоўнікі «Моўнікі».

[11] Мабыць, ваніклі ў часы Вялікага княства Літоўскага, пра якія Ян Станіслаў Урбан (1750–1812) пісаў: «Мова, якую (рас. *которым*) даводзіцца (рас. *приходится*) адну мову, а другую (рас. *другой*) — другой (рас. *другою*) называць, таму што ў ёй (рас. *в ней*) адна частка (рас. *часть*) — польскія, а другая — літоўскія словы (рас. *слова*)» (цыт. паводле: Щерба Л. В. Избранные работы... С. 48).

„Ці можна вызначыць ступень змешвання моў?“ (Щерба Л. В. О степени смешения языков // Щерба Л. В. Избранные работы... С. 45).

„Моўнікі“ — назоўнікі, якія ўтвараюцца ад назоў моў: *англічанін*, *беларус*, *грэк*, *іспанец*, *кітаец*, *паляк*, *рускі*, *украінец*, *француз*, *японец* і г. д.

Затое цяпер мы маем справу ня зь нейкай абстрактнай «славізацыяй», як кажуць мае апанэнты, а сама шчырай *расеізацыяй*.

Як бачым, сам зь сябе жадны элемэнт мовы нічога ня значыць. Толькі забясьпечаны пэўнай сэмантыкай, ён можа разглядацца як паказьнік тае ці іншае сыстэмы. Калі сыстэма разьвіваецца інэрцыйна, бяз моцнага ўплыву звонку, дык ні матэрыяльныя роўні мовы, ні іх сэмантычны падклад не зазнаюць істотных менаў. Калі ж моўная сытуацыя спрыяе канвэргенцыі, тады ўзьнікае падобнасьць у сынтаксе, марфалёгіі, нават у фанэтыцы. Гэтак утвараюцца моўныя хаўрусы. Мовы, прыналежныя да аднаго хаўрусу, назапашваюць супольны пласт культурных слоў, але розьняцца элемэнтарнаю лексыкай. На кожным роўні розныя элемэнты па-рознаму паддаюцца асыміляцыі. Ёсьць рэгіянальныя лексычныя адзінкі, якія захоўваюцца стагодзьдзямі (ведама ж, калі не адбываецца вялікіх пэртурбацыяў), бо нават пры канвэргентных кантактах сыстэма мовы ня страчвае тоеснасьці.

Фактычна, спсп. Дзермант і Санько даводзяць нешта накшталт моўнае «пэрманэнтнае рэвалюцыі», якая нібыта доўжылася тут цэлыя стагодзьдзі. Калі ж паспрабаваць рацыянальна зразумець іх мэтафару пра «нітку» і «пацеркі», дык можна сказаць, што заміж беларускае мовы яны абгрунтоўваюць нейкі «глётагенэтычны кацёл», які, маўляў, «кіпеў» стагодзьдзямі. Тым часам жадных *піджынаў* і *кайнэ*, нават у «кантактных зонах», ніхто й ніколі не фіксаваў. Насамрэч, я дапускаю актыўную піджынізацыю ў пару славянскае калянізацыіі тутэйшых земляў як адну з імаверных гіпотэзаў, але ўсё гэта адбывалася ў дапісьмовыя часы, бо тыя ўскосныя і беспасярэднія зьвесткі, якія даносяць да нас помнікі пісьменства, гавораць пра *ўстойлівасьць* беларускае мовы як сыстэмы ў дыяхраніі. Нават нечаканую ўстойлівасьць, зважаючы на неспрыяльныя экстралінгвістычныя чыньнікі. Гэта й ёсьць довад супраць «катла» ці «лябараторыі».

Калі сур'ёзна гаварыць пра канвэргентныя працэсы на тэрыторыі Беларусі, дык мала неадменна цьвердзіць «аўтахтоны», «субстрат» нібы «халва-халва» ды бяздумна

фіксаваць балтызмы. Трэба паставіць пытаньне: дзе мы маем справу з *субстратнай* канвэргенцыяй, а дзе з *кантактнай* і, адпаведна, дзе ўплывы глыбінныя (субстрат), а дзе паверхневыя (адстрат). Адылі, калі ўжо даўнімаць моўны хаўрус, дык нельга не зважаць на тое, што менавіта *сынтакс* пры дачыненьнях розных моваў асабліва паддаецца канвэргенцыі[12]. Я ўжо не гавару пра тое, што нельга вывучаць нашы балтызмы, маючы нейкае абстрактнае і прыблізнае ўяўленьне пра славянізмы. Калі спадары гавораць пра ўплыў царквы, дык яны мусяць усьведамляць, якая гэта была мова і дзе сьляды яе ўплыву. Калі гавораць пра іншыя славянізмы, дык, зноў жа, ня трэба сыпаць «боб з гарохам» у адно рэшата, не адрозьніваючы паўднёва-, усходне- і заходнеславянскія элемэнты, а таксама месца і час іх засваеньня (заўважу: пры ўсёй умоўнасьці падзелу славянскіх моў, іх маркеры далёка ня ўмоўныя).

А цяпер спусьцімся зь неба структураў на зямлю людзей. Балцкі чыньнік у разуменьні нашай гісторыі, само сабою, вялікі крок наперад. Каб яго разгарнуць, як слушна зазначыў А. Казакевіч, «быў патрэбны дастатковы археалягічны і лінгвістычны матэрыял, які зьявіўся толькі пасьля Другой сусьветнай вайны». Але, як заўжды бывае, і мы гэта можам: безь перабольшаньняў ды скрайнасьцяў ніколі не абходзіцца. «Балцкі рамантызм» можна было чакаць. Але адкуль такая «сьлепаглуханемата» што да беларускае мовы? Па-мойму, чыньнік таксама акурат дасьпеў, і менавіта за апошнія гады, абазначыць яго можна як *адчужэньне ад мовы* яе ж насьбітаў ці, шырэй, *атрафія традыцыі* (тое, што яна ідзе побач з *гіпэртрадыцыяналізмам* — ня дзіва, інакш і быць не маіў).

Можна зразумець, калі, прыкладам, літоўцы (ці расейцы, палякі), знаёмячыся з «Статутам», іншымі даўнейшымі тэкстамі, не пазнаюць беларускасьці іх мовы. Тут сытуацыя, такая, якую колькі гадоў таму апісаў у «Нашай Ніве» С. Шупа: землякі Кучмы, даючы інтэрвію, на пытаньні журналіста адказвалі па-беларуску, але пазнаць гэта мог толькі беларус. Бо ўкраінцы іх маўленьне маглі ўспрымаць як «украінскі дыялект», а расейцы ды іншыя і пагатоў мала адчуваюць розьніцу, дзе ўкраінскае, дзе беларускае. І калі спсп. Дзермант ды Санько «шыюць» мне грознае (бо вельмі ж навукаватае), але, як

[12] Дзіва, вялікі рыс. А могуць перасякаць другой межы, і прыцца гэта мовы роўны, даны на гады, насьбітаў ці, з розных сма'яў, як гэта відаць на прыкладзе сэрбскахарвацкае, грэцкае і альбанскае на Балканах і суседняе зь імі турэцкае мовы. (...) Нягледзячы

разабрацца, сумнеўнае ды мала зьмястоўнае вінаванне, што «рэпрэсіўнасьць інтэрпрэтуючай рэтраспэкцыі», дыкадбадкуаў на іх адрас іншым дыягназам у іхным стылі: «дыстрафічная рэцэпцыі інтэрпрэтатара». З грунту, яны вызнаюць «аўтахтанісцкую» тэорыю, але не распазнаюць беларускіх тэкстаў як «сваіх», таму ня маюць *алібі аўтахтонаў*.[13]

На жаль, усё больш і больш беларусаў засвойваюць беларускую мову з кніг і частакроць — у сталым веку. «Роднай» яна можа лічыцца толькі ў плашчыні *аксіялёгіі*, а не *псыхалёгіі*. А задамо сюды сусьветны чыньнік, глябальную ўрбанізацыю і, сумна. Цікава, што пры вытручэньні аўтэнтычнай сэмантыкі частакроць назіраеш, як вонкава лексычны пласт нават «багацее», становіцца больш арыгінальным. Але пурыстычныя інтэнцыі набываюць форму аплікацыяў у сфармаваным узросе: «адной мовы з двума тэрмінамі». Таму, калі мова беларускіх пісьменьнікаў XIX — пачатку XX стст. паказвала, адкуль тыя паходзілі, дык у сучасных паказвае, якія слоўнікі яны чытаюць (для такога аналізу асабліва цікавы ідыялект самога Сапкі (а таксама яго эвалюцыя), але баюся, у даным кантэксьце гэта зноў будзе эскаляцыяй «пераходу на асобы», бо маўленьне — адна з інтымнейшых рэчаў). Тут важна іншае: зразумець сацыяльную (ды псыхалягічную) прычыну тае «абэрацыі эроку».

Яшчэ адзін пабочны чыньнік, які мог спрычыніцца да зьяўленьня *балцкай утопіі*, чыста працоўны: доўга займаюцца балтызмамі, міжволі пачнеш перабольшваць іх ролю. У пазнаньні заўжды ёсьць небясьпека ці спакуса — гіпастазаваньне мэтаду. Цалкам апраўданы ды зразумелы *мэтадалягічны* атамізм (як і рэдукцыянізм) нярэдка набывае *анталягічны* статус. Тады й пачынаецца «гульня ў пацеркі».

А цяпер самы час разабраць контраргумэнты, выстаўленыя на мой адрас. Спсп. Санько і Дзермант пішуць:

Смаленскія граматы зь іх лексычнымі, сынтаксычнымі і фанэтычнымі асаблівасьцямі — гэта гістарычны факт. Але тое, што пісаны яны на смаленскай адмене старабеларускай мовы, якой у побыце паслугавалася большыня жыхароў Смаленскага краю, — гэта, дарэчы, вельмі праўдападобная, але інтэрпрэтацыя.

[13] Параўн.: «Мы заўжды мусім зьвяртацца да сьведамасьці індывіда, які гаворыць на дадзенай мове (...) і іншага жарала, апрача яго сьведамасьці, у нас наагул няма – таму для

на тое, адбадкуаў ўвага рудніх13 лексычных адзінак, Санфэльд паказаў, што яна пашыраецца таксама й на сынтаксычныя, марфалягічныя і фаналягічныя характарыстыкі» (Леман В. Н. Новое в индоевропеистичес исследованиях // Вопросы языкознания. 1991. № 4. С. 111). Гл. таксама: Нерознак В. П. Языковой союз // Лингвистический энциклопедический словарь. Москва, 1990. С. 617–618.

Цудоўна сказана! Толькі ўсё, здаецца, можна пачаць інтэрпрэтацыяй, а тым больш — самой інтэрпрэтацыяй. Ці варта?

Я нідзе не казаў, што тэта мена тая мова, якой *пасугавалі ся ў любце*». Я толькі назваў яе *беларускай*, «у ісьце», як сказалі б мае апанэнты. Давайце ж паспрабуем перапісаць па-сучаснаму той урывак з Клімента Смаляціча (ізноў Смаленск!), які я ўзяў за эпіграф. Думаю, ён застанецца царкоўнаславянскім, хоць ты лацінкай, хоць арабіцай яго перапісвай. Патрэбны пераклад, бо тэкст запраўды не беларускі, чаго ня скажаш аб грамаце.

А вось наколькі гэтая мова «канцылярская» — варта падумаць. Бо кадыфікаванай канцылярскай мовы тады, як я зазначаў, яшчэ не было. Зрэшты, ня буду такім прыдзірлівым, хай сабе й так. Тут, хутчэй за ўсё, мы маем справу зь першымі спробамі стварыць такую мову, але, на жаль, спсп. Дзермант і Санько (якія ўсё ведаюць!) маўчаць аб галоўным: што ж паслужыла матэрыялам да мовы граматы? Адкуль яна ўзялася? З паветра матэрыялізавалася? На жаль, іх тэорыя заняла ўсяго адзін сказ: «Роля адміністрацыйнага рэсурсу была прынцыповай» (роля ж царквы пачала патроху адпадаць: «Рэлігійны чыньнік наўрад ці даў бы назіраны вынік»). І яшчэ, я не разумею, навошта сп. Санько, слова ў слова, перапісвае аргумэнты аб балцкіх уплывах (з тымі самымі прыкладамі, тымі ж спасылкамі), якія ён тарнаваў у артыкуле за 1999 год і якія наагул (!) не датычаць цытаванага мною тэксту?[14]

Балцкіх каранёў «аканьня» ды пераходу *w* у *u* (хоць ёсць і іншыя вэрсіі) я не зьбіраюся адмаўляць[15]. Але марна спадзяваць спрабуюць атрымаць зыск з свайго (усё ж аднабаковага) зьясьненьня смаленскае граматы. Калі быць самакрытычным, дык найсумнеўней у маім цытаваньні выглядае «дзеепрыслоўе», ўсё ж рэч ня ў гэтым, аўтары забываюцца, што я рабіў не *транскрыпцыю*, а *адаптацыю*, таму, збольшага, гэта праблемы *тэксталёгіі*, а не *гістарычнае фаналёгіі*. Я ўжо ўспамінаў, што ня меншыя тэксталягічныя праблемы, зьвязаныя з тэорыяй ст. Магу нагадаць, як асабліва праблематычныя тэксты, «Пінскую шляхту» В. Дуніна-Марцінкевіча і вершы Ф. Савіча

[14] Гл. і Сасноўскі Т. Праблемы беларускай дыялектнай лексікаграфіі // Беларуская мова. 1999. Вып. 1. С. 103–109.

[15] Сумнеўны ня ўплыў субстрату, а тыя высновы, якія робяць

Тамбаўскі Пінаскі на ільняному полю...», напісаныя на адменах палескіх гаворак, якім, нібыта (?), не адмаўляюць у беларускасьці. Тут маім апанэнтам забракла, хутчэй за ўсё... звычайнага пачуцьця гумару.

У нас часам так «застаражытніваюць» бедныя тэксты, атачаюць такімі «табу», што тыя апынаюцца па той бок чалавечнасьці, нібыта ня людзі іх пісалі. Таму, ахвяруючы дэталямі, я спрабую аказаць цэлае. Гэты парадокс можна параўнаць з оптыкай імпрэсіянізму: чым пільней мы ўглядваемся ў тэкст, тым у большай ступені ад нас зьнікае сэнс. Зь нястачы машыны часу хіба што ідэальнае выйсьце — мена ракурсаў: арыгінал, аналіз, адаптацыя, пераклад і г. д.

Адзін зь першых аб «правох» беларускае мовы на яе ўласную даўніну загаварыў Ф. Багушэвіч:

Чытаў я ці мала старых папераў па дзьвесьце, па трыста гадоў таму пісаных у нашай зямлі і пісаных вялікімі панамі, а нашай мовай чысьцюсенькай, як бы вот цяпер пісалася.

Багушэвіч быў праўдзівым аўтахтонам, а таму й меў пачуцьцё «свайго». Зрэшты, нашы мовазнаўцы і І. Насовіч, і В. Ластоўскі, і інш., кожны па-свойму, з увагаю ставіліся да старабеларускіх тэкстаў. Але запраўды прарыў у паяднаньні «канцоў і пачаткаў» зрабіў Я. Станкевіч. Варта пагартаць яго «Беларуска-расійскі (вялікалітоўска-расійскі) слоўнік», каб у гэтым упэўніцца. Часамі, пры вывучэньні даўніны, беручы пад увагу мноства пераходных тэкстаў, перад лінгвістамі паўстае праблема дэмаркацыі беларускага і царкоўнаславянскага. Насамрэч, калі не зважаць на дэталі, гэтую праблему за нас разьвязалі ўжо даўно. Старабеларускія лексыконы вельмі дакладна паказваюць, дзе адзінкі беларускія, а дзе не. А адштурхоўваючыся ад гэтага, параўноўваючы розныя тэксты ды сучасныя гаворкі, можна аналізаваць далей. Смаленская грамата 1229 году каштоўная для нас тым, што ў ёй вельмі рана і нечакана поўна адбіліся жывыя гутарковыя элемэнты (прашу ня блытаць з моваю ў цэлым). Ужо той даўно ведамы факт, што пэрфэкт тут ужываецца бязь зьвязкі *быть*, вельмі пра многае кажа. Пазьней, пры кадыфікацыі літаратурнае мовы, адбываецца частковы рэгрэс у бок кніжнасьці. І толькі ў XVII

ст., у «Прамове Мялешкі», «Лісьце да Абуховіча» жывая гутарковая стыхія, як ніколі раней, *пачынае* адваёўваць свае правы.

Але, так ці гэтак, зьвязкі з жывой гутарковай стыхіяй ніколі не перарывалася. Той факт, што не існавала граматык «простае» мовы, таксама ўскосна сьведчыць аб блізкасьці мовы літаратурнае й мовы народнае. Рэч у тым, што граматыкі даўней пісалі як дапаможнікі для зразуменьня кніжных моваў. (Граматыка І. Ужэвіча пісалася ня тут і не для тутэйшых.)

І хоць пакуль што неразьвязаных пытаньняў паддастаткам, ужо сёньня можна рабіць верагодныя выракі аб арэальнай атрыбуцыі паасобных тэкстаў к. XVII — пач. XVIII стст. на падставе іх лексыкі. Пра гэта я маюся напісаць адумысна, а тут адно зьвярну ўвагу на некаторыя даўнейшыя лексычныя адзінкі, якія лучацца з сучаснымі гаворкамі і, наадварот, дыялектныя, якія сягаюць сівой даўніны. Пачну з тае самае смаленскае граматы.

УЗДУМАЦЬ. Сучасны узус гэтае слова тарнуе завужана і, часьцей за ўсё, з адмоўнай канатацыяй. У народным жа маўленьні яно мае безьліч адценьняў. Спатыкаецца яно ў К. Марашэўскага, М. Гарэцкага, а найраней — у грамаце 1229 г.: *Таго лета, калі Альбрахт, уладыка рыскі ўмёр — уздумаў князь смаленскі, Мсьціслаў Давыдаў сын, прыслаў у Рыгу сваёга луччага папа Ерамея і зь нім вумна мужа Панцялея із сваёга горада Смаленска.* Цікава, як бы пісар напісаў па-царкоўнаславянску? Пэўна што, *помыслилъ* ‘надумаўся’, ці *положилъ*, *вменилъ* ‘пастанавіў’. А па-расейску гэта гучала б — *решил*. Між іншым, апошняе, сваім парадкам, разьвілося з царкоўнаславянскага *ршить* ‘разьвязаць’, а ўжо пад уплывам яго ўзьнікла й беларуска-савецкае *вырашыць*. Пра гэта я пісал двойчы. Цяпер толькі зазначу: *думаць*, *уздумаць*, *надумаць* — адзінкі з таго ж самага сэмантычнага поля.

НАПЯРОД. Гэта яшчэ адзін прыклад, дзе ў смаленскага аўтара мы можам павучыцца беларускасьці. Помню, мяне як токам ударыла, калі я прачытаў: *Метаці жэрабі, каго напярод везьці ку Смаленску*. Запраўды, у нас на Лідчыне гаварылі *напярод*, *упярод*. Гэты тэкст актуалізаваў мой дзіцячы досьвед (у нейкім

сэнсе генную памяць) і… вельмі дапамог. Рэч у тым, што многія артыкулы РБС будаваліся ў свой час без картатэкі, няйначай, як на перакладзе рэмарак расейскіх тлумачальных слоўнікаў. І менавіта пад уплывам граматы (нават, я б сказаў, на яе матэрыяле) мне ўдалося ўкласьці артыкул да расейскага-беларускага слоўніка, які выглядае гэтак:

прежде 1. *нареч. (раньше)* упярод; 2. *нареч. (сначала)* напярод, перш; 3. *предл. уст. (до чего)* да *(чаго)*; *(перед чем)* перад *(чым)*; **~ отпуска** да адпачынку, перад адпачынкам; 4. *предл. (раньше)* раней, перш; **прийти ~ всех** прыйсьці раней (перш) за ўсіх; *< > ~* **всего** перадусім, насамперш, перш-наперш.

ДЗЯРЖАЦЬ. На першы пагляд гэтае слова можа падацца зусім не беларускім (*дзяржаці русі з лацінскім языком*). Аднак і тут ня ўсё проста. Некалі я надумаўся спраўдзіць у Я. Станкевіча, як будзе лепш: *атрымваць* ці *атрымоўваць*. Бо *атрымліваць*, як ведама, кепска — фармант *-ліва-* пры дзеясловах не ўжываецца. Я перагарнуў увесь слоўнік, але адзінак з гэтым коранем не знайшоў наагул. А пазьней выявілася, відаць, Станкевіч дзеяслоў *трымаць* уважаў за палянізм, таму ў слоўніку ў яго чытаем: *дзяржаць*, *адзержваць*, *дадзержаць*. У нас на Лідчыне ёсьць і *атрымваць* і *дзяржаць*. Відаць, абодва маюць права на існаваньне — ведама, калі іх разьмежаваць стылёва.

НАДАБЕ. Тут акурат тая адзінка, якую можна ўважаць арэальным маркерам «у зародку». На беларускім абшары ёсьць два канкурэнтныя прыслоўі: *надабе* і *трэба*. Калі першае характэрнае для паўночна-ўсходняга арэалу, дык другое — найболей для паўднёва-заходняга. Першае прыслоўе тарнавалася ў вельмі раньніх беларускіх тэкстах, той жа смаленскай грамаце: *Аже лацінскі госьць б'ецца міжы сабою ў рускай зямлі, люба мечам а люба дзеравам, — князю то ня надабе міжы сабою судзіці;* у Судзебніку Казімера Ягайлавіча: *А над злодзеем міласьці ня надабе*; дык другое — стала нормаю сучаснае літаратурнае мовы. Тое, што *надабе* трывае толькі ў пэўных дыялектах, таксама ня мала нам кажа. Пакуль існуе сыстэма — захоўваюцца яе маркеры.

ВЕК: ДА ВЕКУ. А таксама: *да канца веку*; *зь вякоў*; *на вяку*; *на схіле веку*; *па век*; *у веку*; *у квеце веку*; *цэлы век*. Устойлівыя

спалучэньні з кампанэнтам *век* у беларускай мове досыць пашыраныя, некаторыя зь іх перабылі шмат стагодзьдзяў, некаторыя — маладзейшыя, але асаблівую загадку становіць выслоўе *да веку*, якое ўсплывае перш у 1229 г: *Пра сей мір трудзіліся добрыя людзі: Ральф із Кашэля дваранін, Тумаш-смалянін, аж-бы мір быў — і да века.* А потым… у У. Караткевіча *«На Беларусі Бог жыве», — // І няхай да веку жыве*. Можна сказаць, дзей Караткевіч як пісьменьнік-гісторык узяў яго з граматы, і годзе. Але гэта не здымае праблемы, бо нешта падобнае знаходзім у Ф. Багушэвіча: *Хоць бы не зьнямець мне і да канца веку!* Вельмі цікавая апазыцыя ёсьць у А. Гурыновіча: *Мужык слухаў яго // Ад веку да веку, // І дажыўся таго, // Што папаў ў апеку.* Я. Станкевіч, спасылаючыся на М. Гарэцкага, піша ў сваім слоўніку гэты выраз як адно слова: давеку. І, урэшце, у слоўніку Ластоўскага, на старонцы 88, знаходзім: *Еж напаўсытна, пі напаўп'яна, пражывеш давеку.* Дык можа *да веку* аж з тае пары бытуе на Аршаншчыне? Прынамсі, яго структура цалком беларуская, параўнайма: *дадушы*, *дапраўды*, *дазваньня* і г. д.

Можна яшчэ шмат цікавага заўважыць у смаленскай грамаце, як, прыкладам, *наўсьпяць* (параўн. *наўсьлед*, *наўкол*, *наўза* ‘соты’), *колы* (параўн.: *калёсы* ‘воз’), але пяройдзем да іншых прыкладаў…

ЗА*Е*СЬЦІ. У «Баркалабаўскай хроніцы» ёсьць такі сказ: *Жарабя воўк заеў.* Дзеяслоў тут ужываецца з тым рэдкім народным адценьнем *заесьці* ‘загрызьці да сьмерці’, зь якім яго й цяпер сустрэнеш на Лідчыне, кажуць: *Дальбог, заядуць камары!* Гэта ня кніжнае слова і не абстрактнае «славянскае», а тутэйшае, беларускае.

ТАКР*О*К. У лідзкіх гаворках склалася рэдкае словаўтваральнае гняздо: *такрок* ‘летась’, *такрошні* ‘леташні’, *паз**а**такрак* ‘пазалетась’, *паз**а**такрашні* ‘пазалеташні’. А ў «Баркалабаўскай хроніцы» знаходзім да яго «этымалягічны матэрыял»: *Бо тот рок вары мала было, толька грыбы: леднікі, апенькі елі.* Зрэшты, такі самы прыметнік існаваў ужо ў 1600 г. у запісах Менскага гродзкага суду: *Статку дзей у яго было: конь адзін, карова адна, падцёлак такрочны*. Ня ведаю, ці ёсьць тут якія адпаведнікі ў

польскай мове, але няма сумневу: данае гняздо разьвілося на тутэйшым грунце.

КУБАРКА. Гэтае слова на роднай Лідчыне я чуў зь дзяцінства, прыкладам: *Вазьмі кубарку з пад канэрэву*. Таму і ўжыў яго ў вершы: *Мой час, павы жардзіна плоту, доўгі, // зялёны — сасьпяшчэй час гультаіства // ружавую кубарку пафутболіш.* Якое ж было маё зьдзіўленьне, калі ў слоўніках «старажытнарускае» мовы мне пачало трапляцца на вочы *кубара*. Выявілася, што паходзіць яно ад грэцкага *κυβάρα* пасудзіна, карабель[16]. Самае цікавае, што славяне назычылі гэтае слова не назвы зах ст., яшчэ да занятаду насавых галосных, відаць, грэцкую лексэму яны вымаўлялі як *kubara*, а пасьля пераходу *[q]* у *[u]* ўжо пераняўшыся як *kubara*. У сваім канчальным выглядзе слова мае тое агучваньне, якое прынята называць «усходнеславянскім». Дык якім жа ветрам яго занесла на Лідчыну? Дарэчы, слова вельмі патрэбнае! Некалі падобнага забракла Алесю Аркушу, дык ён прыдумаў уласнае — *кансэроўка* — і таксама ўжыў у вершы: *У кансэроўцы зварухнулася траска*, пра што расказваў мне ў 1988 г. на Іслачы.

ЗНАК: *ані знаку*; *даць знак*; *давацца ў знакі*; *для непазнаку*; *знакам тым*; *мець знак*; *няма знаку*; *не засталося знаку*; *толькі знак*. Пэўна што, гэта ня ўсе беларускія ідыёмы, дзе ёсьць кампанэнт *знак*, але й таго паддастаткам, каб пераканацца ў сыстэмнасьці данага сэгмэнту мовы. А дзеля прыкладу я прытачу яшчэ колькі кантэкстаў, найбольш багатых на жыцьцёвыя рэаліі і, мусова, за розныя стагодзьдзі: *Макі, гарохі, бабы, проса, рэпа — то ўсё згола пагінула. А каторыя малацілі яр, зерня — толькі знак. А калі зьмелець, сьпячэць, — то ў печы сьпячэцца, а з лапаты ў печ ня зложыць. Зь печы аж апалонікам выбярэць. Такжа і жыта вельмі было неўмалотна. А калі муку жытнюю ў хлебе сьпякуць, то цеста печанае салодка, а за скарыну хаця ложкі кладзі, а ў печы не пячэцца* («Баркалаб. хр.»). *Глянуць на нас [апенек], сьмеху варта, камель, як лазіна і шапка, — зжалься Божа, — толькі знак той! — А ў яго [баравіка] галава з салятырку і нага, як выварацень* (У. Галубок). *Андрэй Аўсянік паказваў перада мною, возным, і стараною шляхтаю ручніцу пташую ўсю аббіту, ложа пашчапана ў штукі, а замку*

16 Гл.: Якубинский Л. П. История древнерусского языка. Москва, 1953. С. 335.

17 Цыт. паводле: Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведнік. — Мінск, 1989; Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. — Мінск, 2002.

18 Трофимович Т. Старорусская и старобелорусская деловая письменность в истории русско-белорусских языковых контактов // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае моваznаўства і літаратуразнаўства: Зборнік матэрыялаў канферэнцыі. Ч. 3. Віцебск, 1997. С. 469–472.

знаку не было, адна рура застала (Акты 1603 г.). *Ужо добра вечарэла — сонца ані знаку; над зямлёй плыў блеск, як скурка пячонага раку* (А. Паўловіч).

Смакуйце, спадарове, водар жывой мовы — не абстрактнай «балцкай» і не «славянскай», а *беларускай*, «сваёй уласнай», як пісалася ў Статуце, і якая ўжо не адно стагодзьдзе мае «свой твар», г. зн. — сыстэму. Дый што тут казаць! Тут ледзь ня ў кожнай фразе я чую свае, лідзкія словы: *злажыць* ‘пакласьці’, *пашчапаны*, *абабіты*… Сама цікава, што існавала гэта ўсё праз цэлыя стагодзьдзі, а ў наш час — занікае. Чаму б гэта? Ці не таму, што толькі ў наш час пайшла эрозія сыстэмы мовы?

Старабеларуская мова часамі падкідвае загадкі, якіх найлепшыя знаўцы не даюць рады разьвязаць, але… яна іх разьвязвае сама. Дзеля прыкладу параўнаем невялікія ўрыўкі з Статуту 1588 г.

Арыгінал:

А бортнікам вольна на лезіва лык альбо луб’я на лазьбень і на іншыя патрэбы, што бортнікам на патрэбы іх бортніцкія прыслухаець, тыле, іле ім патрэба будзець, узяці што можаць на сабе занесьці, а ня возам вывезьці (Разьдз. X; арт. 3).

Пераклад:

А бортнікам дазваляецца драць лыка на свае рабочыя прылады і на іншыя патрэбы, якія спатрэбяцца бортнікам, столькі, колькі ім будзе трэба і колькі на сабе можа вынесьці, а ня возам вывезьці[17].

Наколькі блякла выглядае пераклад супраць арыгіналу! Але рэч ня ў гэтым. Некалі Я. Станкевіч гэты сказ улучыў у свой слоўнік дзеля слоў *лазьбень* і *лезіва*, якія зусім праігнараваў сучасны перакладнік. Станкевіч патлумачыў, што *лазьбень* — гэта «кораб да зьбіраньні мёду», а насупраць слова *лезіва* паставіў пытальнік. І ўсё ж зьясьненьне гэтага загадкавага тэрміну мы знойдзем у «Тураўскім слоўніку»: *лезіва* ‘пад’ёмнае прыстасаваньне для пчаляроў’ (*лезіво — така дошчэчка з дзіркамі і вороўка доўга, кіне ее за сук, вороўку цягне і сам себе*

цягне) — можна сказаць, бортніцкі «ліфт».

А калі мы паспрабуем параўнаць паасобныя адзінкі арыгіналу і перакладу, дык сучасная мова зноў выглядацьме несамавіта, добрыя беларускія словы заступаюць расеянізмы: *шпег — лазутчык*; *вож — праваднік*; *шкода дзеецца — наносяць шкоду*; таўталёгіі: *непатрэбны і паражнуючы — непатрэбны і бескарысны*; *паслуга і пажытак — карысьць і прыбытак*; недакладнасьці: *чыніць паслугу — прыносіць карысьць*; *уставуем — устанаўліваем*; шматслоўе: *злое — дрэнная справа* і г. д. Нават архаічныя адзінкі замяняюцца такімі няўдалымі расеянізмамі: *іж — паколькі*; *суць — зьяўляюцца*, што ці ня лепей ужо пакінуць, як ёсьць? Затое палянізмы застаюцца нечапанымі: *панства*, *непрыяцельскі*, *належачы*. Ведама, вінаватая ня мова, а перакладнікі.

Тое, што асноўныя рысы беларускае мовы ў XVI ст. былі сфармаваныя, паказвае пераклад некаторых беларускіх праўніцкіх тэрмінаў у расейскім «Саборным улажэньні 1649 г.», прыкладам: *красьць — воровать*, *зладзейства — воровство*, *абмовіць — оговорить*, *забойства — убийство*, *словы сарамоціць — обесчестить словом*, *а горла прыправіць — смерти предать*, *на горла сказаць — приговорить к смертной казни*[18].

ПЭЙЗАЖ ЗЬ БЯРЭЗЬНІКАМ

Спсп. Дзермант і Санько ў якасьці балцкіх мясьцінаў успомнілі Эйшышкі Лідзкага павету 1529 г., а ў якасьці сучасных балцкіх анкляваў — Пелясу ды Радунь прыкладна таго самага рэгіёну. Дык жа маё дзяцінства й прайшло ў тых краёх. Заўжды, пакуль я стаяў у Лідзе на прыпынку і чакаў яўсевіцкага аўтобуса, мне мазоліў вочы аўтобус «Ліда—Пеляса». А неўзабаве прыходзіў наш і — вёз мяне ў бок Радуні, праз Крупава, дзе заварочваў на Яўсевічы. Але я сходзіў раней, на прыпынку «Запольле», і шыбаваў у свае Дамэйкі — насамрэч ад прыпынку да Запольля далей як да Дамэек. (Назоў *Эйшышкі* я таксама помню з маленства — ці там нехта паходзіў «з-пад Эйшышак»... ці нехта туды паехаў... ці яшчэ нешта...)

Калі выйсьці зь дзедавай хаты на падворак, дык тварам

упрэсься ў лес. Далёка на ўсходзе, за бароўскім лесам (у Бароўцы быў маёнтак цешчы польскага маршала Рыдз-Сьміглага) разьмясьцілася Ліда. У летнія туманныя ранкі чуваць, як далёка, наўзбоч Ліды, у Гудах, гудуць цягнікі (тады, малым, я ня ведаў, што «гудамі» беларусаў называлі літоўцы і выводзіў найменьне ад дзеяслова *гудзець*). Недзе справа ад мяне ў паўднёвым кірунку ляжыць вёска Хрулі, за імі — Бельскія, Дайнавб. Крыху на паўднёвы захад — Запольле, якое некалі трымалі сваякі Ігната Дамэйкі. Ззаду за дзедаваю хатаю на поўдзень — Рапэйкі, Янцавічы, Казічы і, нарэшце, бабуліна радзіма — Яўсевічы, за імі яшчэ — Мальгі. У бок на паўночны захад — Крупава, дзе мой прадзед ставіў касьцёл. Недзе ў тым кірунку былі маёнткі, панішчаныя саветамі: Баяршчына, Сукурчы. У Сукурчах, дзед казаў, адзін з будынкаў быў вельмі стары, на бэльцы там нібыта прачыталі дату XVI ст. А за Крупавам, калі крыху пад'ехаць, зараз будзе й Радунь.

Запраўды ў нашых мясцінах, туды пад Радунь ці каля Яўсевічаў, жывуць літоўцы, іх мясцовыя жыхары называюць *барцякі*. Праўда, найменьне гэтае з адмоўнай канатацыяй, накшталт *кацапы, хахлы*. Тутэйшыя, да якіх належаць і мае найбліжэйшыя сваякі, адрозьніваюць сябе ад барцякоў, яны больш схіляюцца да польскасьці, але гавораць, як самыя прызнаюцца, *папросту*. Мая прабаба нябожчыца Юзэфа, якая паходзіла зь Яўсевіч, расказвала: «Бывала, як выйдуць касіць, па адзін бок Дзітвы нашы, а па другі — барцякі. Нашы хлопцы кашулі ў порткі ўдзявалі, а барцякі зьверху падпяразвалі. Таму барцяка адразу пазнаеш». А баба Марыя, калі ганіла чый густ, казала: «Адзелася, як барцянка!» Лічылася, што барцянкі апранаюцца ярка і безгустоўна. Барцяком не адмаўлялі ў заможнасьці, працавітасьці, яны трымалі шмат скаціны, птушак, але казалі, дзей у барцякоў брудна ў хаце, што яны могуць у хаце трымаць скаціну, курэй. Нашы таксама бралі жыўнасьць у хату, але толькі ў вялікія маразы.

Шлюбы паміж нашым бокам і барцякамі былі ня частыя, але звыклыя. Казалі: «За барцяка пайшла». Або: «Барцянку ўзяў». У нас у Дамэйках жыла адна барцянка, з-пад Радуні, і адзін барцяк. Барцянка была замужам за дзедавым хросным сынам, кожны дзень прыходзіла да нас па ваду і называла дзеда

«крышчоны». Барцяк жыў на другім канцы вёскі, меў кепскі характар, і часам я чуў ад бабулі: «От бэрць халерны!» Яшчэ трэба заўважыць, што паміж барцякамі і рэштаю тутэйшага насельніцтва зусім няма рэлігійных адрозьненьняў. У нашых ваколіцах карэнных праваслаўных няма наагул. Была адна, зь іншага боку Лідчыны, дык яе (бо не каталічка) называлі «саветкаю». А калі мая маці выйшла замуж за бацьку, які паходзіў з Касьцюковіцкага раёну, тады ўсе казалі: «Пайшла за кацапа».

Спадзяюся, тут зразумелая дэскрыпцыйная дыстанцыя (хоць ад маіх апанэнтаў можна чакаць якіх заўгодна «псыхааналізаў»). Аб'ект я апісваю зь сярэдзіны калектыву і — толькі з «польскага» боку, убачыць яго з «барцяцкага» ў мяне няма змогі. Дарэчы, мясцовае насельніцтва гэткае «патайное», што звонку сягнуць углыб «мэнтальнасьці» бадай што немажліва. Існуе пэўная «герархія даверу», якую можна апісаць паступенна: 1) «палякі»; 2) католікі («палякі» і «барцякі»); 3) тутэйшыя (у купе з праваслаўнымі); 4) чужыя («саветы», «немцы» і г. д.). Раман расейскага пісьменьніка Багамолава «Момант праўды», паводле якога зьняты ведамы фільм «У жніўні 1944», досыць дакладна апісвае сытуацыю на Лідчыне, але... вачыма «савета», які лучае ў нецікавае становішча.

Заразом самаідэнтыфікацыя («паляк», «літовец», «беларус» і пад.) моцна залежыць ад асьветы. Дарэчы, між «барцякоў» самаазначэньне «палякі» досыць частае, праўда, цяпер, можна меркаваць, усё больш пашыраюцца брэнды «беларусаў» ды «літоўцаў». Ад самаідэнтыфікацыі не залежаць сымпатыі. У цэлым, яны паўтараюць тую самую герархію даверу. Але ёсьць і індывідуальныя адрозьненьні. Прабаба Юзэфа, уважаючы сябе за «палячку», этнічных палякаў, «варшавякаў», не любіла, бо польскія жаўнеры спрабавалі ўлезьці ў яе хату, пазьбівалі замкі, але не адолелі хітрай сялянскай «збвалкі». Затое, падвучыўшы яшчэ ў Першую сусьветную вайну нямецкую мову, цудоўна ладзіла зь немцамі. Дзед Браніслаў недалюбліваў этнічных літоўцаў зь Літвы, вінаваціў іх у слугаваньні як немцам, так і саветам. А да савецкіх салдат, хоць яны ў яго й стралялі, ставіўся спакойна, хваліў: галодныя, але падзеляцца апошнім. Баба Марыя была зацятая, «закалёная», як у нас

казалі, палянафілка, а «савет» у яе гучала як лаянка, дый ня дзіва, энкавэдысты адбілі прадзеду Баляславу лёгкія, дапытваліся пра АК.

Запраўды сярод барцякоў з кожным пакаленьнем станавілася ўсё больш беларускамоўных. Але беларусізацыя адбывалася ў форме «змаганьня моваў» — жаднае піджынізацыі ані духу не было. Так, казалі, быццам барцякі, гаворачы папросту, «расьцягвалі словы», ня ведаю, не заўважаў. Затое гаворку Яўсевічаў нельга не пазнаць, яна вельмі мэлядычная, можа, тыя ж акут і цыркумфлекс тут можна адшукаць? Ня ведаю... Тым часам у Далекіх (адкуль паходзіла прабаба па дзеду) гавораць *вуўк* ‘воўк’, *дуў* ‘даў’ (тое, што нагадваюць апанэнты). Гэта рэчы ў дыялекталёгіі даўно ведамыя, на жаль, мала вывучаныя. Думаю, ставіць пытаньне толькі ў адной плашчыні — «славянізацыя балтаў» — не зусім рацыянальна, нават з увагі на разнаякаснасьць зьяваў, назіраных у розных вёсках. Чаму б не задумацца над тым, што «славянізаваныя балты» і «збалтызаваныя славяне» могуць суіснаваць і праяўляцца па-рознаму — тыя ж «гуды», «дайнава»? Разьвязваньнем прыватных пытаньняў, а не шуканьнем «істы» розьніцца, паводле К. Попэра, мэтадалягічны наміналізм ад эсэнцыялізму.

На жаль, у мяне складваецца ўражаньне, што мае апанэнты досыць абстрактна ўяўляюць моўную сытуацыю, калі пішуць пра насельнікаў кантактных зонаў: «зьбеларусізаваліся або спалячыліся канчаткова», а таксама — «тут чыньнік каталізацыі ўжо ня можа быць недаацэнены». Практычна, тут ніхто й нідзе не спалячваўся ў моўным пляне, можна гаварыць толькі пра культурнае спалячваньне. У тых жа Яўсевічах яшчэ да рэвалюцыі існавала падпольная польская школа, у якую хадзіла мая прабаба (школу нават спрабавалі разганяць казакі), але людзі як гаварылі «папросту», так і працягвалі гаварыць. Таксама падобна, што мае апанэнты не разьмяжоўваюць паняткаў *дыглясія* і *білінгвізм*, бо ўжываюць іх па чарзе як сынонімы. Калі ж падыходзіць распадзельна, дык тут можна гаварыць пра *беларуска-літоўскі* білінгвізм і, толькі з пэўным вараваньнем, пра *польска-беларускую* ды *польска-літоўскую* дыглясію.

Дзеля ясьнейшага апісаньня сацыялінгвістычнае сытуацыі ў даным рэгіёне хацеў бы прытачыць адзін аўтэнтычны маналёг, які я запісаў у 1989 г. у вёсцы Яўсевічы ад Галены Рамэйкі (будучы студэнтам, я яго транскрыбаваў як матэрыял курсавой працы):

Некалі жылі ў хатах старых... Велькія дружыны былі! А мы некалі — малыя. Гулялі... А ўжо ўвечары — седзімо. Лучына паліцца. Такі велькі сярод хаты павешаны...

А дзед усё верацёньне тачыў, прасьнічку павесіўшы. Сьнегу наверне многа. Гурбы велькія. А дзед нам кажа:

Гэта, дзеткі, на ігрышча йдуць маладыя...

А як цяплом, вясною... Пагонім пасьвіць каровы. Цёпла. Кветкі цьвітуць. Пташкі сьпяваюць... Зараз воўк і зашалахціць, калі гэтта! Тут ужо хочуць аблову рабіць — на воўка! Яны, гавечкі, зьляталіся... А бывала — і ўхопіць каторую...

Вечаркі былі... Ужо як папрыходзяць... З калаўродкамі!.. У танцы кінуцца! А цяпер... Усё пуста. Нічога няма!

Едуць цераз гуліцу тут задзіцьвяне... А дзед прасьнічку такую зрабіў. Кажа:

— От, глянь! Гэта ж барцяк згубіў!

А мне ўжо ўцехі было!..

Аднаго ж разу, як украўся воўк у гэтую... У хлеў. Былі гавечкі. А ён хвост усунуў — як зашавяліў! — яны ў кучу зьбіліся...

І тэраз бывае такое — улез... гавечкі пабіў...

Таксама зь вялікім задавальненьнем зьвярну ўвагу на некаторыя балтызмы, якія шырока бытуюць у беларускіх гаворках Лідзкага раёну.

ТОШЧЫ. Нядаўна Э. Мазько нагадаў мне даўную спрэчку: «А ты

меў рацыю!» Выявілася, гадоў дзесяць таму я спрачаўся з сваім навуковым кіраўніком А. М. Пяткевічам і даводзіў, дзей слова *тошчы*, якое сустракаецца на Лідчыне, аўтэнтычнае. А. М. запярэчваў, маўляў, гэта русізм. Я не пагаджаўся: «Які русізм! Яно такое арганічнае, што й думкі такой нельга дапусьціць. Наагул, у нас у асноўным толькі палянізмы ёсьць». А. М. настойваў: «Значыць, зь бежанства беларусы прынесьлі!» «Ды не было ў нас бежанства!» Так мы й не дайшлі да праўды. І, нарэшце, высьветлілася, беларускае *тошчы* мае літоўскі адпаведнік: *tuрuias* ‘пусты’. У нас гавораць: *Дай мне тошчы ворак. Гляджу, а ў збане зусім тошча.* Менавіта сэмантыка сыгналізуе: гэта не расейскае слова, што відаць, калі прытачыць антонімы: бел. *тошчы — поўны*, рас. *тощий — толстый, полный*. У расейскай мове яно захавалася толькі ў пераносным сэнсе, у нас, наадварот, у скразным — пра худога чалавека нельга сказаць «тошчы». Цікава тут успомніць паралелі з стараславянскае: *тъщетьнъ* ‘марны’, *тъщета* ‘шкода, уйма’, а таксама артыкулы старабеларускіх лексыконаў: *тщание — спешение*; *тщетно — порожне*; *тщуся — спешуся.*

КАЛБАЦІЦЬ. У Дамэйках часта гавораць: *Памалу, сьмятану скалбоціш. От, трохі закалбаціла, і ўжо гатова. Перакалбаціла і выліла. А гэта яйко калбатун.* Відаць, усе даныя словы сягаюць літоўскага *kalbлti* ‘гаварыць’, параўнайма расейскія сэмантычныя адпавенікі *болтать* 1) ‘балбатаць’; 2) ‘трэсьці’. Мушу зацеміць, што словы *калбаціць* ‘моцна трэсьці’ і *боўтаць* ‘павольна перамешваць, гойдаць’, а таксама *балбатаць* ‘няўцямна гаварыць’ маюць адрозную сэмантыку і таму суіснуюць паралельна. Думаю, і ў літаратурнай мове кожнае зь іх спатрэбілася б.

НЕРАПА. У слоўніку Т. Сьцяшковіч і, адпаведна, у этымалягічным гэтае слова падаецца як *нярэпа* ‘ненаеда’ ад літоўскага *плтера*, у Дамэйках яно мае іншы націск — *нерапа*. Гавораць: *От гэты хлопец некі нерапа!* З улікам таго, што ў сучаснай беларускай мове кепска ўладкаваныя адпаведнікі да расейскага *обжора*, я наважыўся зьмясьціць дадзеную лексэму ў слоўніку, над якім колькі часу працую:

обжора *м., ж. разг.* жарло *м., ж.*; *обл. гродн.* нерапа *м., ж.*, *мог.* мярло *м., ж.*

І ўсё ж, як бы ні вабілі балтызмы, славянізмы на Лідчыне маюць, відаць, працяглую традыцыю. Калі глянуць цьвяроза і разважыць тым жа здаровым розумам, дык з XVI ст. моўная сытуацыя памянялася менш, чым падаецца на першы пагляд. Як жылі пад Эйшышкамі літоўцы (ці карэктней балты?), так і жывуць, можа, паменшала балтамоўных ды, адпаведна, пабольшала славянамоўных. А тое, што апошнія былі таксама — мае апанэнты падказваюць цытатаю зь іхнага ж прыкладу.

БЯРЭЗЬНІК. Што такое бярэзьнік, я ведаў яшчэ ад малых гадоў. Бярэзьнік — бярозавы гай. Ён пачынаўся адразу за кухонным акном. Улетку кожную раніцу я зьбіраў грыбы ў бярэзьніку і чуў словы: *Ідзі, глянь, можа, у бярэзьніку грыбоў нарасло.* Або: *Во тут, у бярэзьніку!* І таму вельмі прыемна было ў цытаце за 1529 г., ды яшчэ той, якая дачыняецца блізкага мне рэгіёну, прачытаць: *Он мі ўказаў сьведкаў у бярэзьніку*. Ці ня з вуснаў таго Пётры Сумарока слова заляцела ў ліст дэцкага? Бо занадта яно спэцыфічнае, каб быць простым складнікам нейкае абстрактнае канцылярскае мовы. А калі так, выходзіць, за колькі стагодзьдзяў калі што й памянялася тут, дык больш колькасна, ніж якасна? Быў і тады беларускамоўны люд у Лідзкім павеце.

Дык якая тут «пэрманэнтная рэвалюцыя»? Ніякай!

Стагодзьдзямі змагаліся дзьве мовы, суіснавалі дзьве сфармаваныя сыстэмы.

Мне падаецца — з стагодзьдзяў (ці) Дня бела-рускіх балтызмаў — сёньняшняя беларуская мова, у іх вельмі падарнага ў XIV стагодзьдзі, а дзеля ідзя абстрактнай эфэрыі можа адносіцца, — беларускай мовы, ці яна была ейбуд збалацкую дыялектыкі іншае, а дзеля фактаў яна ўсім ніжнім, і ўплывамі і таму не б. Што за тут маем? У беларускай мове. Новая беларуская мова сабу (абазначэньне частак цела, зьяваў народны жывёлаўцы) (Март.) — ў [В.] Канцэлярскім, 2) рай калянскае культурнае крыты і [Ім. Бацькі] і 3) Парэалі. Ды ў Гацьвіка — маі Мартынов (В. Вялікі), абстракцыі, трэмінны Кармоны (германізмы за славянізмы) Карыстаючыся

19 Параўн.: «Што да дыялектаў, то яны былі амаль такія ж, як у XIX–XX стагодзьдзях. Але мы ня маем непасрэдных крыніц, зь якіх можна было б даведацца пра ўсходнеславянскія дыялекты Мне падаецца — з стагодзьдзяў (ці) Дня беларускіх балтызмаў — сёньняшняя беларуская мова, у іх вельмі падарнага ў XIV стагодзьдзі, а дзеля ідзя абстрактнай эфэрыі можа адносіцца, — беларускай мовы, ці яна была ейбуд збалацкую дыялектыкі іншае, а дзеля фактаў яна ўсім ніжнім, і ўплывамі і таму не б. Што за тут маем? У беларускай мове. Новая беларуская мова сабу (абазначэньне частак цела, зьяваў народны жывёлаўцы) (Март.) — ў [В.] Канцэлярскім, 2) рай калянскае культурнае крыты і [Ім. Бацькі] і 3) Парэалі. Ды ў Гацьвіка — маі Мартынов (В. Вялікі), абстракцыі, трэмінны Кармоны (германізмы за славянізмы) Карыстаючыся

Цікава, што ў Ф. Шанскага, В. Матрынчыка і шматлікіх іншых
моўных краязнаўцаў зрэдку, але ўсё ж сустракаюцца
беларускамоўныя назвы кшталту *Тамкавічы*, *Сорава*, *Радзівыя кругі* на дрэвах,
Чаплінскі бераг і *Чаплінскі мост* (Ермаловіч, 1994: 373–385).

[20] Хаця б таму, што ў Ермаловіча, як і ў Шанскага, Матрынчыка і
іншых, адсутнічае дыскрэтнасць.

Усё гэта пацвярджае тое, што беларуская мова развілася на
грунце праславянскага дыялекту[19]. На нейкім этапе яна
ўвайшла ў цесны кантакт з балцкімі гаворкамі.
Міграцыянісцкая мадэль этнагенэзу беларусаў такой,
пільнуючы мноія сур'ёзныя навуковцы, дзякуй добра
кладзецца на дадзеную схему. Відаць, славяне-каланізаўцы
балцкія абшары расселіліся ў балцкім асяродку так, што
славянскія выспачкі перамяжаліся і доўга суіснавалі з балцкімі,
пакуль славяне дарэшты не засмілявалі тубыльцаў. Шмат
радзейшыя калёніі славянаў былі ў паўночна-заходняй частцы
Беларусі, таму й асыміляцыя там ішла куды павальней. У гэтую
схему можна ўносіць шмат удакладненьняў, але я ня бачу
падставаў для яе перагляду і для элімінацыі славянскага
чыньніку з этнагенэзу беларусаў[20].

Я крытыкаваў і крытыкую тэорыю «аўтахтанізму» з гледзішча
глётагенэзу. Таму хацеў бы атрымаць адказ на пытаньні,
зьвязаныя менавіта з гэтаю праблемаю:

1. Адкуль «выхадцы з Скандынавіі» несьлі славянскі элемэнт?

2. Чаму яны самыя былі «славізаваныя», а не «германізаваныя»?

3. Што ў мове паказвае на сьвецкі ўплыў, а што на царкоўны?

4. Як «славізаваліся» іншыя «рускія» землі?

5. Які наагул быў мэханізм «славізацыі»?

Сумняюся, каб на гэтыя пытаньні тэорыя «мела» рацыянальны
адказ, а калі я яго запраўды пачую, дык мушу прызнаць, што
ідэя балцкага аўтахтанізму мае пад сабою грунт, а ня голую
фантазію.

Ня ведаю, што скажуць гісторыкі, але як па-дзеля мяне, дык

тэорыя была б утрая больш пераканаўчай, каб мае апанэнты не рабілі на падставе яе такіх фантастычных глётагенэтычных высноваў.

ДЗЕ НАРА ЛІСІЦЫ?

Вось дапісваю сваё запярэчаньне, а пачуцьцё вельмі прыкрае. Тэкст мае першае рэплікі быў менш зьмястоўны, але, далібог, цалком памяркоўны. У мяне не было мэты «зьнішчыць» (і тым больш не было жаданьня сабе «дурыць галаву» разборамі). Хацелася ўбачыць, як спадары разгорнуць «экзатычную» тэорыю шырэй. А выявілася — разгортваць няма чаго? Ці я памыляюся? Цяпер, мушу прызнацца, тон адказу перадаўся і мне, як я ні супраціўляюся — не магу пахваліцца памяркоўнасьцю допісу. Фактычна, гэта крок назад у пляне культуры дыскусіі. Не разумею, навошта замест таго, каб гаварыць аб справе, выкарыстоўваецца гэтая дымавая завеса, якая падаецца як навука, апэлюе да філязофіі, а насамрэч ёсьць чыстай рыторыкай? Мяне зусім ня вабіць аналіз казуістыкі ды сафістыкі, якім я мусіў займацца. Што ж... *Лісіца заўжды стараецца адвесьці лаўца ад нары!*

Шкада, што сама ідэя балцкіх каранёў беларусаў набывае тупіковы і бяссэнсавы ракурс. Праблема не аналізуецца — проста любой цаной даводзіцца «балцкая іста». У маіх апанэнтаў ёсьць жаданьне прапагандаваць уласную тэорыю, але не відаць імкненьня разьвіваць выказаныя ў ёй тэзы. Дык ці варта спрачацца, калі спсп. Дзерманта і Санька не цікавяць праблемы? Дарэчы, мяне зачапіў адзін момант: чамусьці аўтары з гонарам назвалі «крыніцамі» тое, што звычайна называецца «дасьледаваньнямі». Гэта выпадковая абмова? Яны ня ведаюць, што такое крыніца? Ці стыль мысьленьня — падагнаць разьвязаньне пад загадзя ведамы адказ?

І ўсё ж... Калі заўтра нейкі *славянскі ўтапіст* пачне адмаўляць балцкі субстрат, я зь ім буду спрачацца з такой самай палкасьцю, як сёньня спрачаюся з *балцкімі ўтапістамі*. Скрайнія пазыцыі вельмі прадукцыйныя ў чыстай тэорыі, а ў пазнаньні эмпірыкі яны мала што даюць. Чым ламаць дзіды над тым, што пакуль цяжка спраўдзіць, ці ня лепей было б супольна

зьезьдзіць дасьледаваць балцкія мясьціны?

А спрачацца?.. Няма жаданьня! Асабліва пра дэканструкцыю. Лепш пачуць новых людзей...

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/07/12**
[image]

АРКАДЗЬ ЦЕПЛЯКОЎ нарадзіўся ў 1972 годзе ў Жагані (Польшча). Выпускнік Кракаўскай вышэйшай школы філязофіі «Ignatianum» і факультэту рэлігіязнаўства «Centre Sèvres» у Парыжы. Магістрант Ліёнскага ўніверсытэту імя Жана Мулена. Філёзаф, перакладчык. Супрацоўнічае з парыскім месячнікам «Études». Піша па-беларуску.

Encyklopedia wiedzy o jezuitach na ziemiach Polski i Litwy, 1564–1995 / Opracował Ludwik Grzebień przy współpracy zespołu jezuitów. – Kraków: Wydział Filozoficzny TJ, 1996.

Jésuites et Biélorusses: à la lisière de la civilisation ou au carrefour des cultures, par Constantin Simon. – Meudon: «Plamia» revue du Centre d'Études Russes St Georges, 1999.

У гісторыі рымска-каталіцкай царквы, бадай, ніводны манаскі ордэн не выклікаў столькі бурлівых эмоцыяў, як Таварыства Ісуса. Афіцыйны назоў манаскай супольнасьці – «Societas Jesu» – сёньня мала што гаворыць сярэднестатыстычнаму (калі такі наагул існуе) жыхару Беларусі. А вось слова «езуіт» больш вядомае нашым суайчыньнікам і азначае зазвычай не каталіцкага законьніка, а толькі хітраватага і няшчырага чалавека або – найчасьцей – нейкага цемрашала. Сэнс зьмяніўся разам са зьмяненьнем самога грамадзтва і самой мовы. І, як часта бывае ў гісторыі мэнтальнасьцяў, на тое былі свае прычыны. Езуітаў міжволі карціць параўнаць з касмапалітамі – усім вядома, што ў савецкі пэрыяд, асабліва падчас сталінскага тэрору, слова «касмапаліт» зрабілася паланкавым на тэрыторыі савецкай сатрапіі, а самі «грамадзяне сьвету» сталіся ворагамі «народна-патрыятычнай улады».

Параўнаньне лёсаў гэтых двух словаў і тых, каго яны абазначаюць, толькі звонку выглядае недарэчна. Каб разумець, чаму і як дайшло да паўстаньня езуіцкага міту і хто таму спрыяў, трэба вярнуцца ў XVI–XVII стст.

1 Пасьля скасаваньня Ордэну ў 1773 г. і падзелаў Рэчы Паспалітай езуіты, якія апынуліся на тэрыторыі Расейскай Імпэрыі, былі аб'яднаныя ў таемную Беларускую Каталіцкую Місію, якая існавала да 1820 г. Гл. пра гэта: Wiktor Gramatowski, Misja białoruska 1772–1820, Rzym 1967.

Менавіта гістарыяграфічнай дасьледаванасьці гэтага пытаньня і прысьвечаная кніга Пятра Гаўрылюка, Беларусі і Ўкраіны. Выданьне гэтае – плён шматгадовай калектыўнай працы пад кіраўніцтвам польскага езуіцкага гісторыка Людвіка Гжэбеня. Здавалася б, на тэму езуітаў было ўжо напісана шмат тэкстаў і цяжка знайсьці нешта новае, аднак вялікі плюс гэтай кнігі палягае ў тым, што яе аўтарам удалося сабраць разам шматлікія факты і біяграфічныя зьвесткі пра ўсіх езуітаў, якія працавалі на тэрыторыі Рэчы Паспалітай з самага пачатку заснаваньня Ордэну. Факты пададзеныя «сухой» архіўнай мовай, без прыхарошваньняў. Артыкулы, у той ці іншай ступені зьвязаныя зь Беларусьсю, маюцца амаль на кожнай старонцы – і перадусім гэты факт можа зацікавіць беларускіх чытачоў. Другі плюс энцыкляпэдыі ў тым, што яе аўтары мелі доступ да архіўных крыніцаў генэральнай курыі Таварыства Ісуса ў Рыме, куды была дастаўленая большасьць дакумэнтаў, зьвязанных зь дзейнасьцю езуітаў Беларускай правінцыі[1].

У 1999 г., гэтым разам у Францыі, таксама выйшла праца на беларускую тэматыку аўтарства амэрыканскага езуіта, гісторыка ўкраінскага паходжаньня Канстанціна Сымона, выкладчыка папскай калегіі Русікум у Рыме. Сваю працу ён апублікаваў па-французску на старонках часопісу «Пламя», выдаванага Цэнтрам расейскіх дасьледаваньняў у Мэдоне пад Парыжам.

Эўрапейскія гістарыёграфы з самых пачаткаў існаваньня Ордэну, які быў зацьверджаны папам Паўлам III у 1540 годзе, дзяліліся на два супрацьлеглыя лягеры: апалягетаў Таварыства або яго адназначных ворагаў. Такі стан рэчаў у гістарычнай навуцы ў пэўным сэнсе трывае да сёньняшняга дня: візія езуітаў зрэдукавалася да двух колераў: чорнага ці белага. Савецкая і сучасная афіцыйная беларуская гістарыяграфія неяк асабліва не адарвала сымпатыяў айцоў езуітаў, называючы іх

не інакш як *орудием полонизации* беларускага насельніцтва. Нават захаваныя да сёньня езуіцкія барочныя касьцёлы і калегіюмы – апошнія сьведкі дзейнасьці езуітаў у Беларусі – часта акрэсьліваюцца ледзь не як агідныя сьляды іншаземнага засільля. Варта, аднак, нагадаць, што тры зь пяці каталіцкіх катэдраў сёньняшніх беларускіх дыяцэзіяў[2] – былыя езуіцкія касьцёлы.

Рэчаіснасьць, як вядома, заўсёды больш складаная, чым набор некалькіх стэрэатыпаў. Ордэн паўстаў як адказ рымскай царквы на пратэстанцкую рэформу. Ягоным асноўным заданьнем была асьвета каталіцкага кліру, які, у адрозьненьне ад пратэстанцкіх пастыраў, быў мала адукаваны. Таму досыць хутка езуіцкая дзейнасьць сканцэнтравалася вакол школаў. Езуітам удалося стварыць вельмі пасьпяховую сыстэму навучаньня, якая доўга служыла мадэльлю для эўрапейскіх адукацыйных установаў. Дастаткова згадаць «Ratio studiorum» – езуіцкую пэдагагічную праграму, якая ўпершыню падкрэсьлівала неабходнасьць рознабаковага выхаваньня вучняў у каталіцкіх школах, дзе акрамя рэлігіі выкладаліся рыторыка, мовы, матэматыка, філязофія, мастацтвы і інш.

[2] Сёньня ў Беларусі існуе тры дыяцэзіі: езуіцкая мудлыяцэзія, якая доўга ставіла у Менску і Маскоўскую.

[3] A.M.D.G. *Ad maiorem Dei gloriam* – гэта дэвіз Таварыства Ісуса.

У савецкай гістарыяграфіі езуіты заўсёды асацыяваліся, кажучы палітычным жаргонам, зь нейкай рэакцыйнай групоўкай. Насамрэч, карыстаючыся паняткамі зь сёньняшняй паліталёгіі, можна хутчэй гаварыць пра «левае» крыло каталіцкай царквы. Яшчэ да скасаваньня Ордэну ў XVIII ст. езуіты стварылі ў Паўднёвай Амэрыцы нешта накшталт сацыяльнай дзяржавы для аўтахтоннага насельніцтва. У гісторыю гэтая хрысьціянская рэспубліка ўвайшла пад назвай Парагвайскіх Рэдукцыяў (Las Reducciónes del Paraguay), чым прыцягнула гнеў гішпанскай і партугальскай каляніяльных уладаў. У 1773 г. пад ціскам Бурбонаў Клімэнт XIV скасаваў Таварыства Ісуса. Варта таксама нагадаць, што і ў сучасную эпоху, у XX ст., езуіты былі заангажаваныя ў рух так званае тэалёгіі вызваленьня, чым наклікалі на сябе гнеў папы Яна Паўла II, якому бліжэйшы быў кансэрватыўны «Opus Dei»; і паставілі пад пагрозу існаваньне свайго Ордэну на пачатку 80-х гг., калі Таварыствам кіраваў гішпанец Пэдра Арупэ.

У сваёй місійнай дзейнасьці езуіты карысталіся прынцыпам так званай *інкультурацыі*. Каб пасьпяхова праводзіць катэхізацыю, трэба зьвяртацца да людзей на зразумелай ім мове і ўжываць блізкія ім паняткі. Дзеля гэтага езуіты вывучалі мясцовыя культуры. Звычайна экспартаваная культура застаецца вонкавай культурай. Але гэткае вонкавае, павярхоўнае хрысьціянства было ў супярэчнасьці з духоўнымі практыкаваньнямі, якія прапісаў Ігнацы зь Ляёлы, заснавальнік Ордэну. Ігнацы быў перадусім містыкам, а не палітыкам, як яго часта ўяўляюць. Усьведамленьне гэтага духоўнага й містычнага вымярэньня вельмі важнае, каб зразумець сутнасьць езуіцкае місіі. Духоўныя практыкаваньні зьяўляюцца падставай манаскага жыцьця езуітаў, і тыя запрашаюць верніка праз мэдытацыі жыць і служыць у поўным значэньні слова *hic et nunc* – і ўсё гэта *дзеля большае хвалы Бога*[3]. Практыкаваньні адрасаваныя ўсім вернікам, яны папулярныя да сёньняшняга дня і называюцца рэкалекцыямі. Таму другім пасьля асьветніцтва прыярытэтам езуіцкай дзейнасьці былі так званыя народныя місіі. Езуіцкае «місіянэрства» – гэта не абавязкова падарожжа ў далёкія і экзатычныя краіны, а папросту распаўсюджваньне эвангельскай *добрай весткі* там, куды скіроўвае жыцьцё.

Ці не найбольш вядомы ў сусьветнай гісторыі прыклад езуіцкай інкультурацыі – Матэо Рычы, італьянскі езуіт XVI ст., які першым у Кітаі ў якасьці місіянэра і яму ўдалося зрабіць навуковую кар'еру пры дварэ кітайскага імпэратара. Варта дадаць, што ён быў першым іншаземцам, якому было афіцыйна дазволена прамаўляць пра Хрыста ў сталіцы Паднябеснае. Рычы быў сьвятаром, падарожнікам, астраномам і – у сучасным значэньні слова – лінгвістам. Ён быў першым эўрапейцам, які стварыў слоўнік кітайскае мовы. Дарэчы, першы слоўнік літоўскай мовы быў таксама створаны езуітам Канстанцінам Шырвідам у 1620 г., а ягоная граматыка ўжывалася яшчэ да канца XIX ст.

Першыя езуіты, якія прыбылі на тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага ў 1569 г. на запрашэньне віленскага біскупа Валяр'яна Пратасевіча, паходзілі з Аўстрыйскае правінцыі Таварыства Ісуса[4] , і гэтых нямецкамоўных езуітаў цяжка *а*

[4] Правінцыя – гэта наркюўны тэрмін, які абазначае тэрытарыяльную адзінку Ордэну. На землях Рэчы Паспалітай існавалі дзьве правінцыі: Польская і Літоўская. Даты заснаваньня адпаведна 1575 і 1608 гады.

priori абвінавачваць у палянізацыі. У 1608 г. афіцыйна была заснаваная Літоўская правінцыя. Правінцыя магла аўтаномна, без дапамогі звонку, займацца выхаваньнем кандыдатаў у Ордэн. На практыцы гэта значыла, што большасьць законьніцкай моладзі была мясцовага паходжаньня. Такім чынам, у езуіцкіх калегіюмах на землях ВКЛ (як і ў іншых правінцыях) было шмат людзей рознага этнічнага паходжаньня: ліцьвінаў, палякаў, жмудзінаў, латышоў, немцаў. А калі дадаць да гэтае лічбы езуітаў-прафэсараў гішпанцаў, італьянцаў ды іншых, якія таксама выкладалі ў калегіюмах, то і выходзіць цалкам «касмапалітычнае хрысьціянскае асяродзьдзе». Тагачасная Літоўская правінцыя пакрывала тэрыторыю ўласна Літвы, Беларусі, Жмудзі, а таксама частку Інфлянтаў і Прусаў, а пазьней і Мазовіі са сталіцай Варшавай. Але менавіта ў Вільні знаходзілася рэзыдэнцыя езуіцкага правінцыяла.

Прысутнасьць езуітаў у Беларусі цалкам адпавядала сусьветнай місіі таварыства. Віленскі арцыбіскуп Пратасевіч жадаў, каб езуіты затармазілі на падуладных яму землях развой пратэстанцкай рэформы, якая пасьпяхова шырылася сярод ліцьвінаў. Ён таксама спадзяваўся, што зьяўленьне езуітаў прынясе асьвету й вышэйшую культуру мясцоваму мяшчанству. Ужо ў 1570 г., праз год пасьля прыбыцьця, езуіты заснавалі Віленскі калегіюм. Варта дадаць, што да гэтае даты ў Літве практычна не было ніводнае школы ў сучасным сэнсе гэтага слова, і мясцовая шляхта была вымушана пасылаць сваіх сыноў на вучэньне за мяжу або ў Польшчу. У 1579 г. Віленскі калегіюм быў павышаны да рангу ўнівэрсытэту з правамі акадэміі. Гэта была адзіная ўстанова такога ўзроўню ўва ўсім Вялікім Княстве. У заснавальніцкай хартыі кароль Сьцяпан Батура пісаў, што ў мурох акадэміі могуць вучыцца ня толькі ягоныя каталіцкія падданыя, але й жыхары суседніх «ерэтычных і схізматычных» земляў.

Значная колькасьць студэнтаў акадэміі былі ўласна беларусамі. Вывучаючы сёньня каталёгі езуіцкіх калегіюмаў, можна зь лёгкасьцю заўважыць, што больш за палову вучняў былі *рускага (Ruthenus)* паходжаньня. Усходняя суседка Рэчы Паспалітай менавалася тады *«Moscovia»* і панятак *«Ruthenia»* да яе не адносіўся. Але сярод студэнтаў былі таксама і маскоўцы, якіх

менавіта так і акрэсьлівалі ў езуіцкіх школьных рэестрах.

Рэакцыя на прысутнасьць езуітаў у нашай частцы Эўропы не забавілася. Шмат антыезуіцкіх памфлетаў друкавалася ў XVIII ст. у Пецярбурзе. Так, напрыклад, у 1765 г. быў выдадзены памфлет супраць езуітаў з Амсьціслава, якія абвінавачваліся ў тым, што жывасілам заганяюць *рускіх мужыкоў* у каталіцкія касьцёлы. Выданьне было падпісана нейкім Жазэфам Бурдыёнам. Пазьней выявілася, што пад гэтым псэўданімам хаваўся сам Вальтэр, праціўнік езуітаў, а замоўцам памфлету была Кацярына II. Можна толькі падазраваць, якія матывы падштурхнулі французскага пісьменьніка ўступіць у абарону «забабонных сялянаў» у глухім куце беларускай зямлі. Посьпехі езуітаў на ніве ўніяцтва не адказвалі палітычным запатрабаваньням расейскай кароны. Каб апраўдаць падзел Рэчы Паспалітай, паўстае ідэалёгія аб'яднаньня праваслаўных народаў. Падобная сытуацыя паўторыцца пазьней, у верасьні 1939 г. – у выглядзе дамовы Молатава–Рыбэнтропа. У расейскай вялікадзяржаўніцкай, а пазьней і ў савецкай ідэалягічнай гістарыяграфіі езуіты прыраўноўваліся ледзь не да саміх д'яблаў і «памагатых заходніх імпэрыялістаў». Але ці сапраўды ўсё было так страшна?

Да сярэдзіны XVII стагодзьдзя езуіты стварылі на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага шырокую сетку навучальных установаў і амаль цалкам засяродзілі ў сваіх руках сярэднюю і вышэйшую адукацыю. Езуіты зрабілі велізарны ўклад у беларускую культуру, зь іхных школаў выйшаў шэраг знакамітых вучоных, грамадзкіх дзеячаў і пісьменьнікаў, імёны якіх пазьней значна паўплывалі на развой беларускай нацыянальнай культуры. Дзякуючы ім у Беларусі да 1820 г. існавала высокаразьвітая сыстэма эўрапейскай адукацыі (каля 10 вышэйшых гуманітарных школаў, зь іх дзьве акадэміі і 7 гімназіяў), якая была зьнішчаная пасьля далучэньня Беларусі да Расеі.

Але ня толькі праз школы езуіты прычыніліся да развою беларускай культуры. Літаратурная спадчына езуітаў ня можа пакінуць абыякавым. Безумоўна, уплыў Рэфармацыі быў важным чыньнікам разьвіцьця эўрапейскіх нацыянальных

літаратураў, але і езуіцкая Контрарэфармацыя пазытыўна паўплывала на нацыянальнае пісьменства. Выдавецкая дзейнасьць езуітаў не абмяжоўвалася толькі выданьнем кніг на польскай ці лацінскай мовах. Вядомы італьянскі езуіт Антоніё Пасэвіна, аўтар слыннага твору «Moscovia», які двойчы быў у Вільні, прапанаваў віленскім езуітам перакласьці тэалягічныя трактаты на рускую мову. Першым зьявіўся пераклад трактату Генадзя Схалярыя (Genadius Scholarius), канстантынопальскага патрыярха, аб працэсіі Сьвятога Духу. Ужо ў 1585 г. быў перакладзены на старабеларускую вядомы ўва ўсёй Эўропе катэхізіс аўтарства нямецкага езуіта Пятра Канізія *«Катехізм ілі наука всем православным хрістіяном к поученію вельмі полезно»*. Пераклад быў выкананы Васілём Амаскім, езуітам беларускага паходжаньня. У Вільні езуіты апублікавалі яшчэ некалькі палемічных трактатаў, напісаных па-руску, каб абараніць Берасьцейскую унію. Адзін зь іх быў названы «Унія, альбо Выклад преднейшых артыкулов ку з'едноченю греков с костелом рымскім нальзашчых» і пабачыў сьвет у 1595 г. Калі ў той час у Масковіі таму, хто вяшчаў «ерась», выразалі язык, езуіты арганізоўвалі тэалягічныя дыспуты, на якія запрашалі праваслаўных і пратэстантаў.

У адрозьненьне ад пратэстантаў і праваслаўных, езуіты паспрыялі развою і сьвецкай літаратуры. Вялікую ролю ў гэтым адыграў тэатар. Езуіты асаблівую ўвагу надавалі драматычнаму мастацтву. Тэатар быў важным элемэнтам сьветапогляду чалавека эпохі барока. Большасьць п'есаў была напісана па-польску, але часта з так званымі беларускімі «інтэрмэдыямі», у якіх пэрсанажы гаварылі «простай» мовай. Дарэчы, гэта тычылася і літоўскай мовы. Акрамя драматычных твораў рэлігійнай тэматыкі *па-руску*, паўстала таксама шмат камэдыяў. Пісаліся яны часта на ўсім зразумелай мове, каб падкрэсьліць актуальнасьць высьмейваных заганаў. Інсцэніроўка адной зь першых такіх п'есаў, названай «Сымон Гардзілюд», адбылася ў 1584 г. у Вільні, і напісаў яе езуіт польскага паходжаньня Каспар Пянткоўскі. Галоўны пэрсанаж твору – віленскі мяшчанін-мізантроп. Езуіцкі тэатар быў важным элемэнтам выхаваўчай праграмы. Сярод іншых сьвецкіх твораў варта згадаць «Дыскурс жыдовін з скоморохом і Сенько Налевайко». Абедзьве п'есы былі напісаныя

гарадзенскім езуітам Якубам Пылінскім, друкаваліся яны лацінкай.

Што тычыцца літургіі, езуіты ўжывалі «простую» мову ў сваіх казанях, калі зьвярталіся да простых грамадзянаў. Калі ўжо ў другой палове XVIII ст. беларуская мова фактычна выйшла з афіцыйнага ўжытку на абшарах ВКЛ, езуіты працягвалі друкаваць кнігі па-беларуску. У езуіцкіх выдавецкіх рэестрах з гэтага пэрыяду ёсьць шмат назоваў па-руску, друкаваных лацінкай. У 1774 г. у Полацку быў апублікаваны зборнік царкоўных гімнаў, напісаны ў «полацкім дыялекце», які быў названы «Kantyczka, abo Nabożne pieśni w narzeczu połockim». Гэта ці не найбольш вядомае сярод дасьледчыкаў беларускай культуры выданьне з апошніх гадоў існаваньня Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў.

Шмат славутых сыноў Вялікага Княства Літоўскага былі вучнямі езуітаў. Сярод іх быў таксама Сымон Полацкі, які вучыўся ў Віленскай акадэміі. У сваіх нататках ён пералічыў сярод сваіх настаўнікаў трох езуіцкіх прафэсараў тэалёгіі, якія выкладалі ў Вільні ў 1653 г.: Казімера Каяловіча, Лукаша Залускага і Ўладзіслава Рудзінскага. У часе пазьнейшай кар'еры пры двары маскоўскага цара Сымону Полацкаму часта даводзілася быць аб'ектам атак кансэрватыўнага маскоўскага патрыярха Якіма, які акрэсьліваў Сымона Полацкага як чалавека, «сапсаванага езуіцкім навучаньнем».

Скасаваньне Ордэну, падзелы Рэчы Паспалітай і пазьнейшае выгнаньне езуітаў з тэрыторыі Расейскай імпэрыі паклалі канец гэтым пачынаньням. Ужо шмат пазьней, у міжваенную пару, у Альбярціне каля Слоніму дзейнічала ўсходняя місія Таварыства Ісуса. У 30-х гг. XX ст. тут выдаваўся па-беларуску часопіс «Да злучэньня». З 1938 г. ён друкаваўся лацінкай. Польскія ўлады пільна сачылі за гэтымі езуіцкімі ініцыятывамі. У складаным палітычным кантэксьце XX ст. беларусы разглядаліся як зрусіфікаваныя палякі або як апалячаныя расейцы, і ўсе, хто прычыніўся да развою беларускай ідэнтычнасьці, прызнаваліся за ворагаў. І езуіты зноў патрапілі ў чорныя сьпісы.

У XVII і XVIII стст. яшчэ цяжка гаварыць пра паўстаньне беларускай нацыянальнай самасьвядомасьці. Беларускае

адраджэньне прынята датаваць канцом XIX – пачаткам XX стст. Аднак многія выдатныя асобы, якія паспрыялі гэтым працэсам, былі так ці інакш зьвязаныя з таварыствам. І нават калі цяжка абгрунтаваць тэзу, што езуіты сьвядома спрыялі станаўленьню беларускай нацыянальнай сьвядомасьці, то ўсё ж можна сказаць, што яны да яе прычыніліся *a posteriori*.

Які, здавалася б, сёньня інтэрас выцягваць гісторыю езуітаў з далёкай мінуўшчыны. Мне падаецца, што самы непасрэдны: сёньня ідэалягізаваная гістарыяграфія прычыняецца да пазбаўленьня беларусаў іх эўрапейскай гісторыі, у якой Таварыства Ісуса займае годнае месца. Уся гісторыя беларусаў зводзіцца да шматлікіх помнікаў Леніну, параскіданых па ўсёй краіне, якія стаяць на скрыжаваньнях вуліцаў ды на пляцах, што нясуць цяжар савецкіх шыльдаў.

Застаецца шкадаваць, што выдадзеная ў Кракаве ў 1996 г. энцыкляпэдыя не знайшла водгукаў у беларускай навуковай крытыцы. Але кнігай зацікавіліся літоўскія выдаўцы, і цяпер рыхтуецца яе пераклад на літоўскую мову. Дарэчы, ужо ў польскім кракаўскім выданьні прадмова напісаная ў двух моўных варыянтах: па-польску і па-літоўску. Шкада, што няма беларускае вэрсіі. Тлумачыцца гэта можа й вельмі банальна: кніга гэтая – плён супрацоўніцтва польскіх і сучаснай літоўскай правінцыяў Таварыства Ісуса, а Беларусь ужо ня ёсьць іх часткай. У адрозьненьне ад Польшчы і Літвы, пра заходнеэўрапейскія краіны нават ня згадваючы, няма сёньня ў Беларусі ніводнай езуіцкай школы. Два айцы-езуіты працуюць у парафіях Гарадзеншчыны, адзін зь іх зьяўляецца каталіцкім капэлянам гарадзенскае турмы...

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 4 (44) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/14

[image]

ПАВАЛ АБРАМОВІЧ

Павал Абрамовіч
крытык літаратуры. Рэгулярна друкуецца ў «ARCHE».

Жаночыя комплексы і непатрэбныя скарбы

Рублеўская, Людміла. *Золата забытых магілаў. Паралельны раман* // Дзеяслоў. №№ 9–10. 2004.

Рублеўская, Людміла. *Скокі сьмерці. Гатычны раман* // Дзеяслоў. №№ 18–19. 2005.

У «Золаце забытых магілаў» і «Скоках сьмерці» Людміла Рублеўская магла скарыстаць досьвед такіх сучасных літаратараў, як італьянец Умбэрта Эка і гішпанец Артура Пэрэс-Рэвэртэ – «каралёў гістарычных раманаў-дэтэктываў». Магла, але не скарыстала.

«Імя Ружы» і «Клюб Дзюма, альбо Цень Рышэлье» падобныя да вежы. Калі чытач валодае разьвітым інтэлектам, ён здольны ўзьняцца на самы верх вежы і атрымаць асалоду ад сузіраньня далягляду. У выпадку, калі інтэлектуальныя здольнасьці чытача пакідаюць жадаць лепшага, яму досыць і першага-другога паверху вежы – У. Эка і А. Пэрэс-Рэвэртэ паклапаціліся, каб і тут чытач знаходзіў сабе занятак, весела і з карысьцю бавіў час. Няхай глядзіць калекцыі зброі ў галерэях ці гартае старажытныя кнігі з маляўнічымі мініятурамі, седзячы ля каміна. Чаму б не? А на вежу ён узьнімецца, калі захоча

(дакладней, паразумнее) – празь некалькі гадоў ці дзесяцігодзьдзяў.

Пабудова раманаў Рублеўскай прасьцейшая, чым у згаданых аўтараў. Кнігу «Золата забытых магілаў» аўтарка назвала «паралельным раманам», хоць гэты падзагаловак пасаваў бы і «Скокам сьмерці» – «гатычнаму раману» (вызначэньне, ізноў жа, аўтарскае). Кажу так, бо ў абодвух раманах падзеі разгортваюцца паралельна – у сёньняшнім дні і ў мінулым. Калі «сучаснасьць» у абодвух раманах Рублеўскай храналягічна амаль супадае з нашым часам, то «мінулае» – гэта XIX і XV стагодзьдзі: падзеі перад і пасьля паўстаньня Каліноўскага («Золата забытых магілаў») і гісторыя «вольнага» гораду Старавеску, на які абрынулася пошасьць («Скокі сьмерці»). Аповед мякка сьлізгае з дня сёньняшняга ў мінулае і зноў вяртаецца ў сучаснасьць. У мінулым героі змагаюцца і кахаюць, у сучаснасьці – шукаюць золата паўстанцаў («Золата забытых магілаў»), расьсьледуюць таямніцу старажытных гадзіньнікаў («Скокі сьмерці») і таксама кахаюць. Нічога складанага, мудрагелістага. Сюжэтная проза з простай, традыцыйнай будовай. Інтэлектуал, які любіць кнігі-лябірынты, кнігі, якія запрашаюць яго ў мінулае толькі дзеля таго, каб ён «пачуў размовы пра сэміётыку і іншыя мудрыя рэчы, пра Бахціна і Хёйзынгу» (Ю. Лотман – пра У. Эка), такі інтэлектуал не ўваходзіць у кола чытачоў Рублеўскай.

Аднак ёсьць адна рэч, якая родніць Рублеўскую з Эка і Пэрэсам-Рэвэртэ: дэталёвая прапрацоўка гістарычнага фону: «Пакараньне было такім – вінаватаму разразалі жывот і прыбівалі канец кішкі да дрэва. А потым няшчаснага бізунамі ганялі па крузе, пакуль усе вантробы не наматаюцца на камель» («Золата забытых магілаў»), або «...высокая немаладая кабета... падала дзяўчыне кубак з чырвонага вэнэцыянскага шкла. Чырвоны колер мусіў дадаваць сілы зёлкам» («Скокі сьмерці»). Іншым разам Рублеўская кідаецца ў стылізацыі: яна апісвае гістарычных пэрсанажаў, а таксама падзеі мінулых часоў так, як уяўляе іх сабе чалавек XXI стагодзьдзя:

Чарнявы, як грак, Шарль з вусамі, закручанымі ў тугія чорныя колцы, бесклапотна зарагатаў – нібыта ў яго не было

пятнаццаці франкаў доўгу за кватэру, і не прэтэндавалі на яшчэ два не зароблены франкі зеляншчык і прачка, а ў дом на віа Тарэ-дзі-Нона, у Залаты дом з чароўнай Зізі, яго проста больш у доўг ня пусьцяць. Гэтак жа бесклапотна засьмяяўся і Анры, рудаваты мажны барадач у саламяным капелюшы-канат'е. Няхай у кішэні – ані сантыма, Бог любіць сьпеўных птушак і заўсёды спашле ім нешта на кавалак хлеба... і келіх абсэнту («Золата забытых магілаў»).

* * *

Расейскі бэлетрыст Б. Акунін неяк патлумачыў, чаму ў якасьці галоўнага пэрсанажа для новага цыклю сваіх раманаў ён абраў манашку. «Я ня ўмею апісваць сэксуальных сцэнаў», – прызнаўся ён.

Галоўныя гераіні «Золата забытых магілаў» і «Скокаў сьмерці» – разьведзеныя маладыя жанчыны з вышэйшай адукацыяй (адна – гісторык, другая – журналістка), ганарлівыя, закамплексаваныя, адзінокія: «Я ніколі не зайздросьціла дзяўчатам, якія былі прыгажэйшыя за мяне. Зайздрасьці не было і цяпер. Але... нейкая туга. (...) А мне застаецца гэты паўпусты тралейбус, мокры асфальт, што ляціць за вокнамі, быццам чорная рака, і ўсе лістапады, па якіх я буду блукаць – сама, сама, сама...» («Скокі сьмерці»). Нуль сэксуальнасьці: «Паліна заколвала ў цяжкі вузел цёмныя валасы і апранала доўгія сукенкі. (...) Ёй хацелася быць падобнай на віктарыянскую клясную даму, якую-небудзь міс Тэмпл: годнасьць, бездакорныя манеры. Трымай дыстанцыю, мінак» («Золата забытых магілаў»).

Эратычных сцэнаў у сваіх раманах Рублеўская, як і Акунін, не прадугледжвала (ці не таму, што ня ўмее іх апісваць?), вось чаму галоўныя гераіні ў яе *такія*, а ня іншыя. У той жа час трэба нагадаць, што пэўная частка чытачоў (і частка, трэба сказаць, вялікая) амурных, прыгодніцкіх, дэтэктыўных, фэнтэзійных і іншых твораў заўсёды чакае, калі ж нарэшце Ён і Яна зьліюцца ў экстазе. І аўтар ня можа ня ўлічваць гэтага чытацкага «чаканьня». Аўтар мусіць спраўдзіць надзеі тых, для

каго піша. Рублеўская ігнаруе гэтых чытачоў, хоць дае ім падставу падумаць, што любоўныя жарсьці ў яе кнігах усё ж будуць. Яна ж апісвае маладых жанчын, а не манашак!

Дзеля справядлівасьці трэба адзначыць, што адна *амурная* сцэна (на два раманы) усё-ткі ёсьць. Вельмі пурытанская сцэна. Што цікава, яна апісана празь перажываньні… мужчыны:

Ноч палала на вуснах, быццам ноч Рыму, падпаленага шалёным цэзарам. І Вінцэсь зноў і зноў патанаў у невымоўнай пяшчоце і амаль невыноснай жарсьці, і зоры сыпаліся на іх праз галінкі ялінаў, зь якіх склалі будан… Такое было іх каханьне – цудоўнае, п'янкое, з прысмакам сьмерці («Золата забытых магілаў»).

Нацыянальная «жаночая» проза яскрава ілюструе закамплексаванасьць беларускіх жанчын.

* * *

Дэтэктыўныя лініі ў раманах Рублеўскай мацнейшыя, чым, напрыклад, у амэрыканца Дэна Браўна, аўтара нашумелага бэстсэлера «Код да Вінчы». Толькі вось сцэна ля магілы Ганор'я Рашчынскага («Золата забытых магілаў») «пастановачная»: «добрыя» героі, якія выкапалі золата паўстанцаў Каліноўскага, уважліва слухаюць, як узброеныя злодзеі, што пад'ехалі на джыпе, каб захапіць тыя скарбы, самі апавядаюць пра свае злачынствы, замест таго каб адразу «прыбраць» сьведкаў. Але падобную «пастановачнасьць», мастацкую ўмоўнасьць мы ўжо назіралі ў фіналах раманаў Агаты Крысьці – калі Эркюль Пуаро, а таксама злачынцы і сьведкі, седзячы ў пакоі, па чарзе нясьпешна аднаўляюць ход падзеяў. Канон жанру, зь ім не паспрачаесься.

* * *

Абодва раманы Рублеўскай прысьвечаны адвечным

«беларускім» пытаньням. Нават апісаньні прыроды маюць выразную «нацыяналістычную» афарбоўку: «Трава пад нагамі не шапацела, а ламалася, і калолася неміласэрна, як маскалі пад Воршай...» («Золата забытых магілаў»).

У «Золаце...» занадта шмат дэкляратыўнасьці, аўтарскай зададзенасьці. Іншым разам гэта шкодзіць стварэньню дакладных псыхалягічных партрэтаў. Вось які дыялёг адбываецца паміж беларускімі паўстанцамі, якія трымаюць аблогу расейцаў.

– Цікава, ці будуць расказваць легенды пра нас? – азваўся Стась Людвісар ад суседняга акна.

– Вядома! Мы ж будзем героямі ў новай вольнай краіне! – аптымістычна заявіў Марка.

– Хлопчыкі!.. – сумна зазначыў пан Вакула. – Рыхтуйцеся да таго, што праз сто гадоў ніхто ня ўспомніць вашага сёньняшняга геройства ў гэтай вежы. Магчыма, і вежы самой ня будзе.

– Ну, вы яшчэ скажыце, што нашыя нашчадкі ў гэтым будынку ўчыняць тэатар ды будуць паказваць апэрэткі, – запярэчыў Вінцэсь. – Ня можа ж такога быць, каб тыя, хто будзе жыць пасьля нас, перасталі цаніць сваю волю! Колькі народу за яе загінула, колькі рознага кшталту суворавы бязьвінных тут панішчылі! Не, я не магу паверыць, што гэта забудзецца.

«Ня веру!» – як казаў Станіслаўскі. Віной таму, хутчэй за ўсё, не адсутнасьць таленту, а спэцыфічны патрыятызм аўтаркі, пад уплывам якога «Золата...» ператварылася ў раман ідэяў.

Нездарма галоўныя героі знаходзяць сэнс жыцьця ў каханьні, адмаўляючыся ад улады, якую ўвасабляе золата. А вось па-мастацку кволых вобразаў ці апісаньняў у «Скоках сьмерці» амаль няма. Рублеўская, відавочна, усьвядоміла свае пралікі і засяродзілася на эстэтычным. Містычнае, злавеснае, змрочнае апісана вельмі пераканальна, падзеі разьвіваюцца дынамічна,

набліжэньне катастрофы зачароўвае. Сам вобраз скокаў сьмерці, дарэчы, («Ляціць шалёны карагод… Трымаемся мы ўсе за рукі, жывыя і нябожчыкі, і кіруе нашымі скокамі нехта нябачны і бязьлітасны, прагнучы ўлады») жахліва-запамінальны, шматплянавы, супастаўляльны з вобразам «дзікага паляваньня».

* * *

«Давялося пачуць сумную фразу ад калегі-літаратара: «Калі б Караткевіч належаў да сёньняшняга пакаленьня, яго б ніхто ня ведаў». І вы ведаеце, я гатовая пагадзіцца», – піша Рублеўская (Советская Белоруссия. 2005. № 212). З аднаго боку, пісьменьніца цьвяроза глядзіць на рэчы, усьведамляючы, што час літаратурацэнтрычнай культуры незваротна мінае. Таму, не ўпадаючы ў гістэрыю альбо дэпрэсію, як большасьць сёньняшніх беларускіх інтэлектуалаў старэйшага веку, яна спакойна і мэтанакіравана рэалізуе праграму-мінімум, выкарыстоўваючы велізарны рэсурс «Советской Белоруссии», а менавіта ўсяляк заахвочвае людзей да чытаньня айчыннай клясычнай літаратуры, выхоўвае павагу да апошняй: «Не адкрыю новых ісьцін, калі скажу, што трэба чытаць, выдаваць, нарэшце, проста шанаваць нацыянальную клясыку. (…) У нас ёсьць беларуская клясычная літаратура… Скарб незаменны, неацэнны».

З другога боку, Рублеўская перакананая, што «вышыні ніхто не скасоўваў» і што літаратура, у якой узьнімаюцца адвечныя пытаньні, сёньня па-ранейшаму патрэбная. Як пісьменьніца, яна не пакідае спробаў выканаць праграму-максымум: напісаць беларускамоўны празаічны твор, роўнавялікі ці, прынамсі, ня горшы за Караткевічаў. А яшчэ, падобна аўтару «Дзікага паляваньня караля Стаха» і «Чорнага замку Альшанскага», – выхаваць чытача-грамадзяніна прыгодніцка-дэтэктыўным раманам. Толькі вось Караткевіч пісаў свае творы фактычна ўва ўмовах адсутнасьці цікавай беларускай літаратуры, тады як Рублеўскай даводзіцца працаваць у час, калі адны цікавяцца замежнай літаратурай, а другія не цікавяцца літаратурай зусім.

Караткевіч вечна сварыўся з партыйнымі функцыянэрамі, дырэктарамі выдавецтваў, меў вялікія непрыемнасьці праз сваіх літаратурных герояў, але ўрэшце ягоныя кнігі праходзілі цэнзуру, траплялі ў плян, выдаваліся вялікімі накладамі і даходзілі да беларускага чытача. Камуністычная сыстэма забясьпечвала пераклад і распаўсюджваньне кніг Караткевіча – яго выдавалі па-гішпанску і па-віетнамску, ён карыстаўся попытам ува «ўсесаюзнага» чытача.

Караткевічу было лягчэй.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/14
[image]

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ

Даніла Жукоўскі – крытык літаратуры. Асноўная прафэсійная ідэнтычнасьць – намесьнік дырэктара па якасьці гарадзенскага шклазаводу.

Białoruś. Kraina otoczona wysokimi górami. – Wybór i przekład Katarzyna Kotyńska, Małgorzata Buchalik. – Olsztyn: Borussia, 2004.
Змест анталогіі:

1. І. Сін. «Нобелеўская лекцыя»
2. У. Арлоў. «Ордэн Белай Мышы»
3. І. Бабкоў. «Матэрыялы да біяграфіі Адама Клакоцкага»
4. У. Арлоў. «Genius loci»
5. Е. Вежнавец. «Візіт архіварыуса»
6. В. Мудроў. «Камікадзэ»
7. У. Някляеў. «Кот у мяшку»
8. Ф. Хлус, М. Юр. «Нябоская фаўна Беларусі»
9. І. Сідарук. «Скрадзены вяпрук»

...Autorzy nie dokumentują życia, lecz tłumaczą je na swój język i poetykę bez kompleksów «zacofanej, zamkniętej prowincji» Europy. Współuczęstniczą w tworzeniu kultury uniwersalnej.

З рэдакцыйнае аўтарэцэнзіі

Першае ўражанне ад кнігі псуе… першы змешчаны ў ёй тэкст. Замалая ўсё ж кніжка, каб згадваць у ёй пра нобелеўскія амбіцыі, і справа зусім не ў нясціпласці, а ў пачуцці маштабу. Збор дзевяці апавяданняў васьмёх аўтараў можа ўяўляць цікавасць, але наўрад ці як дапаможнік для шведскіх акадэмікаў. Тэкст Сіна застаецца цьмяным і непрытульным у створаным высілкамі перакладчыкаў беларускім міні-сусвеце. Чалавек, знаёмы з сучасным літарацкім колам, адзначыць у вычварэнскай «лекцыі» эпатажнасць a la Majakovski, чалавек, неабыякавы да размеркавання грошай вынаходніка дынаміту, згледзіць, можа, даволі няўклюдную пародыю на вялікапышныя прамовы лаўрэатаў, але больш за ўсё даймае жаданне недаўменна паціснуць плячыма: што тут цікавага з літаратурнага гледзішча, што тут такога, каб рэпрэзентаваць беларускую літаратуру для замежнага чытача? Недаўменне выклікае ўвагу да дэкларацый складальнікаў анталогіі.

Словы на вокладцы пакідаюць ўражанне, што мэтаю кнігі ёсць пазнаёміць польскіх чытачоў з найбольш вестэрнізаванаю плынню нашае літаратуры і што універсалісцкая тэндэнцыя мае выяўляцца не толькі фармальна, але й тэматычна. З абраных у кнігу тэкстаў вынікае, што беларускіх пісьменнікаў хвалюе ўздзеянне на грамадства дзяржаўнае машыны [2, 5, 6, 7], моцна непакоіць уплыў новых рэаліяў [9], які яны ацэньваюць збольшага як разбуральны. Прэзентаваная таксама і прысутнасць у сучаснай беларускай літаратуры сюжэтаў, уласцівых еўрапейскім альбо нават шырэй – заходнім літаратурам [2, 3, 6, 8]. Грамадская праблематыка выразна пераважае над фантазіямі разбэшчанага эга [1, 4].

Творы характарызуюць аўтараў, як нечужых еўрапейскай культуры пісьменнікаў з краіны з недэмакратычным грамадствам. Цяжка сказаць, наколькі высока ставіць гэткія *walory* польскі чытач, але гэта, праўду кажучы, не наш клопат. Наш клопат хіба ў тым, дзе гэты малюнак занадта мінаецца з праўдаю.

Прапорцыі, калі браць за першаўзор беларускамоўныя выданні, істотна парушаныя, але ці гэта мае значэнне? Ніякага, бо хіба хто намагаецца праз кніжку аб'ёмам каля 200 старонак

прэзентаваць усю літаратуру?; істотнае, бо характарызуе намеры складальнікаў. Але шмат у чым заявы супярэчаць зместу твораў: апавяданні дакументуюць жыццё, фіксуючы пэўныя з'явы сучаснасці і недалёкага мінулага [3, 5, 6, 9], эзопава мова [2, 7] зацікаўлення палітычнымі актуаліямі не хавае, аўтары, кожны на свой лад, зацята змагаюцца з трывушчымі каланіяльнымі комплексамі [1, 3, 4, 5, 7, 9]. Не заўважыць гэтага, здаецца, немагчыма.

Яшчэ больш спрэчным падаецца (трохі прыхаваны) тэзіс, што адмова ад гэткіх падыходаў гарантуе ўдзел у стварэнні універсальнай культуры, якая, хутчэй за ўсё, падаецца складальнікам каштоўнасцю нашмат большага рангу за культуру беларускую (і польскую?). На мой дылетанцкі густ, казаць пра панаванне ў сучаснай еўрапейскай літаратуры нейкага эквіваленту стылю «інтэрнацыянальнай готыкі» не варта, таму пытанне «да каго далучацца?» папросту не мае карэктнага адказу. Ва універсальную культуру сёння ўваходзяць адно праз якасць і ўнутрынацыянальную (або рэгіянальную, як Быкаў) вядомасць, і ўвага да «мясцовых асаблівасцяў» (то бо' балючых праблем уласнага грамадства) падаецца неабходнасцю, а не перашкодаю, асабліва калі мова пра апавяданні.

Але змест анталогіі неабавязкова тлумачыць высокімі тэарэтычнымі меркаваннямі, таму далей аналізаваць складальніцкую канцэпцыю з акадэмічных пазіцый няма сэнсу. Складальнікі ўзялі тое, што мела станоўчы рэзананс у асяроддзі беларускіх чытачоў, і праілюстравалі мастацкімі творамі... польскую стужку навін з Беларусі. Маем: дыктатуру-тыранію-аўтарытарызм [2, 6, 7], імклівую і разбуральную капіталізацыю-вестэрнізацыю [9], вызваленне розумаў [3, 5, 8], сумнеўныя сваёй каштоўнасцю вынікі творчае разняволенасці [1, 4].

Застаецца вырашыць, радавацца гэткай ілюстрацыйнай кан'юнктурнасці ці не.

Асабіста мяне анталогія цалкам задавальняе ўзроўнем твораў (бо адпавядае таму ўзроўню, які маецца), але пужае сваёй падпарадкаванасцю знешнім да літаратуры фактарам. Каб

аспрэчыць ролю прыдатка да RSS-стужкі, кнізе моцна не хапае прысутнасці, дзеля прыкладу, Ф. Сіўка або У. Сцяпана. Фільтр, якім карысталіся складальнікі, быў не столькі літаратурна-мастацкі (хаця, да іхняга гонару, яны пра гэта не забыліся), але ў большай ступені паліталагічна-ідэалагічны. Не думаю, каб гэткі выбар можна было апраўдаць спасылкамі на аўдыторыю – кніга наўрад ці планавалася як камерцыйнае выданне. З аднаго боку, анталогія выглядае спісам «перспектыўных» аўтараў для патэнцыйных польскамоўных фундатараў (і ў гэтым ракурсе з'яўленне на першым месцы І. Сіна чытаецца як асабістая прыхільнасць да яго). З іншага – і гэта больш верагодна – як маленькі ўнёсак у абгрунтаванне легітымнасці і натуральнасці вестэрнізацыі... польскага грамадства.

Прыём вельмі просты: расцягванне адпаведнага канцэптуальнага поля як мага далей на ўсход ад польскае мяжы. Беларуская сітуацыя, што б гэнае азначэнне ў дадзеным кантэксце ні азначала, прэзентуецца гэтак, каб ейная складанасць і нетыповасць выглядала неправакацыйна, лагічна клалася ў шэраг доказаў слушнага развіцця цэнтральна- і ўсходнееўрапейскіх народаў у якасці эвалюцыйна менш прасунутага выпадку, які, аднак не парушае нутранай гармоніі і адзінства працэсу.

Ну хіба гэта не ўдзел у «tworzeniu kultury uniwersalnej»! Сумна ад такога ўдзелу, бо грунтуецца ён на чым заўгодна, але не на павазе да беларускае культуры.

Анталогія выглядае не вынікам чыстае літарацкае зацікаўленасці ў працы калегаў па фаху, але працаю, выкананаю на замову палітолагаў. Лягчэй уявіць яе не ў руках студэнта-філолага, а студэнта-палітолага, які рыхтуецца да семінара па трансфармацыі постсацыялістычных грамадстваў: на ейных старонках ён знойдзе неабходныя прыклады.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 4 (44) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/14
[image]

ГЕНАДЗЬ СЕМЯНЧУК

Генадзь Семянчук, гісторык, археолаг, супрацоўнік катэдры археалёгіі і этналёгіі Гарадзенскага ўнівэрсытэту.

Расійская выключнасць і еўрапейская рацыянальнасць

Przebinda Grzegorz. *Między Moskwą a Rzymem. Myśl religijna w Rosji XIX i XX wieku.* – Kraków: Universitas, 2003.

Przebinda Grzegorz. *Piekło z widokiem na niebo. Spotkania z Rosią 1999–2004.* – Kraków: Znak, 2004.

Аб’ектыўная і суб’ектыўная, русафільская і русафобская, эканамічная і культурная залежнасць Беларусі ад Расіі не толькі выклікае палітычна-ідэалагічныя спекуляцыі, маніпуляцыі і фальсіфікацыі пануючага рэжыму, часовы гаспадарчы дабрабыт, але ўжо зрабілася сэнсам жыцця для некалькіх пакаленняў беларусаў.

Аўтар памянёных кніг, прафесар Ягелонскага універсітэта ў Кракаве, філолаг і гісторык ідэй, спецыяліст у расійскай літаратуры і рэлігійнай філасофіі XIX–XX стст. аналізуе гісторыю падобнай залежнасці і паміж іншымі нацыямі нашага рэгіёну.

РОЗУМ І ВЕРА – ШАНЕЦ ДЛЯ РАСІІ

Г. Пшэбінда акцэнтуе ўвагу на расійскай рэлігійнай думцы, бо перакананы, што большасць праблемаў Расіі, як у гісторыі, так і ў сучаснасці, выклікана спецыфічнай расійскай інтэрпрэтацыяй хрысціянства, а таксама абумоўленым гэтым панаваннем дзяржавы ў сферы філасофіі, рэлігіі і наагул мыслення.

Сёння назіраецца рэнесанс расійскага нацыяналізму, які грунтуецца на некалькіх падставах – антызаходніцтва і шырэй антыамерыканізм плюс нацыянальная абранасць і выключнасць, якія шчыльна звязаныя з «праўдзівай» праваслаўнай верай. Яго ідэалагічныя падставы сфармаваліся і вядомы яшчэ з XIX ст. Адсюль вынікае адмаўленне заходнееўрапейскай – каталіцкай і пратэстанцкай – рацыянальнасці. Як часта бывае апошнім часам, менавіта «крытыка» амерыканскіх і заходнееўрапейскіх каштоўнасцяў зрабілася галоўным аргументам у прапагандысцкай машыне сучасных беларускага і расійскага палітычных рэжымаў. Антырацыяналізм у расійскім грамадстве быў і ёсць характэрным і для славянафілаў-нацыяналістаў, і для атэістаў-інтэрнацыяналістаў. А яго панаванне характэрна і для часоў імперыі, і для часоў савецкай дыктатуры, і для сённяшніх часоў суверэннай Расійскай Федэрацыі. А лукашэнкаўскае палітычнае і інтэлектуальнае асяроддзе праславілася сёння толькі капіяваннем думак і паводзін так званага «старэйшага брата». Даходзіць часам да абсурду, калі беларускі філосаф, палітолаг, сацыёлаг ці гісторык польскага паходжання «абгрунтавана» даводзяць пра перавагу расійскага і праваслаўнага ладу як прагрэсіўнага перад польскім і заходнееўрапейскім, каталіцкім і пратэстанцкім як крызісным і рэгрэсіўным.

Шырокае і грунтоўнае зацікаўленне расійскай філасофіяй у постсавецкім грамадстве ў кароткі перыяд паміж 1989 і 1992 гг., перыяд «вяртання філасофіі ў Расію», было добрым знакам. Назіраўся найцікавейшы працэс сутыкнення расійскай філасафічнай рэфлексіі з ідэямі лібералізму, што адчыняла шляхі да прагрэсіўнага развіцця ў сферах гаспадаркі, палітыкі, сацыяльных адносін. Натуральна, што любая мадыфікацыя

альбо адступленне ад нормаў імперскага кіравання ў Расіі – гэта шанец для зменаў у Беларусі, магчымасць вяртання на сваё еўрапейскае месца. Аднак са снежня 1993 г. расійскія лібералы і – шырэй – «заходнікі» паступова ссоўваліся на маргінэс. І пытанне «добраўпарадкавання» Расіі адклалася на няпэўны час, бо зноў запанаваў антырацыяналізм, толькі цяпер спалучаны з меркантылізмам. Найлепшым адлюстраваннем расійскіх пераменаў ёсць «беларуская сітуацыя» перыяду А. Лукашэнкі. У дадзенай сітуацыі *«пісанне гісторыі найноўшай расійскай думкі робіцца заняткам аднастайным»*.

КАРЫСНЫЯ МЕРКАВАННІ АЛЯКСАНДРА САЛЖАНІЦЫНА

У тэксце *«Русский вопрос» к концу XX века»*, надрукаваным у «Новом мире» (1994. № 7), А. Салжаніцын падкрэслівае, што няшчасці Расіі апошніх 300 год вынікалі з яе абсурднага тэрытарыяльнага экспансіянізму. Замест таго, каб у пераломныя моманты займацца ўнутраным рэфармаваннем краю, ад якога заўсёды прыбывала вольнасці і хлеба, Расія на працягу стагоддзяў удзельнічала ў вайсковых міжнародных кампаніях, якія аслаблялі яе і духоўна, і матэрыяльна.

Яшчэ адзін момант у палітычных поглядах расійскага пісьменніка – гэта стаўленне да дэмакратыі ўвогуле і дэмакратычнага добраўпарадкавання Расіі ў прыватнасці. За крыніцу для аналізу быў узяты тэкст *«Как нам обустроить Россию? Посильные соображения»*. Сярод прапанаваных Арыстоцелем формаў дзяржаўнага ладу – манархія, арыстакратыя і дэмакратыя. – А. Салжаніцын выбірае апошнюю. Праўда, з сур'ёзнай агаворкай – дэмакратыя гэта адпаведная форма дзяржаўнага кіравання, а не ўніверсальны прынцып чалавечага існавання. Таму дэмакратыя – гэта не спосаб улады, а спосаб абмежавання яе – так, каб тая не перашкаджала развіццю ў чалавеку галоўных якасцяў, якія яму даюць сям'я і вера. А найбольшых поспехаў дэмакратыя дасягае не ў сітуацыі, калі большасць пераважае над меншасцю, а калі яны разумеюцца паміж сабою.

Для Салжаніцына няма мэты «адбудоўваць» Расію, ён заклікае

яе «будаваць». Праф. г. Пшэбінда на гэты конт заўважае, што для пісьменніка Расія яго мары ніколі не існавала ў мінулым, ніколі раней не было адпаведнага стану, які мог бы сёння быць адзіным прыдатным узорам. А мы, на жаль, штодня сутыкаемся са спробамі рэканструкцыі СССР альбо БССР, у той час, калі трэба канструяваць Беларусь, Расію і іншыя краіны. Эфекты дзейнасці «рэстаўратараў» – гэта ўзмацненне таталітарных і дыктатарскіх тэндэнцый, усеагульны кантроль, змяншэнне ролі асобы, прыярытэт абавязкаў над правамі, барацьба з іншадумствам і воляй.

У сувязі з гэтым вельмі характэрнай з'яўляецца крытыка Салжаніцыным традыцыяналізму Расійскай Праваслаўнай царквы. Асабліва шкоднай у пераломных сітуацыях ёсць «шматвекавая традыцыя асацыяльнага праваслаўя», якое не здольнае выйсці за межы ўласнай парафіі і нагадвае больш археалагічны артэфакт, чым актыўную сілу. Гаворка вядзецца не пра асвячэнне лядовых палацаў ці банкаў, альбо пра дэманстрацыйна-тэлевізійнае бласлаўленне ўлады.

На жаль, даволі часта нават самыя прыгожыя і правільныя тэарэтычныя прынцыпы пераўтвараюцца ў нацыянальна-эгаістычныя, а момантамі нават у брутальныя палітычныя эмоцыі. г. Пшэбінда справядліва адзначае падобную метамарфозу ў А. Салжаніцына. Вось яго «практычны патрыятызм» моцна разыходзіцца з «тэарэтычным», калі гаворка заходзіць аб правах расійскага народа ў межах самой федэрацыі і асабліва па-за яе межамі. Тут ён і гарлівы нацыянал-патрыёт, ініцыятар стварэння Расійскага Саюза, і антыамерыканіст, і антысіяніст, і нават антыеўрапеіст, бо негатыўна паставіўся да далучэння Польшчы і іншых краін Цэнтральнай Еўропы да НАТО.

ЯН ПАВЕЛ II ДУМАЎ ПРА БЕЛАРУСЬ

Асаблівай увагі заслугоўваюць развагі г. Пшэбінды пра Яна Паўла II і яго кантакты з праваслаўем і расійскай культурай у апошнія пятнаццаць гадоў жыцця. Спачатку некалькі ўласных назіранняў. Пры жыцці Айца Святога ў Беларусі, у Расіі і

часткова ва Украіне, так званай «кананічнай тэрыторыі» Маскоўскага патрыярхату (сам патрыярхат яе вызначыў яшчэ за часоў фармавання ідэі «Масква трэці Рым і чацвёртаму не існаваць» у канцы XV–XVI стст.), яго афіцыйна часта характарызавалі толькі як антыкамуніста, саюзніка ЗША, разбуральніка «праўдзівага» хрысціянства і ненавісніка праваслаўя. (Цікава, што амаль 130 гадоў назад Фёдар Дастаеўскі вылучыў адваротную тэзу, што «Рымскі Папа – гэта правадыр камунізму».)

Праўда, няма чаму здзіўляцца, бо, як паведамляе г. Пшэбінда, Палітбюро КПСС у шчыльным супрацоўніцтве з КДБ ужо 13 лістапада 1979 г. сфармулявала шасціпунктавы праект «Барацьба з палітыкай Ватыкана адносна сацыялістычных краін». У гэтую барацьбу былі ўцягнуты Міністэрства замежных спраўаў СССР, Акадэмія навук СССР і саюзных рэспублік, ТАСС, тэлевізія і прэса. У першым пункце гаварылася аб мабілізацыі партыйных уладаў у рэспубліках з рымска- і грэкаталіцкім насельніцтвам (у першую чаргу ў Беларусі, ва Украіне, у Прыбалтыцы). У другім пункце заклікалася да шырэйшага «абмену інфармацыяй» з братнімі камуністычнымі партыямі ў Аўстрыі, Аргентыне, Бельгіі, Ірландыі, Італіі, Партугаліі, Францыі і Заходняй Нямеччыне. У трэцім было загадана нейтралізаваць «мірную фразеалогію» адпаведных групаў у каталіцкім касцёле. Паводле чацвёртага, КДБ павінна было распаўсюджваць за мяжой думкі, што «Ян Павел II з'яўляецца небяспечным для каталіцкага касцёла». І апошняе: Акадэмія навук павінна была яшчэ больш працаваць над умацаваннем асноваў «навуковага атэізму». (Цікава было б яшчэ раз правесці даследаванне наконт тэматыкі «навуковых» дысертацый, манаграфій і артыкулаў, абароненых у 70–80-я гады XX ст. сучаснымі беларускімі ідэолагамі, часткай «кіраўнічых» асобаў у акадэмічнай і універсітэцкай гістарычнай, філасофскай, сацыялагічнай, рэлігіязнаўчай навуках. Пераканаць, што шмат для каго ідэалагічнай асновай былі падобныя рэкамендацыі, пастановы і праекты.)

Палітыка і ідэалогія найперш камуністычных уладаў СССР, а потым падпарадкаваных радыкальнаму праваслаўю расійскіх і беларускіх уладаў не дазволілі Рымскаму Папу, вядомаму

сваёй верацярпімасцю, любоўю і міласэрнасцю, які адбыў больш за сто падарожжаў па ўсім свеце, наведаць Беларусь і Расію. Вось жа, выходзіць, што Б. Ельцын і У. Пуцін разам з Аляксіем II і А. Лукашэнка з Філарэтам, замест таго каб застацца ў гісторыі як асобы, якія спрыялі прыезду Яна Паўла II у еўрапейскія і хрысціянскія краіны і ўсталяванню праўдзівага дыялогу паміж заходне- і ўсходнееўрапейскімі цывілізацыямі, застануцца ў ёй з геростратавай славай дэструктыўных сілаў. І ўжо рыторыка аб праеўрапейскіх кірунках, дэмакратычнасці і ліберальнасці сучасных беларускіх і расійскіх афіцыйных палітыкаў не можа быць шчырай і пераконваць. На жаль, і сёння, пасля смерці Яна Паўла II, па-за газэтай «Наша Ніва» ў беларускай медыяльнай прасторы мы не сустрэлі справядлівых водгукаў і ацэнак яго жыцця, дзейнасці і творчасці. Яго багатая тэалагічная і філасофская спадчына надалей застаецца па-за ўвагай і розумам сучасных беларускіх гуманістаў, большасць з якіх надалей функцыянуюць у межах вульгарнага марксізму і атэізму альбо прарасійскага «самаўладдзя, праваслаўя і народнасці» ці зноў моднага еўраазіяцтва.

З кнігі вынікае, што Ян Павел II ставіўся з прыхільнасцю да расійскай, украінскай і беларускай культураў (апошнія ён ведаў менш) і быў прыязна настроены да праваслаўя. Пра гэта сёння, на жаль, не ведае нават праеўрапейска настроеная расійская і беларуская інтэлігенцыя. Дзіўна, але адносіны да Папы Рымскага, паляка з паходжання, і яго поглядаў сярод праваслаўных інтэлектуалаў Расіі і Беларусі чамусьці праектаваліся на стаўленне да Польшчы, польскай культуры і польскага каталіцызму, а не на галоўнага прадстаўніка каталіцкага касцёла.

Паказальная дыскусія паміж Янам Паўлам II і Аляксандрам Салжаніцыным, якая адбылася 16 кастрычніка 1993 г. на пятнаццацігоддзе пантыфікату. Дарэчы, расійскі пісьменнік і дысідэнт савецкага часу быў адзінай асобай, якую ў гэты ўрачысты дзень прыняў пантыфік. Папа Рымскі выступаў як спадкаемца ідэі польска-літоўска-рускай (чытай беларуска-ўкраінскай) Рэчы Паспалітай і спасылаўся на традыцыі талеранцыі ў гэтай дзяржаве. А. Салжаніцын заставаўся пад уплывам гістарычных прэтэнзій расійскіх інтэлектуалаў да

Ватыкану, а таксама фанатычных антыкаталіцкіх тэндэнцый сучаснай расійскай эміграцыі. Ён лічыў Расію выключна праваслаўнай дзяржавай, выстаўляў прэтэнзіі каталіцкаму касцёлу за тое, што той на працягу стагоддзяў пагардліва глядзеў на праваслаўе як на горшую рэлігію, а цяпер, пасля падзення камунізму, спрабуе праводзіць экспансіўную палітыку на тэрыторыі Расіі. Расійскі пісьменнік прыводзіў аргументы толькі ў катэгорыі «гістарычна было»: удзел у дзвюх дзімітрыядах і акупацыя Масквы польскімі войскамі, паход Стэфана Баторыя на Пскоў на чале польскіх войскаў, задушэнне паўстання Севярына Налівайкі і Багдана Хмяльніцкага польскімі войскамі, Берасцейская унія 1596 г. як пагроза Расіі. І паўсюль толькі расійска-польскія гістарычныя адносіны. Для А. Салжаніцына няма ў гэтых падзеях беларуска-ўкраінскай гісторыі і шматнацыянальнай Рэчы Паспалітай.

Для Яна Паўла II беларусы, украінцы, літоўцы – гэта паўнавартасныя нацыі, якія ўтваралі ў мінулым супольную дзяржаву Рэч Паспалітую. Для А. Салжаніцына беларускія і ўкраінскія землі – гэта «рускія тэрыторыі», якія былі аб'ектам польскай каланізацыі. У чэрвені 1991 г. у Варшаве Папа Рымскі публічна паведаміў : *«Te narody* (беларускі, украінскі і літоўскі. – Г. С.) *dążą do swojej autonomii, do swojego samostanowienia, swojej własnej podmiotowości, także politycznej. My się tego cieszymy. Cieszymy się z tego rozwoju, z tego dojrzewania sąsiadów na wschodzie»*. Гэта гучная падтрымка іх самастойнасці, якую пацвердзіў Ян Павел II падчас сваіх падарожжаў у 1993 г. у Літву і ў 2001 г. ва Украіну. Прызнанне рэлігійнай, культурнай і палітычнай самабытнасці Беларусі і Украіны – не фармальна-юрыдычна, а духоўна, – гэта найважнейшы крок для папраўлення польска-расійскіх адносінаў і добраўпарадкавання Расіі.

«Прыгажосць уратуе свет», – кажа князь Мышкін у «Ідыёту» Фёдара Дастаеўскага. Ян Павел II гаворыць: «Сіла дабра схавалася ў натуры прыгожага». «Якая прыгажосць і які свет яна ўратуе?» – пытае праф. г. Пшэбінда. І адказвае: *«Павінны быць «новы свет» і «новая Еўропа», з вольнымі і незалежнымі Польшчай, Украінай, Беларуссю і Літвой, а таксама самакіраванай і не варожай да Еўропы Расіяй»*.

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/14
[image]

ДЗМІТРЫЙ КРЫВАШЭЙ
кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік аддзелу нацыянальна-культурнага разьвіцьця Беларусі Інстытуту гісторыі НАН Беларусі. У 2000 г. абараніў канлыдацкую дысэртацыю «Разьвіцьцё культурных сувязяў Рэспублікі Беларусі з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Эўропы

Дзмітрый Крывашэй
Праблема выбару і мяжы

Вялікі А. Ф. *На раздарожжы. Беларусы і палякі ў час перасялення (1944–1946 гг.).* – Минск: БДПУ, 2005. – 319 с.

Адной з галоўных праблем ва ўсе часы была і застаецца праблема тэрытарыяльная. Сусед з суседам вадзіцца з-за мяжы паміж агародамі, а гісторыя ведае шмат фактаў, калі тэрытарыяльныя прэтэнзіі служылі прычынай памежных канфліктаў і войнаў.

Кніга Анатоля Вялікага прысвечана менавіта мяжы. А дакладней, уплыву працэсаў урэгулявання савецка-польскай мяжы на этнасацыяльныя працэсы на беларуска-польскім памежжы. У манаграфіі яскрава вылучаюцца дзве асноўныя праблемы: вызначэнне мяжы і этнічныя працэсы. На маргінесе застаюцца пытанні міжэтнічных кантактаў насельніцтва рэгіёна.

У кнізе чатыры раздзелы. У першым разглядаюцца праблемы вызначэння дзяржаўнай мяжы паміж Савецкім Саюзам і Польшчай. Змест раздзела выразна дэманструе нацыянальна-дзяржаўную пазіцыю аўтара. Ён падрабязна спыняецца на аналізе пазіцыі Менска ў пытанні беларуска-польскага ўчастка савецка-польскай мяжы і доказна сцвярджае той факт, што «заходняя мяжа Беларусі вызначалася на аснове не

двухбаковага беларуска-польскага, а савецка-польскага дагавора. З гэтага вынікае, што кіраўніцтва Беларусі не мела права самастойна вызначаць межы рэспублікі. Яны вызначаліся ў Маскве» (с. 42). Ведучы гаворку аб адхіленнях мяжы на карысць Польшчы, аўтар заўважае, што яны «былі зроблены не коштам тэрыторыі Расіі, а коштам тэрыторыі Беларусі» (с. 20).

Аналізуючы мерапрыемствы па выпрацоўцы беларуска-польскага «Пагаднення аб эвакуацыі беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзянаў з тэрыторыі БССР» ад 9 верасня 1944 г. і яго змест, аўтар прытрымліваецца думкі, што яно было падпісана з ініцыятывы Крамля. Пры гэтым ён не адмаўляецца ад таго, што гэтая выснова дастаткова хісткая (с. 54). Ідучы далей у аналізе і параўнаннях, аўтар выказвае наступную (зноў жа хісткую) думку аб тым, што «савецкі бок пры абмеркаванні ўмоў беларуска-польскага пагаднення аб «эвакуацыі» скарыстаў у якасці ўзору савецка-германскае міжурадавае пагадненне аб абмене насельніцтвам паміж СССР і Германіяй, якое было падпісана краінамі 16 лістапада 1939 г.» (с. 56).

Важным метадалагічным пытаннем для аўтара ёсць пытанне пра выбар тэрміна, які б больш дакладна апісваў працэсы значных этнічных перамяшчэнняў, якія былі штучна распачатыя ў адпаведнасці з савецка-германскімі пагадненнямі. Аўтар адхіляе тэрміны «эвакуацыя» і «рэпатрыяцыя» і спыняецца на «перасяленні», «абмене насельніцтвам». Паралельна з гэтымі развагамі аўтар, на наш погляд, вельмі слушна адзначае, што «ўсе зацікаўленыя бакі (…) перш за ўсё турбавала праблема не людзей, якія падлягалі перасяленню, а тэрыторыі. (…) Лёсы соцень тысяч людзей па абодва бакі мяжы, іх жаданні, волевыяўленне не клапацілі нікога. Фактычна яны сталі заложнікамі палітычных рашэнняў» (с. 45).

У наступных двух раздзелах прадстаўлена гісторыя практычнага ажыццяўлення перасялення асоб польскай нацыянальнасці ў Польшчу. На нашу думку, выкладанне матэрыялу ў іх недастаткова паслядоўнае. На першы погляд, змест раздзелаў разбіты паводле храналагічнага прынцыпу – мяжою з'яўляецца вясна 1945 г. Пры бліжэйшым знаёмстве са

зместам відаць пэўная блытаніна. Напачатку другога раздзела, які ў цэлым прысвечаны праблеме перасялення ў перыяд 1944 – пачатку вясны 1945 гг., аўтар асобную частку аддае пад аналіз эвалюцыі стратэгіі партыйнага кіраўніцтва БССР у адносінах да «польскага насельніцтва, якое засталося ў рэспубліцы». Спрабуючы даць адзнаку колькасці польскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі, ён звяртаецца да архіўных дакументаў 1946 г., палемізуе з П. Эберхардам і Т. Кручкоўскім, а таксама распавядае аб ліквідацыі польскага школьніцтва ў Беларусі ў 1947–1948 гг. На наш погляд, гэтая частка павінна быць змешчаная (згодна з храналагічным падыходам) у канцы трэцяга раздзела.

Наступныя главы прысвечаны больш жыццёвым праблемам, асноўнай з якіх ёсць вырашэнне пытання «ехаць ці заставацца?» (раздзел 2, глава 2). Менавіта з гэтай главы яскрава заўважаецца змена аўтарскіх сімпатый – ён займае пазіцыю паляка – жыхара Беларусі.

Апісваючы тэмпы падачы заяў на перасяленне, аўтар лічыць, як пераломны перыяд вясну 1945 г. Пры тлумачэнні гэтага факту ён пакідае па-за ўвагай значны вонкавапалітычны фактар. Згодна з Я. Мірановічам, да сярэдзіны 1945 г. мясцовыя палякі (пераважна на тэрыторыі Заходняй Беларусі) разглядалі запіс на перасяленне як «своеасаблівую форму ціхага плебісцыту, які павінен быў прадэманстраваць польскасць заходніх раёнаў БССР»[1] і такім чынам паўплываць на вырашэнне тэрытарыяльнага пытання на карысць Польшчы. У сувязі з гэтым колькасць тых, хто звярнуўся ў камісіі па перасяленні, была нязначнай. Сітуацыя змянілася пасля Крымскай канферэнцыі, калі стала зразумелай марнасць спадзяванняў, – лічбы выраслі ў разы. Пра тое, што ў пункты рэгістрацыі прыходзілі «не столькі для таго, каб зарэгістравацца на выезд у Польшчу, колькі для таго, каб засведчыць сваю прыналежнасць да польскай нацыянальнасці», піша і А. Вялікі (с. 73).

[1] Mironowicz E., Taka S., Radzik R. Zmiana struktury ludnościowej Białorusi w XX wieku. – Białystok: Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku, 2005. – 89 s.

Сп. Вялікі згадвае пра Крымскую канферэнцыю, калі распавядае пра польскае падполле як фактар, які рабіў магутны ўплыў на працэсы перасялення. Аналіз дзейнасці

польскага падполля дазволіў аўтару вылучыць два перыяды, мяжою якіх стала канферэнцыя ў Крыме. На думку аўтара, у першы перыяд «лонданскі ўрад і падполле не пакідалі надзеі на вяртанне ўсходняй мяжы, якая існавала напярэдадні 17 верасня 1939 г. Падполле, выконваючы палітычны загад лонданскага ўрада, скіроўвае дзейнасць на забарону палякам рэгістравацца і выязджаць у Польшчу» (с. 109). У другі перыяд «падполле, наадварот, прыкладае намаганні, каб усё польскае насельніцтва рэгістравалася і выязджала ў Польшчу» (с. 110). Такія дзеянні Арміі Краёвай аўтар характарызуе не толькі як антысавецкія, антыбеларускія, але і як антыпольскія (с. 113).

Вось такія два меркаванні двух паважаных гісторыкаў. Я. Мірановіч не заўважыў таго, пра што гаворыць А. Вялікі, цытуючы паведамленні прадстаўнікоў савецкай улады (разглядаючы, такім чынам, гэты працэс з яе пазіцый). Наколькі, усё ж такі, быў значны ўплыў польскага падполля? Магчыма, ісціна ляжыць пасярэдзіне?

Асобная частка прысвечана аналізу пазіцыі Каталіцкага Касцёла, якая «істотна паўплывала на рашэнне вернікаў у пытанні перасялення» (с. 115–116). Аўтар заўважае цікавую тэндэнцыю: святары не аддзяляліся ад прыхаджанаў у рашэнні выехаць ці застацца. «Калі большасць вернікаў прыходаў заставалася ў Беларусі, то разам з імі заставаліся і святары» (с. 122). Даследчык распавядае пра меркаванне савецкіх уладаў пра тое, што рымска-каталіцкія святары, якія заставаліся ў Беларусі, мелі прамое ўказанне Ватыкана не выязджаць з рэспублікі. Аднак ён вельмі асцярожна падыходзіць да гэтага: «Можна меркаваць, што размовы з кіраўніцтвам епархій святары мелі, і іх рашэнне выязджаць ці заставацца залежала як ад кіраўніцтва епархій, так і ад саміх святароў» (с. 120).

Аўтар шляхам аналізу дакументаў вызначае сукупнасць фактараў, якія вымушалі палякаў з'язджаць з Беларусі. Галоўнымі з іх былі сацыяльна-эканамічныя, грамадска-палітычныя, канфесійныя, этнічныя, роднасныя і іншыя. Сп. Вялікі падрабязна спыняецца на іх аналізе і прыходзіць да высновы, што «дамінуючымі неабходна прызнаць сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя» (с. 221). Разам з гэтым

даследчык адзначае, што «частку палякаў вымушала пераязджаць высокае пачуццё нацыянальнай самасвядомасці» (с. 103). Менавіта гэтае пачуццё было найбольш выкрышталізавана ў інтэлігенцыі, якая складала, паводле падлікаў Я. Чарнякевіча, што прыводзіць А. Вялікі, каля ј ад усіх перасяленцаў (с. 163).

У гэтым месцы было б цікава параўнаць працэс перасялення з Беларусі палякаў з працэсам перасялення з Польшчы беларусаў. На жаль, аўтар не выкарыстоўвае параўнаўчага аналізу пры правядзенні даследавання. Выезду беларусаў з Польшчы прысвечаны асобны, апошні раздзел. У ім і знаходзім адказ на ўзніклае пытанне – «абсалютную большасць зарэгістраваных і пераселеных складала бядняцкая і серадняцкая часткі сялянства. (…) Прадстаўнікі інтэлігенцыі (урачы, настаўнікі, інжынерна-тэхнічныя работнікі і заможнае сялянства) фактычна праігнаравалі перасяленчую акцыю» (с. 204–205). Акрамя гэтага, «магчымасцю перасялення ў БССР таксама скарыстаўся і партыйна-савецкі, прафсаюзны, камсамольскі актыў, які ўдзельнічаў у сацыялістычных пераўтварэннях на Беласточчыне ў 1939–1941 гг. (с. 204–205). Як можна заўважыць, пераезд у Беларусь адбываўся з цалкам кан'юнктурных пазіцый. Ехалі ці з надзеяй на лепшае жыццё ў «краіне роўных магчымасцяў», ці ў мэтах выратавання ад помсты. А дзе ж пачуццё нацыянальнай самасвядомасці?! Імкненне да ўз'яднання?

Трэці раздзел манаграфіі прысвечаны аналізу другога перыяду працэсу перасялення палякаў, які пачаўся ўвесну 1945 г. Ён характарызуецца ўвядзеннем жорсткага кантролю над працэсам з боку партыйных і савецкіх органаў. Першым крокам быў разгляд на паседжанні бюро ЦК КП(б)Б 5 красавіка 1945 г. пытання «Аб недахопах у працы па перасяленні грамадзянаў польскай нацыянальнасці ў Польшчу». Шмат разважаючы пра вызначэнне нацыянальнай прыналежнасці мясцовага насельніцтва, аўтар спыняецца і на праблеме суаднясення веравызнання з нацыянальнай прыналежнасцю. Менавіта яна паслужыла прычынай больш уважлівага стаўлення камісій па перасяленні да тых, хто імкнуўся выехаць. З чэрвеня 1945 г. для атрымання эвакадакументаў неабходна было падаць

даваенныя дакументы (да 1939 г.) ці даведку мясцовых уладаў, якія пацвярджалі нацыянальнасць. Гэта значна ўскладніла магчымасці выезду.

Распавядаючы аб перашкодах, якія беларускія ўлады ставілі на шляху перасялення палякаў, аўтар толькі ў канцы раздзела згадвае аб прычыне такіх перамен. Зразумела, што яны былі эканамічнага характару – «недапушчэнне выезду ў Польшчу працаздольнага і гаспадарлівага насельніцтва, якое разглядалася як танная рабочая сіла ў аднаўленні разбуранага вайной гаспадарчага комплексу Беларусі» (с. 151). У гэтым раздзеле аўтар не прыводзіць ніякіх доказаў гэтага тэзіса. Гэта звязана з тым, што дакументы па гэтым аспекце праблемы цытаваліся значна раней, калі ішла гаворка пра матывы пераезду палякаў (раздзел 2, глава 4). Зноў жа, непаслядоўнасць у падачы матэрыялу не дазваляе аргументаваць высновы. На старонках 100–102 аўтар якраз і спыняецца на прыкладах, якія характарызуюць цяжкое становішча кадравай напружанасці ў сувязі з масавым выездам настаўнікаў, медработнікаў, работнікаў прамысловасці, інжынерна-тэхнічнага комплексу. Зноў да гэтых пытанняў аўтар вяртаецца ў частцы 3 раздзела 3.

Асобным, адарваным ад папярэдняга зместу з'яўляецца чацвёрты раздзел манаграфіі, які прысвечаны даследаванню праблемы перасялення беларусаў з тэрыторыі Польшчы ў Беларусь. Аўтар зноў прыгадвае перадгісторыю пытання, беларуска-польскае пагадненне ад 9 верасня 1944 г. і пратакол ад 25 лістапада 1945 г., распавядае пра вялікую колькасць работнікаў спецслужбаў. Як і ў выпадку з палякамі, якіх не хацелі заўважаць беларускія ўлады, улады Польшчы не заўважалі беларусаў. Аднак існавалі і значныя адрозненні. Даследчык адзначае, што «ў дзеяннях польскіх левых сіл, якія прыйшлі да ўлады, і лонданскага эмігранцкага ўрада, нягледзячы на адрозненні, выразна праглядалася адна мэта – стварэнне ў Польшчы аднанацыянальнай дзяржавы і гэтым самым пазбаўленне ад усіх праблем, звязаных з беларусамі як нацыянальнай меншасцю» (с. 178).

Шкада, што аўтар не знаёмы са зборнікам дакументаў
[2] Sprawy narodowościowe i wyznaniowe na Białostocczyznie,

простага чалавека, яна «разарвала трывалыя і ўстойлівыя роднасныя, сяброўскія, суседскія сувязі, парушыла векавы лад жыцця, значна змяніла традыцыйную структуру насельніцтва. (…) Для соцень тысяч людзей гэта была асабістая трагедыя» (с. 223).

У канцы кнігі прыведзены біяграфічныя звесткі пра асобных дзеячаў, пра якіх згадваецца ў тэксце. Акрамя гэтага, у кнізе змешчаны 53 дадаткі ў выглядзе табліц.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/07/14
[image]